ISSN 1609–9672

И З В Е С Т И Я

Гомельского государственного университета имени Ф.Скорины

№ 2(65)
Гуманитарные науки

2011

И З В Е С Т И Я

Гомельского государственного университета имени Ф.Скорины

Научный и производственно-практический журнал
Выходит 6 раз в год
Издается с октября 1999 г.

№ 2(65)
Гуманитарные науки

2011

Учредитель – Гомельский государственный университет имени Ф.Скорины

Журнал зарегистрирован в Министерстве информации Республики Беларусь
(свидетельство о регистрации № 546 от 6 июля 2009 года)

РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ:

А. В. Рогачев (главный редактор)

О. М. Демиденко (зам. главного редактора)
Л. А. Шеметков (зам. главного редактора)

Го Вэньбинь, Г. Г. Гончаренко, А. М. Дворник, Г. М. Евелькин,
Н. Н. Коленчукова (ответственный секретарь), С. В. Жаворонок, В. Г. Жогло, Ф. В. Кадол,
В. Н. Калмыков, В. В. Кириченко, Г. Е. Кобринский, Г. Г. Лазько, А. М. Литвин,
А. В. Макаревич, И. В. Максимей, Н. В. Максименко, Г. И. Нарскин, О. С. Осипова,
А. Н. Сердюков, Н. В. Сильченко, Б. В. Сорвиров, А. А. Станкевич,
В. М. Хомич, И. Ф. Штейнер, Я. С. Яскевич

Адрес редакции:
ул. Советская, 104, к. 2-17, 246019, Гомель
Тел. 60-27-71, e-mail: vesti@gsu.by

© Известия Гомельского государственного
университета имени Франциска Скорины, 2011
© Proceedings of the F.Scorina Gomel State University, 2011

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

Филология

УДК 811.161.3'373.21'373.421

Сінанімія ў тапанімічнай лексіцы

Н. А. Багамольнікава

Артыкул прысвечаны вывучэнню сінанімічных адносін у тапанімічнай лексіцы.
Ключавыя словы: апелятывы, онімы, тапанімія, сінонімы, сінанімія, сістэмныя сінанімічныя сувязі, тапанімічная сінанімія, варыянтнасць, сінхранія.

The article is devoted to studying of synonymic relations in toponymic vocabulary.
Keywords: appellatives, onyms, toponymy, synonyms, synonymy, system synonymic connections, toponymic synonymy, alternativeness, synchronism.

Пад тэрмінам *тапанімія* мы разумеем сукупнасць тапонімаў: гідронімаў, айконімаў, урбанонімаў, мікратапонімаў, харонімаў. У апошнія гады ўсё большую ўвагу лінгвістаў прыцягвае да сябе рэгіянальная тапанімія, якая ўяўляе сабою складаную сістэму з разнастайнымі ўнутрысістэмнымі адносінамі.

На пытанне вызначэння сінонімаў у мовазнаўстве сярод вучоных існуе некалькі пунктаў погляду. Так, сінонімамі называюць словы: а) тоесныя па значэнні; б) блізкія па значэнні; в) тоесныя або блізкія па значэнні; г) здольныя абазначаць адзін прадмет або адно і тое ж паняцце [8, с. 237]. Першы падыход да сінонімаў (А. Д. Грыгор'ева) вельмі абядняе іх змест, зніжае праблему адбору сінонімаў як важных моўных сродкаў для выражэння вельмі тонкіх адценняў думак і пачуццяў людзей. Не кваліфікуюць дастаткова поўна і іншыя азначэнні. Найбольш распаўсюджаным (яго яшчэ называюць традыцыйным) разуменнем сініоніма з'яўляецца азначэнне А. П. Яўгеньевай, якая лічыць сінонімамі словы, што абазначаюць адно і тое ж паняцце, тоесныя або блізкія па значэнні, пэўным чынам суаднесеныя ў даны час у мове і служаць для дэталізацыі і абазначэння тонкіх сэнсавых адценняў паняцця або выражэння экспрэсіўных, стылістычных, жанравых і іншых адрозненняў [8, с. 237]. Прапанаваны падыход адлюстроўвае важнейшыя формы семантычных адносін у апелятыўнай лексіцы, "якімі характарызуюцца сінанімія і сінонімы, а іменна: тоеснасць або блізкасць значэння членаў апазіцыі – з аднаго боку, а таксама асблівасці словаўжывання – з другога боку [8, с. 237]. Сінанімія (ад грэч. synonymia 'аднайменнасць') – поўнае ці частковае супадзенне значэнняў моўных адзінак [4, с. 482]. Як і аманімічныя, сістэмныя сінанімічныя сувязі даволі прадуктыўна выяўляюцца на розных узроўнях апелятыўнай лексікі: сярод марфем, слоў, фразеалагізмаў, словаўтваральных мадэлей, сінтаксічных канструкцый, словазлучэнняў, сказаў. Адзначанае пацвердзім прыкладамі.

У марфеміцы сінанімічнымі могуць быць марфемы (нашай мовы ці ў складзе нашай) усіх відаў. Яны маюць аднолькавае або блізкае значэнне, але генетычна не звязаны паміж сабой, параўн.: ***раб**ота* – ***прац**а* (каранёвыя), *гамяль**чанін*** – *гомел**ец***, *слав**іст*** – *славян**вед*** (суфіксы), ***най**важнейшы* – ***архі**важны* – ***звыш**важны*, ***ультра**модны* – ***супер**модны* (прэфіксы), *вядр**о***, *пол**е***, *возер**а*** (флексіі). Сінанімічнымі афіксы з'яўляюцца і ў словаўтварэнні: звяр'ё - *звяр**ј**о*, *бярэз**нік***, *дуб**няк***, *студэн**цтв**а*, *дзетв**ар**а*, *прафес**ур**а* (суфіксы выяўляюць значэнне 'зборнасці').

Сярод сінонімаў у лексіцы вылучаны наступныя групы, што адрозніваюцца адценнямі значэння, стылістычнай афарбоўкай, спалучальнасцю з іншымі словамі: лексічныя, семантычныя, стылістычныя, кантэкстуальныя (*гулкі* 'гучны, які не адразу змаўкае', сінонімы:

моцны, звонкі [7, с. 100], *наркотык* і *белая смерць*, *Глуха*, *пуста* і *зацята* і нікога не відно (у полі) ‘непрытульна’ [4, с. 482].

Сінтаксічныя ўяўляюць сабой узаемаўзамяняльныя канструкцыі, аднародныя па структуры, сэнсу і функцыях, але якія маюць адметныя семантычныя адценні і стылістычную афарбоўку: *пайсці да возера*, *пайсці пад возера*, *пайсці ў бок возера*, *пайсці ў накірунку возера*. Іх агульнае значэнне – ‘кірунак руху да прадмета’, на адрозненне сэнсавых адценняў у такіх сінанімічных словазлучэннях указваюць прыназоўнікі.

У беларускім мовазнаўстве ў апелятыўнай лексіцы пазначанаму пытанню прысвяцілі свае працы М. Я. Цікоцкі, А. К. Юрэвіч, М. С. Яўневіч і інш. Сінанімічныя ж адносіны на ўзроўні онімаў у беларускай анамастыцы дагэтуль не атрымалі належнай увагі, таму мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца іх даследаванне ў сінхраніі.

Спецыфіка тапанімічных працэсаў выразна праяўляецца на тэрыторыях, што знаходзяцца на памежжы (у дадзеным выпадку, як і наша Гомельшчына) або на якія ўплывалі якім-небудзь чынам розныя народы і дзяржавы. У сувязі з гэтым прыцягвае да сябе ўвагу з’ява тапанімічнай сінаніміі, калі рэальныя геаграфічныя аб’екты названы рознымі імёнамі, матывавальныя асновы якіх указваюць на іх аднолькавыя ці прыблізна аднолькавыя прыкметы і могуць належаць як адной мове, так і розным. Зразумела, што такая сінанімія не з’яўляецца “ісціннай”, не прыбліжана да яе адэкватнага паняцця ў апелятыўнай лексіцы.

Праблема тапанімічнай сінаніміі найперш уяўляе гістарычную цікавасць, адлюстроўваючы асаблівасці гістарычнага развіцця і лёс народаў, таму пытанне вывучалася асобнымі анамастамі, у асноўным англійскімі, у дыяхраніі (А. Х. Смітам) [5, с. 6]. На думку В. Д. Беленькай, “яна можа разглядацца і ў плане сінхранічным, выступаючы ў выглядзе пытанняў аб варыянтнасці назваў, аб адначасовых ці суіснуючых варыянтах” [5, с. 6]. У расійскай тапаніміцы гэты важны накірунак распрацоваўся ў МДУ на філалагічным факультэце пад кіраўніцтвам В. С. Ахманавай [5, с. 4].

Мы пагаджаемся з даследчыцай В. Д Беленькай у тым, што тапанімічная сінанімія можа аналізавацца таксама ў сінхраніі. І ўсё ж, варыянтнасць і сінанімію мы не атаясамліваем, не адносім да раўназначных паняццяў. Варыянтнасць як з’ява ў тапаніміі намі падрабязна ўжо была разгледжана. Да варыянтных мы аднеслі аднакаранёвыя назвы адных і тых жа аб’ектаў з рознымі мадыфікацыямі, а таксама рознакаранёвыя (алонімы), ужытыя для дэфініцыі аднаго і таго ж аб’екта [3, с. 127 - 143]. Варыянты – гэта афіцыйныя назвы разнастайных аб’ектаў, што суіснуюць паралельна з мясцовымі найменнямі.

Паняцце сінаніміі ў тапонімах, на наш погляд, вельмі спецыфічнае і носіць, як і ў аманіміі, унутрывідавы ці міжвідавы характар (сінанімія ў шырокім сэнсе, ці “квазісінанімія”). Іншымі словамі, для абазначэння, функцыянавання розных геаграфічных аб’ектаў выкарыстаны апелятывы, першаснае этымалагічнае значэнне якіх аднолькавае ці прыблізна аднолькавае. Ажыццяўляючы сувязь “чалавек – аб’ект”, онімы адначасова адрозніваюць і называюць аб’екты, даюць ім апісанне фізіка-геаграфічных і іншых прыкмет, у некаторых выпадках нават характарызуюць іх. Сінанімія выяўляецца на апелятыўным і онімным узроўнях у асобных групах лексікі, дзе, акрамя функцыі ўказання, прасочваюцца дадатковыя значэнні, звязаныя з аднолькавай ці падобнай канатацыяй аб’ектаў. У тапанімічнай сінанімічнай сінхраніі, такім чынам, захоўваецца не толькі дэнатацыя (указанне на аб’ект), але і канатацыя – унясенне дадатковых сазначэнняў. А цяпер на прыкладзе асобна ўзятага геаграфічнага рэгіёна Беларусі – Гомельшчыны мы павінны вызначыць, што ўяўляюць сабою тэрміны, якія ўдзельнічаюць у стварэнні тапанімічнай сінаніміі ў шырокім сэнсе.

Назіранні паказваюць, што важнае месца ў гэтым аспекце даследавання займае аналіз геаграфічных тэрмінаў у складзе ўласных найменняў. Гэта абумоўлена тым, што выкарыстаныя для абазначэння аб’ектаў тэрміны рэльефу і ландшафту валодаюць адпаведным зместам: канкрэтнымі прыкметамі або параметрамі, якія адлюстроўвалі ці адлюстроўваюць рэальныя ўласцівасці аб’ектаў.

З’яву сінаніміі ў тапаніміі Гомельшчыны ілюструе наступная табліца.

Віды тапонімаў	Месца функцыянавання	Першаснае значэнне матывавальных асноў
		‘узгоркавая ўзвышаная мясцовасць’:
в. ***Бердыж***	Чач.	дыял. слав. *берд* ‘горб, узвышэнне’
бал. ***Бугорно***	Лельч.	*бугор* ‘узгорак, пагорак’
воз**.** ***Буеч***	К.	*буй, буёк* ‘высокае адкрытае месца’
п. і в. ***Гара***	Б.-К., К.	*гара* ‘высокае месца’
р. ***Гарынь*** (***Горынь***)	Жытк.	слав. *гарынь* ‘гара’
бал. ***Грабяні***	Нар.	*грэбень* ‘прадаўгаватая вяршыня гары’
бал. ***Градзя***	Жытк.	мясц. *града* ‘доўгае павышэнне’
пп. ***Грыва***	Гом.	*грыва* ‘прадаўгаваты ўзгорак’
р. ***Гурыстая***	Лельч.	мясц. *гура* ‘гурба, куча’
р. ***Груд***	Маз.	*груд* ‘узвышаная мясціна’
бал. ***Курган***	Жытк.	*курган* ‘вялікі ўзгорак’, ‘магільны ўзгорак’
бал. ***Куявец***	Лельч	дыял. укр. *куява* ‘круты ўзгорак’
п. ***Лобск***	Жл.	*лоб* ‘высокае адкрытае месца’
воз. ***Сопкі***	Жытк.	*сопка* ‘пясчаны ўзгорак’
р. ***Тур*** (***Туро, Тура***)	Маз.	*тур** ‘выпуклая форма ў выглядзе гарба’
п. ***Халмы***, в. ***Холмеч***	Гом., Рэч.	мясц. *холм* ‘невялікае ўзвышэнне’
в. ***Шаламеі***	Карм.	*шалом*, *шаламея* ‘узвышэнне, бугор’
		‘паніжанае, перавільготненае месца’
бал. ***Алёс***	Маз.. Петр.	*алёс* ‘забалочаны альховы лес’
р. ***Балоння***	Хойн.	*балонь*, *балонье* ‘заліўны луг’
бал. ***Верацея***	Жытк.	арх. *верацея* ‘нізкае балоцістае месца’
р. ***Долінка***	Нар.	*даліна* ‘нізкае месца’
бал. ***Долы***	Нар.	*дол* ‘заліўны луг’
р. ***Займа***	Хойн.	мясц. *займа* ‘пойма, заліўны луг’
воз. ***Калуга***	Жытк.	мясц. *калуга*, *калюг* ‘катлавіна, паніжэнне’
в. ***Катлавіца***	Браг.	*катлавіна* ‘паніжанае месца’
воз. ***Лажэнь***	Жытк.	*лог* ‘паніжэнне рэльефа’
бал. ***Лугі***, в. ***Лужок,***	Петр., Карм.	*луг* ‘заліўная сенажаць’
в. ***Люткава*** (***Людкава***)	Б.-К.	*лют* ‘мокрае месца’
бал-ы ***Муцвіца***	Жытк., Нар., Хойн.	арх. *муцвіца* ‘нізкае балоцістае месца’
р. ***Ныз*** (***Ніз***)	Нар.	*ніз* ‘нізкае месца’
бал. ***Паплавы***	К.	*поплаў* ‘заліўны луг, сенажаць’
бал. ***Плёс, Пляссе***	К.	мясц. *плёс* ‘забалочанае месца’
бал. ***Равенскае***	Нар.	*равінка* ‘паніжанае месца’
в. ***Расава*** (***Росава***)	К.	інд. -еўр. *ros* ‘волага, вада’
в. ***Сірод*** (***Сырод***)	К.	мясц. ‘сырое, пераўвільготненае месца’
в. ***Сырск***	Карм.	
в. ***Хоўхла***	Б.-К.	дыял. *хоўхла* ‘балоцістая нізіна’
		‘багністая мясцовасць’
в. ***Вітлін***	Раг.	*віць* ‘сырое месца, дрыгва’
р. ***Віша***	Акц., К., Св.	рэг. *віш*, *вішарына* ‘багністае, грузнае балота’
вв. ***Вяжны,Вяжышча***	Св.. Нар.	*вязь* ‘топкае месца’
бал. ***Вязькее***	Ельск.	
бал. ***Грузкае***	Жытк.	*грузнуць*
бал. ***Краколь***	Нар.	мясц. *крокаць* ‘вязкае, зыбучае балота’
бал. ***Мерва***	Л.	мясц. *мерва* ‘*вязь* ‘топкае месца’
в. ***Тонеж***	Лельч.	*тонь* ‘топкае дрыгвяністае месца’

бал. ***Плаў*** бал. ***Сосанкі*** бал-ы ***Тапіла, Тапілы*** бал. ***Трасіна***	Нар. Ельск. Акц. К.	*плаў* ‘дрыгва’ засасываць ‘засмоктваць’ *тапіла* ‘твань, трасіна’ трасіна ‘багна’
		‘выгаралая мясцовасць’
бал. ***Апаленае*** бал. ***Асмалец*** в. ***Выгар*** бал. ***Выжар*** (***Вужар***) воз. ***Гары*** бал. ***Гарэлы Мох*** бал. ***Жары*** в. ***Жгунь*** в. ***Пагарэлае*** р. ***Пагарэлле*** бал. ***Падгарэлава*** в. ***Пажаркі*** бал. ***Пажарышча*** бал. ***Паленае*** бал. ***Прыскае*** бал. ***Смаленае***	Нар. Петр. Ветк. Ельск Л. Акц. Акц Добр. Ельск. Маз. Акц. Браг. Хойн. Ельск. Жытк. Петр.	*паліць* ‘спальваць’ *смаліць* ‘паліць агнём, спальваць’ ‘мясцовасць, якая выгарала’ мясц. *выжыгаць* ‘паліць агнём, спальваць’ ‘гарэлая мясцовасць’ *гарэць* ‘ спальвацца’ мясц. *жар* ‘вуголле’ *жгунь* ‘пасека, у якой выпалены пні’ ‘пагарэлая мясцовасць’ *гарэць* ‘спальвацца’ пажар’ спальванне агнём’ *пажарышча* ‘месца, дзе адбыўся пажар’ *паліць* ‘спальваць’ *прысак* ‘гарачы попел’ *паліць* ‘ паліць агнём, спальваць’
		‘адкрытыя і часцей роўныя месцы’
р. ***Вінніца*** бал. ***Вінішча*** бал-ы ***Гало, Галое*** бал. ***Палянкі*** в. ***Палянаўка*** бал. ***Палёўка*** п. ***Стэп,*** в. ***Сцяпы***	К., Маз. К. Хойн. Л. Ветк. Хойн. Добр., Жл.	*вынья* ‘вялікая паляна сярод лесу’ *гало* ‘прастора, пакрытая купінамі’ *паляна* ‘поле сярод балота або лесу’ *поле* ‘бязлесая прастора для пасеву’ арх. *стэп* ‘поле’
		‘звілістая форма аб’екта’
р. ***Вуж*** (вар. ***Уж***) р. ***В’юрок*** р. ***Павілістая***	Нар. Нар. Маз.	
		‘рэчка з многімі рукавамі’, ‘рака’
р. ***Ведрыч*** р. ***Стаход*** в. ***Рэчкі*** бал. ***Хідры***	К. Прыпяць у вярхоўі Ветк. Петр.	*ведрыч*’рэчка з многімі астравамі, рукавамі *сто хадоў* ‘са шматлікімі адгалінаваннямі’ *рака* ‘тып вадаёма’ агульнаінд. *хідры* ‘рака’
		‘дынаміка воднага аб’екта’
р. ***Быстра*** (***Быстрая***) р. ***Верацёнка*** р. ***Вірка*** ст. рэч. ***Вяртун*** бал. ***Гілёўка*** ст. рэч. ***Круцень*** р. ***Ляска***	Маз. Жытк. Жытк. Жытк. Жытк. Ельск. Петр.	‘хуткая ў цячэнні’ *верацяно* ‘ з хуткім цячэннем’ *вір* ‘віруе’ *вярцець* ‘ круціцца’ мясц. *гілёваць* ‘гізаваць’ ‘якая круціцца’ *ляскатаць* ‘выдаваць пры хуткім цячэнні гукі’
		‘непаваротлівасць воднага аб’екта’
бал. ***Смуга*** р. ***Ціхаўка*** р. ***Чапліўка***	Акц. Маз. Хойн.	*смуга* ‘слабы сток вады’ *ціхі* ‘непаваротлівы’ *чапляцца* ‘быць непаваротлівым’

		‘стан паверхні аб’екта’
р. ***Белая Вада***	Нар	*белая* ‘нічога не расце’
бал. ***Бубен****	Жытк.	мясц. *бубен* ‘гладкая паверхня, як у бубна’
бал. ***Голымень***	К.	мясц. *голы* ‘чысты’
бал. ***Лысіца***	К.	мясц. *лысы* ‘чысты’
р. ***Нерасна***	Л.	‘ у ёй нічога не расце’
бал. ***Чыстуха***	К.	*чысты* ‘не пакрыты расліннасцю’
бал. ***Восьпіны***	Маз.	‘пакрытае купінамі’
бал. ***Кашлатэ***	Петр.	мясц. *кашлаты* ‘парослы’
бал. ***Ладыга***	Нар.	*ладыга* ‘парослае’
бал. ***Пасцельнік***	Хойн.	*пасцель* ‘парослае мохам, мяккае’
бал. ***Шапкі***	Хойн.	*шапкі* ‘з купінамі, парослымі мохам’
		‘балота’
в. ***Баклань***	Петр.	ст. слав. bakula ‘маленькае балота’
бал. ***Балотніца***	Ельск.	*балота* ‘тып вадаёма’
в. ***Келі***	Жытк.	манс. *кель*, *келяй* ‘балота’
бал. ***Лубедзь****	Хойн.	прасл. *lubedь* ‘мокрае месца, балота’
бал. ***Неўе****	Нар.	фінск. neva ‘балота'
		‘сажалка’
бал. ***Пласток*** в.	Л.	мясц.. *пласток* ‘сажалка’
Пласток	Жытк.	
бал. ***Прудзішча***	Жытк.	мясц.. *пруд* ‘сажалка’
вв. ***Прудок***	К., Маз, Св.	
бал. ***Стаў***	К.	мясц. *стаў* ‘сажалка’
		‘крыніца’
пп. ***Ключы***, ***Ключавы***	Чач., Раг.	руск. *ключ* ‘крыніца’
бал. ***Крыніцы***	К.	*крыніца* ‘тып вадаёма’
п. ***Крынічны***	Маз.	
вв. ***Рэкта***	Жл., Раг.	балц. *ракціс* ‘ крыніца’
в. ***Студзянец***	Жытк.	мясц. *студня* ‘калодзеж, крыніца’
		‘возера’
бал-ы ***Азярун***, ***Азярэц***	Акц., Ельск.	*возера* ‘тып вадаёма’
бал. ***Ворле***	Л.	ст. пруск. *orle* ‘возера’
		‘пагранічныя зямельныя знакі’
бал. ***Вярэйкі***	Жытк.	уст. *вярэя* ‘стоўб, вароты’
в. ***Сталбун***	Ветк.	*стоўб* ‘ арыенцір, якім адзначалі дарогу
бал-ы ***Стоўб***, ***Стоўп***	К.	праз мясцовасць’

* Спрэчная назва

Матывавальнымі асновамі, такім чынам, з’яўляюцца агульнапрынятыя геаграфічныя тэрміны ў складзе літаратурнай мовы, якім уласціва канкрэтная, у значнай ступені абагульненая семантыка. Акрамя слоў літаратурнай мовы, выкарыстаны ў вялікай колькасці беларускія дыялектныя і лакальныя тэрміны, маюцца і запазычанні.

Наяўнасць шматлікіх лакальных тэрмінаў можна патлумачыць іх выразным адлюстраваннем аб’ектыўных умоў, спецыфікі таго ці іншага геаграфічнага асяроддзя. Акрамя таго, дыялектызмы таксама валодаюць канкрэтнай рэгіянальнай дыстрыбуцыяй.

Запазычаныя ж апелятывы сведчаць аб мовах, што ў свой час прымалі ўдзел у фарміраванні тапаніміі даследаванай тэрыторыі. Асобныя найменні фіксуюць старажытны стан мовы.

Часцінамоўнае выражэнне сінанімічных апелятываў укладваецца ў рамкі назоўнікаў, прыметнікаў, радзей дзеясловаў, онімы – гэта назоўнікі і субстантываваныя прыметнікі. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што некаторыя апелятывы ўжываюцца ў пераносным значэнні (напрыклад, *бубен* як чыстая паверхня).

Сярод тэрмінаў тапаграфіі найбольш развітую групу сінонімаў састаўляюць адзінкі, якія абазначаюць узвышаныя і нізкія, забалочаныя месцы, даюць разнастайныя характарыстыкі мясцовасці і саміх аб'ектаў, называюць тыпы водных аб'ектаў.

Аналіз функцыянавання адзначанага пласта лексікі на сучасным моўным узроўні выяўляе вызначаную спецыфіку тапанімічнага ўжывання адпаведных онімных адзінак. Гэтае палажэнне характэрна не толькі для простых тапонімаў, якія былі аб'ектам нашага разгляду ў дадзеным артыкуле, "але і для тапанімічнай лексікі ў цэлым, незалежна ад структуры асобных назваў" [6, с. 46].

Спіс умоўных скарачэнняў

Акц. – Акцябрскі раён, бал. – балота, бал-ы – балоты, Браг. – Брагінскі раён, Б. -К. – Буда-Кашалёўскі раён, в. – вёска, вар. – варыянт ці ў ( ), Ветк. – Веткаўскі раён, воз. – возера, Гом. – Гомельскі раён, Ельск. – Ельскі раён, Жл. – Жлобінскі раён, Жытк. – Жыткавіцкі раён, К. – Калінкавіцкі раён, Карм. – Кармянскі раён, Лельч. – Лельчыцкі раён, Л. – Лоеўскі раён, Маз. – Мазырскі раён, Нар. – Нараўлянскі раён, п. – пасёлак, Петр. – Петрыкаўскі раён, р. – рака, Раг. – Рагачоўскі раён, Рэч. – Рэчыцкі раён, Св. – Светлагорскі раён, ст. рэч. – старарэчышча, Хойн. – Хойніцкі раён, Чач. – Чачэрскі раён.

Літаратура

1. Багамольнікава, Н. А. Айканімія Гомельшчыны: Слоўнік / Н. А. Багамольнікава, А. А. Станкевіч; навук. рэд. В. П. Лемцюгова. – Гомель: УА "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2003. – 392 с.

2. Багамольнікава, Н. А. Гідронімы басейна ракі Прыпяць: структурна-семантычныя тыпы матывацыі [Тэкст] / Н. А. Багамольнікава. – Гомель: ГДУ, 2004. – 195 с.

3. Багамольнікава, Н. А. Тапанімія Гомельшчыны: структурна-семантычная характарыстыка: манаграфія / Н. А. Багамольнікава; навук. рэд. А. А. Станкевіч; М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель: "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2008. – 242 с.

4. Беларуская мова: Энцыклапедыя: Бел. Энцыкл. / пад рэд. А. Я. Міхневіча; рэдкал. Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 1994.

5. Беленькая, В. Д. Топонимы в составе лексической системы языка / В. Д. Беленькая. – М.: МГУ, 1969. – 166 с.

6. Беленькая, В. Д. Очерки англоязычной топонимики / В. Д. Беленькая. – М.: Высш. школа, 1977. – 227 с.

7. Гамеза, Л. М. Комплексны лексічны слоўнік беларускай мовы (сінонімы, антонімы, амонімы, паронімы) / Л. М. Гамеза. – Мінск: ТетраСистемс, 2008. – 304 с.

8. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. А. Я. Баханькова. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994. – 463 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 811.161.3'367'373.46:35.077.1

Сінтаксічны спосаб утварэння тэрмінаў сферы справаводства

Л. Р. Белка

У артыкуле аналізуецца сінтаксічны спосаб утварэння тэрмінаў сферы справаводства.
Ключавыя словы: сінтаксічны спосаб, тэрміны-словазлучэнні, двухкампанентныя тэрміны, трохкампанентныя тэрміны, чатырохкампанентныя тэрміны, шматкампанентныя тэрміны, спецыфічныя словазлучэнні, сімвалы-словы, тэрміны-сказы.

The syntactic way of office work term formation is analyzed in the article.
Keywords: syntactic way, word combination terms, two-component terms, three-component terms, four-component terms, multicomponent terms, specific word combinations, word symbols, sentence terms.

У тэрміналогіі сферы справаводства найбольш прадуктыўным спосабам тэрмінаўтварэння з'яўляецца сінтаксічны. Як лічыць В. П. Даніленка, гэта – "спосаб утварэння тэрмінаў шляхам словазлучэнняў розных тыпаў" [1, с. 103]. Лексіка-семантычны і марфалагічны спосабы таксама характэрны для сферы справаводства. Але "комплексная намінацыя з'яўляецца адным з асноўных і найбольш прадуктыўных спосабаў стварэння намінатыўных адзінак..гэта абумоўлена імкненнем тэрміналогіі да строгай і дакладнай дыферэнцыяцыі паняццяў, калі межы аднаслоўнага тэрміна аказваюцца вузкімі, а словаўтваральныя магчымасці афіксаў абмежаванымі" [2, с. 47].

Па словах Л. А. Антанюк, ў агульналітаратурнай мове "разгорнутыя намінацыі больш частотныя ў параўнанні з аднаслоўнымі з прычыны магчымасці пашырэння, намінатыўнай гібкасці, удакладнення паняццяў, выражэння катэгарыяльных прымет галоўнага і залежнага кампанентаў словазлучэнняў, падкрэслівання тых ці іншых элементаў намінацыі" [3, с. 70]. Па гэтай прычыне аднаслоўныя тэрміны замяняюцца словазлучэннямі "часцей у навукова-папулярным і іншых стылях мовы з мэтай большай зразумеласці для неспецыялістаў, а часам і ў навуковым стылі з мэтай большай дакладнасці" [3, с. 69-70]. Колькасць тэрмінаў-словазлучэнняў ўзрастае і ў галіновых тэрміналагічных сістэмах. Сфера справаводства не з'яўляецца выключэннем.

Найбольшая колькасць справаводчых тэрмінаў (каля 54% ад разгледжаных намі) утворана шляхам словазлучэння. Тэрміны-словазлучэнні – "гэта полікампанентныя тэрміны, узнікненне якіх абумоўлена неабходнасцю абазначаць новыя паняцці на аснове ўжо існуючых" [4, с. 99]. Аднаслоўныя справаводчыя намінацыі прадстаўлены крыху меншай колькасцю адзінак (каля 46%). Гэта тэндэнцыя характэрна не толькі для тэрміналогіі справаводства. "Шматкампанентныя найменні вельмі характэрны для тэрмінасістэмы. У многіх выпадках утварэнне аднаслоўных лексем тут проста немагчыма, .. таму ў мове функцыянуюць полікампанентныя адзінкі, якія з'яўляюцца намінатыўнымі і характарызуюцца семантычным адзінствам зместу" [5, с. 101-102].

Разам з тым, даследчыкі адзначаюць, што "кадыфікацыйным патрабаваннем да тэрміна з'яўляецца патрабаванне кароткасці" [6, с. 102]. Адным са сродкаў удасканалення тэрміналогіі лічыцца эканомія моўных сродкаў. Яна бачыцца ў тым, "каб не дапускаць неапраўданага падаўжэння слоў, павелічэння колькасці слоў у тэрміналагічных словазлучэннях, а ў той тэрміналогіі, якая ўжо шырока ўжываецца і кадыфікавана, мэтанакіравана і свядома выключыць такія часткі слоў і словы" [7, с. 219].

Але, як лічыць В. П. Даніленка, ў гэтым спосабе намінацыі "некаторая непаўнацэннасць (ён не забяспечвае якасць кароткасці тэрміна) кампенсуецца магчымасцю максімальнага адлюстравання ў тэрміне адметных прыкмет паняцця [1, с. 107].

Мэтай даследавання з'яўляецца аналіз сінтаксічнага спосабу ўтварэння тэрмінаў сферы справаводства.

Паколькі тэрмінаадзінкі, утвораныя сінтаксічным спосабам – “гэта комплексныя найменні рознай структуры і ступені складанасці” [2, с. 46], у выніку даследавання справаводчай тэрміналагічнай лексікі, утворанай такім спосабам, намі выдзелены наступныя групы тэрмінаадзінак: тэрміны-словазлучэнні; спецыфічныя словазлучэнні, адзін з кампанентаў якіх узяты ў двухкоссе, сімвалы-словы і тэрміны-сказы.

Тэрміны-словазлучэнні характарызуюцца наступнымі ўласцівасцівасцямі: “1) наяўнасцю дэфініцыі, суаднесенай з паняццем навукі або тэхнікі; 2) семантычнай цэласнасцю; 3) структурнай устойлівасцю; 4) узнаўляльнасцю; 5) класіфікацыйнай здольнасцю [8, с. 10].

Па структуры тэрміналагічныя словазлучэнні падзяляюцца на двух-, трох-, чатырох- і шматкампанентныя.

Сярод тэрмінаў-словазлучэнняў самымі пашыранымі ў лексічнай тэрмінасістэме сферы справаводства з’яўляюцца двухкампанентныя.

Паводле адносін, у якія уступаюць кампаненты двухчленных тэрмінаадзінак, найчасцей вызначаюцца словазлучэнні з атрыбутыўнымі адносінамі па структурнай мадэлі “прым. + наз.” (*адказны выканаўца, даведачная картатэка, завяральны надпіс, зваротная старонка, кіраўніцкая дзейнасць, незаканвертаваны выгляд, нерэгіструемы дакумент, падначаленая арганізацыя, паштовы адрас, прыватная асоба, скарочанае найменне*) і аб’ектна-атрыбутыўнымі адносінамі па структурнай мадэлі “наз. + наз.” (*акт перадачы, апарат кіравання, аўтар дакумента, вопіс спраў, дата падпісання, індэкс справы, каштоўнасць дакументаў, колькасць экземпляраў, ліст узгаднення, межы плошчы, праект дакумента, прыклад афармлення, рэквізіты бланка, склад камісіі*).

Па характары ядзернага кампанента намі вызначаюцца субстантыўныя і дзеяслоўныя словазлучэнні.

Сярод субстантыўных выдзяляюцца наступныя спалучэнні слоў:

1) з прэпазіцыйным азначэннем пры назоўніку, звязаныя дапасаваннем. Ядзерным кампанентам пры гэтым з’яўляецца: а) невытворны назоўнік (*агульны бланк, адказная асоба, асабовы склад, дамашні адрас, завершаная справа, зарэгістраваны дакумент, лічбавы спосаб, парадкавы нумар, рэгістрацыйны штамп, уваходны дакумент, флагавы спосаб*); б) просты вытворны назоўнік (*агульная дакументацыя, адказны супрацоўнік, выходная карэспандэнцыя, гарантыйнае пісьмо, дакладная запіска, другі адрасат, непадпарадкаваная арганізацыя, паштовае адпраўленне, працоўная кніжка, працоўны распарадак, структурнае падраздзяленне, унутранае узгадненне*); в) складаны вытворны назоўнік (*агульнае справаводства*). Спецыфічны кампанент выражаны: а) простым прыметнікам (*арганізацыйны дакумент, асабісты подпіс, вуглавы штамп, гербавая пячатка, дзяржаўная арганізацыя*, *лічбавы спосаб, ніжняе поле, папяровы носьбіт, рабочае месца, службовая запіска, унутраны дакумент*); б) складаным суцэльнааформленым прыметнікам (*агульнадзяржаўны класіфікатар, машынапісны спосаб, справаводны год, шматрадковы рэквізіт*); в) складаным дэфіснаафармленым прыметнікам (*даведачна-інфармацыйны дакумент, слоўна-лічбавы спосаб, уліковарэгістацыйная форма, экспертна-праверачная камісія*); лічэбнікам (*другі квартал, некалькі рэзалюцый; першы экземпляр, пятая старонка; разавы карэспандэнт*);

2) з постпазіцыйным азначэннем, выражаным простым назоўнікам і звязаныя кіраваннем. Гэтыя словазлучэнні аб’ядноўваюцца беспрыназоўнікавай сувяззю і з дапамогай прыназоўнікаў. Беспрыназоўнікавыя тэрмінаадзінкі ўтвараюцца па структурнай мадэлі “наз. + наз. род. скл.” (*адрасаванне дакумента, альбом формаў, аўтар дакумента, бланк пісьма, вопіс спраў, грыф дадатку, дата падпісання, засведчанне копіі, індэкс справы, код дакумента, ліст узгаднення, наменклатура спраў, пачатак абзаца, прозвішча выканаўцы, размер шрыфта, тэкст пратакола*). Прыназоўнікавыя тэрмінаадзінкі ўтвараюцца па структурных мадэлях: а) “наз. + прын. + наз. род. скл.” (*выпіска з загада, загаловак да тэксту, падстава для пераводу, патрабаванні да дакументаў)*; б) “наз. + прын. + наз. дав. скл.” (*інструкцыя па справаводству)*; в) “наз. + прын. + наз. він. скл.” (*адказ на запыт, вывад на друк, запіс у журнал, запрашэнне на нараду, перадача ў архіў, спасылка на дакумент, спіс на рассылку)*; г) “наз. + прын. + наз. твор. скл.” (*работа з дакументамі)*; д) “наз. + прын. + наз. мес. скл.” (*адзнака аб паступленні, афармленне на камп’ютары, даведка аб выкананні, заява аб зваль-*

ненні, звесткі аб выкананні, пасведчанне аб адукацыі). Постпазіцыйнае азначэнне можа быць выражана простым назоўнікам (*код дакумента, тэкст пратакола*), складаным суцэльнааформленым назоўнікам (*аб'ём дакументаабароту*) і складаным дэфіснааформленым (*кіраўнік падраздзялення-выканаўцы*).

Дзеяслоўныя тэрміны характарызуюцца "доволі значнай прадуктыўнасцю ў агульналітаратурнай мове і нязначнай ужывальнасцю ў сучаснай тэрміналогіі [9, с. 84]. У асноўным гэтыя тэрміны з'яўляюцца двухсастаўнымі. У дзеяслоўных словазлучэннях у ролі галоўнага кампанента выступае дзеяслоў і ў постпазіцыі – назоўнік, звязаныя кіраваннем. Тэрміны-словазлучэнні прадстаўлены наступнымі мадэлямі: а) "дзеясл. + наз. він. скл." (*ажыццяўляць кантроль*, *весці справу, выканаць дакумент, засведчыць копію, зняць сігналізацыю, накіраваць дакумент, прыняць работніка, размясціць рэквізіты, сфарміраваць справу)*; б) "дзеясл. + прыназ. + наз. род. скл." (*давесці да выканаўцаў)*; в) "дзеясл. + прыназ. + наз. він. скл." (*адказаць на запыт, запрасіць на нараду, падаць на разгляд, перадаць ў архіў, прыняць на працу, спаслацца на дакумент, увесці ў дзеянне)*; г) "дзеясл. + прыназ. + наз. твор. скл." (*азнаёміць з загадам)*; д) "дзеясл. + прыназ. + наз. мес. скл." (*аформіць па форме, пакінуць у справе, працаваць на пасадзе).*

Паводле адносін, у якія уступаюць кампаненты трохчленных тэрмінаў-словазлучэнняў, вылучаюцца словазлучэнні з аб'ектна-атрыбутыўнымі (*выпіска з наменклатуры спраў, грыф абмежавання доступу, дата адпраўкі дакумента, індэкс структурнага падраздзялення, кантроль за выкананнем дакументаў, расшыфроўка асабістага подпісу, справа пастаяннага захавання, цэнтр верхняга поля*) і атрыбутыўнымі адносінамі (*асабовая справа работніка, поўнае найменне арганізацыі, састаўная частка рэквізіта, стандартнае становішча табулятара, унутраны працоўны распарадак*), вельмі рэдка з аб'ектна-акалічнаснымі (*колькасць лістоў у справе*) або атрыбутыўна-акалічнаснымі адносінамі (*стаж працы ў арганізацыі*).

Сярод трохкампанентных словазлучэнняў пераважаюць тэрміны, у склад якіх уваходзяць простае словазлучэнне і залежнае ад яго асобнае слова (азначэнне) у прэпазіцыі. "Прэпазіцыйнае азначэнне адносіцца па сэнсу да ўсяго словазлучэння ў цэлым, а не да яго галоўнага члена, з залежным словам простага словазлучэння яно не звязана ні па сэнсу, ні граматычна" [10, с. 7]. Ядзерны кампанент (простае словазлучэнне) часцей за ўсё выражаецца: а) спалучэннем двух назоўнікаў. Часцей за ўсё ў якасці азначэння выступае прыметнік: структурная мадэль "прым. + наз. + наз. у род. скл." з дапасаваннем (*асабовая справа работніка, верхняе поле дакумента, вуглавое размяшчэнне рэквізітаў, дакументацыйнае забеспячэнне кіравання, зводная наменклатура спраў, паштовы адрас адпраўшчыка, поўнае афармленне спраў, поўнае найменне арганізацыі, састаўная частка рэквізіта, уніфікаваная сістэма дакументацыі, уніфікаваныя формы дакументаў)*, але сустракаецца і лічэбнік: структурная мадэль "ліч. + наз. + наз. у род. скл." з дапасаваннем (*другая палавіна дня, першая старонка дадатку, першы ліст дакумента, шостае становішча табулятара)*; б) спалучэннем прыметніка з назоўнікам. У якасці азначэння выступае прыметнік: структурная мадэль "прым. + прым. + наз." з дапасаваннем) (*адзіная рэгістрацыйна-кантрольная картка, дапаможная даведачная картатэка, дзяржаўная архіўная служба, ініцыятыўны выходны дакумент, унутраны працоўны распарадак*).

Прадуктыўнымі з'яўляюцца трохкампанентныя тэрміны **з** постпазіцыйным двухчленным азначэннем пры назоўніку, звязаныя дапасаваннем. Постпазіцыйнае азначэнне выражаецца: а) спалучэннем прыметніка з назоўнікам без прыназоўніка па структурнай мадэлі "наз. + прым. у род. скл. + наз. у род. скл.": *адпраўка выходнай карэспандэнцыі, заканчэнне ўстаноўленага тэрміну, індэкс структурнага падраздзялення, мяжа левага поля, найменне структурнага падраздзялення, пратакол поўнай формы, расшыфроўка асабістага подпісу, рэгістрацыя уваходных дакументаў, справа пастаяннага захавання, фарміраванне асабовай справы, цэнтр верхняга поля*; б) спалучэннем прыметніка з назоўнікам і прыназоўнікам па структурнай мадэлі "наз. + прыназ. + прым. у мес. скл. + наз. у мес. скл." (*даведка аб заработнай плаце, палажэнне аб структурным падраздзяленні*, *справы па асабовым складзе*); в) спалучэннем двух назоўнікаў з прыназоўнікам па структурных мадэлях "наз. + прыназ. + наз. мес. скл. + наз. род. скл." (*абавязкі ў складзе камісіі, адзнака аб завярэнні копіі, акт аб спісанні*

маёмасці, выраўноўванне па шырыні ліста, заява аб прыёме на працу, індэкс па наменклатуры спраў, справаводства па зваротах грамадзян), “наз. + прыназ. + наз. у род. скл. + наз. у род. скл.” (*выпіска з наменклатуры спраў, патрабаванні да тэкстаў дакументаў*), “наз. + прыназ. + наз. у твор. скл. + наз. у род. скл.” (*кантроль за выкананнем дакументаў*); г) спалучэннем двух назоўнікаў без прыназоўніка па структурнай мадэлі “наз. + наз. у род. скл. + наз. у род. скл.” (*афармленне праекта дакумента, грыф абмежавання доступу, дата атрымання дакумента, журнал рэгістрацыі дакументаў, загадчык аддзела кадраў, назва віду дакумента, найменне пасады адрасата, схема размяшчэння рэквізітаў, форма бланка пісьма, экспертыза каштоўнасці дакументаў*).

Сустракаюцца двухчленныя словазлучэнні ў якасці ядзернага кампанента ў прэпазіцыі, звязанага прыназоўнікавым кіраваннем з залежным назоўнікам па структурных мадэлях “наз. + наз. у род. скл. + прыназ. + наз. у мес. скл.” (*выдача інфармацыі па запытах, колькасць лістоў у справе, стаж працы ў арганізацыі*) і “наз. + наз. у род. скл. + прыназ. + наз. у твор. скл.” (*арганізацыя работы з дакументамі, тэхналогія работы з дакументамі).*

У асобную групу дадзенага пункта можна выдзяліць словазлучэнні, якія складаюцца з чатырох лексем, але адносяцца да трохкампанентных, таму што ў іх складзе адзін з кампанентаў з’яўляецца непадзельным словазлучэннем. У склад гэтых словазлучэнняў уваходзяць простае словазлучэнне (ядзерны кампанент) і залежнае ад яго азначэнне (непадзельнае словазлучэнне) ў постпазіцыі. Ядзерны кампанент выражаецца спалучэннем прыметніка з назоўнікам, у якасці азначэння выступае спалучэнне назоўніка з назоўнікам (прым. + наз. + наз. у род. скл. + наз.): *Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь, дзяржаўны стандарт Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь*.

Яшчэ ў адну асобную групу можна вылучыць трохкампанентныя словазлучэнні, паміж падпарадкавальнымі або галоўнымі кампанентамі якіх існуе злучальная сувязь. Часцей за ўсё злучальнай сувяззю звязваюцца падпарадкавальныя кампаненты. У гэтых выпадках у якасці апорнага кампанента выступае прэпазіцыйны назоўнік, а дадатковыя кампаненты выражаюцца назоўнікамі, звязанымі злучальнымі спалучальнымі злучнікамі (наз. + наз. род. скл. + злучн. + наз. род. скл.): *выраб пячатак і штампаў;* (наз. + наз. мес. скл. + злучн. + наз. мес. скл.): *камітэт па архівах і справаводству* або злучальнымі пералічальна-размеркавальнымі злучнікамі (наз. + наз. род. скл. + злучн. + наз. род. скл.): *месца складання або выдання.* Можа ў якасці апорнага кампанента выступаць і постпазіцыйны субстантываваны прыметнік, а дадатковыя кампаненты – азначэнні – выражаюцца прыметнікамі, звязанымі злучальнымі спалучальнымі злучнікамі (прым. + злучн. + прым. + прым.): *камунікацыйныя і камерцыйныя даныя*. Злучальнай сувяззю могуць звязвацца і апорныя кампаненты. Пры гэтым яны выражаюцца назоўнікамі, а ў якасці залежнага кампанента выступае постпазіцыйнае азначэнне-назоўнік (наз. + злучн. + наз. + наз. род. скл.): *прозвішча і ініцыялы атрымальніка*.

Сярод чатырохкампанентных часцей за ўсё выкарыстоўваюцца тэрміны з прэпазіцыйным адначленным азначэннем пры трохкампанентным словазлучэнні, у якім назіраецца спалучэнне назоўніка з двухчленным постпазіцыйным азначэннем – спалучэннем “наз. + наз.”: больш за ўсё тэрмінаў утвораны па структурнай мадэлі “прым. + наз. + наз. род. скл. + наз. род. скл.” (*агульны сход работнікаў арганізацыі, аднаасобны парадак вырашэння пытанняў, аўтаматызаваная сістэма апрацоўкі інфармацыі, выбарачны падлік аб’ёму дакументаабароту, індывідуальны тэрмін выканання дакумента, калегіяльны парадак вырашэння пытанняў, тыповы тэрмін выканання дакумента*), менш – па мадэлі “прым. + наз. + прым. род. скл. + наз. род. скл.” (*першапачатковая апрацоўка ўваходзячых дакументаў, рэгістрацыйны штамп уваходных дакументаў, уніфікаваная сістэма арганізацыйна-распарадчай дакументацыі, устаноўлены набор абавязковых рэквізітаў*) і адзначаюцца адзіныя выпадкі ўтварэння слоў па структурных мадэлях “прым. + наз. + прыназ. + прым. твор. скл. + наз. твор. скл.” (*парадкавы нумар з літарным абазначэннем*) (дапасаванне).

Другую групу полікампанентных адзінак утвараюць чатырохкампанентныя тэрміны з постпазіцыйным трохчленным азначэннем пры ядзерным кампаненце – назоўніку. Постпазіцыйнае азначэнне выражана: 1) асноўным кампанентам – простым словазлучэннем “наз. род.

скл. + наз. род. скл.” у постпазіцыі і залежным кампанентам – прэпазіцыйным прыметнікам у якасці азначэння па структурнай мадэлі “наз. + прым. род. скл. + наз. род. скл. + наз. род. скл.” (*арганізацыя недзяржаўнай формы ўласнасці, дакументы пастаяннага тэрміну захоўвання, дакументы часовага тэрміну захоўвання, служба дакументацыйнага забеспячэння кіравання, табель уніфікаваных форм дакументаў)*; 2) прэпазіцыйным назоўнікам у ролі галоўнага кампанента і простым словазлучэннем “прым. род. скл. + наз. род. скл.” – спецыфічным кампанентам у ролі азначэння па структурнай мадэлі “наз. + наз. род. скл. + прым. род. скл. + наз. род. скл” (*альбом формаў арганізацыйна-распарадчых дакументаў, вопіс дакументаў доўгачасовага захавання, вопіс дакументаў пастаяннага захавання)*; 3) прэпазіцыйным назоўнікам у ролі галоўнага кампанента і простым словазлучэннем “прым. род. скл. + наз. род. скл.” – спецыфічным кампанентам у ролі азначэння па структурнай мадэлі “наз. + прыназ. + наз. мес. скл. + прым. род. скл. + наз. род. скл” (*загад па пытаннях асноўнай дзейнасці, загад аб накладанні дысцыплінарнага спагнання*); 4) адзінкавыя выпадкі з ядзерным кампанентам – простым словазлучэннем “прым. род. скл. + наз. род. скл.” у постпазіцыі і залежным – прэпазіцыйным прыметнікам у якасці азначэння па структурнай мадэлі “наз. + прым. род. скл. + прым. род. скл. + наз. род. скл.” (*правілы ўнутранага працоўнага распарадку)* і 5) прэпазіцыйным назоўнікам у ролі галоўнага кампанента і простым словазлучэннем “наз. род. скл. + наз. род. скл.” – спецыфічным кампанентам у ролі азначэння па структурнай мадэлі “наз. + прыназ. + наз. род. скл. + наз. род. скл. + наз. род. скл.” (*патрабаванні да афармлення рэквізітаў дакументаў*).

Менш прадстаўлены адзінкі з прэпазіцыйным адначленным азначэннем пры трохкампанентным словазлучэнні, якое складаецца з простага словазлучэння “наз. + наз. род. скл.” і залежнага прыметніка ў ролі азначэння: па структурнай мадэлі “прым. + прым. + наз. + наз. род. скл.” з дапасаваннем (*агульны працоўны стаж работніка, левы верхні вугал дакумента, левы ніжні вугал дакумента, правы верхні вугал дакумента*).

Адзінкавымі выпадкамі прадстаўлены тэрмінаадзінкі з прэпазіцыйным адначленным азначэннем і словазлучэннем “наз. + наз. род. скл.” у якасці галоўнага кампанента, звязанага прыназоўнікавым кіраваннем з залежным назоўнікам па структурнай мадэлі “прым. + наз. + наз. род. скл. + прыназ. + наз. мес. скл.” з дапасаваннем (*парадкавы нумар справы па наменклатуры*).

Кампаненты адзначаных чатырохкампанентных тэрмінаў уступаюць у атрыбутыўныя і аб’ектна-акалічнасныя адносіны.

Непрадуктыўную групу “складаюць найменні-словазлучэнні, якія з’яўляюцца складанымі кампазіцыямі, утворанымі на базе традыцыйна двух- і трохчленных апорных словазлучэнняў. Агульнае значэнне ўсіх гэтых утварэнняў складаецца з фіксаваных значэнняў яго кампанентаў” [10, с. 9].

Да такіх шматкампанентных тэрмінаў мы адносім пяцікампанентныя з прыназоўнікамі, злучнікамі і без іх (*адбітак Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, максімальная даўжыня радка шматрадковага рэквізіту, ніжняе поле першага ліста дакумента, правілы аказання паслуг паштовай сувязі, пратакол агульнага сходу работнікаў арганізацыі, спецыяліст службы дакументацыйнага забеспячэння кіравання; адзнака аб пераносе даных на машынны носьбіт, код органаў дзяржаўнай улады і кіравання, код юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, парадак прыёму, пераводу і звальнення работнікаў*), шасцікампанентныя з прыназоўнікамі, злучнікамі і без іх (*правы ніжні вугал першага ліста дакумента; адзнака аб выкананні дакумента і накіраванні яго ў справу, інструкцыя па афармленні дакумента з выкарыстаннем камп’ютэрных тэхналогій, пячатка з відарысам Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, спасылка на рэгістрацыйны індэкс і дату ўваходнага дакумента*), сямікампанентныя з прыназоўнікамі і без іх (*першы экземпляр зваротнай старонкі апошняга ліста дакумента; асобны ліст рэзалюцыі з адзнакай аб сувязі з асноўным дакументам*) і васьмікампанентныя з прыназоўнікамі (*форма агульнага бланка з падоўжаным размяшчэннем рэквізітаў на дзвюх мовах, форма бланка пісьма з вуглавым размяшчэннем рэквізітаў на адной мове, форма бланка пісьма з падоўжаным размяшчэннем рэквізітаў на адной мове*).

Такія шматслоўныя тэрміналагічныя словазлучэнні, якія, па словах Л. А. Антанюк, “набліжаюцца па аб’ёму да дэфініцый тэрмінаў, узнікаюць у выніку шырокай дэталізацыі паняццяў” [3, с. 73].

Варта адзначыць, што ў справаводчай лексіцы шматкампанентныя тэрмінаадзінкі, на нашу думку, не могуць падвяргацца эліпсісу, таму што кожнае слова мае свой сэнс і без яго ўжывання губляецца агульнае значэнне тэрміна. Многія з пералічаных полікампанентных тэрмінаў з'яўляюцца назвамі рэквізітаў – інфармацыйных элементаў дакументаў, якія ўстаноўлены Дзяржаўным стандартам Рэспублікі Беларусь, і павінны выкарыстоўвацца толькі ў такім выглядзе. Таксама не заўсёды можна прымяніць абрэвіятурнае скарачэнне тэрмінаўсловазлучэнняў, якое з'яўляецца ў навуковай тэрміналогіі, на думку даследчыкаў, "надзвычай аптымальным сродкам стварэння кароткага варыянта тэрміна. Яно не змяняе ні сэнсавай структуры паняцця-тэрміна, ні граматычнай структуры яго разгорнутага варыянта" [11, с. 100]. Аднак такі сродак дасягнення кароткасці тэрміна, як абрэвіяцыя выкарыстоўваецца ў справаводчай тэрмінасістэме. "Пры гэтым абрэвіятурнае скарачэнне "не мяняе, як правіла, ні зместавай структуры тэрмінуемага паняцця, ні граматычнай структуры разгорнутага варыянта тэрміна. Скарачаецца толькі "прастора", якую займае разгорнуты шматслоўны тэрмін у тэксце, і час, неабходны для яго агучвання ў маўленні" [6, с. 12-13]. Намі вызначаны як ініцыяльныя скарачэнні (*адзіная дзяржаўная сістэма справаводства – АДСС, адзіная дзяржаўная сістэма дакументацыйнага забеспячэння кіравання – АДСДЗК, аўтаматызаваная сістэма апрацоўкі інфармацыі – АСАІ, дзяржаўная архіўная служба Рэспублікі Беларусь – ДАСРБ, уніфікаваная сістэма арганізацыйна-распарадчай дакументацыі – УСАРД, уніфікаваная сістэма кіраўніцкай дакументацыі – УСКД*), так і змешаныя (*спецыяліст службы дакументацыйнага забеспячэння кіравання – спецыяліст службы ДЗК)*. Такая тэндэнцыя, як лічыць Л. А. Антанюк, вызначаецца не толькі імкненнем да кароткасці, але і "імкненнем дасягнуць адзінства зместу тэрміна і яго моўнага афармлення, пераадолець абумоўленую знакавай спецыфікай тэрмінаў супярэчнасць паміж раздзельнааформленасцю, полікампанентнасцю тэрміна ў плане структурнага выражэння і семантычным адзінствам уваходзячых у склад тэрміналагічнага словазлучэння лексічных адзінак у плане зместу" [3, с. 65]. Дасягнуць такога палажэння, калі б кожнаму паняццю адпавядала сціслае і дакладнае абазначэнне, амаль немагчыма, паколькі "працэс дыферэнцыяцыі паняццяў навукі і тэхнікі з'яўляецца аб'ектыўнай перадумовай выкарыстання комплекснай намінацыі, якая імкнецца да дакладнага абазначэння дадзенага паняцця. Выкарыстанне шматслоўных тэрміналагічных адзінак дыктуецца неабходнасцю мець строгія адназначныя абазначэнні" [12, с. 101].

У справаводчай тэрміналогіі вылучаецца асобная група **спецыфічных словазлучэнняў**, адзін з кампанентаў якіх узяты ў двухкоссе. Па структуры іх можна падзяліць на наступныя групы:

1. двухсастаўныя: складаюцца з двух кампанентаў, адзін з якіх выражаны назоўнікам, а другі – ўзятымі ў двухкоссе назоўнікам або назоўнікам з прыназоўнікам (*адзнака "Асабіста", рэквізіт "Рэзалюцыя", рэквізіт "Пячатка", слова "Верна", слова "Кантроль", слова "Копія", слова "у справу"*);

2. трохсастаўныя: складаюцца з двух кампанентаў, адзін з якіх выражаны назоўнікам, а другі ўзяты ў двухкоссе і ўяўляе сабой двухсастаўны сказ (*адзнака "Дадаткі запатрабаваны"*) або спалучэнні "прым. + наз." (*грыф "Асобай важнасці", рэквізіт "Рэгістрацыйны індэкс"*), "прысл. + прысл." (*грыф "Зусім сакрэтна"*), "наз. + наз." (*рэквізіт "Код арганізацыі", рэквізіт*); "наз. + прыназ. + наз." (*рэквізіт "Загаловак да тэксту", рэквізіт "Адзнака аб паступленні"*);

3. чатырохсастаўныя: складаюцца з двух кампанентаў, адзін з якіх выражаны назоўнікам, а другі ўзяты ў двухкоссе і ўяўляе сабой постпазіцыйнае двухчленнае азначэнне пры назоўніку, якое выражаецца спалучэннямі "наз. род. скл. + наз. род. або мес. скл." (*рэквізіт "Назва віду дакумента")* або "прым. + наз." (*рэквізіт "Найменне структурнага падраздзялення"*);

4. шматсастаўныя: складаюцца з двух кампанентаў, адзін з якіх выражаны: а) назоўнікам, а другі ўзяты ў двухкоссе і ўяўляе сабой шматкампанентнае тэрміналагічнае словазлучэнне (*закон "Аб нацыянальным архіўным фондзе і архівах Рэспублікі Беларусь", рэквізіт "Спасылка на рэгістрацыйны індэкс і дату ўваходнага дакумента", рэквізіт "Адзнака аб выкананні дакумента і накіраванні яго ў справу"*); б) спалучэннем "прым. + наз.", а другі ўзяты ў двухкоссе і ўяўляе сабой шматкампанентнае тэрміналагічнае словазлучэнне

(*агульнадзяржаўны класіфікатар "Органы дзяржаўнай улады і кіравання", агульнадзяржаўны класіфікатар "Юрыдычныя асобы і індывідуальныя*).

Сярод справаводчых полікампанентных тэрмінаў можна вылучыць **сімвалы-словы**. Як адзначае В. П. Даніленка, гэта – "асаблівы камбінаваны структурны тып тэрміналагічнай намінацыі, у склад якой, побач са слоўнымі знакамі, уваходзяць сімвалы (літары, лічбы, графічныя знакі)" [1, с. 37]. "Гэты структурны тып тэрміналагічнай лексікі з нямоўнымі сродкамі выражэння пэўных паняццяў характэрны, галоўным чынам, для матэматычнай, фізічнай, хімічнай тэрміналогіі" [6, с. 97]. Прааналізаваныя намі сімвалы-словы ўяўляюць сабой спалучэнні: 1) тэрміна з нумарам (*дадатак 2, пратакол № 1, рэквізіт 21*); 2) тэрміна з літарным кампанентам (*дадатак А, літара "К"*); 3) тэрміна з лічбавым кампанентам (*размер шрыфта 9 пунктаў, 50-годдзе з дня нараджэння, узгадненне 10. 01. 2010, шрыфт 24-га кегля*); 4) тэрміна з літарна-лічбавым кампанентам (*бланк фармату А5, дзяржаўны стандарт Рэспублікі Беларусь СТБ 6. 38-2004, рэгістрацыя 10 студзеня 2010 года, інтэрвал дакладна 14 пт, фармат А4*). Ядром у такіх тэрмінах, як і ва ўсіх іншых, з'яўляюцца паўназначныя словы.

Сярод прааналізаваных тэрмінаадзінак сферы справаводства можна выдзеліць **тэрміны-сказы**. Вылучаныя сказы можна падзяліць на дзве групы: 1) простыя сказы, якія ўяўляюць сабой няпоўныя іменныя з дзейнікам, выражаным назоўнікам, і азначэннем, выражаным дзеепрыметным зваротам (*Дадаткі, названыя ў тэксце; Дакумент, складзены сумесна некалькімі арганізацыямі; Дакумент, узяты на кантроль*); 2) складаныя сказы, якія дзеляцца на дзве падгрупы: а) складаназалежныя сказы, у якіх галоўная частка з'яўляецца няпоўным іменным неразвітым сказам, а даданая – азначальнай часткай, якая выражае атрыбутыўныя адносіны і з'яўляецца двухсастаўным развітым сказам (*Асоба, якая не з'яўляецца супрацоўнікам; Асоба, якая падпісала дакумент; Дакумент, на які даецца адказ; Дакумент, які мае дадатак*); б) складаназалежныя сказы, у якіх галоўная частка з'яўляецца няпоўным іменным развітым сказам, а даданая – азначальнай часткай, якая выражае атрыбутыўныя адносіны і з'яўляецца двухсастаўным развітым сказам (*Найменне пасады асобы, з якой узгадняецца дакумент; Найменне пасады асобы, якая заверыла копію; Найменне пасады асобы, якая падпісала дакумент*; *Службовая асоба, якая названа першай; Фактычная пасада асобы, якая падпісала дакумент; Экзэмпляр дакумента, які застаецца ў арганізацыі*). Некаторыя з даследчыкаў падобныя тэрмінаадзінкі вызначаюць як "тэрміны-апісанні, якія суадносяцца па будове са складаназалежнымі сказамі" [13, с. 10].

Такім чынам, у выніку даследавання ўстаноўлена, што тэрміны сферы справаводства, утвораныя сінтаксічным спосабам, у асноўным з'яўляюцца тэрмінамі-словазлучэннямі, большая частка з якіх – двухкампанентныя. Акрамя іх, вылучаюцца спецыфічныя словазлучэнні, адзін з кампанентаў якіх узяты ў двухкоссе; сімвалы-словы, у склад якіх, побач са слоўнымі знакамі, уваходзяць сімвалы (літары, лічбы, графічныя знакі, або іх спалучэнне) і тэрміны-сказы.

Літаратура

1. Даниленко, В. П. Русская терминология: опыт лингвистического описания / В. П. Даниленко. – Москва: Наука, 1977. – 247 с.

2. Мінакова, Л. М. Беларуская навукова-тэхнічная тэрміналогія: фарміраванне, функцыянаванне, развіццё: манаграфія / Л. М. Мінакова, С. М. Аніськова, А. А. Станкевіч – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2004. – 146 с.

3. Антанюк, Л. А. Беларуская навуковая тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне / Л. А. Антанюк. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987. – 240 с.

4. Аніськова, С. М. Утварэнне тэрмінаў воднага транспарту / С. М. Аніськова //: міжвед. зб. / ГДУ імя Ф. Скарыны. – Гомель, 1997. – Вып. 23: Беларуская мова. – С. 99-104.

5. Тамашэвіч, Т. І. Аналітычныя намінацыі ў мове і маўленні / Т. І. Тамашэвіч, З. М. Тамашэвіч // Чацвёртыя навуковыя чытанні, прысвечаныя Сцяпану Некрашэвічу: матэрыялы навук. канф., Гомель / Міністэрства адукацыі РБ, Гомельск. дзярж. ун-т; навук. рэд.: А. А. Станкевіч [і інш.]. – Гомель, 1999. С. 100-105.

6. Арашонкава, Г. У. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі / Г. У. Арашонкава [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – 175 с.

7. Усовіч, К. С. Эканомія моўных сродкаў як важнейшы напрамак удасканалення эканамічнай тэрміналогіі / К. С. Усовіч // Перспектывы развіцця і функцыянавання нарматыўнай лексікі: артыкулы і матэрыялы міжнар. навук. -мет. канф., Гомель, 22-23 мая 1998 г. / Міністэрства адукацыі РБ, Гомельск. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны; рэдкал.: М. М. Воінаў [і інш.]. – Гомель: ГКІ, 1998. С. 218-221.

8. Аніськова, С. М. Тэрміналогія воднага транспарту ў беларускай мове: аўтарэф. дыс... канд. філал. навук: 10. 02. 01 / С. М. Аніськова; Гом. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель, 2000. – 17 с.

9. Панкова, Н. М. Лексіка-граматычная характарыстыка геалагічных тэрмінаў 20-х гадоў / Н. М. Панкова // міжвед. зб. / ГДУ імя Ф. Скарыны. – Гомель, 1997. – Вып. 24: Беларуская мова. – С. 81-89.

10. Мінакова, Л. М. Тэрміналогія аўтамабільнага транспарту ў беларускай мове: аўтарэф. дыс... канд. філал. навук: 10. 02. 01 / Л. М. Мінакова; Гом. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель, 1999. – 16 с.

11. Тамашэвіч, Т. І. Пра сціслaсць у мове і маўленні / Т. І. Тамашэвіч // міжвед. зб. / ГДУ імя Ф. Скарыны. – Гомель, 1988. – Вып. 16: Беларуская мова. – С. 99-105.

12. Мінакова, Л. М. Структурна-граматычная характарыстыка назваў аўтамабіляў і іх тэхнічных параметраў / Л. М. Мінакова // міжвед. зб. / ГДУ імя Ф. Скарыны. – Гомель, 1996. – Вып. 22: Беларуская мова. – С. 99-106.

13. Буракова, М. У. Юрыдычная тэрміналогія ў беларускай мове: аўтарэф. дыс... канд. філал. навук: 10. 02. 01 / М. У. Буракова; Гом. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель, 2004. – 17 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 811.161.3'373.232'237(476.2)

Семантычная характарыстыка прозвішчаў Лоеўскага раёна

У. А. Бобрык, Т. А. Рагачова

У артыкуле даецца семантычны аналіз прозвішчаў жыхароў Лоеўскага раёна. Вызначана 16 лексіка-семантычных груп слоў, якія сталі асновай для ўтварэння прозвішчаў. У выніку аўтары даследавання прыйшлі да высновы, што найбольш ужывальнымі з'яўляюцца прозвішчы, утвораныя ад уласных імён, а таксама ад назваў прафесій і батанічных назваў. Меншую частку складаюць прозвішчы, утвораныя ад назваў прадуктаў харчавання і геаграфічных назваў.
Ключавыя словы: прозвішча, семантыка, адапелятыўнае прозвішча, адыменнае прозвішча, адтапанімічнае поле, словаўтварэнне, лексіка-семантычная група.

The article gives the semantic analysis of surnames of Loev region citizens. Sixteen lexico-semantic word groups that have become the basis for surname formation are allocated here. As a result the researchers have come to a conclusion that the most common surnames are the ones formed from proper names, and also from trade and botanical names. The smaller part is made by the surnames formed from food and place names.
Keywords: surname, semantics, appellative surname, surname made from name, toponymic field, word-formation, lexico-semantic group.

Уласныя асабовыя назвы ў лексіцы кожнай мовы займаюць асобнае месца. Яны вылучаюцца і па паходжанні, і па функцыях, якія выконваюць.

Імя, імя па бацьку і прозвішча – гэта сталыя спадарожнікі чалавека на працягу ўсяго жыцця. З названых трох элементаў афіцыйнага поўнага наймення асобы, безумоўна, найбольш старажытным з'яўляецца імя. Другі элемент – гэта імя па бацьку. Нарэшце, трэці элемент поўнай назвы – прозвішча. Прозвішчы ўзніклі ў Беларусі ў 17–18 стст. на аснове ўласных імён і імён-мянушак.

Разнастайнасць беларускіх прозвішчаў абумоўлена вялікай колькасцю разнародных элементаў, выкарыстаных у якасці іх асноў. Да іх належаць як спрадвечныя, так і запазычаныя словы. Паводле стану ў мове – гэта асабовыя імёны, імёны па бацьку, імёны-мянушкі, а таксама, што не выключана, гатовыя прозвішчы, геаграфічныя назвы, назвы плямён і народаў, апелятыўная лексіка мовы. Сотнямі нябачных сувязей звязаны прозвішчы з жыццём грамадства, з яго культурай, якая складаецца з сукупнасці матэрыяльных і духоўных дасягненняў. Мова, літаратура, мастацтва, рэлігія, філасофія адносяцца да духоўнай культуры. Сам слоўнікавы склад мовы жыва рэагуе на прагрэс, адпаведна ўсё новае знаходзіць адлюстраванне ў ім. Таму ўтворанае ў тую ці іншую эпоху імя суадносіцца з яе культурнымі і гістарычнымі традыцыямі, нясе інфармацыю і выступае непаўторным помнікам свайго часу. Багацце і стракатасць асноў прозвішчаў нагадваюць энцыклапедыю мовы, штодзённага жыцця, умоў існавання, спосабаў і формаў задавальнення матэрыяльных і духоўных патрэб людзей.

Аналіз семантыкі і структуры прозвішчаў – цікавая, каштоўная і цяжкая справа, што прызнаецца многімі антрапанімістамі. Ён, на думку А.Суперанскай, "дае значную інфармацыю, якая ўяўляе цікавасць для гісторыкаў, этнографаў, сацыёлагаў, а таксама лінгвістаў. Пры параўнанні лексічных палёў, па якіх размяркоўваюцца асновы прозвішчаў у розных мовах, можна зрабіць вывады пра агульнасць або, наадварот, рознасць нацыянальных культур асобных народаў" [1, с. 81].

Лексічны склад беларускіх прозвішчаў надзвычай багаты і разнастайны. Паходжанне многіх беларускіх прозвішчаў матываванае. Даследчыкі адзначаюць, што шматлікія беларускія прозвішчы ўтварыліся семантычным шляхам – шляхам пераасэнсавання былых назваў-характарыстык асобы па тых ці іншых адзнаках ці ад гутарковых формаў імён. Пазней унутраная форма, матывіроўка (лексічнае значэнне) сцерліся, і найменне пачало выконваць чыста намінатыўную функцыю – функцыю вылучэння чалавека сярод іншых.

Існуе шмат лексіка-семантычных груп слоў, што сталі асновай для ўтварэння прозвішчаў. Сярод прозвішчаў Лоеўскага раёна можна вылучыць наступныя:

Прозвішчы, якія ўтвораны ад уласных імёнаў. Частка беларускіх, як і большасць рускіх прозвішчаў, утварылася ад каляндарных асабовых імён рымска-каталіцкага або візантыйска-грэчаскага паходжання, якія раней фіксаваліся ў святцах – царкоўным календары. Чым больш няпоўных і ацэначных імён ад поўнага імені, тым больш фанетычных варыянтаў яно мела ў розных гаворках, тым болей узнікала ад яго прозвішчаў.

Прозвішчы ўтвараліся і ад жаночых імёнаў, галоўным чынам ад такіх, якія былі пашыраны ў сялянскім асяродку. Але адно можна сказаць з упэўненасцю: асноўную колькасць прозвішчаў далі мужчынскія імёны, таму што галоўным у сям'і на працягу ўсіх стагоддзяў, калі фарміраваліся прозвішчы, быў мужчына.

Абрамчук, Агафонаў, Агафоненка, Агіевіч, Аксёнаў, Аляксееў, Анісаў, Анісавец, Андрэйка, Андрыявец, Андрэявец, Анікеенка, Андрэйчык, Андрыянец, Адаменка, Антоненка, Антановіч, Антонік, Анцімончык, Ахрыменка, Астапенка, Астаповіч, Ануфрыеў, Антановіч, Антончык, Апанасенка, Арцёменка, Арцёмчык, Арцюшкін, Аўдзееў, Асіпенка, Астапенка, Астаф'еў, Афанасенка, Афончанкаў, Ахрэменка, Бакун (Аввакум), Багдановіч, Барысаў, Барысенка, Богуш, Валяр'янаў, Васільеў, Васільцоў, Васілік, Васюк, Вашчанка (Васіль), Восіпаў, Гапон, Гарашчук, Гапоненка, Гаўрыленка, Герасіменка, Германовіч, Глебік, Грыгор'еў, Грышкавец, Грышын, Грышкоў, Давыдоўскі, Давыдзенка, Давыдовіч, Даніловіч, Дарафееў, Данілаў, Данілец, Даніленка, Дарашкоў, Дземідзенка, Дземідовіч, Дзенісавец, Дзянісаў, Дзмітрэнка, Дзяменцьеў, Захараў, Захарэўскі, Захарчанка, Зянько, Захаранка, Змітровіч, Змітрэнка, Ібрагімаў, Іваненка, Іванчыкаў, Іванец, Іваноў, Ігнаценка, Ігнацік, Ільюкоў, Кандраценка, Кандрацкі, Каралёў, Карпенка, Карповіч, Каспяровіч, Касьян, Канстанцінаў, Клімовіч, Кудзінаў (Акіндзій), Кузьменка, Купрыянчык, Купрэйчык, Лазараў, Лявонаў, Лук'янаў, Лявоненка, Майсеенка, Максіменка, Маркавец, Маркаўцоў, Марчанка, Мартынаў, Матвейчыкаў, Міронаў, Міткевіч, Міхалевіч, Міхальчанка, Мішкоў, Мокша (Мокій), Навуменка, Назараў, Нікіфараў, Нікіценка, Несцер, Осіпаў, Патапенка, Паўлаў, Пахомчык, Паўленка, Паўлюк, Парфамовіч, Панасевіч, Паўлючэнка, Пракапенка, Пракопчык, Пратасаў, Пятрэнка, Пецькаў, Петравец, Петрачоў, Петруненка, Петрусевіч, Піменаў, Савіцкі, Савіч, Савічаў, Самсонаў, Сапончык (Сапонія), Саўчанка, Свірыдава, Санько, Сафронаў, Стасько, Свірыдзенка, Святагор, Святагораў, Семянчук, Сідарэнка, Сіманаў, Сцяпанаў, Сцепанцоў, Сцяпанчанка, Супрун, Супруненка, Сямёнаў, Тарасенка, Труш (*Трыфан*), *Уласенка, Усціменка, Фалей, Фядзей, Фурс, Фёдараў, Філіпенка, Фядосаў, Фядосенка, Фядотаў, Халімончык, Хамічэнка, Харламаў, Ходас, Цімафееў, Цімашэнка, Ціхановіч, Юрчанка, Якаўлеў, Ярашэнка, Яроменка, Яромін, Яфіменка, Яўграфаў.*

Адзначаюцца адзінкавыя выпадкі ўтварэння прозвішчаў ад жаночых імён: *Марусіч, Марусеў, Мар'янаў, Адарчук, Надзін, Сурын* < Сара [2, с. 259].

Аналіз гэтай групы паказаў, што найбольшую колькасць імён, ад якіх утварыліся прозвішчы, складаюць агульнавядомыя імёны. Але сустракаюцца прозвішчы, якія ўтварыліся ад малавядомых імён: *Кароль, Акіндзій, Мокій, Сапонія, Святагор, Яўстафій, Яўграфій* і інш.

Прозвішчаў адапелятыўнага паходжання ў беларускай мове даволі многа. Гэта група складае прыкладна каля паловы ўсіх прозвішчаў. Вядомы антрапаніміст М. В. Бірыла адзначае, што "з пункту погляду гісторыі мовы адапелятыўная антрапанімія з'яўляецца захавальнікам, кансервантам лексікі папярэдніх эпох, дае матэрыял для больш глыбокага вывучэння гістарычнага слоўніка, моўных узаемасувязей" [3, с. 4]. Згодна з гэтым у якасці асноў для ўтварэння прозвішчаў магла выкарыстоўвацца лексіка, якая адлюстроўвае самыя разнастайныя галіны жыццядзейнасці народа і навакольнай рэчаіснасці – быт, заняткі, становішча ў сям'і і грамадстве, фізічныя, разумовыя і маральныя якасці, пачуцці, сацыяльны ўклад, жывёльны і раслінны свет і пад. У гэтым сэнсе антрапанімія, утвораная ад апелятыўнай лексікі, з'яўляецца кладоўкай гісторыка-культурнай спадчыны, дае каштоўны матэрыял для вывучэння агульнай гісторыі народа. Пры ўтварэнні прозвішчаў Лоеўскага раёна выкарыстоўвалася лексіка наступных семантычных груп:

Назвы асоб па прафесіі ці занятку, сацыяльным становішчы. Прозвішчы, утвораныя ад назваў прафесій, сведчаць пра разнастайнасць прафесій у Беларусі. З развіццём грамадства зніклі некаторыя прафесіі, а разам з імі страціліся і іх назвы, якія ляжаць ў аснове прозвішчаў. Тым не менш іх этымалогія ў большасці застаецца празрыстай. Прозвішчы, што былі ўтвораны ад назваў прафесій, роду заняткаў або выконваемага дзеяння, прадстаўляюць сабой каштоўную крыніцу па гісторыі мовы і культуры: *Алейнік* < алейнік ‘спецыяліст па вытворчасці алею’ [4, с. 223]; *Асадчы* < асадчы ‘заснавальнік паселішча’ [3, с. 24]; *Аўчыннікаў* < аўчыннік ‘майстар, які вырабляе аўчыны’ [4, с. 304]; *Баброўнік* < баброўнік ‘лавец баброў’ [3, с. 29]; *Бабраўнічы* < баброўнік ‘той, хто разводзіць баброў’ [2, с. 241]; *Бандарэнка, Бондар* < бондар ‘майстар па вырабу драўлянай пасуды’ [4, с. 395]; *Баярын, Баярынаў* < баярын ‘радавіты дваранін, буйны памешчык’ [4, с. 355]; *Будзілоўская* < будзіла ‘хто будзіць, не дае спаць’ [3, с. 64]; *Буднік* < буднік ‘рудакоп’ [3, с. 64]; *Бурлачук* < *бурлак* ‘рабочы, які ў арцелі цягнуў паўз бераг супраць цячэння судны’ [4, с. 422]; *Вінічэнка* < вінакур ‘той, хто займаецца вінакурэннем’ [4, с. 491]; *Гайдук* < гайдук ‘слуга, выязны лакей часоў прыгоннага права’ [5, с. 14]; *Ганчар, Ганчарык, Ганчарэнка* < ганчар ‘майстар, рамеснік, які вырабляе з гліны пасуду і іншыя рэчы’ [5, с. 26]; *Дзегцяроў, Дзягцяр, Дзегцярэнка* < дзягцяр ‘той, хто гоніць дзёгаць’ [5, с. 178]; *Драгуноў* < драгун ‘салдат або афіцэр некаторых кавалерыйскіх часцей, здольных весці бой і ў спешаным баі’ [5, с. 194]; *Дзякаў* < дзяк ‘ніжэйшы царкоўны служыцель у праваслаўнай царкве; псаломшчык’ [5, с. 179]; *Званароў* < званар ‘царкоўны служыцель, які звоніць у званы’ [5, с. 436]; *Дворнік* < дворнік ‘работнік, які падтрымлівае чысціню і парадак на двары і на вуліцы каля дома’ [5, с. 159]; *Кавалёў, Кавалеўскі, Кавальчук, Коваль* < каваль < ‘рабочы, майстар, які займаецца коўкай металу’ [5, с. 570]; *Кажамяка* < кажамяка ‘майстар, які вырабляе сырамятныя скуры’[5, с. 573]; *Камандзірчык* < камандзір ‘начальнік вайсковай часці, падраздзялення, ваеннай часці’ [5, с. 597]; *Канаваленка* < канавал ‘лекар без спецыяльнай ветэрынарнай адукацыі, які займаецца лячэннем коней’ [5, с. 609]; *Катлярэнка, Катляроў* < катляр ‘майстар, які вырабляе катлы’ [3, с. 192]; *Крамар, Крамараў* < крамнік ‘уладальнік крамы або прадавец у краме’ [3, с. 217]; *Козак, Казачэнка* < казак ‘вольны чалавек з прыгонных сялян, халопаў, гарадской беднаты, якія ўцякалі на ўскраіны дзяржавы’ [5, с. 574]; *Краўчанка, Краўцоў* < кравец ‘спецыяліст па шыццю адзення’ [5, с. 719]; *Кузняцоў* < кузнец ‘рабочы, майстар, які займаецца коўкай металу’ [5, с. 570]; *Кучараў* < кучар ‘фурман, рамізнік, вазніца’ [3, с.236]; *Кушнер* < кушнер ‘рамеснік, які вырабляе шкуры на футра і шые з футра’ [5, с. 765]; *Маёраў* < маёр ‘афіцэрскае званне ў арміі, вышэйшае за званне капітана’ [6, с. 83]; *Мельнікаў, Мельнічэнка, Мельнік* < мельнік ‘уладальнік млына або работнік у млыне’ [6, с. 166]; *Музычэнка* < музыкант ‘той, хто іграе на якім-небудзь музычным інструменце’ [6, с. 179]; *Мукамел* < мукамол ‘спецыяліст па размолу збожжа’ [6, с. 180]; *Палівач* < ‘той, хто палівае’ [3, с. 110]; *Панамарчук, Панамарэнка* < панамар ‘царкоўны служка’ [2, с. 98]; *Папоў* < поп ‘свяшчэннік’ [7, с. 191]; *Папраўкін* < ад паправіць ‘той, хто папраўляе’[4, с. 24]; *Пастухоў* < пастух ‘той, хто пасе статак’ [7, с. 92]; *Пекарскі* < пекар ‘рабочы, які займаецца выпечкай хлеба’ [7, с. 153]; *Плотніцкі* < плотнік ‘рабочы, які займаецца грубай апрацоўкай драўніны, узвядзеннем драўляных будынкаў, вырабам простай драўлянай мэблі’ [9, с. 284]; *Прудник* < прудник ‘мельнік на вадзяным млыне’ [3, с. 333]; *Рыбакоў* < рыбак ‘чалавек, які займаецца лоўляй рыбы’ [7, с. 739]; *Салдаценка* < салдат ‘радавы ваеннаслужачы сухапутнага войска’ [8, с. 26]; *Скамарох* < скамарох ‘вандроўны акцёр’ [8, с. 153]; *Скачко* < скачко ‘той, хто скача, падскоквае, прыгае’ [3, с. 377]; *Старавойтаў* < стары войт ‘начальнік гарадскога пасялення’ [4, с. 501]; *Старажэнка* < стораж ‘чалавек, які ахоўвае што-небудзь’ [8, с. 329]; *Стаднікаў* < стаднік ‘той, хто даглядае статак’ [3, с. 388]; *Стрэльчанка* < стралец ‘ваеннаслужачы асобага пастаяннага войска ў Рускай дзяржаве 16 – пач. 18 стст.’ [8, с. 332]; *Такарэнка, Токар* < токар ‘рабочы, спецыяліст па апрацоўцы металу, дрэва і пад. шляхам абточвання’ [8, с. 494]; *Ткачэнка, Ткачоў* < ткач ‘рабочы, майстар, які вырабляе тканіну на ткацкім станку’ [8, с. 490]; *Царанок, Царык* < цар ‘тытул манарха ў Расіі, Балгарыі і Сербіі’. // ‘Асоба, якая мае гэты тытул’ [9, с. 228]; *Чарнец* < чарнец ‘манах’ [9, с. 300]; *Чуйко* < ад чуць ‘той, хто чуе’ [3, с. 452]; *Швец* < шавец ‘майстар па шыццю і рамонту абутка’ [9, с. 340];

Шкроб < шкроб ‘той, хто скрабе’ [3, с. 475]; *Шынкарэнка* < шынкар ‘уладальнік шынка або прадавец спіртных напіткаў у ім’ [9, с. 429].

Прозвішчы, утвораныя ад геаграфічных назваў, складаюць невялікую па колькасці групу: *Башкірава* (Башкірыя), *Берлін* (г. Берлін), *Велікаборац* (в. Вялікі Бор), *Данская* (р. Дон), *Двінін* (р. Дзвіна), *Жыліцкі* (в. Жылічы), *Казярожац* (в. Казярогі), *Дубаўцоў* (в. Дубы, Дубава) [3, с.138], *Пінчук* (г. Пінск).

Прозвішчы, утвораныя ад назваў народаў і этнічных груп: *Літвінаў* (ліцвін), *Маскалёў, Маскаленка* (маскаль), *Славянскі* (славянін), *Татарынаў* (татарын), *Чаркас* (чаркас), *Швед* (швед), *Турчын* (турак), *Хахлоў* (хахол), *Цыганкоў* (цыган).

Назвы частак цела і покрыва чалавека і жывёл. Прозвішчы, звязаныя з асобнымі часткамі чалавечага цела, былі даволі папулярнымі. У якасці прозвішч маглі выкарыстоўвацца і назвы частак цела жывёл: *Бязрукіх, Бяспятых, Валасюк, Гарбатаў, Гарбуноў, Гарленка, Горленка, Гузаў, Гулянкоў* < гуля ‘гуз, жаўлак’ [5, с. 95]; *Дзюбкін, Зубаха, Зубец, Зубцоў, Каленчанка, Капытоў, Кудрыцкі* < кудры ‘кучаравыя валасы’ [3, с. 226]; *Кукса* < кукса ‘астатак пакалечанай або ампутаванай рукі, нагі’ [5, с. 751]; *Крылоў, Лабан, Лапіцкі, Мазгоў, Маслак* – маслак ‘вялікая косць, пераважна сцегнавая; вытырклая косць’ [6, с. 117], *Пузырэнка* < пузыр ‘мяшок, шар у целе чалавека або жывёлы, які звычайна змяшчае ў сабе якую-небудзь вадкасць’ [7, с. 517]; *Пупач, Пушок, Ражкоў, Рагалевіч, Ус, Ушкін, Чача* < чача ‘волас, валасы’ [2, с. 449]; *Шкурко, Шчацінін, Шыянаў, Шэін.*

Назвы жывёл і птушак, рыб. Гэта група з’яўляецца адной з важных крыніц для ўтварэння прозвішчаў Лоеўскага раёна: *Баранаў, Бараноўскі, Бірукоў* < бірук ‘воўк’ [3, с. 54]; *Белкін, Блаха, Бут* < бут ‘сляпень, авадзень’ [2, с. 72]; *Бусленка, Быкоўскі, Бычкоўскі, Бычок, Бычына, Бугай* < бугай ‘начная балотная птушка сямейства чапляў, празваная так за тое, што вясной самец яе, апусціўшы дзюбу ў ваду, утварае гучныя гукі, падобныя да рыку бугая’ [3, с. 412]; *Вараб’ёў, Варабей, Волкаў, Волчак, Варонін, Варановіч, Галкін, Гілянок* < гіль ‘снягір’ [3, с. 108]; *Голубеў, Гракаў, Гусак, Дзятлаў, Дрозд, Драздоў, Жарабенка, Жук, Жукаў, Жукоўскі, Жураўскі, Зайцаў, Зайко, Здрок* < здрок ‘авадзень’ [3, с. 159]; *Зыкаў* < зык ‘гул, гудзенне, шум’ [3, с. 162]; *Зязюля, Казека* < рэг. казека ‘вош’ [3, с. 168]; *Казлоў, Казлоўскі, Казлоўскіх, Казлянок, Казуля, Камароў, Карась, Карповіч, Карпенка, Квакухін* < квакуха ‘курыца з куранятамі’ [3, с. 197]; *Каток, Кечка* < кечка ‘каза’ [3, с. 200]; *Козік, Коршыкаў, Коршак, Котаў, Кошчанка, Крот, Крысін, Кулік, Курачкін, Куценка* – куць ‘шчаня’ [3, с. 237]; *Ласіца, Ластаўка, Лебедзеў, Лебядзінскі, Лісоўскі, Логаш* < логаш ‘прыпражны конь’ [3, с. 255]; *Лось, Мухаеў, Мядзведзеў, Мядзведзь, Пацаў* < пац ‘пацук’ [3, с. 318]; *Петухоў, Прус* < прус ‘рыжы таракан’ [7, с.402]; *Пугач* < пугач ‘драпежная начная птушка атрада соў’ [7, с. 515]; *Рабец* < рабец ‘від коршуна’ [3, с. 243]; *Рагалевіч* < рагаль ‘жук-рагач’ [2, с. 345]; *Рак, Ракоўскі, Рачкоўскі, Рачыкоўскі, Сабаленка, Савенка, Савёнак, Сазановіч, Самкоў, Сакалоў, Салаўёў, Саранчук, Сарокін, Снігір, Сомаў, Стрыжак, Судакоў, Тараканаў, Турко* < турко ‘вол з загнутымі ўнутр рагамі’ [3, с. 418]; *Хрушчынскі, Цяцерын, Чыж, Чыжык, Шпакаў, Шпакоўскі, Шчука, Шчучэнка, Язікаў.*

Прозвішчы, утвораныя ад батанічных тэрмінаў. Дадзены падпункт уключае ў сябе прозвішчы, утвораныя ад назваў дрэў, кветак, садавіны і інш.: *Арэшкін, Бабок, Буракоў, Бярозкін, Вішнёўскі, Вішнякоў, Вярбіцкі, Гарох, Грэчка, Гарошка, Грыб, Дубін, Дубчак, Дубіцкі, Івахненка, Каліна, Калінін, Карнееў, Качан, Колас, Крапіўка, Лазоўскі, Ліпскі, Маліноўскі, Падыгрушны, Плюшч, Рамашка, Рошчын, Рыжык, Свідоўскі* < свідзіна ‘кустовая або дрэвавая расліна сямейства кізілавых з белымі, жоўтымі ці ружовымі кветкамі’ [8, с. 90]; *Травін, Хмель, Цвіль* – цвіль ‘семя хмеля’ [3, с. 436]; *Чартапалох, Чысцік* < чысцік ‘травяністая расліна сямейства губакветных, якая мае кветкі, сабраныя ў мяцёлкі, і шурпаталістае сцябло’ [9, с. 334].

Прозвішчы, утвораныя ад назваў прадуктаў харчавання. У мінулым харчаванне займала важнае месца ў жыцці людзей, што звязана з цяжкай працай. Таму зразумела, чаму ад гэтых назваў утварылася даволі шмат прозвішчаў. Гэта і назвы першых страў, і назвы каш, і назвы страў з мукі. Хлеб з’яўляўся і з’яўляецца галоўным прадуктам харчавання, таму не магло не быць прозвішча, утворанага ад слова “хлеб”. Адно прозвішча ўтварылася ад назвы напоя. *Баршчэўскі, Бецін* – бець ‘вялікая булка хлеба’ [3, с. 53]; *Бражны* < брага ‘рошчына з

соладу, мукі і бульбы, з якой гоняць спірт' [4, с. 398]; *Бублікаў*, *Бурдыгаў* < бурда 'мутны напітак' [3, с. 69]; *Калатуша* – калатуша 'негустая страва з раскалочанай у вадзе ці ў малацэ мукі' [5, с. 582]; *Журко* < жур 'негусты аўсяны кісель' [5, с. 260]; *Калдун, Кісель, Кісялёў, Корж, Каржакоў* < корж 'прэснае, сухое печыва з мукі; праснак' [5, с. 714]; *Крупоўскі, Кулага, Кулажанка* < кулага 'страва з мукі' [3, с. 228]; *Кулеш, Куляшоў* < кулеш 'рэдкая мучная каша з салам' [5, с. 752]; *Куліч* < куліч 'салодкі здобны пірог цыліндрычнай формы (па праваслаўнаму календару выпякаўся на вялікдзень)' [5, с. 752]; *Лапуноў* – лапун 'праснак з бульбы і мукі' [3, с. 245]; *Лапшын, Масленчанка, Масленка, Прыгара* < рэг. прыгарка 'прыгарэлае месца, прыгарак' [2, с. 334]; *Саладуха* < саладуха 'салодкая страва з густазаваранай жытняй мукі' [8, с. 24]; *Сметанчук, Рабчанка* < рабко 'страва з пшана і грэцкай мукі' [3, с. 344]; *Хлебін, Хлебнікаў, Цукараў*.

Прозвішчы, якія абазначаюць фізічныя і фізіялагічныя характарыстыкі чалавека, рысы характару, уласцівасці розуму: *Бадроў, Балабан* < балабан 'пустамеля, балбатун' [3, с. 36]; *Белавусаў, Белы, Бялян, Бізюк* – рус. бизой 'сляпы' [3, с. 53]; *Бакарэвіч* – бакар 'з поўнымі, круглымі бакамі' [3, с. 35]; *Блатун* < блатун 'валакіта, бабнік' [3, с. 55]; *Боўда* < боўда 'балда, дурань' [3, с. 59]; *Болбас* < болбас 'балбатун' [3, с. 57]; *Байко* < байко 'гаварун, пустамеля' [3, с. 33]; *Брахуноў* < брахун 'ілгун, хлус, манюка' [4, с. 402]; *Буры, Бязручанка, Веліканаў, Вырва* < вырва 'сарвігалава' [3, с. 91]; *Галабурда* < галабурда 'дэбашыр, буян' [3, с. 96], *Галаван* < галаван 'галаваты' [3, с. 96], *Галуза* < галуза 'гарэза, свавольнік' [3, с. 99]; *Глушак, Глушанко, Глушнеў, Глушэц* < глушак 'глухі' [3, с. 111]; *Голік, Губар* < губар 'губач, губаты' [3, с. 119]; *Дзікун* < дзікун 'нелюдзімы, дзікаваты чалавек' [5, с. 174]; *Жог* < жог 'прайдзісвет' [3, с. 147]; *Забіран, Карнавушанка* < карнавух 'карнавухі, з кароткімі вушамі' [3, с. 186]; *Кароткі, Кашлач, Крыванасенка, Корзун* < корзун 'без пярэдніх зубоў, шчарбаты' [2, с. 214]; *Кракін* – 'той, хто кракае, крэкча' [3, с. 217]; *Крываручка* < 'чалавек, у якога крывая рука' [3, с. 221]; *Кульгавы, Лобан* < лабан 'чалавек з вялікім ілбом' [3, с. 239], *Лагута* < лагута 'дурнаваты, калека' [3, с. 241]; *Лёгкі, Ліхач, Лысенка, Лысянок, Лысы, Мандрык, Мандрыкін* – мандрыка 'вандроўнік' [3, с. 274]; *Малы, Мелюхаў* < мелюх 'балбатун' [3, с. 283]; *Піскун* < піскун 'той, хто часта пішчыць' [7, с. 259]; *Налягач, Ніцко* < ніцы 'хітры' [3, с. 300]; *Нядбайла* < нядбайла 'той, хто абыякава адносіцца да сваіх абавязкаў, да справы; лянівы' [6, с. 426]; *Няпомняшчы, Салагуб* < салагубы 'чалавек з тоўстымі і заўсёды мокрымі губамі' [3, с. 362]; *Сяды, Сіпаты, Слепчанка, Смалян* < смаляны 'падобны на смоль, чарнамазы, чарнявы' [3, с. 383]; *Склема* < склема 'плакса' [2, с. 378]; *Смірноў, Таратын* < таратын 'балбатун' [3, с. 409]; *Талсты, Толсцікаў, Тупіца* < тупіца 'тупы, някемлівы, абмежаваны чалавек' [8, с. 552]; *Хлусаў* – хлус 'той, хто хлусіць; манюка' [3, с. 431]; *Ціхамірaў* < ціхамір 'ціхамірны, спакойны' [3, с. 438]; *Ціхановіч* < ціхан 'ціхоня' [3, с. 438]; *Цішкоў, Цыба* < цыба 'даўганогі чалавек, цыбаты' [3, с. 440]; *Чаравач* < чаравач 'той, у каго вялікае чэрава, пузаты' [3, с. 446]; *Чубар* – чубар 'чубаты' [3, с. 451]; *Шахлевіч* < шахло 'касматы, лахматы' [3, с. 472].

Назвы асоб па адносінах сваяцтва ці становішча ў сям'і: *Бабкоў, Адзінец* < адзінец 'адзінокі, бессямейны чалавек' [3, с. 17]; *Байдак* < байдак 'адзінокі, халасты чалавек' [3, с. 34]; *Блізнец, Дзядзенка, Дзядкова, Дзедулевіч, Кардаш* < кардаш 'брат' [3, с. 185]; *Малкоў* < малка 'малютка' [3, с. 271]; *Малыгін* < малыга 'дзіця, малыш' [2, с. 272]; *Новік* < 'новы чалавек у сям'і' [3, с. 294]; *Навіцкі, Пазняк* < пазняк 'позняе дзіця' [3, с. 308]; *Пазнякоў, Першын* – першы 'першы ў сям'і, першынец' [3, с. 323]; *Прывалаў* – руск. привал 'прымак' [3, с. 334]; *Прымак, Прымачэнка* < прымак 'зяць, прыняты ў сям'ю жонкі, які жыве ў доме жонкі' [4, с. 514]; *Прыходзька* < прыходзька 'той, хто прыйшоў, прышлы' [3, с. 336]; *Траян* < траян 'бацька траіх блізнят' [3, с. 413].

Прозвішчы, утвораныя ад назваў абутку і адзення: *Башлакоў* < башлык 'суконны востраканечны капюшон з доўгімі канцамі, які надзяваецца на шапку' [4, с. 352]; *Калоша, Калошыч, Башмак, Кічкар* < кічка 'род жаночага галаўнога ўбору' [3, с. 204]; *Капялюш, Капоця* < капота 'жаночае хатняе плацце шырокага пакрою з рукавамі і разрэзам спераду' [3, с. 180]; *Лапцеў, Папруга* < папруга 'раменны пояс або пояс увогуле' [7, с. 27]; *Пасталоўскі* < пасталы 'даўні мяккі сялянскі абутак з цэлага кавалка скуры, які носіцца з анучамі і прывяз-

ваецца да ног аборамі’ [7, с. 87]; *Шубянок, Сакоўскі, Саковіч* < сак ‘жаночае адзенне’ [3, с. 361]; *Камзолаў, Тулупаў*.

Прозвішчы, што паходзяць ад назваў прылад працы, прыстасаванняў і прадметаў дамашняга ўжытку. Амаль што кожная прылада працы можа выкарыстоўвацца як прозвішча. Ёсць прозвішчы, якія ўтварыліся ад тэрмінаў, якія зараз не выкарыстоўваюцца ці ёсць толькі ў дыялектах. *Абадзінскі, Багроў* < багор ‘жалезны крук на доўгай жэрдцы для расцягвання бярвенняў у час пажару’ [4, с. 324]; *Бязмен* < бязмен ‘ручная рычажная або спружынная вага’ [4, с. 439]; *Бераснеў* < берасцень ‘гаршчок, аплецены бяростаю, бярозаваю карою’ [3, с. 52]; *Буглак* < бугалак ‘сіло’ [3, с. 63]; *Вярэніч* < вярэня ‘торбачка з бяросты’ [3, с. 93]; *Грабянок* < грэбень ‘пласцінка з зубамі для расчэсвання валасоў або для заколвання і ўпрыгожвання жаночай прычоскі’ [3, с. 89]; *Гунько* < гуня ‘посцілка’ [3, с. 121]; *Долатаў, Маджара* < маджара ‘павозка’ [3, с. 265]; *Кадачкін, Капыловіч* < капыл ‘кавалак дрэва ў форме ступні, на якім шавец робіць абутак’ [5, с. 633]; *Кастрама* < руск. кострома ‘нізкі гатунак мыла’ [3, с. 191]; *Кацёл, Кацуба, Кацубняк* < кацуба ‘качарга’ [3, с. 195]; *Кірчанка, Кірпічэнка, Ключэўскі, Кошалеў, Кордзік* < корда ‘вяроўка’ [3, с. 213]; *Лапаценка, Ласкутоў* < ласкут ‘абрэзак, шматок’ [3, с. 246]; *Ларцаў, Ларчанка, Лемех, Лямешка* < лямеш ‘частка плуга, якая падразае пласт зямлі знізу’ [6, с. 73]; *Матузка* < матуз ‘скручаная вузкая палоска тканіны, шнурочак для завязкі’ [6, с. 122]; *Малаткоў, Мятліцкі, Мяшэчак, Пакрышка*, *Піпчанка* < піпка ‘невялікая люлька’ [3, с. 324]; *Палазняк* < палазняк ‘матэрыял, прыгодны на палазы’ [3, с. 309]; *Рагачоў* < рагач ‘рычаг для пад’ёму’ [3, с. 345]; *Разанаў* < разан ‘розга’ [3, с. 346]; *Ражон* < ражон ‘завостраны кій’ [7, с. 562]; *Сумкін, Сусла* < сусла ‘соска’ [3, с. 400]; *Талкач, Талкачоў* < таўкач ‘прылада ў выглядзе качалкі з патоўшчаным круглым канцом, якой таўкуць што-небудзь’ [8, с. 483]; *Тамараў* < тамар ‘страла з касцяным тупым наканечнікам для палявання на собаля, куніцу, гарнастая’ [3, с. 407]; *Торба, Хамутоўскі*, *Чапега* < чапега ‘драўляная аснова плуга’ [3, с. 445]; *Чарпакоў, Чопчыц* < чоп ‘чан’ [3, с. 451]; *Шылаў, Шылец, Байдак* – байдак ‘тоўстая дошка для падлогі ці столі’ [3, с. 34]; *Ятчанка* < ятка ‘перасоўная прадуктовая дробная лаўка’ [3, с.500].

Назвы элементаў зямной паверхні, шляхоў зносін, апрацаваных участкаў: *Лугоўскі, Баравы, Грань* < грань ‘лінія падзелу; граніца, мяжа’ [5, с.79]; *Дуброўскі, Залугоўскі, Заярны, Канаплянік* < канаплянік ‘участак зямлі, засеяны каноплямі’ [5, с. 611]; *Нагорны, Падбярозны, Палевікоў, Палявы, Палянскі, Запольскі, Залескі, Забалоцкі.*

Назвы абстрактных паняццяў: *Балашэнка* < балаш ‘ацэнка’ [3, с. 37]; *Гула* < гула ‘глупства, бязглуздзіца’ [3, с. 121]; *Гулай, Катлабай* < з тат. котлы ‘шчасце’ і бай ‘багаты’ [3, с.192]; *Кубаркоў* < кубар ‘узятка, хабар’ [3, с. 225]; *Нячаеў* < нячай ‘сумненне, адчай’ [3, с. 303]; *Рагозін* < рагоза ‘глупства, недарэчнасць, бязглуздзіца’ [3, с. 345]; *Разумаў, Тужык.*

Назвы музычных інструментаў і іх частак: *Дудкін, Смыкаў.*

Назвы хвароб, траўм, паталагічных адхіленняў: *Калтуноў, Сінякоў, Каклюшкін, Жог, Чырык.*

Такім чынам, аналіз прозвішчаў Лоеўскага раёна выявіў шмат разнастайных лексіка-семантычных груп, ад якіх яны ўтвораны. Найбольш пашыранымі з’яўляюцца прозвішчы, якія ўтварыліся ад уласных імён, а таксама ад назваў прафесій, назваў расліннага свету. Найменш пашыраны – прозвішчы, што ўтварыліся ад назваў прадуктаў харчавання, геаграфічных назваў.

Літаратура

1. Суперанская, А. В. Современные русские фамилии / А. В. Суперанская, А. В. Суслова; под. ред. Ф. П. Филина. – М.: Наука, 1981. – 176 с.

2. Унбегаун, Б. Русские фамилии / пер. с англ. / Б. Унбегаун /общ. ред. Б. А. Успенский. – Москва: Прогресс, 1989. – 443 с.

3. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія 2: Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі / М. В. Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 508 с.

4. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т.1. А-В. – Мн., 1977. – 608с.
5. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т.2. Г-К. – Мн., 1978. – 768 с.
6. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т.3. Л-П. – Мн., 1979. – 672 с.
7. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т.4. П-Р. – Мн., 1980. – 768 с.
8. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т.5, ч. 1. С-У. – Мн., 1982. – 663 с.
9. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т.5, ч. 2. У-Я. – Мн., 1984. – 608 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 811.161.3 – 085 + 821.161.3 – 1.03.09

Мастацкія асаблівасці перакладу А. Куляшова паэмы М. Лермантава “Дэман”

А. М. Воінава

У артыкуле аналізуюцца спосабы і прыёмы перакладу паэтычнага тэксту М.Лермантава на беларускую мову Аркадзем Куляшовым не толькі з пункту гледжання раўнацэннага ўзнаўлення мастацкага вобраза, але і з пункту гледжання адэкватнага выбару лінгвістычных сродкаў.
Ключавыя словы: мастацкі пераклад, адэкватнае ўзнаўленне тэксту, лексічны эквівалент, сістэма лексічных і мастацкіх сродкаў, перадача мастацкага вобраза.

The article analyzes Arcady Kuleshov’s translation methods of a poetic text by M. Lermontov into the Belarusian language not only from the point of an equivalent reconstruction of a literary image, but also from the point of an adequate choice of linguistic means.
Key words: literary translation, adequate text translation, lexical equivalent, system of lexical and literary means, literary image translation.

Адной з самых актуальных праблем сучаснага мовазнаўства па-ранейшаму застаюцца пытанні мастацкага перакладу, стварэнне адэкватнай сістэмы вобразаў сродкамі іншай мовы. Сёння добра ўсведамляецца, што мастацкая інтэрпрэтацыя іншамоўнага тэксту садзейнічае ўзбагачэнню інтэлектуальнай культуры народа, адкрывае шырокія перспектывы развіцця нацыянальнай культуры і літаратуры. Мастацкі пераклад на многіх этапах з'яўляўся своеасаблівым стымулятарам узаемадзеяння літаратур. У першую чаргу гэта адносіцца да блізкароднасных славянскіх літаратур – беларускай і рускай. Старонкі ўзаемасувязей дзвюх літаратур праз мастацкі пераклад і ўзаемапераклад пачаліся з асэнсавання творчасці А. Пушкіна, М. Лермантава, М. Някрасава, І. Крылова, М. Горкага. Нягледзячы на значныя дасягненні ў пытаннях тэорыі і практыкі перакладу, малараспрацаваным застаецца лінгвістычны, моўны аспект мастацкага перакладу. Але для “практыкі перакладу, і тым больш для тэорыі яго з’яўляецца неабходнасцю лінгвістычная аснова, веданне заканамернасцей, якія існуюць паміж пэўнымі мовамі” [1, с.10]. У сваім даследаванні мы хацелі б звярнуцца да аналізу некаторых моўных асаблівасцей перакладу Аркадзем Куляшовым паэмы «Дэман» класіка рускай літаратуры М. Лермантава на беларускую мову.

Сінтаксічная будова паэмы вельмі багатая: у ім выкарыстоўваюцца розныя тыпы сказаў – простыя, аднасастаўныя, складаныя, складаныя сінтаксічныя канструкцыі. Перакладчык досыць часта адэкватна ўзнаўляе пэўную сінтаксічную канструкцыю. Так, просты сказ ён перакладае простым: *в последний раз она плясала* [2, с.88] – *на жаль, Тамара танцавала апошні раз!* [3, с.38] складаны – адпаведнай канструкцыяй: *слова умолкли в отдаленье, вослед за звуком умер звук* [2, с. 94] – *удалеч словы адляталі, і вось за гукам гук памёр* [3, с. 44]. Неабходна адразу ж адзначыць, што простыя сказы ўжываюцца значна радзей у параўнанні са складанымі, што можна растлумачыць своеасаблівай інтанацыяй лермантаўскага твора.

Аднак большую цікавасць прадстаўляюць выпадкі неадэкватнай перадачы сінтаксічных канструкцый. Замена – найбольш распаўсюджаны тып перакладчыцкіх трансфармацый. Замяняцца могуць як граматычныя адзінкі (формы слоў, часціны мовы, члены сказа, тыпы сінтаксічнай сувязі), так і лексічныя. “Замена ў сказе звычайна выклікаецца адсутнасцю той або іншай канструкцыі ў мове перакладу, несупадзеннем ва ўжыванні канструкцый, а таксама неаднолькавым словаўжываннем, рознай спалучальнасцю слоў”, – указвае М.С. Ржавуцкая [4, с. 11]. Так, А. Куляшоў ў значнай колькасці выпадкаў просты сказ на мове арыгінала перадае складаным. Часцей за ўсё такія адхіленні назіраюцца ў простых сказах, ускладненых адасобленымі азначэннямі, дзеепрыметнікавымі і дзеепрыслоўнымі словазлучэннямі, якія, як вядома, выкарыстоўваюцца ў беларускай мове абмежавана. Звычайна канструкцыі з дзеепры-

метнікавымі зваротамі патрабуюць істотнай перабудовы цэлай страфы, пры перадачы такіх зваротаў не можа быць поўнага стандарту і нікольки не выключаецца выбар паміж некалькімі, хаця б і блізкімі адна да другой, магчымасцямі. Сістэма рускіх дзеепрыметнікавых форм не столькі багацейшая за беларускую, колькі значна адрозніваецца ступенню ўжывальнасці. Відавочна, што руская мова багацейшая формамі і адценнямі для выражэння таго, што ў беларускай мове выражаецца з дапамогай больш вузкага кола дзеепрыметнікавых сродкаў або зусім без прыцягнення дадзенай граматычнай катэгорыі. Ведаючы гэта, А.Куляшоў пры перакладзе сінтаксічных канструкцый з дзеепрыметнікамі або выкарыстоўвае больш характэрныя для беларускай мовы дзеепрыметнікі ці апускае малахарактэрныя, ужывае прыметнікі або цалкам трансфармуе страфу: *когда бегущая комета* [2, с.84] – *калі камета мімалётнай* [3, с.33]; *следя мелькающие волны* [2, с.84] – *дрымоты поўныя маўклівай* [3, с.34]; *звонко-бегущие ручьи* [2, с.86] – *і гаваркія ручаі* [3, с.35]; *пещеры, где палящим днём* [2, с.86] – *пячоры, дзе спякотным днём* [3, с.35]; *гарема брызжущий фонтан* [2, с.88] – *гарэма велічны фантан* [3, с.37]; *на пену скачущей волны* [2, с.90] – *сцяны на хвалі* [3, с.40]; *им в грядущем нет желанья* [2, с.94] – *дзень наступны – без жадання* [3, с.44]; *стоит с блистающим челом* [2, с.100] – *стаіць з асветленым чалом* [3, с.51].

Больш вольнае абыходжанне з тэкстам арыгінала заўважаецца і пры перадачы сказаў з дзеепрыслоўнымі зваротамі, якія таксама ў беларускай мове менш пашыраны, чым у рускай. Перакладчык, імкнучыся захаваць рытм і інтанацыю гучання лермантаўскага твора або свядома апускае дзеепрыслоўе: *ничтожной властвуя землёй* [2, с.85] – *зямлі нікчэмнай уладар* [3, с.34]; *и птица, кружась в лазурной высоте* [2, с.85] – *дзе ўвага птушак і звяроў* [3, с.34] або замяняе дзеясловам ці іншым адэкватным сродкам: *глубоко внизу чернея, как трещина, жилище змея* [2, с.85] – *і трэшчынай чарнеў, і гулкім змяі звілістым прытулкам* [3, с.34]; *в ладони мерно ударяя, они поют* [2, с.87] – *біць у ладоні пачынае сяброўскі гурт* [3, с.36]; *кружа его над головой* [2, с.87] – *трасе яго над галавой, то кружыць* [3, с.37]; *едва, едва переступая* [2, с.87] – *ледзь валачэ цяжкія ногі* [3, с.39]; *дрожит, обитель пробуждая* [2, с.96] – *гудзе, наўколле абуджае* [3, с.48]; *и между их, прорезав тучи* [2, с.97] – *між імі, хмарам непадсудны* [3, с.48].

Перабудова сінтаксічнай канструкцыі заўважаецца і пры перадачы адасобленых азначэнняў: *так стройны, полны выраженья, так полны милой простоты* [2, с.89] – *і ўсе не змушаныя рукі такой здзіўлялі прастатой* [3, с.38]; *и птичка, спрятанная в ней* [2, с.94] – *і птушка, што схавана ў ёй* [3, с.44]; *полон жизни новой, с моей преступной головы я гордо снял венец терновый* [2, с.103] – *пайшло інакшай каляінай жыццё. Цярновы мой вянок я скінуў* [3, с.54]; *утомлена борьбой всегдашней* [2, с.89] – *самой то горача, то сцюжна* [3, с.54].

Сустракаюцца выпадкі неадэкватнай замены сінтаксічнай канструкцыі і пры перадачы аднасастаўных сказаў. Так, пры перакладзе двухсастаўны сказ у лермантаўскім творы перадаецца А. Куляшовым аднасастаўным. Часцей за ўсё такія выпадкі звязаны з пропускам асабовага займенніка, што дапамагае перакладчыку засярозіць увагу менавіта на дзеянні: *Задумчив, у стены высокой он бродит* [2, с. 99] – *Задумлівы, па сцежцы горнай, ступае* [3, с. 50]; *Он поднял взор* [2, с. 98] – *Зірнуў* [3, с.50]; *Кого-то ждёт она давно!* [2, с. 98] – *Чакае некага даўно* [3, с.50]; *Клянусь я первым днём творенья* [2, с.107] – *Клянуся першым днём стварэння* [3, с.58].

Перакладчык іншы раз карыстаецца прыёмам дабаўлення, г.зн. уводзіць у сказ новыя кампаненты, што прыводзіць да пашырэння структуры сказа, а таксама да семантычных змен: *И Ангел грустными глазами на жертву бедную взглянул* [2, с. 101] – *На бедную ахвяру сумна Анёл збянтэжаны зірнуў* [3, с.52]; *Синело предо мной пространство* [2, с.104] – *Сінелі вечныя прасторы* [3, с.55]; *презрительным окинул оком* [3, с. 86] – *на ўсё з пагардай глянуў строга* [4, с.35]; *Так повреждённая ладья* [2, с. 104] – *Так паруснік пасля крушэння* [3, с.55]; *И след кровавый за ним вился по крутизне* [2, с. 105] – *Крывавы след віўся па скале крутой* [3, с.56]. Увядзенне дабаўленняў тлумачыцца разыходжаннямі ў лексічных сістэмах мовы, неабходнасцю ўдакладнення для носьбіта мовы перакладу рэалій, названых у перакладзе, несупадзеннем пэўных формаўтваральных мадэляў арыгінала і перакладу, могуць быць выклі-

каны папярэднімі трансфармацыямі-заменамі, а найчасцей патрабаваннямі захавання рытму і страфы арыгінала, як гэта і адбываецца ў перакладзе “Дэмана”.

Такія трансфармацыі часта звязаны з праблемай перадачы на беларускую мову стараславянізмаў, якія не вельмі шырока прадстаўлены ў сучаснай мове і запазычаны ў асноўным праз рускую (глава, ісціна, саюз, благароддзе, благаслаўляць, блажэння, славесны і г.д.). Функцыя іх была рознай: фармальнае выкарыстанне славянізмаў як лексічных варыянтаў для вырашэння версіфікацыйных задач і для надання твору ўрачыстасці, узнёсласці або адпаведнага гістарычнага каларыту. Як бачым, славянізмы амаль усе стылістычна нейтральныя, шырока ўжываюцца ва ўсіх стылях мовы. Як слушна заўважае М.Г.Булахаў, “наяўнасць стараславянізмаў беларускай мовай абмяжоўваецца немагчымасцю падпарадкаваць гукавую, марфалагічную і словаўтваральную форму чужога слова нацыянальнай спецыфіцы” [5, с. 10]. Таму складанай з’яўляецца задача перадаць сродкамі беларускай мовы тэкст, у якім шырока прадстаўлена кніжнаславянская лексіка. Неабходна захаваць высокае гучанне такога тэксту, яго ўзвышанасць, пафас.

Трэба адразу адзначыць, што А.Куляшоў добра ўсведамляў складанасць задачы, якая стаяла перад ім. Ён добра адчуваў, што перакласці паэзію М.Ю. Лермантава – значыць не толькі захаваць сэнс арыгінала, але і асаблівасці яго мастацкай спецыфікі, арганічна спалучыць вернасць перадачы лермантаўскага тэксту з узнаўленнем яго мастацкай формы ў беларускім варыянце. А.Куляшоў даў выдатныя ўзоры адэкватнай перадачы кніжнаславянскай лексікі, якую актыўна выкарыстоўваў рускі аўтар.

Лексічная палітра кніжнаславянізмаў ў паэме «Дэман» вельмі шырокая – сустракаюцца няпоўнагалосныя формы, словы са спалучэннем жд, щ, уласна стараславянізмы.

Уласна стараславянскую лексіку, ужытую ў агульным, нейтральным сэнсе, А.Куляшоў звычайна замяняе на стылістычна нейтральныя беларускія адпаведнікі: *И звёзды яркие, как очи, как взор грузинки молодой* [3, с.86] – *Зор вочы яркія, як вочы гор прыгажуні маладой* [4, с.35]; *по милому челу блуждая* [3, с.88] – *квола любы твар кранае* [4, с.37]; *где прах отцов их был зарыт* [3, с.91] – *дзе іх бацькоў схаваў нябыт* [4, с.41]; *взор твой ожидал* [3, с.86] – *позірк твой чакаў* [4, с.42]; *бесплотный взор его очей* [3, с. 93] – *ягоны позірк бесцялесны* [4, с.43]; *ланиты девственные жжёт* [3, с.93] – *на вусны горкі след кладзе* [4, с.43]; *тают на устах* [3, с.99] – *прагных губ* [4, с.49]; *коснулся жаркими устами* [3, с.109] – *да губ губамі ён прыпаў* [4, с. 61]; *не целовал такого ока* [3, с.88] – *не цалаваў такога вока* [4, с.37]; *уста невесты целовал* [3, с.91] – *нявесты вусны цалаваў* [4, с.40].

Дадзеныя ілюстрацыі даказваюць, што стараславянізмы амаль паслядоўна замяняюцца агульнаўжывальнымі беларускімі эквівалентамі: *взор – позірк; чело – твар; прах – нябыт; ланиты – вусны; уста – губы*. У некаторых выпадках перакладчык для захавання рытму, інтанацыі страфы наогул апускае складаныя для перакладу кніжнаславянскія словы: *склониться ли на ложе сна* [3, с. 98] – *наважыцца заснуць – не спіць* [4, с.49]; *лобзанья тают на устах* [3, с.99] – *а пацалункам прагных губ* [4, с. 49]; *презрительным окинул оком* [3, с. 86] – *на ўсё з пагардай глянуў строга* [4, с.35]; *и кущи роз, где соловьи* [3, с.99] – *і руж кусты, дзе салаўі* [4, с.35]; *но презрел удалой жених* [3, с.91] – *але забыўся зух-жаніх* [4, с.40]; *храпит и рвётся, будто к брани* [3, с.92] – *ляціць нібы на поле бою* [4, с.41]; *глаголу вод его внимали* [3, с. 85] – *прыкута да грымотнай хвалі* [4, с.34]; *гостить я буду до денницы* [3, с.94] – *гасціць я буду жа да золку* [4, с.44]; *крестит дрожащими перстами* [3, с.110] – *ён хрысціцца* [4, с.63].

У прыведзеных прыкладах А.Куляшоў проста прапусціў лексемы *ложе, око, кущи, глагол, денница, лобзанье* што, канешне, адбілася на агульным высокім гучанні даных строф – мікравобраз атрымаўся некалькі будзённым. Крыху знізіла высокае паэтычнае гучанне радкоў замена стараславянізма *презрел* на стылістычна нейтральнае, агульнаўжывальнае *забыўся*. Кніжнаславянізмы, ужытыя для вырашэння пэўных мастацкіх задач, стварэння каларыту часу, служылі для характарыстыкі некаторых вобразаў, заставаліся: *морщины смуглого чела* [3, с.93] – *маршчыны на чале* [4, с.42]; *венец из радужных лучей не украшал его кудрей* [3, с.95] – *вянок нябеснага святла не азараў яго чала* [4, с.45]; *был томный цвет ее чела* [3, с.110] – *абрысы млявага чала* [4, с.63] і інш. Такая замена апраўдана, бо неабходна заўсёды помніць, што слоўнікавы склад мовы ўяўляе сабой не проста сукупнасць слоў, а сістэму, якая

дапускае бясконца разнастайныя, але не любыя спалучэнні слоў у любым кантэксце: асобныя элементы слоўніка звязаны адзін з адным пэўнымі сэнсавымі і стылістычнымі адносінамі. Гэтыя абставіны праяўляюцца пры перакладзе і часта не дазваляюць выкарыстоўваць бліжэйшы слоўны адпаведнік, патрабуюць доўгіх пошукаў раўнацэннага ў сэнсавых і стылістычных адносінах варыянта і вымагаюць вялікіх намаганняў ад перакладчыка.

Амаль паслядоўна замяняе беларускі перакладчык няпоўнагалосныя формы, уласцівыя стараславянскай мове, на поўнагалосныя ці імкнецца адшукаць адэкватную замену ім. Як вядома, у рускай мове ў ХУШ – пачатку XIX стст. узмацніўся працэс дыферэнцыяцыі паміж кніжнаславянскай і рускай лексікай. Асноўны напрамак гэтага працэсу – замацаванне за кніжнаславянізмамі вытворных абстрактных значэнняў, а за рускімі – намінацый, агульных для рускіх і славянскіх паралеляў. Сфера ўжывання славянізмаў у намінатыўным значэнні звужаецца – яны пераходзяць у разрад высокай або паэтычнай лексікі [6, с.42].

У канцы XIX ст. адбываўся працэс абмежавання выкарыстання стылістычных славянізмаў у розных жанрах рускай мастацкай літаратуры, у тым ліку і ў мове паэзіі, дзе яны з’яўляліся асноўным стылявым элементам. Функцыянаванне поўнагалосных і няпоўнагалосных варыянтаў у другой палове XIX ст. сведчыць пра далейшае разыходжанне іх сфер ужывання і семантыкі.

Усё гэта добра ўсведамляў А.Куляшоў, разумеючы, што пастаянна ці поўнасцю замяняючы няпоўнагалосныя формы – сродак стварэння паэтычнасці – поўнагалоснымі, ён зніжае агульнапаэтычную тканіну твора. Але, з другога боку, няпоўнагалосныя формы не ўласцівы беларускай мове, і каб наблізіць твор да беларускага чытача, перакладчык свядома ішоў на такую замену: *узок путь прибрежный* [3, с.90] – *няпэўнасць сцежкі прыбярэжнай* [4, с.40]; *слезою жаркою, как пламень* [3, с.100] – *слязой, як полымя, гарачай* [4, с.51].

Як бачым, калі ў беларускай мове прысутнічае агульнаўжывальны поўнагалосны беларускі адпаведнік, то А.Куляшоў выкарыстоўвае яго, калі ж такой адэкватнай замены няма, то перакладчык або проста апускае кніжнаславянскую няпоўнагалосную лексему або поўнасцю трансфармуе страфу. Выбар варыянта тут таксама залежыць ад суадносін з суседнімі сінтаксічнымі канструкцыямі, ад неабходнасці захавання інтанацыйнай плыні і рыфмы твора: *у врат Кавказа на часах* [3, с.85] – *глядзелі замкаў вежы тыя* [4, с.34]; *властитель Персии златой* [3, с.88] – *багатай Персіі ўладар* [4, с.37]; *пред ним катилася тогда* [3, с.89] – *плылі бясконцай чарадой* [4, с.37]; *недолго жениха младого* [3, с.93] – *нядоўга жаниха з парога* [4, с.42]; *на труп безгласный* [3, с.93] – *на труп халодны* [4, с.43]; *пред ним тоску мою пролью* [3, с.96] – *дачку ўратуе ад тугі* [4, с.43]; *синело предо мной пространство* [3, с.194] – *сінелі вечныя прасторы* [4, с.55].

Такімі прынцыпамі карыстаецца А.Куляшоў, калі перакладае лексемы са спалучэннем *жд*: *давно отверженный блуждал* [3, с.85] – *выгнання дух, даўно блукаў* [4, с.34]; *сеял зло без наслажденья* [3, с.85] – *ён сеяў зло без асалоды* [4, с.33]; *дрожит, обитель пробуждая* [3, с.96] – *гудзе, наўколле абуджае* [4, с.48]; *по милому челу блуждая* [3, с.88] – *квола любы твар кранае* [4, с.37]; *Отчизна, чуждая поныне* [3, с.88] – *нядолю, што ў чужой краіне* [4, с.38]; *То был ли признак возрожденья?* [3, с.89] – *Што гэта – свята адраджэння?* [4, с.38]; *ни за добро вознагражденья* [3, с.103] – *за ўчынак добры ўзнагароды* [4, с.55].

Іншы раз замена мікравобразу вымагаецца не чыста лінгвістычнымі праблемамі, а патрабаваннем рыфмы, імкненнем захаваць агульнае гучанне лермантаўскай паэмы. Так, аўтар іншы раз апускае эпітэты, параўнанні, іншыя мастацкія дэталі або ўводзіць свае, некалькі адрозныя ад арыгінала: *из-под завистливой ресницы* [3, с.87] – *хвілінны жаль засцеле вейкі* [4, с.37]; *взмахнув растрёпанною гривой* [3, с.92] – *махнуўшы цёмнай хваляй грывы* [4, с.42]; *в тени дерев миндальных* [3, с.96] – *ў засень дрэў самотных* [4, с.47]; *меж кустов, покрытых инеем цветов* [3, с.97] – *кустоў і зябкіх кветак іх* [4, с.48]; *как будто за звездой звезда* [3, с.87] – *як хвалі – адна, другая ўслед за ёй* [4, с.37]; *злой дух коварно усмехнулся* [3, с.101] – *злы дух прытоена ўсміхнуўся* [4, с.52]; *бывало, только ночи сонной прохлада землю обоймет* [3, с.98] – *бывала, толькі над шляхамі раскіне ноч свой цёмны плашч* [4, с.49]; *Ты прекрасна* [3, с.101] – *Ты багіня!* [4, с.52]; *белей и чище покрывала* [3, с.110] – *бялей чысцюткае паперы* [4, с.63]; *коня измученного гонит* [3, с.98] – *шпарчэй каня ён паганяе* [4, с.49]; *в час торжественный заката,*

когда, растаяв в море злата [3, с.112] – *у момант вечаровы, калі ў нябёс прастор барвовы* [4, с.64]. У некалькіх месцах заўважаецца замена прыназоўнікавых параўнання на творны параўнання, што не парушае агульнай мастацкай тканіны твора: *из боя вынес, как стрела* [3, с.92] – *вынес з пекла бою стралой* [4, с.42]; *ковром раскинулись* [3, с.86] – *як дываны, ляглі* [4, с.35]; *сиял он тихо, как звезда* [3, с.96] – *ён ціхай зоркай ззяў заўжды* [4, с.47].

Экзатычную лексіку, даволі шырока прадстаўленую ў паэме, А. Куляшоў поўнасцю захоўвае, прычым у адрозненне ад арыгінала, дзе сам аўтар каменціруе незразумелыя словы, не дае яе тлумачэння: *чинар развесистые сени* [3, с.85] – *чынар разгалістыя шаты* [4, с.34]; *покрыта белою чадрой* [3, с.87] – *князёўна ходзіць пад чадрой* [4, с.36]; *звучит зурна* [3, с.87] – *гучыць зурна* [4, с.36]; *гарема брызжущий фонтан* [3, с.88] – *гарэма велічны фантан* [4, с.37]; *играет ветер рукавами его чухи* [3, с.90] – *гуляе вецер з рукавамі чухі ягонае* [4, с.39]; *на чепраке его видна* [3, с.92] – *спярэсцілі чапрак ягоны* [4, с.42]; *чингара стройное бряцанье* [3, с.99] – *і вось суладны звон чынгара* [4, с.50].

У М. Лермантава творчая дамінанта надзвычай шырокая. Яму ўласцівы іронія і гнеўны пафас, лірычнасць і грамадзянскасць, песеннасць і разнастайная палітра моўна-выяўленчых сродкаў. Можна з упэўненасцю сказаць, што А.Куляшоў выдатна справіўся з пастаўленай задачай – перакладам складанай паэмы, прапанаваў свае адпаведнікі кніжнаславянскай лексікі, здолеў па-майстэрску перадаць чароўныя радкі паэмы і даў чытачу паўнацэнны высокамастацкі пераклад, у якім адлюстраваліся галоўныя рысы стылю М. Лермантава. Для перакладу А. Куляшова ўласцівы адыход ад літаралізму пры поўным захаванні сэнсу арыгінала, асаблівасцей яго мастацкай спецыфікі, у ім арганічна спалучаецца вернасць перадачы аўтарскага тэксту з узнаўленнем яго мастацкай формы ў беларускім варыянце.

Літаратура

1. Фёдоров, А. Основы общей теории перевода. – М., 1968
2. Лермонтов, М.Ю. Собрание сочинений: В 4-х т. Т.2 – М., 1964
3. Куляшоў, А. Збор твораў: У 5 т. Мн., 1977. Т.4
4. Ржавуцкая, М.С. Пераклад сінтаксічных канструкцый з беларускай мовы на рускую (на матэрыяле твораў Івана Мележа) Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук – Мн., 2000
5. Булахов, М.Г. Основные вопросы сопоставительной стилистики русского и белорусского языков. – М., 1979
6. Замкова, В.В. Славянизм как стилистическая категория в русском литературном языке середины ХУШ в. – М., 1972.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК [811.161.3+811.161.1+811.111]'373:398.9

Фразеа-семантычнае мікраполе "ўвядзенне ў зман" у беларускай, рускай і англійскай мовах

В. Г. Гаўрыловіч

У артыкуле праведзены аналіз заонімных фразеалагічных адзінак беларускай, рускай і англійскай моў, якія складаюць фразеа-семантычнае мікраполе "увядзенне ў зман", на аснове чаго выяўляюцца універсальныя і адрозныя стэрэатыпныя вобразы ў светапоглядзе беларусаў, рускіх і англічан.
Ключавыя словы: фразеалагічная адзінка, фразеа-семантычнае поле, фразеа-семантычнае мікраполе, група, фразеа-семантычная падгрупа, міжмоўныя адпаведнікі.

The article analyzes zoonimic phraseological units of the Belorussian, Russian and English languages making a phraseological and semantic microfield of "deception" on the basis of what universal and distinctive stereotypic images in the outlook of Belarusians, Russians and Englishmen come to light.
Keywords: phraseological unit, phraseological and semantic field, phraseological and semantic microfield, group, phraseological and semantic subgroup, interlingual conformity.

Паняцце поля ўзыходзіць да вызначэння мовы як сістэмы, якая ўяўляе сабой складаны механізм. Выкарыстанне полевага падыходу пры даследаванні моўных з'яў дапамагае больш глыбока раскрыць сістэмныя сувязі ў мове, асаблівасці моўнай свядомасці, пры аналізе фразеалогіі – выявіць сістэмныя адносіны, у якія ўступаюць фразеалагічныя адзінкі (ФА) унутры поля, ахарактарызаваць іх семантычную структуру.

Шырокае прызнанне і развіццё тэорыя семантычных палёў атрымала ў 1960-х гг. мінулага стагоддзя і распрацоўвалася, у першую чаргу, з апорай на лексіку. На неабходнасць вывучэння семантычных палёў у фразеалогіі ўказваецца яшчэ ў доктарскай дысертацыі А.У.Куніна [12, с. 418].

В.С. Ахманава дае наступнае азначэнне семантычнага поля (СП): "1) частачка ("кавалачак") рэчаіснасці, якая выдзелена ў чалавечым вопыце і тэарэтычна мае ў дадзенай мове адпаведнік у выглядзе больш ці менш аўтаномнай лексічнай мікрасістэмы; 2) сукупнасць слоў і выразаў, якія складаюць тэматычны рад, словы і выразы мовы, якія ў сваёй сукупнасці пакрываюць пэўную галіну значэнняў" [1, с. 334].

Тэрмін "фразеалагічнае поле" быў ужыты ў 1967 г. Л.І. Райзензонам і Ю.Ю.Аваліані для абазначэння "супольнасці лагічных і псіхалагічных сфер, а таксама ўласна "быццёвых" сфер, якія спараджаюць аднолькавае ў цэлым (з частковымі варыяцыямі) кола фразеалагічных з'яў" [18, с. 74].

Н.М. Кірылава пад фразеа-семантычным полем (ФСП) разумее сукупнасць ФА, якія адносяцца да адной паняційнай сферы і характарызуюцца пэўнымі сістэмнымі адносінамі паміж сабой [10, с. 54].

Асаблівую цікавасць уяўляе вывучэнне ФСП розных моў, паколькі "садзейнічае рашэнню праблемы суадносін універсальнага і ідэаэтнічнага ў мове, дазваляе выявіць нацыянальную спецыфіку чляненння і адлюстравання ў мове аб'ектыўнай рэчаіснасці" [17, с. 7].

Пры аб'яднанні ФА ў ФСП неабходна ўлічваць інтэгральныя і дыферэнцыяльныя прыкметы. Як заўважае В.П. Жукаў, дыферэнцыяльныя семантычныя прыкметы ўказваюць на семантычную своеасаблівасць фразеалагізма (або слова), а інтэгральныя – на падабенства адной ФА да другой [8, с. 26].

ФСП складаецца з фразеа-семантычных мікрапалёў (ФСМП), якія падзяляюцца на фразеа-семантычныя групы (ФСГ), якія ў сваю чаргу складаюцца з фразеа-семантычных падгруп (ФСПГ). Выдзяленне ФСГ і ФСПГ ажыццяўляецца шляхам выдзялення дыферэнцыяльных прыкмет. Пад ФСГ мы разумеем сукупнасць ФА, якія валодаюць адной агульнай семантычнай прыкметай і шэрагам дыферэнцыяльных прыкмет.

ФА, якія аб'ектывуюць канцэпт "увядзенне ў зман", утвараюць аднайменнае ФСМП, найбольш шырока прадстаўленае ФА ў межах ФСП "паводзіны чалавека".

ФА з семантыкай "увядзенне ў зман" былі аб'ектам увагі лінгвістаў. Так, аналіз універсальнага канцэпту "падман" даецца ў рабоце А.Д. Кошалева [11]. Канцэпт "ашуканства" на матэрыяле рускай мовы аналізуе У.І. Карасік [9], на матэрыяле ФА англійскай і рускай моў разглядаюць Н.М. Панчанка, У.І. Шахоўскі [16; 23], рускай, англійскай і нямецкай – І.Э. Фядзюніна [20], беларускай – В.А. Ляшчынская [14]. ФСП "увядзенне ў зман" у кагнітыўным аспекце на матэрыяле ФА рускай мовы даследуецца ў рабоце Г.В. Грыцэнкі [6].

ФА беларускай мовы з семантыкай "увядзенне ў зман" у параўнальна-супастаўляльным плане з ФА рускай і англійскай моў не разглядаліся. У межах артыкула абмяжуемся толькі заонімнымі ФА.

Мэта артыкула – правесці рэканструкцыю канцэпта "ўвядзенне ў зман" на матэрыяле беларускіх, рускіх і англійскіх ФА з кампанентам-заонімам, устанавіць адрозненні і падабенствы ФСМП "увядзенне ў зман" беларускай, рускай і англійскай моў, выявіць вобразы, якія ляглі ў аснову ФА, вызначыць міжмоўныя фразеалагічныя адпаведнікі, паколькі толькі такі комплексны аналіз дазваляе найбольш поўна ўстанавіць універсальна-тыпалагічныя і нацыянальна-спецыфічныя характарыстыкі фразеалагічнага складу кожнай мовы.

У выніку аналізу семантыкі заонімных ФА, якія ўтвараюць ФСМП "увядзенне ў зман" (33 ФА беларускай мовы, 32 – рускай і 36 – англійскай), выдзелена пяць ФСГ: 1) 'актыўная мана', 2) 'пасіўная мана', 3) 'суб'ект увядзення ў зман', 4) 'аб'ект увядзення ў зман' і 5) 'атрыбуты (сродкі) увядзення ў зман'.

У **першую** ФСГ 'актыўная мана' ўваходзяць ФА беларускай, рускай і англійскай моў, якія адлюстроўваюць спосабы скажэння рэчаіснасці. Яе складаюць адзінаццаць ФСПГ:

1) 'глупства, бязглуздзіца' – *поўныя эквіваленты* (маюць тоесную семантыку, аднолькавую структурна-граматычную арганізацыю і кампанентны склад): бел. *трызненне сівой кабылы* 'тое, што пазбаўлена ўсякіх падстаў; бяссэнсіца' [13] – руск. *бред сивой кобылы* 'несусветнае глупства; бязглуздзіца' [21], што, магчыма, звязана з адным і тым жа вобразам, заснаваным на народным павер'і, паводле якога сівая кабыла лічыцца неразумнай [4, с. 57]; *поўныя аналагі* (маюць аднолькавую семантыку, падобную структурна-граматычную арганізацыю, суадносны ў адной лексеме кампанентны склад): бел. *трызненне сівой кабылы* – руск. *бред собачий* 'несусветнае глупства; бязглуздзіца' – англ. *an Irish bull* (дасл. – ірландскі бык) 'яўны абсурд, яўная бязглуздзіца' [3], *a cock(-)and(-)bull story* 'непраўдападобная гісторыя, небыліца'; руск. *бред сивой кобылы*, *бред собачий* – англ. *an Irish bull*, *a cock(-)and(-)bull story*.

Вобраз быка ў ФА *an Irish bull* зацемнены. Ён можа ўзыходзіць да старафранцузскага *boul* 'ашуканства, хітрасць', ісландскага *bull* 'лухта', сярэднеанглійскага *bull* 'ілжывасць' або да дзеяслова *bull* 'абдурваць, кпіць, махляваць' [26]. Наяўнасць азначэння *Irish*, магчыма, можна растлумачыць спрадвечнай варожасцю паміж англічанамі і ірландцамі, а таксама стэрэатыпам аб дурноце ірландцаў, які склаўся ў англійскім гумары.

Наконт паходжання ФА *a cock(-)and(-)bull story* існуе неалькі версій. Паводле адной, вытокі ФА ляжаць у паданні пра дзве гасцініцы ў Англіі, якія называліся the Cock і the Bull. У той час (да 17 ст.) сярод падарожнікаў склалася традыцыя выдумляць фантастычныя гісторыі з мэтай пацешыцца і прабавіць час. (Гэтая ідэя скарыстана ў "Кентэрберыйскіх апавяданнях" Чосэра. У нечым гэта нагадвае традыцыю ў беларускай літаратуры, якая ідзе ад Яна Баршчэўскага). Згодна з другой версіяй, ФА лічыцца вынікам няправільнага перакладу французскай ФА *coq-a-l'ane* 'як певень да асла' па прычыне падабенства гукаў [24].

2) 'намінацыя хітрасці' – англ. *a spider's web* (дасл. – павуковая павуціна) 'хітраспляценні, інтрыгі', *monkey business* (дасл. – справа малпы) 1) 'дурыкі, хітрыкі, фокусы'; 2) 'дзіўная, падазроная, не зусім чыстая справа, махінацыя';

3) 'безгрунтоўнае абяцанне' – англ. *a bird in the bush* (дасл. – птушка ў кустах) 'падманлівая мара, хімера; безгрунтоўнае абяцанне' (з'яўляецца часткай прыказкі *a bird in the hand is worth two in the bush* [3, с. 82]);

4) 'крывадушша, крывадушнічаць' – *поўныя эквіваленты*: бел. *ліць/праліваць кракадзілавы слёзы* 'двудушна, прытворна або няшчыра скардзіцца' – руск. *лить крокодильи*

слёзы ‘крывадушна скардзіцца, прытворна, няшчыра шкадаваць аб чым-н.’; *поўныя аналагі*: бел. *кракадзілавы слёзы* ‘крывадушнае спачуванне, прытворнае шкадаванне’ – руск. *лить крокодильи слёзы* (узыходзяць да павер’я пра тое, што кракадзіл, перш чым канчаткова праглынуць сваю ахвяру, пралівае слёзы [2, с. 530]);

5) ‘ашуканства, ашукваць’ – *поўныя эквіваленты*: бел. *траянскі конь* 1) ‘ашуканства, хітры падман’; 2) ‘чалавек, які са здрадніцкімі намерамі дамагаецца чыйго-н. даверу, выдае сябе не за таго, кім з’яўляецца на самай справе’ (у 1 знач.) – англ. *a Trojan horse* (дасл. – траянскі конь) ‘схаваная небяспека; падрыўная, дыверсійная дзейнасць (у краіне, намечанай для захопу)’; *поўныя аналагі*: руск. *обмануть старого воробья на мякине* ‘ашукаць каго-н.’ – англ. *catch old birds with chaff* (дасл. – злавіць старых птушак на мякіне) ‘лёгка падмануць, правесці вопытных людзей’; *безэквівалентныя*: руск. *как сивый мерин* врёт ‘бессаромна, нахабна’; англ. *cry wolf (too often)* (дасл. – крычаць “воўк” (вельмі часта) ‘паднімаць ілжывую трывогу, падрываць давер да сябе непраўдзівым клічам на дапамогу’ (намёк на байку Эзопа пра пастуха, які забаўляўся тым, што крычаў “воўк, воўк!”, каб падмануць людзей [3, с. 829]);

6) ‘нагаворваць, паклёпнічаць’ – *поўныя эквіваленты*: бел. *вешаць сабак* на каго, каму (*навешаць сабак* на каго, каму) ‘нагаворваць на каго-н., лаяць, абвінавачваючы ў чым-н.’ – руск. *вешать собак* на кого (*навешать собак* на кого) ‘нагаворваць, паклёпнічаць на каго-н., беспадстаўна абвінавачваць у чым-н.’; *частковыя эквіваленты* (маюць тоесную семантыку, аднолькавую структурна-граматычную арганізацыю і пэўныя разыходжанні ў кампанентным складзе (наяўнасць аднаго адрознага лексічнага кампанента падобнай паняційнай семантыкі або варыянтных кампанентаў): бел. *вешаць сабак* на каго, каму (*навешаць сабак* на каго, каму) – руск. *вешать собак на шею* кому ‘нагаворваць, паклёпнічаць на каго-н., беспадстаўна абвінавачваць у чым-н.’, што звязана з ужываннем слова *сабака* ў значэнні “лопух” (вешаць лопух на каго-небудзь, паводле забабонных уяўленняў, азначала наслаць на гэтага чалавека сурокі, папярэдне “загаварыўшы” такую “сабаку”) [15, с. 665];

7) ‘гаварыць недарэчнае, бязглуздае’ – *частковыя эквіваленты*: бел. *круціць вала <за хвост>* 1) ‘бязмэтна праводзіць час’; 2) ‘гаварыць што-н. недарэчнае, бязглуздае’ (у 2 знач.) – руск. *вертеть вола* ‘гаварыць бязглуздзіцу, лухту’; *поўныя аналагі*: бел. *выкідаць/выкідваць конікі* (*выкінуць конікі*) ‘рабіць ці гаварыць што-н. недарэчнае, нечаканае’, *брахаць на сабак* навучыцца/навучыць ‘гаварыць недарэчнае, неразумнае’ – руск. *вертеть вола*;

8) ‘ліслівіць’ – руск. *прикидываться лисой* (*прикинуться лисой*) ‘лашчыцца з карыслівай мэтай; ліслівіць’, *извиваться ужом* перед кем 1) ‘дагаджаць, паддобрывацца, ліслівіць’; 2) ‘хітрыць, выкручвацца, спрабуючы апраўдаць сябе’ (у 1 знач.);

9) ‘хваліцца’ – *поўныя эквіваленты*: бел. *распускаць <павіны> хвост* ‘залішне хваліцца якімі-н. поспехамі, дасягненнямі і пад.’ – руск. *распускать павлиний хвост* (*распустить павлиний хвост*) ‘красуючыся, старацца зрабіць уражанне на каго-н.’, якія тлумачацца ўяўленнямі пра паўліна як важную, ганарлівую і самаўлюбёную птушку;

10) ‘хітрыць’: а) ‘хітрыць, выкручвацца’ – *поўныя эквіваленты*: бел. *звівацца вужам (-ом)* ‘хітрыць, спрытна выкручвацца’ – руск. *извиваться ужом* перед кем 1) ‘дагаджаць, паддобрывацца, ліслівіць’; 2) ‘хітрыць, выкручвацца, спрабуючы апраўдаць сябе’ (у 2 знач.); бел. ведаць, *дзе ракі зімуюць* ‘(ведаць) як паступіць найлепш, больш выгадна (пра хітрасць, спрыт і пад.)’ – руск. знать, *где раки зимуют* ‘будучы хітрым, разумным, вопытным, ведаць, як паступіць найлепшым чынам, выгадна і ўдачна’; *поўныя аналагі*: бел. *звівацца вужам (-ом)* – англ. *play (the) fox* (дасл. – гуляць у лісу) ‘хітрыць, прыкідвацца’; руск. *извиваться ужом* перед кем (у 2 знач.) – англ. *play (the) fox*; *частковыя аналагі* (маюць тоесную або блізкую семантыку, розную структурна-граматычную арганізацыю, розны або суадносны ў адной лексеме кампанентны склад): бел. ведаць, *дзе ракі зімуюць* – руск. *извиваться ужом* перед кем (у 2 знач.); бел. ведаць, *дзе ракі зімуюць* – англ. *play (the) fox*; руск. знать, *где раки зимуют* – англ. *play (the) fox* б) ‘хітрыць з мэтай падмануць каго-н.’ – *поўныя эквіваленты*: бел. *гуляць у ката і мышку/у кошкі-мышкі* ‘хітраваць, стараючыся падмануць каго-н.’, *пагуляць у ката і мышку/у кошкі-мышкі* ‘схітраваць, стараючыся падмануць каго-н.’ – руск. *играть в кошки-мышки* с кем ‘хітрыць, імкнучыся ашукаць каго-н.’ – англ. *play cat and mouse with smb.* (дасл. – гуляць у ката і мышку з кім-н.) ‘хітраваць, стараючыся падмануць каго-н.’;

поўныя аналагі: бел. *гульня ў ката і мышку (у кошкі-мышкі)* ‘хітрасць, імкненне падмануць каго-н.’ – руск. *играть в кошки-мышки* с кем; бел. *гульня ў ката і мышку (у кошкі-мышкі)* – англ. *play cat and mouse with smb.*;

11) ‘перабольшваць, прыхарошваць’ – *поўныя эквіваленты*: бел. *рабіць з мухі слана (зрабіць з мухі слана)* ‘беспадстаўна перабольшваць што-н., надаваць чаму-н. нязначнаму вялікае значэнне’ – руск. *делать из мухи слона* ‘надаваць чаму-н. нязначнаму, малаважнаму вялікае значэнне’; *поўныя аналагі*: бел. *рабіць з камара каня (зрабіць з камара каня)* – руск. *делать из мухи слона* ‘надаваць чаму-н. нязначнаму, малаважнаму вялікае значэнне’ – англ. *turn geese into swans* (дасл. – ператвараць гусей у лебядзей) ‘прыхарошваць, перабольшваць’; *частковыя аналагі*: бел. *рабіць з камара каня (зрабіць з камара каня)*, *рабіць з мухі слана (зрабіць з мухі слана)* – англ. *all one’s geese are swans* (дасл. – усе гусі – лебедзі) ‘ён/яна і г.д. усё прыхарошвае, перабольшвае’; руск. *делать из мухи слона* – англ. *all one’s geese are swans*.

Як бачым, мадэль “рабіць з якой-н. маленькай жывёлы якую-н. вялікую жывёлу” ў трох мовах канкрэтызуецца рознымі заонімамі. Агульнай антанімічнай парай для ФА беларускай і рускай моў выступае пара *муха – слон*. Нацыянальнай спецыфікай беларускага варыянта ФА з’яўляецца супрацьпастаўленне камара каню, англійскага – гусей лебедзям.

ФСГ ‘актыўная мана’ і яе ФСПГ прадстаўлены ў табліцы № 1.

Табліца № 1

ФСГ ‘актыўная мана’				
№	ФСПГ	Колькасць ФА		
		беларуская мова	руская мова	англійская мова
1	‘глупства, бязглуздзіца’	1	2	2
2	‘намінацыя хітрасці’	–	–	2
3	‘безгрунтоўнае абяцанне’	–	–	1
4	‘крывадушша, крывадушнічаць’	2	1	–
5	‘ашуканства, ашукваць’	1	2	3
6	‘нагаворваць, паклёпнічаць’	1	2	–
7	‘гаварыць недарэчнае, бязглуздае’	3	1	–
8	‘ліслівіць’	–	2	–
9	‘хваліцца’	1	1	–
10	‘хітрыць’: а) ‘хітрыць, выкручвацца’ б) ‘хітрыць з мэтай падмануць каго-н.’	 2 3	 2 1	 1 1
11	‘перабольшваць, прыхарошваць’	2	1	2
	Усяго ФА:	16	15	12

У другую ФСГ ‘пасіўная мана’ ўваходзяць ФА англійскай мовы, у якіх знайшлі адлюстраванне спосабы ўтойвання інфармацыі. Яе складаюць чатыры ФСПГ:

1) ‘прытварацца’ – *play (the) fox* (дасл. – гуляць у лісу) ‘хітрыць, прыкідвацца’, *play possum* (дасл. – прыкідвацца апосумам) 1) ‘прытварацца хворым або мёртвым (у выпадку небяспекі апосум прытвараецца мёртвым)’; 2) ‘прыкідвацца недасведчаным або някемлівым’;

2) ‘маскіраваць сапраўдную мэту’ – *shoot at a pigeon and kill a crow* (дасл. – страляць у голуба і забіць варону) ‘маскіраваць сваю сапраўдную мэту’;

3) ‘весці двайную гульню’ – *run with the hare and hunt with the hounds* / *hold with the hare and run with the hounds* (дасл. – бегчы з зайцам і паляваць на яго з сабакамі / трымаць зайца і бегчы з сабакамі) ‘служыць і нашым і вашым, весці двайную гульню’;

4) ‘адцягваць увагу’ – *throw out a tub to the whale* (дасл. – кінуць кадушку кіту) ‘адцягваць ад сябе ўвагу (звыч. небяспечнага праціўніка)’; *drag/draw a red herring/red-herring*

across the path/track/trail (дасл. – валачыць па дарозе вэнджаны селядзец) ‘наўмысна ўводзіць ў зман; адцягваць увагу ад пытання, якое абмяркоўваецца; збіваць з панталыку’. “Літаральнаму” значэнню апошняй ФА адпавядае наступная прататыпная сітуацыя: каб стварыць фальшывы след пры трэніроўцы паляўнічых сабак, па дарозе валачылі вэнджаны селядзец.

ФСГ ‘пасіўная мана’ і яе ФСПГ прадстаўлены ў табліцы № 2.

Табліца № 2

ФСГ ‘пасіўная мана’				
№	ФСПГ	Колькасць ФА		
		беларуская мова	руская мова	англійская мова
1	‘прытвараццa’	–	–	2
2	‘маскіраваць сапраўдную мэту’	–	–	1
3	‘весці двайную гульню’	–	–	1
4	‘адцягваць увагу’	–	–	2
Усяго ФА:		–	–	6

Трэцяя ФСГ ‘суб’ект увядзення ў зман’ аб’ядноўвае ФА, якія называюць і характарызуюць суб’ект увядзення ў зман. Яна складаецца з чатырох ФСПГ:

1) ‘сукупнасць небяспечных людзей’ – *поўныя эквіваленты*: бел. *асінае гняздо* ‘прыстанішча, зборышча небяспечных, шкодных людзей’ – руск. *осиное гнездо* ‘пра жыллё, зборышча шкодных, небяспечных для грамадства людзей’; *частковыя эквіваленты*: бел. *асінае гняздо* – англ. *a hornet’s nest* / *a nest of hornets* (дасл. – шэршневае гняздо) ‘тое, што хавае небяспеку’; руск. *осиное гнездо* – англ. *a hornet’s nest* / *a nest of hornets*;

2) ‘чыноўнік (бюракрат, фармаліст)’ – *частковыя эквіваленты*: бел. *канторскі пацук* ‘канцылярскі чыноўнік, бяздушны бюракрат, фармаліст’ – руск. *канцелярская/чернильная крыса* кто 1) ‘чынуша, бюракрат, фармаліст’; 2) ‘служачы установы, які мае справу з паперамі і г.д.’ (у 1 знач.). Вобраз ФА суадносіцца з зааморфным кодам культуры, згодна з якім пацук з’яўляецца істотай непрыемнай да агіды, подлай, мелка эгаістычнай і злоснай [4, с. 326];

3) ‘хітрун, праныра’ – *поўныя эквіваленты*: руск. *старый лис* кто ‘хітры чалавек’, *старая лиса*/*лисица* кто ‘хітры чалавек’ – англ. *an old fox* (дасл. – старая ліса) ‘хітрун’; руск. хитрый *как лиса* кто ‘вельмі хітры, пранырлівы, спрытны чалавек’ – англ. *(as) cunning (sly) as a fox* ‘хітры’; *поўныя аналагі*: бел. *падшыты лісіцай* ‘вельмі хітры і лжывы (пра чалавека)’, *з-пад сучкі яйцо/яйка ўкрадзе* ‘вельмі хітры, пранырлівы, здольны зрабіць нечаканае ці, здавалася б, немагчымае’, *ласкавае/ліслівае цяля/цялятка* ‘спрытны, дагодлівы чалавек, які ўмее пакарыстацца абставінамі’ – руск. *старый лис* кто, *старая лиса*/*лисица* кто, *лиса Патрикеевна* ‘хітры, пранырлівы чалавек; праныра, ліслівец’, *лисий хвост* ‘хітры, крывадушны чалавек’, *гусь лапчатый* ‘прайдзісвет, махляр; хітры, пранырлівы чалавек’ – англ. *a downy bird* (дасл. – хітрая птушка) ‘хітрун, хітрая шэльма’, *a sly dog* ‘скрытны чалавек, хітрун’ (звыч. пра чалавека, які ўтойвае свае грашкі); руск. хитрый *как лиса* кто ‘вельмі хітры’ – англ. *(as) tricky as a monkey* ‘свавольны; хітры; шкодны’, *(as) slippery as an eel* (дасл. – слізкі як вугор) ‘выкрутлівы, спрытны’; *частковыя аналагі*: бел. *падшыты лісіцай*, *з-пад сучкі яйцо/яйка ўкрадзе*, *ласкавае/ліслівае цяля/цялятка*, *дабры бабры (дабёр бабёр)* ‘хітры, выкрутлівы чалавек’ – руск. хитрый *как лиса* кто; бел. *дабры бабры (дабёр бабёр)* – руск. *старый лис* кто, *лисий хвост*, *лиса Патрикеевна*, *гусь лапчатый*; бел. *дабры бабры (дабёр бабёр)* – англ. *an old fox*, *a downy bird*, *a sly dog*, *(as) cunning (sly) as a fox*, *(as) tricky as a monkey*, *(as) slippery as an eel*; бел. *падшыты лісіцай*, *з-пад сучкі яйцо/яйка ўкрадзе*, *ласкавае/ліслівае цяля/цялятка* – англ. *(as) cunning (sly) as a fox*, *(as) tricky as a monkey*, *(as) slippery as an eel*; руск. *старый лис* кто, *старая лиса*/*лисица* кто, *лиса Патрикеевна*, *лисий хвост*, *гусь лапчатый* – англ. *(as) cunning (sly) as a fox*, *(as) tricky as a monkey*, *(as) slippery as an eel*;

4) ‘ашуканец, нягоднік, крывадушнік’ – *поўныя эквіваленты*: бел. *гад*/*змей падкалодны* ‘агідны, шкодны, каварны чалавек, які дзейнічае спадцішка (пра мужчыну)’ – руск. *змея подколодная* ‘злосны, крайне каварны, агідны чалавек’; бел. *воўк у авечай шкуры/скуры*

‘каварны, крывадушны чалавек’ – руск. *волк в овчьей/овечьей шкуре* ‘чалавек, які ўтойвае свае благія дзеянні маскай дабрачыннасці, крывадушнік’, што тлумачыцца агульным паходжаннем з Бібліі; *частковыя эквіваленты*: бел. *воўк у авечай шкуры/скуры* – англ. *a wolf in sheep’s clothing* (дасл. – воўк у авечым адзенні) ‘чалавек, які здаецца дружалюбным або бяскрыўдным, але на самай справе з’яўляецца ворагам’ [25, с. 1549]; руск. *волк в овчьей шкуре* (*волк в овечьей шкуре*) – англ. *a wolf in sheep’s clothing*; *поўныя аналагі*: бел. *гад/змей падкалодны*, *гад паласаты* / *гад паўзучы* / *гад печаны* ‘вылюдак, нягоднік, агідны, шкодны, каварны чалавек (пра мужчыну)’, *траянскі конь* (у 2 знач.), *воўк у авечай шкуры/скуры* – руск. *змий-искуситель* ‘пра каварнага, небяспечнага чалавека’, *колорадский жук* ‘пра крывадушнага, хітрага, каварнага чалавека’ – англ. *a snake in the grass* ‘тайны вораг’; бел. *гад паласаты* / *гад паўзучы* / *гад печаны*, *траянскі конь* (у 2 знач.), *воўк у авечай шкуры/скуры* – руск. *змея подколодная*; руск. *змея подколодная*, *колорадский жук* – англ. *a snake in the grass*, *a wolf in sheep’s clothing*.

Уяўленне аб змяі як істоце нячыстай і варожай, на думку А.У. Гура, абавязана біблейска-хрысціянскай традыцыі, якая разглядае змяю як увасабленне д’ябла [7, с. 280].

ФА англійскай мовы *a snake in the grass* (дасл. – змяя ў траве) узыходзіць да цытаты з “Энеіды” Вергілія *latet anguis in herba* (*a snake lurks in the grass* – дасл. змяя таіцца ў траве) [27, с. 304]. Вобраз ФА звязаны з уяўленнем аб змяі, якая схавалася, прытаілася, і таму асабліва небяспечная.

Як відаць, усе тры народы атаясамліваюць хітрага чалавека з вобразамі лісы/ліса, ката і мышкі, дадаткова беларусы і рускія – з вужом, беларусы – з бабром, рускія – з гуссю, англічане – з птушкай, сабакам, малпай і апосумам.

Параўнанне хітрага чалавека з лісою невыпадковае: у пошуках здабычы ліса праяўляе надзвычайную хітрасць. Так, напрыклад, падчас лоўлі птушак ліса, прыкінуўшыся мёртвай, выцягваецца на траве, а калі птушкі злятаюцца да яе, яна спрытна ўчэпліваецца ў іх [5, с. 296].

З вышэйпералічаных ФА цікавасць выклікаюць дзве ФА рускай мовы: *лиса Патрикеевна* і *гусь лапчатый*.

У ФА *лиса Патрикеевна* згадваецца імя канкрэтнай гістарычнай асобы – літоўскага князя Патрыкія Нарымантавіча, што стварае пэўны падтэкст, калі ўзгадаць той факт, што князь каварна і хітра пасеяў узаемны недавер і варожасць паміж жыхарамі Ноўгарада [19, с. 130].

ФА *гусь лапчатый* узыходзіць да тэксту замовы *с гуся вода, а с тебя, дитятко, вся худоба*, а асацыяцыя гусь ‘махляр, прайдзісвет’ з’явілася пад уплывам звароту *как с гуся вода* і была звязана з уяўленнямі, што замоўленаму чалавеку не страшныя хваробы і няўдачы [2, с. 142].

ФСГ ‘суб’ект увядзення ў зман’ і яе ФСПГ прадстаўлены ў табліцы № 3.

Табліца № 3

ФСГ ‘суб’ект увядзення ў зман’				
№	ФСПГ	Колькасць ФА		
		беларуская мова	руская мова	англійская мова
1	‘сукупнасць небяспечных людзей’	1	1	1
2	‘чыноўнік (бюракрат, фармаліст)’	1	1	–
3	‘хітрун, праныра’	4	6	6
4	‘ашуканец, нягоднік, крывадушнік’	6	4	2
	Усяго ФА:	11	12	9

Чацвёртая ФСГ ‘аб’ект увядзення ў зман’ уключае ФА, якія называюць і характарызуюць аб’ект увядзення ў зман. Яна складаецца з чатырох ФСПГ:

1) ‘якасная характарыстыка аб’екта’ – *поўныя эквіваленты*: бел. *дойная карова* ‘крыніца матэрыяльных даброт, якой можна несумленна карыстацца ў асабістых мэтах’ – руск. *дойная корова* ‘крыніца матэрыяльных даброт, якімі хто-н. карыстаецца ў асабістых мэ-

тах, не ведаючы меры’ – англ. *a milch/milking cow* (дасл. – малочная карова) ‘нязменная крыніца даходу, абагачэння’; *безэквівалентная*: англ. *plucked pigeon* (дасл. – ашчыпаны голуб) ‘ашуканы прастак’;

2) ‘самападман’ – англ. *a fly on the (coach-)wheel* (дасл. – муха на коле) ‘чалавек, які моцна перабольшвае сваё значэнне, уплыў або ўдзел у якой-н. справе’ (з байкі Лафантэна “Дыліжанс і муха”, у аснову якой была пакладзена байка Эзопа [3, с. 288]); *ostrich policy* (дасл. – страусавая палітыка) ‘палітыка, заснаваная на самападмане’;

3) ‘даць сябе ўвесці ў зман’ – *поўныя аналагі*: бел. *пазнацца на фарбаваных лісах* ‘адчуць, зведаць на ўласным вопыце чые-н. хітрыкі, падман’ – англ. *rise to the fly* (дасл. – падняцца да мухі) ‘клюнуць, папасціся на вуду’, *swallow a gudgeon* (дасл. – праглынуць пячкура) ‘даць сябе ашукаць, перахітрыць, правесці; папасціся на вуду’;

4) ‘не даць сябе ўвесці ў зман’ – *частковыя эквіваленты*: бел. *на крывой кабыле/казе не аб’едзеш* каго ‘не ашукаеш, не перахітрыш’ – руск. *на козе не объедешь* кого (*объехать на козе* кого) / *на вороных не объедешь* / *на саврасой не объедешь* кого ‘не перахітрыш, не правядзеш, не падманеш’ [22]; *частковыя аналагі*: бел. *на крывой кабыле/казе не аб’едзеш* каго – англ. *there are no flies on* 1) ‘яго не ашукаеш, ён напагатове; ён не дурань’; 2) ‘ён поўны энергіі, бадзёрасці’; 3) ‘ён абсалютна бездакорны чалавек; надзвычай добрай якасці’ (у 1 знач.); руск. *на козе не объедешь* кого (*объехать на козе* кого) / *на вороных не объедешь* / *на саврасой не объедешь* кого – англ. *there are no flies on* (у 1 знач.); *безэквівалентная*: англ. *smell a rat* (дасл. – чуць пацука) ‘чуць нядобрае, падазраваць несумленную гульню’.

ФСГ ‘аб’ект увядзення ў зман’ і яе ФСПГ прадстаўлены ў табліцы № 4.

Табліца № 4

ФСГ ‘аб’ект увядзення ў зман’				
№	ФСПГ	Колькасць ФА		
		беларуская мова	руская мова	англійская мова
1	‘якасная характарыстыка аб’екта’	1	1	2
2	‘самападман’	–	–	2
3	‘даць сябе ўвесці ў зман’	1	–	2
4	‘не даць сябе ўвесці ў зман’	1	3	2
	Усяго ФА:	2	3	7

Пятую групу ўтвараюць ФА, якія называюць і характарызуюць атрыбуты (сродкі) увядзення ў зман. У ёй выдзяляюцца *поўныя эквіваленты*: бел. *падсадная качка* ‘тайны агент, правакатар’ – руск. *подсадная утка* ‘падасланы правакатар’ – англ. *a decoy duck* (дасл. – падсадная качка) ‘прынада, пастка’; *частковыя эквіваленты*: бел. *падсадная качка* – англ. *a stool pigeon* (дасл. – падсадны голуб) ‘шпік, правакатар, паведамляльнік’; руск. *подсадная утка* – англ. *a stool pigeon*; бел. *птушынае малако* 1) ‘птушкамлечнік – цыбулевая расліна з бязлістым сцяблом (кветкавай стрэлкай) і прыкаранёвым лісцем’; 2) ‘нешта неверагоднае, казачнае, яўна немагчымае (часцей пра ежу)’; 3) ‘вельмі смачны торт, а таксама цукеркі асобага гатунку’ (у 2 знач.) – англ. *pigeon’s milk* (дасл. – галубінае малако) ‘нешта неіснуючае (звыч. уяўны прадмет, за якім пасылаюць з мэтай абдурыць каго-н.)’; *поўныя аналагі*: бел. *падсадная качка* – англ. *a red herring (across the trail)* ‘тое, што збівае са следу, знарок адцягвае ўвагу; манеўр, які абстрагуе (адцягвае)’; руск. *подсадная утка* – англ.; *a red herring (across the trail)*; *поўныя аналагі*: бел. *ход канём* ‘спрытны, абходны манеўр, разлічаны на поспех у чым-н.’ – руск. *делать ход конём (сделать ход конём)* ‘скарыстоўваць хітры і эфектыўны прыём для дасягнення якой-н. мэты’; *частковыя аналагі*: бел. *падсадная качка* – англ. *like a carrot to a donkey* (дасл. – як морква для асла) ‘спакуслівая прынада’; руск. *подсадная утка* – англ. *like a carrot to a donkey*.

ФСГ ‘атрыбуты (сродкі) увядзення ў зман’ і яе ФСПГ прадстаўлены ў табліцы № 5.

Табліца № 5

ФСГ ‘атрыбуты (сродкі) увядзення ў зман’			
Усяго ФА:	Колькасць ФА		
	беларуская мова	руская мова	англійская мова
	3	2	5

ФСМП “увядзенне ў зман” у трох мовах складаецца з рознай колькасці ФСГ, а ў межах іх – з рознай колькасці ФСПГ (гл. табл. № 6).

Табліца № 6

ФСМП ‘увядзенне ў зман’		
Беларуская мова		
№	ФСГ / ФСПГ	Колькасць ФА
I	**‘Актыўная мана’**	16
1	‘глупства, бязглуздзіца’	1
2	‘крывадушша, крывадушнічаць’	2
3	‘ашуканства, ашукваць’	1
4	‘нагаворваць, паклёпнічаць’	1
5	‘гаварыць недарэчнае, бязглуздае’	3
6	‘хваліцца’	1
7	‘хітрыць’ а) ‘хітрыць, выкручвацца’ б) ‘хітрыць з мэтай падмануць каго-н.’	 2 3
8	‘перабольшваць, прыхарошваць’	2
II	**‘Суб’ект увядзення ў зман’**	11
1	‘сукупнасць небяспечных людзей’	1
2	‘чыноўнік (бюракрат, фармаліст)’	1
3	‘хітрун (праныра)’	3
4	‘ашуканец (нягоднік, крывадушнік)’	5
III	**‘Аб’ект увядзення ў зман’**	3
1	‘якасная характарыстыка аб’екта’	1
2	‘даць сябе ўвесці ў зман’	1
3	‘не даць сябе ўвесці ў зман’	1
IV	**‘Атрыбуты (сродкі) увядзення ў зман’**	3
	Усяго ФА:	33
Руская мова		
№	ФСГ / ФСПГ	Колькасць ФА
I	**‘Актыўная мана’**	15
1	‘глупства, бязглуздзіца’	2
2	‘крывадушша, крывадушнічаць’	1
3	‘ашуканства, ашукваць’	2
4	‘нагаворваць, паклёпнічаць’	2
5	‘гаварыць недарэчнае, бязглуздае’	1
6	‘ліслівіць’	2
7	‘хваліцца’	1
8	‘хітрыць’ а) ‘хітрыць, выкручвацца’ б) ‘хітрыць з мэтай падмануць каго-н.’	 2 1
9	‘перабольшваць, прыхарошваць’	1
II	**‘Суб’ект увядзення ў зман’**	12
1	‘сукупнасць небяспечных людзей’	1
2	‘чыноўнік (бюракрат, фармаліст)’	1

3	‘хітрун (праныра)’	6
4	‘ашуканец (нягоднік, крывадушнік)’	4
III	**‘Аб’ект увядзення ў зман’**	4
1	‘якасная характарыстыка аб’екта’	1
2	‘не даць сябе ўвесці ў зман’	3
IV	**‘Атрыбуты (сродкі) увядзення ў зман’**	2
	Усяго ФА:	32
	Англійская мова	
№	ФСГ / ФСПГ	Колькасць ФА
I	**‘Актыўная мана’**	12
1	‘глупства, бязглуздзіца’	2
2	‘намінацыя хітрасці’	2
3	‘безгрунтоўнае абяцанне’	1
4	‘ашуканства, ашукваць’	3
5	‘хітрыць’ а) ‘хітрыць, выкручвацца’ б) ‘хітрыць з мэтай падмануць каго-н.’	 1 1
6	‘перабольшваць, прыхарошваць’	2
II	**‘Пасіўная мана’**	6
1	‘прытварацца’	2
2	‘маскіраваць сапраўдную мэту’	1
3	‘весці двайную гульню’	1
4	‘адцягваць увагу’	2
III	**‘Суб’ект увядзення ў зман’**	9
1	‘сукупнасць небяспечных людзей’	1
2	‘хітрун, праныра’	6
3	‘ашуканец, нягоднік, крывадушнік’	2
IV	**‘Аб’ект увядзення ў зман’**	8
1	‘якасная характарыстыка аб’екта’	2
2	‘самападман’	2
3	‘даць сябе ўвесці ў зман’	2
4	‘не даць сябе ўвесці ў зман’	2
V	**‘Атрыбуты (сродкі) увядзення ў зман’**	5
	Усяго ФА:	40

Як відаць, ФА беларускай, рускай і англійскай моў, якія аб’ектывуюць канцэпт “увядзенне ў зман”, выяўляюць вялікае падабенства паводле семантычнай структуры. Самай вялікай колькасцю ФСГ характарызуецца ФСМП “увядзенне ў зман” у англійскай мове. Адрозненні выяўляюцца ў адносінах колькасці ФА аднолькавых ФСГ і ФСПГ. Самай колькаснай групай у трох мовах з’яўляецца ФСГ ‘актыўная мана’ (16 ФА ў беларускай мове, 15 – у рускай і 12 – у англійскай), што можна кваліфікаваць як адмоўнае стаўленне да такой з’явы ў беларусаў, рускіх і англічан. Выдзяляюцца ФСГ і ФСПГ, уласцівыя толькі адной мове. Так, ФСГ ‘пасіўная мана’ складаюць ФА толькі англійскай мовы. У складзе ФСГ ‘актыўная мана’ толькі беларускай і рускай мовам уласціва ФСПГ ‘гаварыць недарэчнае, бязглуздае’, толькі рускай – ‘ліслівіць’, толькі англійскай – ‘намінацыя хітрасці’ і г.д.

Такім чынам, ФСМП “увядзенне ў зман” прадстаўлена значнай колькасцю ФА ў кожнай з аналізаваных моў, з якіх выдзяляюцца ўніверсальныя стэрэатыпныя вобразы ў светаўспрыманні трох народаў, якімі з’яўляюцца *ліса*, *кот/кошка* (хітрасць), *змяя* (каварства), *воўк* (крывадушша), што тлумачыцца агульнай крыніцай паходжання, агульным вопытам, які выцякае з супадзення сацыяльна-гістарычных умоў развіцця народаў, універсальнасцю зыходных для фразеалагізацыі сітуацый. Адрозненні назіраюцца паміж трыма народамі і ў межах

пэўных двух народаў, што сведчыць пра самабытнасць вобразнага мыслення носьбітаў беларускай, рускай і англійскай моў.

Літаратура

1. Ахманова, О.С. Словарь лингвистических терминов / О.С. Ахманова. – М. : Едиториал УРСС, 2004. – 569 с.

2. Бирих, А.К. Словарь русской фразеологии. Историко-этимологический справочник / А.К. Бирих, В.М. Мокиенко, Л.И. Степанова. – СПб. : Фолио-Пресс, 1998. – 704 с.

3. Большой англо-русский фразеологический словарь: Около 20 000 фразеологических единиц / А.В. Кунин. – 5-е изд. – М. : Живой язык, 1998. – 944 с.

4. Большой фразеологический словарь русского языка: Значение. Употребление. Культурологический комментарий / Отв. ред. В.Н. Телия. – М. : АСТ-ПРЕСС КНИГА, 2006. – 784 с.

5. Брэм, А.Э. Жизнь животных : в 3 т. / А.Э. Брэм. – М. : ТЕРРА, 1991. – 524 с. – Т. 1. Млекопитающие.

6. Гриценко, Г.В. Фразео-семантическое поле “Введение в заблуждение”: когнитивный аспект (на материале русского языка) : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.01; Барнаул, 2009. – 20 с.

7. Гура, А.В. Символика животных в славянской народной традиции / А.В. Гура. – М. : Индрик, 1997. – 912 с.

8. Жуков, В.П. Семантика фразеологических оборотов: Учеб. пособие для студ. пед. ин-тов по спец. “Рус. яз. и лит-ра” / В.П. Жуков. – М. : Просвещение, 1978. – 160 с.

9. Карасик, В.И. Концепт как индикатор эпохи (“очковтирательство”) / В.И. Карасик // Политическая лингвистика. – Вып. 4. – Екатеринбург, 2009. – С. 9–13 // http://www.philology.ru/linguistics2/karasik-09.htm.

10. Кириллова, Н.Н. Сопоставительная фразеология романских языков / Н.Н. Кириллова. – Л. : ЛГПИ, 1986. – 81 с.

11. Кошелев, А.Д. К описанию универсального концепта ‘обман – обмануть’ // Логический анализ языка. Между ложью и фантазией / Отв. ред. Н.Д. Арутюнова. – М. : Индрик, 2008. – С. 118–133.

12. Кунин, А.В. Основные понятия английской фразеологии как лингвистической дисциплины и создание англо-русского фразеологического словаря. – дис. д-ра филол. наук : 10.02.02 / А.В. Кунин. – М., 1964. – 1229 с.

13. Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў : у 2 т. / І.Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 2008. – 2 т.

14. Ляшчынская, В.А. Адлюстраванне канцэпту “ашуканства” ў фразеалагізмах беларускай мовы / В.А. Ляшчынская // Беларуская фразеалогія і еўрапейскі моўны кантэкст : зб. навук. арт. : у 2 т. – Т. 1 / Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна, Каф. гісторыі беларус. мовы і дыялекталогіі; рэдкал.: М.М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст : Альтернатива, 2009. – С. 25–30.

15. Мелерович, А.М. Фразеологизмы в русской речи. Словарь: около 1000 единиц / А.М. Мелерович, В.М. Мокиенко. – М. : Русские словари, Астрель, 2001. – 856 с.

16. Панченко, Н.Н. Средства объективации концепта “обман” : на материале английского и русского языков : дис. …канд. филол. наук : 10.02.20 / Н.Н. Панченко. – Волгоград, 1999. – 236 с.

17. Полевые структуры в системе языка / Научн. ред. З.Д. Попова. – Воронеж : Изд-во Воронежского ун-та, 1989. – 198 с.

18. Ройзензон, Л.И. Современные аспекты изучения фразеологии / Л.И. Ройзензон, Ю.Ю. Авалиани // Проблемы фразеологии и задачи её изучения в высшей и средней школе. – Вологда : Северо-Западное книжное издательство, 1967. – С. 68–81.

19. Рогалев, А.Ф. Об исторической подоснове фразеологизма лиса Патрикеевна / А.Ф. Рогалев // Славянская фразеология в ареальном, историческом и этнокультурном аспектах: Материалы III Международной научной конференции / Отв. ред. В.И. Коваль. – Гомель : УО “ГГУ им. Ф. Скорины”, 2003. – С. 127–131.

20. Федюнина, И.Э. Концепт “обман” в русской, английской и немецкой языковых картинах мира, репрезентируемых фразеологизмами : дис. … канд. филол. наук : 10.02.19 / И.Э. Федюнина. – Белгород, 2009. – 207 с.

21. Фразеологический словарь русского литературного языка / сост.: А.И. Фёдоров. – М. : ООО “Фирма Издательство АСТ”, 2001. – 720 с.

22. Фразеологический словарь русского языка. Свыше 4000 словарных статей / Под ред. А.И. Молоткова. – 2-е изд. – М. : Сов. Энциклопедия, 1968. – 543 с.

23. Шаховский, В.И. Национально-культурная специфика концепта “обман” во фразеологическом аспекте / В.И. Шаховский, Н.Н. Панченко // Фразеология в контексте культуры. – М., 1999. – С. 285–288.

24. Cock-and-bull story [Electronic resource] / Cock-and-bull story. – Mode of access : http://wisegeek.com/what-is-a-cock-n-bull-story.htm. – Date of access : 15.08.2010.

25. Hornby, A.S. Oxford Advanced Learner’s Dictionary of Current English / Ed. by Sally Wehmeier. – Great Britain : Oxford University Press. – 2000. – 1600 p.

26. Irish bull [Electronic resource] / Irish bull. – Mode of access : http://en.wikipedia.org/wiki/Irish_bull. – Date of access : 15.08.2010.

27. Longman dictionary of English idioms. – Great Britain : the Pitman Press, Bath. – 1980. – 387 p.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 81.3

Лексические трансформации при переводе повести В. Короткевича “Дикая охота короля Стаха” с белорусского языка на английский

О. А. Дегтярёва

Проблема лексических трансформаций представляет особый интерес при функционально-типологическом исследовании переводных произведений. В статье представлен обзор наиболее употребляемых лексических трансформаций, приведены их описание, примеры использования при переводе повести В. Короткевича “Дикая охота короля Стаха” с белорусского языка на английский.
Ключевые слова: художественная литература, переводческие трансформации, лексические трансформации, языковая единица, лексическая единица, функционально-типологический анализ.

The problem of lexical transformations in translation is of great interest for functional- typological research of translated works of literature. The paper presents a brief outline of the topic illustrated with the examples taken from the story “King Stakh`s Wild Hunt” by Uladzimir Karatkevich.
Keywords: fiction, transformations in translation, lexical transformations, a unit of language, a lexical unit, function-typological analysis.

Художественное произведение относится к разряду текстов, которые всегда имеют ярко выраженный национальный характер, и каждый язык обладает своеобразными, присущими только ему, средствами выразительности. В связи с этим перевод художественных текстов представляет собой довольно сложную проблему: в художественной литературе как особом типе словесного искусства используются образы в широком смысле слова, которые создаются писателем самыми разнообразными языковыми средствами. Поэтому переводчику необходимо особенно тщательно взвешивать все детали, из которых складывается художественное впечатление, чтобы в переводе не лишить произведение его яркости, красочности и индивидуальных особенностей стиля автора. Но, вместе с тем, переводчик не должен слепо копировать каждую деталь, если это идет вразрез со стилистическими нормами языка. При необходимости переводчик может заменить один прием другим, производящим равный эффект, и реализовать это представляется возможным при помощи различных переводческих трансформаций (далее ПТ).

Проблема ПТ неоднократно освещалась в научной литературе. Так В. Н. Комиссаров рассматривает переводческие (межъязыковые) трансформации как преобразования, с помощью которых можно осуществить переход от единиц оригинала к единицам перевода в указанном смысле. Поскольку ПТ осуществляются с языковыми единицами, имеющими как план содержания, так и план выражения, они носят формально-семантический характер, преобразуя как форму, так и значение исходных единиц. В рамках описания процесса перевода ПТ рассматриваются как способы перевода, которые может использовать переводчик при переводе различных оригиналов в тех случаях, когда словарное соответствие отсутствует или не может быть использовано по условиям контекста [1, с.172].

Я. И. Рецкер определяет трансформации как "приемы логического мышления, с помощью которых мы раскрываем значение иноязычного слова в контексте и находим ему русское соответствие, не совпадающее со словарным" [2, с.38].

Наиболее распространёнными видами ПТ являются лексические трансформации (далее ЛТ), применяемые при переводе в том случае, если в исходном тексте встречается нестандартная языковая единица на уровне слова, например, имя собственное, присущее исходной языковой культуре и отсутствующее в переводящем языке; термин в той или иной профессиональной области; слова, обозначающие предметы, явления и понятия, характерные для исходной культуры или для традиционного именования элементов третьей культуры, но отсутствующие или имеющие иную структурно-функциональную упорядоченность в переводящей культуре [3, с.51].

Я. И. Рецкер указывает, что не всегда можно классифицировать каждый пример перевода из-за переплетения категорий, но при этом выделяет следующие разновидности ЛТ: дифференциация, конкретизация, генерализация, смысловое развитие, антонимический перевод, целостное преобразование, компенсация потерь в процессе перевода [2, с.38].

Согласно В. Н. Комиссарову, основными типами ЛТ являются переводческое транскрибирование и транслитерация, калькирование, лексико-семантические замены (включающие конкретизацию, генерализацию, модуляцию) [1, с.172].

Из вышеизложенных положений можно сделать вывод, что проблема ЛТ весьма разнообразна в своей типологизации и не существует единого мнения относительно их классификации.

Целью данного исследования является функционально-типологический анализ ЛТ, применяемых при переводе повести Владимира Короткевича «Дзікае паляванне караля Стаха» (Uladzimir Karatkevich “King Stakh`s Wild Hunt”), произведенного Mary Mintz [4,5,6].

Анализ фактического материала позволил нам выделить следующие типы ЛТ.

1. Переводческая транскрипция – это формальное пофонемное воссоздание исходной лексической единицы с помощью фонем переводящего языка, фонетическая имитация исходного слова; **переводческая транслитерация** – формальное побуквенное воссоздание исходной лексической единицы с помощью алфавита переводящего языка, буквенная имитация формы исходного слова.

Иначе говоря, транскрипция либо транслитерация (полная или частичная) – непосредственное использование данного слова, обозначающего реалию, либо его корня в написании буквами своего языка или в сочетании с суффиксами своего языка.

Нет такого слова, которое не могло бы быть переведено на другой язык, хотя бы описательно, т.е. распространенным сочетанием слов данного языка. Но транслитерация необходима именно тогда, когда важно соблюсти лексическую краткость обозначения, соответствующего его привычности в языке подлинника, и вместе с тем подчеркнуть специфичность называемой вещи или понятия, если нет точного соответствия в языке перевода.

Особо следует выделить как переводческую проблему так называемые реалии, наименования национально-культурных объектов, характерных для исходной культуры и сравнительно мало или вовсе не известных переводящей культуре. В условиях масштабной межкультурной коммуникации такие именования составляют весьма значительную группу, и наиболее распространенным способом их передачи на другом языке является переводческая транскрипция или стандартная транслитерация.

Целесообразность и правомерность транслитерации в известных случаях доказывается тем, что нередко авторы, пишущие о жизни других народов, прибегают к этому языковому средству, как к способу назвать и подчеркнуть реалию, специфическую для быта данного народа [3, с.72]:

Мужык [4, с.14] – *muzhik* [5, с.4] – *mužyk* [6, с.3].

Часто иноязычные слова переносятся в язык перевода именно для выделения оттенка специфичности, который присущ выражаемой ими реалии – при возможности лексического перевода, более или менее точного. Когда транслитерируемое слово употребляется редко или, тем более, впервые переносится в переводной текст, бывает необходимо комментирующее пояснение и соответствующий контекст.

Приведем еще несколько примеров переводческой транскрипции и транслитерации, представленных в печатном и электронном вариантах повести: *Андрэй Беларэцкі* [4, с.13] – *Andrej Belaretzky* [5, с.3] – *Andrej Biełarecki* [6, с.50]; *Ігнась Берман-Гацэвіч* [4, с.49] – *Ignas Berman-Gatzevich* [5, с.54] - *Ihnaś Bierman-Hacevič* [6, с.50]; *Яноускі* [4, с.13] – *Yanowsky* [5, с.4]; *Іасафат Кунцэвіч* [4, с.14] – *Yasaphat Kuntzevich* [5, с.5]; *Гарадзельскі прывелей* [4, с.16] – *Gorodelski privilei* [5, с.8].

2. Калькирование

Наряду с переводческой транслитерацией для языковых единиц, не имеющих непосредственного соответствия в переводящем языке, иногда применяется калькирование – воспроизведение не звукового, а комбинаторного состава слова или словосочетания, когда составные части слова (морфемы) или фразы (лексемы) переводятся соответствующими эле-

ментами переводящего языка. Калькирование как переводческий прием послужило основой для большого числа разного рода заимствований при межкультурной коммуникации в тех случаях, когда транслитерация была почему-либо неприемлема из эстетических, смысловых или иных соображений [3, с.88].

Можа, цёплыя агні вёсак, назвы якіх дагэтуль нейкім цёплым болем уваходзяць у маё сэрца: ***Ліпічна, Сорак Татар, Бярозава Воля, урочышча Разбіты Рог, Памярэч, Дубрава, Вавёркі?*** [4, с.15] – *Perhaps it was the warm lights of the villages, and their names, which even to this very day fill my heart with warmth and a kind of pain:* ***Linden-Land, Forty Tatars, Broken Horn, Oakland, Squirrels, Clouds, Birch-Land Freedom*** [5, с.7].

В отличие от транскрипции, калькирование не всегда бывает простой механической операцией перенесения исходной формы в переводящий язык; зачастую приходится прибегать к некоторым трансформациям. В первую очередь это касается изменения падежных форм, количества слов в словосочетании, аффиксов, порядка слов, морфологического или синтаксического статуса слов и т.п.

Калькированию обычно подвергаются термины, широко употребимые слова и словосочетания: названия памятников истории и культуры, названия политический партий и движений, исторические события [3, с.90].

Калькирование нередко становится более предпочтительным способом перевода, чем транскрипция, поскольку в результате транскрипций создаются единицы, не имеющие смысла в переводящем языке (далее ПЯ), своего рода псевдослова [3, с.92].

3. Лексико-семантические замены – это способ перевода лексических единиц оригинала путем использования в переводе единиц ПЯ, значение которых не совпадает со значениями исходных единиц, но может быть выведено из них с помощью определенного типа логических преобразований. Основными видами подобных замен являются конкретизация, генерализация и модуляция (смысловое развитие) значения исходной единицы [1, с.174].

Конкретизацией называется замена слова или словосочетания иностранного языка (далее ИЯ) с более широким предметно-логическим значением словом или словосочетанием ПЯ с более узким [1, с.174].

І паўсюль я бачыў гора народнае, бачыў брудных дзяцей, бачыў сляпых жабракоў, бачыў гора народа майго, ***даражэй за які*** *– я зараз ведаю гэта – у мяне не было нічога на свеце* [4, с.16] – *And everywhere I saw blind beggars and dirty children, saw the woe of my people whom* ***I loved more than anything else*** *in the world – this I know now* [5, с.6].

Полной противоположностью конкретизации является **генерализация** – замена единицы ИЯ, имеющей более узкое значение, единицей ПЯ с более широким значением, т.е. преобразование, обратное конкретизации [1, с.176].

Необходимость генерализации может быть вызвана стилистическими нормами ПЯ, опасностью искажения смысла при переводе слова или словосочетания его словарным соответствием [2, с.44]

Ці ***мурожны*** *пах маладога сена і зоры праз* ***прадзёртую страху*** *адрыны?* [4, с.15] – *Or the* ***intoxicating*** *fragrance of the fresh hay and the stars shining through* ***the holes in the roof*** *of the hayloft* [5, с.7]

Я ***пабываў*** *і там, у мяне былі маладыя ногі і маладая прага* [4, с.16] – *There, too, I* ***went*** [5, с.6].

Следует отметить, что в процессе перевода одно и то же слово может подвергаться ЛТ в противоположных направлениях: в сторону сужения и расширения значения, т.е. может быть объектом как конкретизации, так и генерализации.

Прием модуляции или смыслового развития заключается в замене переводимой единицы на контекстуальное, логически связанное с ней слово или словосочетание [2, с.45].

В основе лежит принцип, когда упомянутая в тексте причина развивается и заменяется ее следствием (или наоборот). Иногда такой метод – единственный способ адекватно передать исходный смысл.

Сюда относятся различные метафорические и метонимические замены, производимые на основе категории скрещивания.

Если учесть, что все знаменательные части речи делятся на три категории: предметы, процессы и признаки, то в ходе перевода наблюдается поразительное разнообразие замен как

внутри каждой категории, так и между различными категориями. Для передачи одного и того же содержания средствами другого языка часто безразлично, какой формой слова будет выражено это содержание. Предмет может быть заменен его признаком, процесс предметом, признак предметом или процессом и т.д. [2, с.45].

Але мне выпала паехаць толькі ў пачатку жніўня месяца, калі не да казак і толькі цягучае наша ***«жніво»*** *гучыць над палеткамі* [4, с.17] – *But I had managed to leave only at the beginning of August, not the time for story-telling. One could hear then only* ***the drawn-out songs of harvest time*** *resounding through the fields* [5, с.9].

4. Приём целостного преобразования является определённой разновидностью смыслового развития. Идея его состоит во всеобъемлющем преобразовании как отдельных слов, так и предложения в целом. Изменения носят именно комплексный характер [2, с.53].

Тенденцией, аналогично проявляющейся и в других видах ЛТ, является использование целого перечня частотных лексических единиц, образованных языковыми контактами традиционно, результатом чего становятся различные словарные соответствия, как постоянные, так и вариантные. В наибольшей степени проявления такой тенденции встречаются в разговорном языке.

Дальбог, *я і не думаў, я не ведаю* [4, с.31] – ***Upon my word of honour****, I had nothing harmful in mind* [5, с.29]

Как мы видим из примера перевода, несмотря на то, что эта пара не имеет ни общей внутренней формы, ни схожих семантических компонентов, она вполне согласовано передаёт общее смысловое содержание, выраженное на разных языках.

5. Антонимический перевод представляет собой замену какого-либо понятия, выраженного в подлиннике, противоположным понятием в переводе с соответствующей перестройкой всего высказывания для сохранения неизменного плана содержания.

В большинстве случаев использование противоположного понятия в переводе влечет за собой замену утвердительного предложения отрицательным или отрицательного – утвердительным [2, с.48].

…– Гэта Яноўскія. Разумееце вы, Яноўскія! ***Няўжо вы не чулі****?* [4, с.26] – *They are the Yanowskys. You understand, the Yanowskys!* ***You must have heard of them****!* [5, с.22]

– Пан Беларэцкі ***яшчэ не хоча спаць****?* [4, с.33] – *Perhaps* ***you are ready for sleep now?*** [5, с.31]

6. Приём лексических добавлений

Многие элементы смысла, остающиеся в оригинале невыраженными, подразумеваемыми, должны быть выражены в переводе с помощью лексических единиц [1, с. 201].

Соответственно, для того, чтобы правильнее и понятнее передать смысл исходного материала, переводчику может потребоваться ввести несколько дополнительных слов. Причины кроются в различиях синтаксиса, грамматики, отсутствии четких лексико-семантических эквивалентов в языке перевода, а также иногда в чисто стилистических соображениях.

Іх [партрэтаў, О.Д.] *было больш за шэсцьдзесят, зусім даўніх і амаль што новых,* ***- і гэта было сумнае відовішча*** [4, с.26] – *There were about seventy of them, some ancient and some quite new –* ***and a sad sight they made*** [5, с.23]

Во всех случаях употребления лексического дополнения переводчику требуется быть более осведомленным в сфере темы исходного текста. Необходимо понимать, “что” хотел сказать автор и “почему” он сделал именно так, ведь зная это, можно перевести текст максимально адекватно и понятно.

7. Приём лексических опущений прямо противоположен добавлению и предполагает отказ от передачи в переводе семантически избыточных слов, значения которых оказываются нерелевантными или легко восстанавливаются в контексте [1, с.204] .

І толькі пасля, калі яна ***відавочна супакоілася****, сказаў…* [4, с.31] – *It was only after a while, when she* ***had calmed down*** *that I said…*[5, с.29].

8. Компенсация – это такая трансформация, которая применяется в случае, когда некоторые смысловые элементы и стилистические особенности невозможно передать достоверно. Чтобы не утратить значение полностью, в тексте перевода используются элементы

другого порядка. При этом применяться они могут вовсе не в том самом месте, где они присутствуют в оригинале [2, с.58].

Там, за лясамі, ёсць цёплыя лугі, кветкі, буслы на дрэвах. Там таксама ***галеча і забітасць****, але там людзі неяк шукаюць паратунку ад гэтага* [4, с.33] – *Over there, beyond the forests, there are warm meadows, flowers, storks in the trees, as well as* ***improverished and oppressed people****; but there the people somehow seek escape* [5, с.31]

Применение компенсации наиболее оправдано в тех случаях, когда необходимо передать именно прагматичные, внутрилингвистические значения, представляющие в оригинале значительные характерные языковые черты. К ним можно отнести характерные особенности речи, специфическую диалектную окраску, различную игру слов, каламбуры, жаргон и др., а также случаи, когда невозможно подобрать точное соответствие какому-либо элементу текста.

Обзор некоторых наиболее употребляемых ЛТ показывает, что использование их в переводе должно применяться количественно объективно, с учетом полной осведомленности в отношении обстановки действия текста.

Важной спецификой перевода на английский язык является необходимость структурного замещения или внесение дополнений в текст, как на уровне слов, так и на уровне предложений. Это требование возникает в связи с наличием в английском языке различных специфических грамматических структур и форм, огромного количества слов двоякого или неопределенного значения. Также языковое различие диктует применение ряда опущений и дополнений при переводе.

Однако мы полностью согласны с утверждением Я. И. Рецкер, что не всякий перевод является трансформацией. Преобразование единиц одного языка в единицы другого – аксиома, не требующая доказательств, но и попытка формализации процесса перевода и зашифровки его в формулы ничего не дает переводчику-практику. Перевод всегда будет не только наукой, но и искусством [7, с.84].

Литература

1. Комиссаров, В. Н. Теория перевода (лингвистические аспекты): Учебник для институтов и факультетов иностранных языков / В.Н. Комиссаров. – М.: Высшая школа, 1990. – 253с.

2. Рецкер, Я. И. Теория перевода и переводческая практика / Я. И. Рецкер. – М.: Международные отношения, 1974. – 216 с.

3. Казакова, Т. А. Теория перевода (лингвистические аспекты) / Т. А. Казакова. – СПб.: Союз, 2000. – 320 с.

4. Караткевіч, У. Дзікае паляванне караля Стаха: Аповесць; Чорны замак Альшанскі: Раман. – Для ст. шк. узросту / Прадм. А. Л. Вераб'я. – Мн.: Маст. літ., 2000. – 574 с. – (Школьная бібліятэка).

5. Karatkevich, Ul. King Stakh`s wild hunt: A story / Uladzimir Karatkevich. – Translated by Mary Mintz. – Minsk: Yunatstva Punlishers, 1989. – 270 p.

6. Karatkevich, Ul. King Stakh`s wild hunt: A story [Электронный ресурс] / Uladzimir Karatkevich. – Translated by Mary Mintz. – Minsk: Yunatstva Punlishers, 1989. – Режим доступа: http://txt.knihi.com/karatkievic/palavannie-eng.html. – Дата доступа: 13.01.2008.

7. Тетради переводчика: Вып. 17 / Под ред. проф. Л. С. Бархударова. – М.: Международные отношения, 1980. – 120 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 811.161.3’42:76.0

Тэкст навін як своеасаблівы тып дыскурсу

А. М. Ермакова

У артыкуле разглядаецца тэкст навін як своеасаблівы тып дыскурсу, суперструктурная, макра- і мікраструктурная арганізацыі якога накіраваны на рэалізацыю асноўных функцый тэксту сродкаў масавай інфармацыі: інфармаванне і ўздзеянне.
Ключавыя словы: дыскурс навін, інтэрсуб’ектыўнасць, поле суб’ектыўнай мадальнасці, семантычная макраструктура, суперструктурная арганізацыя тэкстаў.

The article considers the text of news as a special type of a discourse, which superstructural, macro- and microstructural organizations are directed on realization of the basic functions of a mass media text: informing and influence.
Keywords: news discourse, intersubjectivity, subjective modality field, semantic macrostructure, superstructural text organization.

Вывучэнне мовы сродкаў масавай інфармацыі мае вялікую сацыяльную і палітычную значнасць. Якім чынам людзі набываюць сацыяльныя веды, як фарміруюцца іх погляды, устаноўкі, як праз мову рэалізуюцца ідэалагічныя погляды? Агульнавядома, што вербальныя зносіны ўяўляюць сабой адзінства двух аспектаў – вербальнага інфармавання і вербальнага ўздзеяння. Гэтае палажэнне імпліцытна сцвярджае актыўную ролю вытворцы тэкстаў і пасіўную іх спажыўца, што не зусім адпавядае сучаснаму разуменню асаблівасцяў дыскурсу навін.

Суб’ект маўлення ў тэкстах масавай інфармацыі суіснуе разам са спажыўцом інфармацыі, рэцыпіентам. Каардыната “я” вызначае важнае для камунікатыўных актаў паняцце інтэрсуб'ектыўнасці. Адзін з важнейшых момантаў інтэрпрэтацыі выказвання – шматзначнасць “я”. Для сродкаў масавай інфармацыі характэрна імкненне растлумачыць аб'ектыўную сітуацыю нейкім суб'ектыўным чынам у залежнасці ад камунікатыўных мэтаў. Аб'ектыўны свет шляхам трансфармацыі ва ўяўленні суб'екта ацэньваецца, г.зн. суадносіцца са шматлікімі аператарамі, што стварае ў выніку псіхалагічную афарбоўку маўлення – суб'ектыўную мадальнасць. Поле суб’ектыўнай мадальнасці публіцыстычных тэкстаў утвараюць прагматычна арыентаваныя адзінкі, якія выражаюць суб’ектыўныя адносіны да свету. Зыходзячы з таго, што адна з асноўных функцый тэкстаў навін – уздзеянне, можна сцвярджаць думку аб залежнасці эфектыўнасці моўнага ўздзеяння на адрасата ад спосабаў арганізацыі маўлення, у прыватнасці, ад выражанасці ў большай ці меншай ступені катэгорыі суб’ектыўнай мадальнасці ў тэксце.

Тэксты сродкаў масавай інфармацыі аналізуюцца з пазіцый іх уласнай структурнай арганізацыі на розных узроўнях апісання. Катэгорыі марфалагічнага ўзроўню выкарыстоўваюцца для стварэння поля суб'ектыўнай мадальнасці пры ўмове іх кантэкстуальнай вобразнасці. Пры выкарыстанні адзінак лексічнага ўзроўню ў якасці прагматычных сродкаў перавага аддаецца лексемам, якія з'яўляюцца актуалізаванымі або маюць вобразную ўнутраную форму. Актуалізацыя лексічных адзінак у стылістычным кантэксце часта з'яўляецца вынікам неаднароднасці стылістычнай прыналежнасці лексем. Стылістычная транспазіцыя – прыём сенсібілізацыі прагматычнай сілы прагмем. Прагматычная сіла прагмем тым большая, чым меншая частотнасць іх ужывання і чым менш яны чакаемыя ў дадзенай сітуацыі. Эфект экспрэсіўнасці часта дасягаецца эксплуатацыяй унутранай формы слова. Канатацыя “накладваецца” на выказванне, што робіць яго двухпланавым, дае магчымасць вылучыць аб'ектыўна-мадальнае і суб'ектыўна-мадальнае значэнне лексемы. Выбар канататыўнай мадальнасці – сведчанне таго, што аўтар маўлення зацікаўлены не столькі ў кваліфікацыі таго, што належыць свету, колькі ў інтэрпрэтацыі ацэнкі. Актыўна ўнутраная форма эксплуатуецца і падчас ужывання метафары. Метафара ў публіцыстычных тэкстах узнікае як вынік аўтарскага пераасэнсавання значэнняў слоў. У

працэсе ўтварэння поля суб'ектыўнай мадальнасці найбольшую ролю адыгрываюць вобразная і ацэначная функцыі метафары. Прычыны выкарыстання метафары вынікаюць з імкнення, з аднаго боку, да дакладнасці, з другога – да эмацыянальнага выражэння думкі з максімальнай эфектыўнасцю. Найбольш выразнымі сродкамі стварэння поля суб'ектыўнай мадальнасці з'яўляюцца адзінкі сінтаксічнага ўзроўню мовы. У працэсе ўтварэння поля суб'ектыўнай мадальнасці важную ролю адыгрываюць інтанацыйныя канструкцыі, бо прыроду клічных сказаў і рытарычных пытанняў вызначае эмацыянальна-ацэначны змест (модус). Інтанацыйныя канструкцыі шырока выкарыстоўваюцца як спосаб засяродзіць увагу чытача, яны не столькі інфармацыя, колькі адлюстраванне эмацыянальна-валявой сферы псіхікі суб'екта маўлення. Узмацненню выразнасці і пераадоленню стандарту садзейнічае выкарыстанне экспрэсіўных сінтаксічных канструкцый з элементамі перастаноўкі і пералічэння. Сказы з адваротным парадкам слоў, пералічальныя канструкцыі, такія разнавіднасці паўтору, як анафара, эпіфара, сімплока, кампазіцыйны стык і інш., разлічаны на выразны эфект. Структуру ўтварае стылістычны кантраст паміж “звычайным” маўленнем і адхіленнем ад яго. План зместу ўзмацняецца шляхам абнаўлення плана выражэння. Актуалізацыя пэўных сінтаксічных мадэляў уяўляе сабой так званую “сінтаксічную вобразнасць”, уплыў якой на рэцыпіента значны. За своеасаблівай сінтаксічнай пабудовай не толькі індывідуальная форма выяўлення, а і сродак выражэння думак з максімальнай эфектыўнасцю. Экспрэсіўнасцю характарызуюцца і канструкцыі з парцэляцыяй і сегментацыяй, звязаныя па паходжанні з вусным маўленнем. У тэкстах сродкаў масавай інфармацыі яны ўяўляюць сабой стылістычны прыём, выкарыстанне якога прадумана і матывавана камунікатыўнай задачай.

Аднак аналіз дыскурсу навін не абмяжоўваецца лінгвістычным апісаннем фаналагічных, марфалагічных, сінтаксічных або семантычных структур ізаляваных слоў, словазлучэнняў або сказаў. Сучасныя падыходы да тэкстаў сродкаў масавай інфармацыі патрабуюць іншага разумення тэкстаў, тэкстаў як своеасаблівага тыпу дыскурсу.[1] Доўгі час дыскурс разумелі як звязную паслядоўнасць сказаў, сёння ен трактуецца як складаная камунікатыўная з’ява, што ўключае, акрамя вербальнай формы, яшчэ і экстралінгвістычныя фактары, што спрыяюць разуменню тэксту. Веды пра свет, погляды, установкі, мэты адрасата ўлічваюцца падчас прагматычнай інтэрпрэтацыі. Дыскурс з’яўляецца складаным адзінствам моўнай формы, значэнння і дзеяння. Таму найбольшую цікавасць уяўляе аналіз тэкстаў масавай інфармацыі з пазіцый дынамічнай прыроды іх вытворчасці, разумення і дзеяння, што рэалізуецца з іх дапамогай.

Тэксты характарызуюцца складанымі асаблівасцямі, такімі, як адносіны звязнасці паміж сказамі, агульная тэматычная структура, схематычная арганізацыя, шэрагам стылістычных і рытарычных параметраў.

На семантычным узроўні аналіз дыскурсу як паслядоўнасці сказаў дае магчымасць вывучаць суаднесеныя адна з адной інтэрпрэтацыі: значэнні або рэферэнцыі слоў, несамастойных або самастойных сказаў разглядаюцца як функцыя ад значэнняў і рэферэнцый, замацаваных за папярэднімі сказамі. Гэты аспект дыскурсу часта апісваюць з пазіцый лакальнай або паслядоўнай кагерэнтнасці. Тэкст з’яўляецца семантычна звязаным, калі апісвае магчымую паслядоўнасць падзей, г.зн. семантычная звязнасць залежыць ад нашых ведаў і ўяўленняў аб тым, што магчыма ў гэтым свеце.

Наступны, больш высокі і глабальны, узровень аналізу дыскурса сродкаў масавай інфармацыі – семантычная макраструктура. Семантычная макраструктура выяўляецца ў працэсе вылучэння топікаў з тэкстаў. Тэорыя макраструктур дае магчымасць даследаваць асаблівыя характарыстыкі загалоўка і ліда, у якіх суб’ектыўна абагульняецца астатняя частка паведамлення. Вылучэнне макраструктур тлумачыць, чаму у памяці чытачоў утрымліваюцца толькі асноўныя топікі, г. зн. вышэйшыя ўзроўні семантычнай макраструктуры тэкстаў навін.

Схематычная суперструктура тэкстаў навін з’яўляецца той формай, што арганізуе агульнае значэнне тэксту як цэлага. Схема гэта зададзена наборам характэрных катэгорый і правіл, што вызначаюць іх паслядоўнасць. Газетныя паведамленні штодзённа публікуюцца тысячамі і яны арганізаваны ў адпаведнасці з такой схемай, схемай навін. Корпус тэксту дэманструе такія катэгорыі, як кароткі змест, галоўная падзея, фон, кантэкст, гісторыя, вербальныя рэакцыі, каментар.

Арлен Кашкурэвіч не згодзен з Мацісам

У Светлагорскай карціннай галерэі "Традыцыя" імя Германа Пранішнікава адкрыта персанальная выстава народнага мастака Беларусі Арлена Кашкурэвіча. (Загаловак і лід – кароткі змест, галоўная падзея). Асаблівыя ўмовы вытворчасці і ўспрымання навін патрабуюць з'яўлення важнай інфармацыі ў пачатку тэксту. Структурыраванне па прынцыпу рэлевантнасці пранізвае ўвесь тэкст навін.

Усе 26 яго графічных твораў, прадстаўленых на выставе, робяць нас пэўным чынам яго сааўтарамі, аднадумцамі. Яны прасякнуты глыбінным адчуваннем нашай драматычнай гісторыі, філасофскім асэнсаваннем не толькі мінулага, але і сучаснага жыцця. Такое адчуваецца нават у серыі, так і хочацца сказаць, замалёвак з натуры "Гэтае мілае гарадское жыццё…"але самі творы адразу ж выяўляюць іранічнасць падтэксту назвы цыкла. Не такім ужо мілым аказваецца гэтае жыццё, калі разглядаеш карціны "Людзі ў тумане", "Мы толькі прахожыя", "Сабачая пляцоўка", "Сустрэча", "Сон старога музыканта". Толькі зрокавага ўспрымання для іх вельмі і вельмі мала. Вачыма пачынае глядзець душа…(Кантэкст)

Арлен Кашкурэвіч вядомы, перш за ўсё, графічнымі серыямі "Партызаны", "Купаліяна", "Асветнікі", "Святыя зямлі беларускай", "Прысвячэнне В.Быкаву"… ён з пранікнёнай таленавітасцю аздобіў многія кнігі, у тым ліку "Курган" Янкі Купалы, "Песню пра зубра" Міколы Гусоўскага, "Каласы пад сярпом тваім" Уладзіміра Караткевіча, "Снежныя зімы" Івана Шамякіна, "Хатынскую аповесць" Алеся Адамовіча. (Гісторыя)

Светлагорцы маюць рэдкасную магчымасць пабачыць прасякнутую гістарычнай веліччу яго карціну "Паляванне ў Вялікім княстве Літоўскім" і славуты трыпціх "У часы Ірада". (Галоўная падзея). Спецыфічнай асаблівасцю тэкстаў навін з'яўляеца тое, што і топікі і схема навін, што арганізуе іх, не прадстаўлены ў тэксце адной лінейнай паслядоўнасцю. Яны дыскрэтныя, з'яўляюцца ў тэксце па частках.

Як прызнаўся Арлен Кашкуровіч, ён не згозден з Анры Мацісам, які нібыта аднойчы заўважыў, што хацеў бы, каб яго творы былі для гледачоў чымсьці накшталт утульных крэслаў. "Для мяне важна, каб мае карціны, наадварот, перашкаджалі гэтай уяўнай утульнасці, заклікалі да эмацыянальнага роздуму", – гаворыць Арлен Міхайлавіч. (Вербальная рэакцыя) *("Гомельская праўда", 20.11.2010)*

Макраструктуры выводзяцца з тэкстаў на аснове нашых ведаў і перакананняў, і таму яны вар'іруюцца.

Тэматычная структура тэксту разгортваецца паслядоўна, кожны абзац "згортваецца" ў топік.

1. Персанальная выстава Арлена Кашкуровіча

2. 26 твораў – філасофскае адчуванне жыцця

3. Арлен Кашкуровіч вядомы

4. Светлагорцы маюць магчымасць пабачыць карціны

5. Карціны не ўтульныя крэслы, яны заклікаюць да эмацыянальнага роздуму

Топікі лёгка згортваюцца ў адзін, які фармулюем у якасці загалоўка: *Арлен Кашкурэвіч не згодзен з Мацісам* (які лічыць, што карціны – утульныя крэслы)

У тэкст актыўна "ўводзіцца" чытач, што дасягаецца "рэпартажнымі прыёмамі": *калі разглядаеш карціны; такое адчуваецца* (чытач бачыць вачыма аўтара), аўтар аб'ядноўвае чытача і сябе: *робяць нас пэўным чынам яго сааўтарамі, аднадумцамі*, у тэксце сфарміравана выразнае поле суб'ектыўнай мадальнасці: *прасякнуты глыбінным адчуваннем, так і хочацца сказаць, вачыма пачынае глядзець душа, маюць рэдкасную магчымасць, прасякнутую гістарычнай веліччу, славуты трыпціх.* Выразная ацэначнасць сфарміравана пераважна сродкамі лексічнага ўзроўню.

Тэкст тэматычна дакладны, схематычная суперструктура, мікра- і макраструктурная арганізацыя правільныя. Тэкст лёгка ўспрымаецца і з поспехам выконвае асноўныя задачы: інфармуе і ўздзейнічае (*заклікае да эмацыянальнага роздуму)* шляхам эмацыянальнага заражэння, заклікае да дзеяння (хачу наведаць выставу!)

Рэпрэзентацыя і ўзнаўленне падзей-навін журналістамі – не такі просты і інертны працэс, гэта набор канструктыўных стратэгій, што знаходзяцца пад сацыяльным і ідэалагічным кантролем.

Літаратура

1. Ван Дейк, Т.А. Язык. Познание. Коммуникация / Т.А. ван Дейк – М.: Прогресс, 1989.— 312 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 808.1-3

Нарысы па беларускай гідраніміі: *Зéха, Рыта, Тоўша* (этымалагічны каментарый)

Р. М. Казлова

Артыкул прысвечаны даследаванню беларускіх гідронімаў Зéха, Рыта, Тоўша ў арэальным, этымалагічным, храналагічным аспектах.
Ключавыя слова: арэал, анамастыка, онім, гідронім, рэканструкцыя, праславянскі фонд, этнічная атрфбуцыя.

The article deals with the research of Belarusian hydronyms Zekha, Rita, Tousha in areal, etymological and chronological aspects.
Keywords: area, onomastics, onym, hydronym, reconstruction, proslavic fund, ethnic attribution.

Зéха. Бел. *Зéха* – рака ў басейне Заходняй Дзвіны, выцякае з возера Забалоцце і ўпадае ў возера Лепельскае (БКБ 180), – наколькі вядома, не выклікала зацікаўленасці анамастаў. Адпаведны гідронім для яе знаходзіцца ў заходнеславянскім арэале, дакладней, у лужыцкіх славян, дзе цячэ *Zechen Bach* – прыток Нысы Лужыцкай на левабярэжжы Одры (НО п. 124) < слав. *Zech* ці *Zecha*, германізаванае шляхам далучэння апелятыва *Bach* ‘ручай, паток’. Не выключана, што ў якасці адпаведніка для бел. *Зéха* трэба кваліфікаваць руск. *Сéха* – правы прыток ракі Рудзільніцы на левабярэжжы Клязьмы. Змяшэнне шчылінных [*з*] і [*с*] – частая з’ява ў рускіх дыялектах: шчылінныя [*з*] і [*с*], як тлумачыць В. Колесаў, былі нейтральнымі да проціпастаўлення па прызнаку голаса [1, с. 89]. На гэтай падставе руск. *Сеха* можа працягваць зыходнае *Зеха*.

Для разглядаемых гідронімаў выяўляецца апелятыўная аснова: ст.-русск. *зеха* ‘разява, недалёкі чалавек’ (СлРЯ V, 386), руск. дыял. пск. *зéха* (*з-ха*) ‘разява, недалёкі чалавек’, ‘брудны чалавек’, *зéха* ‘жыта’, *зéха* ‘песня’, ад якіх намі не аддзяляецца *зéфа* ‘прозвішча’ (Даль I, 681, 698; СРНГ XI, 270), укр. дыял. *зéха* ‘разява, недалёкі чалавек’ (ЕСУМ II, 265) і інш., якія правамерна кваліфікаваць як аддзеяслоўныя дэрываты. Замацаванасць апелятыва ў беларускай гідраніміі сведчыць аб наяўнасці яго ў мінулым у лексічнай сістэме беларускай мовы. Кантынуанты зыходнага дзеяслова **zěχati* занатаваны ў больш шырокім арэале: бел. дыял. *зéхаць* ‘зяваць’ (ТС II, 152), *зяхáць* ‘хапаць паветра’, *зехáць* ‘бліскаць’ (НЛ 130; Сцяшк. 202), *пазяхáць* ‘зяваць’ (запіс наш), *зяхнýць* ‘уздыхнуць’ (СБГ II, 337), *зíхаць* ‘кідаць позірк, аглядаць’ (ЖС 115), *зíхаць* ‘уздыхаць’ (Янкова 137), *зéхаць* ‘глядзець’, руск. дыял. *зехать* ‘зяваць, крычаць, зваць’, *зéхать* ‘глядзець’ (Даль I, 681), укр. *зехáт*’ ‘бліскаць (аб маланцы)’, *зехáе безасаб.* ‘грае, бліскае зарніца’ (ЛП 83), *зіхáти* ‘разяўляць рот, зваць’, ‘зяваць’, ‘канаць’, *позіхати* ‘зяваць’ (Гринч. II, 155), серб. *зијѐхати* ‘зяваць’, славен. *zéhati* ‘тс’, якія, на правах магчымых, уключаны ў праславянскі лексічны фонд і ўзведзены да **zěχati* (ЕСУМ II, 265).

Бел. *Зеха* суадносіцца намі з ст.-руск. *Зехъ* – антрапонім (Веселовский 123), якія ўзводзяцца да зыходных **Zěχъ* м., **Zěха* ж., якія сфарміравалі значнае анамастычнае гняздо.

З субстантыўных словаўтваральных мадэлей назавем:

**Zěχačь:* ст.-руск. *Зехач* – антрапонім (Веселовский 123) і інш.;

**Zěχlo*: ст.-руск. *Зехло* – антрапонім (Веселовский 123), заходнеслав. *Dorf Zechlin, Flecken Zechlin, Zechlinerhüte* – населеныя пункты, *Groβer Zechliner* – возера ў азёрнай вобласці паблізу гарадоў Diemitz, Mirow, Wustrow (DA 50) < слав. *Zechlin*, германізаванае далучэннем апелятываў, называючых пэўны аб’ект, і інш. Рускія дыялекты захавалі апелятыў *зéхло* ‘акно’, *зехлó* ‘горла, глотка’, *зехольница* ’акно, аконнае шкло’, *зехлать* ‘глядзець’, *зехлать* ‘крычаць’ (СРНГ XI, 270). Адносна дэрывацыйнай мадэлі параўн. ст-руск. *дыхло* ‘дышло’ (СлРЯ IV, 397) і інш.

Зыходнае **Zěχъno* захавалася ў вытворных ад яго: руск. *Зехново* ў Каргапольскім пав. Алонецкай губ. (Олон. 90), *Зехновщина* ў Плесецкім раёне Архангельскай вобл., адзначанае ў старарускіх помніках: “пустошь, что была деревня *Зехновщина*”, і інш. У плане словаўтваральнай тыпалогіі параўн. бел. дыял. *зяўнó* ‘рот, сківіца’ (СБГ II, 337) < **zěvьno*, *Махно* < **Maχъno* [2, с. 248-250].

Вытворныя з асновай **Zěχ-*, матываваныя ад’ектыўнымі апелятывамі:

**Zěχovъ(-a,-o)*: ст.-руск. *Зехов* – антрапонім (Веселовский 123), руск. *Зехово* ў Пудажскім раёне, бел. *Zechowicze* на правым беразе Прыпяці ў былым Мазырскім пав. (SG XIV, 755), заходнеслав. *Zechow* на рацэ Rhin (DA 50), *Zichow* у вобласці Wendenmark на левабярэжжы Одры (DA 52), чэш. *Zechovice* ў Пашумаўскім рэгіёне, *Zichow* на рацэ Мерлінка ў Пльзенскай вобл., *Zichovice* паблізу Volyniě ў рэгіёне Чэскіх Будэёвіц, *Zichovice* на рацэ Otava, *Zichovec* на поўнач ад Stohova ў Пражскай вобл. (ČR; DA 134, 173) – населеныя пункты, якія адлюстроўваюць рэалізацыю *ě > i,* і інш. Нельга не сказаць аб паўднёваслав. *Sechovo* – населены пункт, паблізу якога цячэ *Sechovska reka* – п.п. Вардара, названы па айконіму *Sechovo*, – назвы без этымалогіі [4, с. 277], укр. *Сіхов* – населены пункт на Львоўшчыне (SG V, 549), *Сéховьска Вода* – п.п. Марушчака ў басейне Заходняга Буга на правабярэжнай Вісле (СГУ 499), якія могуць адлюстроўваць змяшэнне (узаемадзеянне) звонкіх і глухіх зычных (*Sechovo < Zechovo, Сіхов < Зіхов < З-ховъ*).

**Zěšinъ*: бел. *Зехино* на Заходняй Дзвіне ў Веліжскім пав. Віцебскай губ. (СпВит 55), ст.-руск. *З-хино* ў Дзярэўскай пяціне Ноўгарадскай зямлі (НПК I, 390), руск. *Зехино* ў Рузскім пав. Маскоўскай губ. (Моск. 197), заходнеслав. *Zechin* у славян за Одрай, паміж Одрай і Старой Одрай (Alte Oder) (DA 67) і інш., матываваныя антрапонімам *Зéха* < **Zěχa.* Адсутнасць палаталізацыі задненёбнага *χ* перад суфіксам *-in-*(*-ин-*) можа сведчыць аб уплыве роднасных адзінак.

Рыта. Рака *Рыта* – л.п. Мухаўца на правабярэжжы Заходняга Буга ў сістэме правабярэжнай Віслы (БКБ 315; HW 388) – цячэ на Брэстчыне і часткова ў Любомльскім раёне Валынскай вобласці Украіны (БКБ 315; СГУ 462). У беларускім арэале цякуць таксама адросткі *Рыты*: *Маларыта* (*Mała Ryta*) – л.п. *Рыты*, на якой размешчаны горад *Маларыта*, *Верхняя Рыта* – п.п. *Маларыты* (БКБ 363, 93). У Маларыцкім раёне фіксуецца айконім *Велікарыта* (РапБр 28).

Рыта ў словаўтваральным плане – гэта гідранімізацыя апелятыва *рыта* – фемініннай формы дзеепрыметніка *рыта* < праслав. **rytъ(-a,-o).* Аб глыбокай храналогіі гідронімаў сведчаць шматлікія іншаславянскія паралелі. Параўн. руск. *Рытой ключ* – л.п. Добрай у сістэме правабярэжнай Акі (Смолицкая 271), *Рыто* (*Рытое*) – возера ў Парэцкім пав. Смаленскай губ. (SG I, 30; VIII, 836), укр. *Рит* – л.п. Рынгача на левабярэжжы Прута, *Рит* – п.п. Ракітні таксама на правабярэжжы Прута, *Ритий* – л.п. Мокрага Лога на правабярэжжы Северскага Данца (МаштДон 46; СГУ 462), польск. *Ryta* – прыток Скавы ў вярхоўі Віслы (HW 32), *Ryta* – паток у Вадовіцкім пав. (SG X, 116) і інш. < праслав. **Rytъ(-a,-o), *Rytъjь(-aja,-oje).* Праслав. **Rytъ(-a,-o)* увайшлі ў антрапанімічную сістэму славян: польск. *Ryt, Ryta, Ryto* (SN VIII, 225) і інш.

У анамастычную сістэму славян увайшлі вытворныя розных слоўтваральных тыпаў ад **Ryta.* Сярод іх – дэмінутывы:

**Rytica:* русск. *Рытица* – рака ў басейне Лугі, польск. *Rycica, Rycice* (2 пасяленні), *Grąd Rycicki* ў Праснышскім, *Rycice* ў Новамінскім, *Rycice* ў Новаалександрыйскім паветах (SG X, 78) і інш.;

**Rytikъ*: ст.-бел. *Рытикъ* (Бірыла I, 252), бел. *Рыцік, Рыцікаў* (Бірыла 358), руск. *Рытиков*, польск. *Rycik* (SN VIII, 208) – антрапонімы, *Рытики* – аколіца, *Рытики, Рытыки* (3 пасяленні) – населеныя пункты ў Шавельскім пав. (SG X, 119; СК 435) і інш.;

**Rytъka*: бел. *Рытка* – варыянтная назва Маларыты (HW 390), *Rytki* – населены пункт у Лідскім пав. (SG X, 117), руск. *Рытковской* – правы верх ракі Мышынскай ў сістэме левабярэжнай Акі (Смолицкая 89) – вытворнае ад *Рытка, Рытковка* – л.п. Вотры ў сістэме Верхняга Дняпра (МаштДн 20), укр. *Rytki* – населены пункт у Праскураўскім пав. (SG X,

117), чэш. *Ritka* – населены пункт, польск. *Rytka* – прыток Gwdy, *Rytki* – возера ў басейне Бельскай Стругі ў сістэме Віслы (HW 212, 691) і інш.

Праслав. **Rytъkъ, *Rytъka, *Rytъko* замацаваліся ў антрапаніміі славян. Параўн. ст.-польск. *Rytka* (SSNO IV, 538), польск. *Rytek, Rytka, Rytko* (SN VIII, 225, 226), бел. *Рытчык* (Бірыла 358) і інш.;

**Rytьcь*: бел. *Рыцéц, -тца* – населены пункт у Брэсцкім раёне (РапБр 112), польск. *Ryceć* – возера ў басейне Заходняга Буга (HW 37) і інш.

З іншых субстантыўных мадэлей трэба назваць:

**Rytina*: руск. *Рытина* – населены пункт у Парэцкім пав. Смаленскай губ. (Смол. 315), польск. *Ryciński* – антрапонім (SN VIII, 208) і інш.;

**Rytva*: бел. *Рытвино* (2 пасяленні) у Полацкім пав. Віцебскай губ. (СпВит 325, 403), руск. *Рытвенка* – рака на правабярэжжы Масквы (Смолицкая 118), *Зарытва* – л.п. Упы (Смолицкая 67) < *За-рытва*, *Рытвино* – населены пункт у Гжацкім пав. Смаленскай губ. (Смол. 160), польск. *Rytwina* – прыток Любшы ў басейне Віслы (HW 129), *Rytwina* – прыток Gwdy (HO 129), *Rytwiny* ў Жарскім (DA 100), *Rytwiany* ў Сандамірскім (SG X, 118) паветах – населеныя пункты, *Rytwiński* – антрапонім (SN VIII, 226) і інш.

Некаторыя з дэрыватаў можна аб'яднаць апорным *n* у суфіксах:

**Rytanь*: бел. *Рытань* – населены пункт у Астравецкім раёне Гродзенскай вобл. (РапГр 212) і інш.;

**Rytenь*: бел. *Рытени* – населены пункт у Дзвінскім пав. Віцебскай губ. (СпВит 126), *Ryteń* – рака, *Rytenie* ў Віленскім, *Rytenie* ў Свянцянскім паветах (SG X, 117) – населеныя пункты, руск. *Рытенков* – антрапонім і інш.;

**Rytynь*: бел. *Рытыни* – населены пункт у Рэжыцкім пав. Віцебскай губ. (СпВит 367), *Rytynie* – населены пункт у Цельшаўскім пав. (SG X, 119), *Rytyna*, *Rytyniak, Rytyński* – антрапонімы (SN VIII, 226) і інш.

Папулярнымі аказаліся ад'ектывы ад **Rytъ(-a,-o)*:

**Rytinъ(-a,-o)*: руск. *Рытин* – верх ракі Праллі на левабярэжжы Проні (Смолицкая 172), *Рытина* – правая вяршыня Белай на правабярэжжы Акі (Смолицкая 187), *Рытин* – антрапонім, бел. *Рытыно* (2 пасяленні) у Рэжыцкім пав. Віцебскай губ. (СпВит 267) і інш.;

**Rytovъ(-a,-o)*: бел. *Рытава* (варыянт *Рытаўна*) – возера ў басейне Чарнічанкі ў Сенненскім раёне Віцебскай вобл. (БКБ 315), *Рытовица* – рака, *Рытовица* – населены пункт у былым Гарадоцкім, *Рытовка* ў Невельскім паветах Віцебскай губ. (СпВит 93, 94, 283), *Рытаў* у Брагінскім раёне Гомельскай вобл. (РапГом 149), руск. *Рытово* ў Гарохаўскім пав. Уладзімірскай (Влад. 67), *Рытовка* ў Парэцкім пав. Смаленскай (Смол. 37) губерняў – населеныя пункты, *Рытов*, ст.-польск. *Rytow, Rytowa* (SSNO IV, 538), польск. *Rytów, Rytówski, Rytowicz, Rytowiec* (SN VIII, 226) – антрапонімы, *Rytówek* у Сакалоўскім пав. (SG X, 107) і інш.;

**Rytьnъ(-a,-o), *Rytьn'a*: руск. *Рытна* – прыток Тратаранкі ў басейне Царэвіча на правабярэжжы верхняга Дняпра (МаштДн 23), *Рытней* – левая балка Гразнай ракі на правабярэжжы Акі (Смолицкая 136) < *Рытний*, *Рытня* – рака ў Духаўшчынскім пав. Смаленскай губ. (Смол. 222), укр. *Ритне* – населены пункт у Радамысльскім пав. Кіеўскай губ. і інш.

Выяўляецца значны пласт уласных назваў, утвораных ад прэфіксальных дзеясловаў на аснове партыцыпіумаў. Гэтыя назвы прэтэндуюць на старажытнасць:

**Narytъ(-a,-o)*: руск. *Нарытка* – рака, *Нарытка* – населены пункт у Юхноўскім пав. Смаленскай губ. (Смол. 424);

**Orzrytъ(-a,-o)*: бел. *Разрытая* ў Касцюковіцкім раёне Магілёўскай вобл. (РапМаг 149), руск. *Разрытый* – ручай у Дзмітраўскім пав. Арлоўскай губ. (Орл. 62), *Разрытое* – населены пункт у Мглінскім раёне Бранскай вобл., укр. *Розри́та* (*Разрытая*), *Моркова Розри́та* – левыя прытокі Северскага Данца на правабярэжжы Дона (МаштДон 44, 45, 62), *Розри́та* (*Разрытая*) – л.п. Лугані ў басейне правабярэжнага Северскага Данца (МаштДон 62), *Розри́та* – л.п. Камісарскага Патока таксама ў басейне той жа ракі (СГУ 374, 468);

**Perrytъ(-a,-o)*: руск. *Ререрытица* – прыток Полісці (ЭС XXXI, 426), *Перерытой* – балка на левым беразе Кутузаўкі ў басейне Упы (Смолицкая 76), укр. *Ререрита* ў Ціраспальскім пав. Херсонскай губ. (Херс. 152), *Перерыта* ў Хоцінскім пав. Бесарабскай

губ. (Бессар. 57) – населеныя пункты, польск. *Przerytka* – ручай у Мрангоўскім пав. Альштынскага ваяв. (Leyd. II, 172);

**Prorytъ(-a,-o)*: бел. *Прорыт* у Дрысенскім, *Прорытка* ў Полацкім паветах Віцебскай губ. – населеныя пункты (СпВит 148, 307);

**Porytъ(-a,-o):* укр. *Пори́тий* – л.п. Васюковай у сістэме Северскага Данца (СГУ 440) і інш.;

**Zarytъ(-a,-o), *Zarytovъ(-a,-o)*: бел. *Зарытава* н. у Ляхавіцкім раёне Брэсцкай вобл. (РапБр 57), руск. *Зарытов* (варыянт *Зарытовка*) – л.п. Зушы, *Зарытов* – правы верх ракі *Зарытов* (Смолицкая 63), *Зарытовка* – п.п. Акі (Смолицкая 66), *Зарытов Колодезь* – л.п. *Зарытвы* (Смолицкая 67), *Зарытовка* – л.п. Рэцешы ў басейне Асятра (Смолицкая 154), *Зарытка* – п.п. Рановы (Смолицкая 184), *Зарытово* ў Кашырскім пав. Тульскай (Тул. 106), *Зарытки* ў Спаскім пав. Разанскай (Ряз. 140) губерняў, польск. *Zaryte* ў павеце Новы Тарг, *Zaryte* ў *Гарволінскім, Zaryte* ў Радомскім паветах і інш.

Тоўша. Бел. *То́ўша* (*То́вша*) – п.п. Сар'янкі на левабярэжжы Заходняй Дзвіны (Сапунов 46; БКБ 222) – належыць да рэдкіх адзінак: гідранімічных аналагаў у іншых рэгіёнах Беларусі не выяўляецца. Затое руская зямля поўніцца імі: *Толша* – п.п. Акі (Смолицкая 142), *Толша* – п.п. Колокшы ў басейне длевабярэжнай Клязьмы (Смолицкая 211), *Тауша* – рака ў межах Уфімскага пав. (Уф. 19) і інш. Да гэтых адпаведнікаў далучаюцца гідронімы з іншай вакалічнай рэфлексацыяй: *Тэльша* – п.п. Таўсолі, *Тэльшы* – возера ў басейне ракі *Тэльшы* ў Ковенскай губ., укр. *Те́йша* – п.п. Тур'і ў басейне правабярэжнай Цісы (СГУ 556), адлюстроўваючы змяненне каранёвага плаўнага *л* > *л'* > *й* (з'ява *салодкагучання*). Структура гідронімаў, як і іх арэал, дазваляюць іх узвядзенне да зыходнай праформы **Tъlša.*

Адпаведныя айконімы, фіксуемыя прыкладна ў тым жа арэале, даюць магчымасць узнавіць і суадносную па роду форму мужчынскага роду **Tъlšь*. Параўн. руск. *Толша* ў Кашырскім пав. Тульскай (Тул. 96), *Толша* ў Сольвычагодскім пав. Валагодскай (Волог. 267) губерняў, *Толши* паблізу Варонежа – назва з *няяснай этымалогіяй,* па заключэнні Папова [3, с. 251], *Тауш* у Уфімскім пав. (Уф. 22), *Тыльша* ў Новааляксандраўскім (СК 264), *Tawsze* ў Расіенскім (SG XII, 267), *Тэльшы* ў Тэльшаўскім паветах Ковенскай губ., укр. *Тельши* ў Чарнігаўскай губ. (Черниг. 95). Да прыведзеных уласных назваў патрэбна далучыць бел. *Толоша* ў рэгіёне Друі, укр. *То́лош* – антрапонім (Чучка 555) – формы з *другім паўнагалоссем*. Як бачым, зыходны каранёвы вакалізм у аснове рэалізаваны *ў о, а, ы, э*, як у мностве іншых асноў аналагічнай структуры.

Перад намі онімы несумненнай праславянскай храналогіі. Праформы **Tъlšъ, *Tъlša* – яўна другасныя, аб чым сведчыць наяўнасць шыпячага ў аснове. Ён можа быць вынікам *j*-суфіксацыі першапачатковага *χ* (**Tъlš-* < **Tъlχj-*).

Дэрывацыйна першаснае **Tъlχa* захавалася ў руск. *Тельха* – п.п. Серажы на правабярэжжы Акі (Смолицкая 269), *Тельха* – рака ў Гарбатаўскім пав. Ніжагародскай губ. (Нгор. 85). Такім чынам, рэальны матэрыял усходнеславянскага рэгіёну дае магчымасць узвесці праслав. **Tъlšь, *Tъlša* да **Tъlχjь, *Tъlχja.*

Адзначым, што ў адносінах да **Tъlχъ, *Tъlšь* правамерна вырашыць генезіс славянскіх антрапонімаў: бел. *То́лах* (Бірыла 412), у гэтым выпадку *То́лах* < *То́лох* – форма з развіццём *другога паўнагалосся* (**Tъlχъ* < **Tъlъхъ* < *То́лох* < *То́лах*), польск. *Tausz, Tausch* (SN IX, 505).

Словаўтваральнае гняздо **Tъlχ-, *Tъlš-* складаюць суфіксальныя вытворныя, якія ўвайшлі ў рознага роду онімныя сістэмы. Сярод вытворных вылучаюцца дэмінутывы:

**Tъlšikъ:* руск. *Толшиковская* – населены пункт у Петразаводскім пав. Алонецкай губ. (Олон. 28);

**Tъlšьcь:* бел. *Тыушэц* – возера ў Дзвінскім пав. Віцебскай губ. (СпВит 105);

**Tъlšьkъ:* польск. *Tłuszek, Tauszkanow* (SN IX, 539) – антрапонімы.

Астатнія суфіксальныя вытворныя можна размеркаваць наступным чынам:

**Tъlšajь:* руск. *Тоншаево* (2 пасяленні) у Вятлужскім пав. Кастрамской губ. (Костр. 99), у якіх адлюстроўваецца дэнталізацыя плаўнага *л* перад пярэднеязычным (*Тоншаево* < *Толшаево*);

**Tъlšanъ:* бел. *Тальшаноўскі* – брод паблізу Дзедаўкі ў Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобл. (БМ 17, 173), *Тымшаны* ў Люцынскім пав. Віцебскай губ. (СпВит 213), у якім этымалагічны *л* змяніўся ў *м* (*Тълшаны* > *Тылшыны* > *Тымшаны*), *Towszany* ў Шавельскім

(SG XII, 440), *Тельшаны* ў Панявежскім (СК 360) паветах Ковенскай губ., укр. *Тавшан-Базар* – ручэй, прыток Ангары на левабярэжжы Салгіра сістэмы Сіваша (СГУ 552) і інш.;

**Tъlšьta:* руск. *Верхняя Толшма, Нижняя Толшма* – правые прытокі Сýханы (Семенов V, 169, 170), *Усть Толшма, Толшемской* (2 пасяленні) у Тоцемскім пав. Валагодскай (Волог. 303, 307), *Толшма* ў Вятлужскім, *Толшминской, Толшминское* ў Солігаліцкім паветах Кастрамской (Костр. 115, 315) губерняў – населеныя пункты.

Несумненна, што ў адносінах да *Толшма* < **Tъlšьta* вырашаецца этымалагічная загадка рускіх гідронімаў:

па-першае, *Тошмы* – п.п. Нерлі на левабярэжжы Клязьмы (Смолицкая 215), у каранёвай марфеме якога адбылася абсорбцыя плаўнага (*Тошма* < *Толшма*);

па-другое, *Тойшмы* – ракі ў Сольвычагодскім пав. Валагодскай губ. (Волог. 295), у каранёвай марфеме якой адлюстравана змяненне плаўнага *л* > *л'* > *j,* так званае *салодкагучанне* (*Тойшма* < *Тольшма* < *Толшма*). Адносна фарманта *-ьта* > *-ма* ў славянскай гідраніміі параўн. *Вязьма* – л.п. Дняпра, *Пушма* – рака ў Маложскім пав. Яраслаўскай губ., *Речма* – л.п. Акі і інш. Знаходзіцца такі фармант і ў гідронімах з асновай **tъlt-*. Параўн. руск. *Волшма* – рака ў Гразавецкім пав. Валагодскай губ. < **Vъlšьta*.

Мікрасістэму **Tъlχ-, *Tъlš-* узбагачаюць онімы-ад'ектывы:

**Tъlχovъ(-a,-o), *Tъlševъ(-a,-o):* ст.-руск. *Толшев* у Цвярскім пав. (ПК 281), руск. *Толшева* ў Яранскім пав. Вяцкай (Вят. 783), заходнеслав. *Telschow* на поўнач ад Putlitz у вобласці Pritzwald'a (DA 49), польск. *Tłuchowo* (некалькі пасяленняў), *Tłuchówko* (некалькі пасяленняў) у Ліпноўскім пав. (SG XII, 345) – населеныя пункты;

**Tъlšinъ(-a,-o):* польск. *Tauszyński, Tłuszyński* – антрапонімы (SN IX, 539, 505) і інш.;

**Tъlšьnъ(-a,-o):* руск. *Толшна* – рака ў Алексінскім пав. Тульскай губ. (Тул. 20), да якой намі далучаецца *Тошна* – рака ў Валагодскім пав. (Волог. 36), *Цельшне* – возера ў Дзвінскім пав. Віцебскай губ. (СпВит 106) – назва з інтэнсіўным змякчэннем анлаутнага *Т* (< *Тэльшно* < *Тълшьно*), да якіх правамерна далучыць назвы з развіццём *паўнагалосся* – *Толошницы* ў Лужскім пав. Санкт-Пецярбургскай губ. (СПб. 97), укр. *Толошний* – антрапонім (Кравч. 156) < *Тълшьныи.*

Характарызуючы ўзноўленую намі анамастычную мікрасістэму **Tъlχ-, *Tъlš-*, адзінкі якой маюць ярка выражаны фанетычны і марфалагічны тып, трэба падкрэсліць: для яе амаль поўнасцю адсутнічае апелятыўная база, што сведчыць аб жыццяздольнасці онімных сістэм у параўнанні з жывой лексікай. У гэтым выпадку онімная сістэма ўспрымаецца як культурна-гістарычны помнік, з якога павінны чэрпаць інфармацыю аб матэрыяльнай і духоўнай культуры этнаса.

Літаратура

1. Колесов В. В. Историческая фонетика русского языка. М.: Высшая школа, 1980.

2. Беларуска-іншаславянскія анамастычныя паралелі // Беларуская мова ў культурнай і моўнай прасторы Славіі. Мн., 2009. С. 243-250.

3. Попов С. А. Ойконимия Воронежской области в системе краеведческих дисциплин. Воронеж, 2003.

4. Duridanov I. Die Hydronymie des Vardarsystems als Geschichtsquelle. Köln-Wien: Bohlau-Verlag, 1975.

Анамастычныя і лексікаграфічныя крыніцы
Прынятыя скарачэнні

Бірыла I – Бірыла М.В. Беларуская антрапанімія. Мн.: Навука і тэхніка, 1968; Бірыла – Бірыла М.В. Беларуская антрапанімія. Мн.: Навука і тэхніка, 1969; БКБ – Блакітная кніга Беларусі. Водныя аб'екты Беларусі. Энцыклапедыя. Мн.: БЭ імя П.Броўкі, 1994. – 415 с.; БМ – Беларуская мова. Мн.: Універсітэцкае, 1985, 1987. Вып. XV, XVII; Веселовский – Веселовский С.Б. Ономастикон. Древнерусские имена, отчества, фамилии. М., 1974; Гринч. – Гринченко Б.Д. Словарь украинского языка. Киев, I908-I909. Т. I-IV; Даль – Даль В.И. Толковый словарь живого великорусского языка. М.: Русский язык, 1978-1980. Т. I-IV;

ЖС – Жывое слова /Пад рэд. Мацкевіч Ю.Ф. і інш. Мн.: Навука і тэхніка, 1978; ЕСУМ – Етимологічний словник української мови /Гол. ред. Мельничук О.С. Київ: Наукова думка, 1982-1985. Т. I-II; Кравч. – Кравченко Л.О. Прізвища Лубенщини. Київ, 2004; ЛП – Лескика Полесья / Отв. ред. Н.И. Толстой. М.: Наука, 1968; МаштДн – Маштаков П.Л. Список рек Днепровского бассейна. СПб., 1913; МаштДон – Маштаков П.Л. Список рек Донского бассейна. Л., 1924; НЛ – Народная лексіка /Пад рэд. Крывіцкага А.А., Мацкевіч Ю.Ф. Мн.: Навука і тэхніка, 1977; НПК – Новгородские писцовые книги, изданные Археографическою комиссиею. Т.I. Переписная оброчная книга Деревской пятины (около 1495 г.). СПб., 1859; ПК – Писцовые книги XVI века /Под ред. Н.В.Калачова. Отд. II. СПб., 1877; РапБр – Рапановіч Я.Н.Слоўнік назваў населеных пунктаў Брэсцкай вобласці. Мн.: Навука і тэхніка, 1980; РапВіц – Рапановіч Я.Н.Слоўнік назваў населеных пунктаў Віцебскай вобласці. Мн.: Навука і тэхніка, 1977; РапГом – Рапановіч Я.Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Гомельскай вобласці. Мн.: Навука і тэхніка, 1986; РапМаг – Рапановіч Я.Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Магілёўскай вобласці. Мн.: Навука і тэхніка, 1983; Сапунов – Сапунов А. Река Западная Двина. Историко-географический обзор. Витебск, 1893; СБГ – Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча. Мн.: Навука і тэхніка, 1979-1986. Т. I. – 512 с.; Т. II – 728 с.; Т. III; Т. IV; Т. V; СГУ – Словник гідронімів України. Ред. колегія: Непокупний А.П., Стрижак О.С., Цілуйко К.К. Київ, 1979; Семенов – Семенов П.П. Географическо-статистический словарь Российской Империи. СПб., 1885. Т. V; СК – Алфавитный список населенных мест Ковенской губернии. Ковна, 1903; СлРЯ – Словарь русского языка XI-XVII вв. М.: Наука, 1974-2002. Вып. I-XXVI. Вып. XXI – 1995 г.; Смолицкая – Смолицкая Г.П. Гидронимия бассейна Оки (Список рек и озер) /Под ред. О.Н. Трубачева. М.: Наука, 1976; **Списки** населенных мест Российской Империи (по сведениям 1859, 1864, 1870, 1872-1877 гг.), изданные Центральным статистическим комитетом МВД:

Бессар. – III. Бессарабская губерния. СПб., 1861; **Влад. –** Влад. – VI. Владимирская губерния. СПб., 1863; **Волог. –** VII. Вологодская губерния. СПб., 1866; **Вят.** – X. Вятская губерния. СПб., 1863; **Костр.** – XVIII. Костромская губерния. СПб., 1877; **Курск.** – XX. Курская губерния. СПб., 1863; **Нгор.** – XXV. Нижегородская губерния. СПб., 1863; **Олон.** – XXVII. Олонецкая губерния. СПб., 1879; **Орл.** – XXIX. Орловская губерния. СПб., 1871; **Перм.** – XXXI. Пермская губерния. СПб., 1875; **Пск.** – XXXIV. Псковская губерния. СПб., 1885; **Ряз.** – XXXV. Рязанская губерния. СПб., 1862; Сарат. – XXXVIII. Саратовская губерния. СПб., 1862; **Смол.** – XL. Смоленская губерния. СПб., 1868; **СПб.** – XXXVII. Санкт-Петербургская губерния. СПб., 1864; **Твер.** – XLIII. Тверская губерния. СПб., 1862; **Тул.** – XLIV. Тульская губерния. СПб., 1862; **Уф**. – XLV. Уфимская губерния. СПб., 1877; **Черниг.** – XLVII. Черниговская губерния. СПб., 1866.

СпВит – Список населенных мест Витебской губернии / Под ред. А.П.Сапунова. Витебск, 1906; СРНГ – Словарь русских народных говоров /Под ред. Филина Ф.П., Сороколетова Ф.П. Вып. 2-32. М.–Л.: Наука, 1965-2003; Сцяшк. – Сцяшковіч Т.Ф. Матэрыялы да слоўніка Гродзенскай вобласці. Мн.: Навука і тэхніка, 1972; ТС – Тураўскі слоўнік. Складальнікі Крывіцкі А.А., Цыхун Г.А., Яшкін І.Я. Мн.: Навука і тэхніка, 1982-1987. Т. I-V; ЭС – Энциклопедический словарь. Издатели Ф.А. Брокгауз и И.А. Ефрон. СПб., 1890-1904. Т. I.-XILI; Янкова – Янкова Т.С. Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны. Мн., 1982; ČR – Česka Republika; DA – Deutschland Atlas; HO – Hydronimia Odry. Wykaz nazw w układzie hydrograficznym /Pod red. Borka H. Opole, 1983; HW – Hydronimia Wisły. Wykaz nazw w układzie hydrograficznym /Pod red. Zwolińskiego P. Wrocław etc., 1965; Leyd. – Leyding G. Słownik nazw miejscowych okręgu mazurskiego. Poznań: PWN, 1959. Cz. II; SN – Słownik nazwisk współcześnie w Polsce używanych. Wydał K. Rymut. Kraków, 1994. T. IX; SSNO – Słownik staropolskich nazw osobowych /Pod red. Taszyckiego W. – Wrocław etc., 1984. T. V; SG – Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. Warszawa, 1880–1895. T.I-XIV.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 81.161.3’373’27:398.9(=161.3)

Аб дыферэнцыяцыі ў выкарыстанні фразеалагізмаў з аднолькавым значэннем і яе асновах

В. А. Ляшчынская

У артыкуле зроблена спроба ўстанаўлення асноў дыферэнцыяцыі фразеалагізмаў беларускай мовы з адным і тым жа значэннем у маўленчай дзейнасці чалавека і прычын узнікнення гэтых адзінак.
Ключавыя словы: фразеалагізм, аднолькавае значэнне, слоўнік, унутраная форма, вобразны складнік, дыферэнцыяцыя выкарыстання.

There is made an attempt to find out the differentiation basis of Belarusian idioms with the same meaning in a person’s speech activity and the reasons for this unit appearing.
Keywords: idiom, the same meaning, dictionary, internal form, figurative component, use differentiation.

Даўно заўважана наяўнасць большай ці меншай колькасці фразеалагізмаў для абазначэння аднаго і таго ж паняцця, з’явы, дзеяння і інш. у разнастайнасці формы іх выражэння. Зразумела, што гэты факт выклікае шэраг пытанняў, з якіх найперш выдзяляюцца два. Першае звязана з прычынай узнікнення фразеалагізмаў: чаму і для чаго столькі абазначэнняў аднаго і таго ж; другое, як вынік першага, – з іх выкарыстаннем: ці на самой справе яны абазначаюць адно і тое ж і ці ёсць магчымасць-немагчымасць, дапушчальнасць-недапушчальнасць ужывання фразеалагізмаў і замены іх адно другім у адным і тым жа кантэксце, альбо ці ёсць розніца паміж фразеалагізмамі з аднолькавым ці блізкім значэннем і ў чым яна выражаецца пры іх выкарыстанні. Адказы на гэтыя пытанні асабліва актуальныя для прагматычным мэтаў, для ўстанаўлення правілаў і законаў функцыянавання фразеалагізмаў у маўленні, для дакладнага і правільнага выкарыстання фразеалагічных адзінак (ФА) у маўленчай дзейнасці носьбітаў мовы ў залежнасці ад сітуацыі, умоў і з пэўнай мэтай.

Для ілюстрацыі звернемся да колькасна прадстаўленай групы ФА, аб’яднаных агульным значэннем ‘многа, у вялікай колькасці’, якіх толькі ў складзе “Слоўніка фразеалагізмаў” І.Я. Лепешава налічваецца 64: *ад пуза; адбою няма; без ліку; без меры; будзь здароў; бяры не хачу; валіцца цераз горла; вышэй вушэй; вышэй галавы; да гібелі; дай бог; дай бог/божа кожнаму; да ліха; да Масквы ракам не пераставіш; да халеры; да хваробы; да чорта; дзякуй богу; з горла лезе/лезла/валіцца/валілася; з горла прэ/перла; імя .. легіён; канца-краю не відаць; колькі ўлезе; колькі хочаш; куры не клююць; мора разліўное; на валовай скуры/шкуры не спішаш; не кот наплакаў; непачаты край/вугал/кут; не хаханькі; пальцам не праткнуць; па <самае> горла; па <самую> завязку; па <самыя> вушы; плюнуць некуды; повен/поўны рот; праз/цераз меру; сорак саракоў; у кожнай кішэні па жмені; хоць адбаўляй; хоць гаць гаці; хоць вазамі вазі; хоць граблямі грабі/заграбай; хоць заваліся; хоць заліся; хоць касой касі; хоць касу закладвай/закладай; <хоць> плот гарадзі; хоць сцены ў хаце абклейвай/клей; хоць <ты> махалам махай; цераз край; цьма цьмушчая; цэлы воз; чортава гібель; чортава процьма; чорт што; яблыку няма дзе ўпасці; як бобу; як гразі; як дроў; як завязаць; як на дзяды; як сабак нярэзаных* [1].

Для поўнага засваення такой колькасці ФА ці нават толькі адзінкавых з іх неабходна ведаць, дзе і калі, пры якіх умовах, у сувязі з чым, з якой мэтай можна выкарыстаць тую ці іншую адзінку з прыведзеных, паколькі гэта вымушаецца ўстаноўленымі правіламі маўленчай дзейнасці калектыву. Справа ў тым, што ўсе яны далёка не адназначныя ў выкарыстанні. Чым жа кіравацца для правільнага выкарыстання, для дакладнасці ўжывання названай групы ФА, як, дарэчы, і іншых?

Пошук адказу на пастаўленыя пытанні з’яўляецца асноўнай мэтай прапанаванага артыкула, паколькі, як вядома, у мове няма нічога збыткоўнага, у тым ліку гэта датычыць і адносна большай ці меншай колькасці фразеалагізмаў аднаго семантычнага поля, а можа, нават

яшчэ ў большай ступені менавіта адносна гэтых унікальных адзінак нашай мовы, паколькі фразеалагізмы “ўзнікаюць на аснове вобразнага ўяўлення аб рэчаіснасці, якое адлюстроўвае пераважна абіходна-эмпірычны, гістарычны і духоўны вопыт моўнага калектыву, звязаны з яго культурнымі традыцыямі” [2, с. 302], і ў ФА выяўляецца ўніверсальны прынцып эканоміі, які абазначае “мінімальную затрату маўленчых намаганняў для забеспячэння максімальнага разумення субяседнікам” [3, с. 99]. А каб разумець, дакладна ўспрыняць поўны сэнс ФА, трэба правільна, да месца, у пэўным акружэнні выкарыстаць гэтую адзінку.

Але спачатку выявім пэўную інфармацыю, якая ўтрымліваецца ў слоўніку і можа быць скарыстана для дыферэнцыяцыі ў выкарыстанні прыведзенай семантычнай групы ФА, паколькі ў слоўніку выдзяляюцца некалькі паказчыкаў, якімі можна кіравацца для правільнага выкарыстання ФА.

Так, для асобных ФА ў слоўніку акрэсліваецца такі крытэрый размежавання для іх выкарыстання, які можна кваліфікаваць як абазначэнне пры семантыцы пэўных ФА таго, што выяўляецца ў вялікай колькасці, ці ўлічваецца спалучальнасць ФА са срога акрэсленымі словамі. Напрыклад, ФА *яблыку няма/не было дзе ўпасці* падаецца з фразеалагічным значэннем ‘у вялікай колькасці’, якое суправаджаецца дадатковай інфармацыяй: “Пра мноства людзей у якім-н. месцы (памяшканні, вагоне, на плошчы і пад.)” [1, т. 2, с. 569]. Праўда, у слоўніку з усіх ФА з агульным значэннем ‘многа, у вялікай колькасці’ толькі асобныя суправаджаюцца такой інфармацыяй: суадносяцца паводле выкарыстання ФА адносна наймення: 1) людзей (*<хоць> плот гарадзі; яблыку няма дзе ўпасці*), 2) дзяцей (*як бобу*), 3) грыбоў ці ягад (*хоць вазамі вазі; хоць граблямі грабі/заграбай; хоць касой касі; хоць касу закладвай/закладай*), 4) грошай (*куры не клююць; хоць сцены ў хаце абклейвай/клей*), 5) яды (*як на дзяды*), 6) напояў (*мора разліўное*), 7) клопату, работы, спраў і пад. (*вышэй вушэй; вышэй галавы; па <самае> горла; па <самыя> вушы; повен/поўны рот*), 8) матэрыялу, ежы і інш. (*бяры не хачу*). ФА *хоць заліся* суправаджаецца заўвагай пра яе выкарыстанне для абазначэння “часцей пра малако, ваду і пад.” [1, т. 1, с, 456], хаця яна ўжываецца і для абазначэння вялікай колькасці віна, гарэлкі і пад.

Нярэдка ў слоўніку ўказваецца, што адна і тая ж ФА акрэсленага семантычнага поля абазначае вялікую колькасць не аднаго чаго-небудзь, а рознага, ці можа спалучацца з рознымі найменнямі чаго-небудзь адносна ўказання іх вялікай колькасці. Так, адна і тая ж ФА выкарыстоўваецца для абазначэння мноства: 1) людзей, канкрэтных і абстрактных прадметаў (*без ліку; хоць адбаўляй; цераз край*), 2) людзей і неадушаўлёных прадметаў (*хоць гаць гаці; хоць <ты> махалам махай; цэлы воз; чортава гібель; чортава процьма; як дроў*), 3) людзей і адушаўлёных прадметаў (*як сабак нярэзаных*), 4) адушаўлёных і кантрэтных прадметаў (*да гібелі*), 5) адушаўлёных і неадушаўлёных прадметаў (*як гразі*).

У сувязі з тым, што такая інфармацыя ў слоўніку падаецца толькі для некаторых ФА, а большасць засталася без яе, можна меркаваць пра іх ужыванне без усякіх абмежаванняў, г. зн. яны могуць абазначаць мноства, вялікую колькасць людзей, самых розных адушаўлёных і неадушаўлёных прадметаў і інш. Але ці так гэта? Возьмем, напрыклад, ФА *ад пуза, да Масквы ракам не пераставіш, у кожнай кішэні па жмені*, *пальцам не праткнуць*, якія, як вядома, нягледзячы на адсутнасць у слоўніку памет такога парадку, у маўленні таксама дыферэнцыруюцца паводле свайго выкарыстання: часцей за ўсё ФА *ад пуза* абазначае мноства яды, харчавання, страў і пад., ФА *да Масквы ракам не пераставіш* і *пальцам не праткнеш* – толькі пра мноства людзей, *у кожнай кішэні па жмені* – пра розныя прадметы, у тым ліку і грошы.

Другім паказчыкам правільнага ўжывання ФА служыць падача ў слоўніку слоў-суправаджальнікаў, без якіх тая ці іншая ФА не можа рэалізавацца ў маўленні, тым самым вызначаецца правіла яе ўжывання, дакладнасць яе выкарыстання. З усіх прыведзеных ФА, аб’яднаных агульным значэннем ‘многа, у вялікай колькасці’, гэты крытэрый вызначаецца, напрыклад, для аднаструктурных і абсалютна тоесных паводле прыведзенага ў слоўніку значэння (‘вельмі многа’) ФА *колькі ўлезе* і *колькі хочаш*, якія адрозніваюцца ва ўжыванні на аснове розных слоў-суправаджальнікаў: першая – “*браць, набраць* і пад.” (*<u>Набралі</u> хлопцы рыбы* ***колькі ўлезе*** *і накіраваліся дадому.* Я. Маўр), а другая – “*даваць, адпускаць* і пад.” (*Грошай на шпіёнскую і падрыўную прапаганду прэзідэнт <u>адпускае</u>* ***колькі хочаш***. “Полымя”); а таксама

для ФА *повен/поўны рот*, якая заўсёды спалучаецца з назоўнікамі *турбот, клопатаў* (*Няхай хто маладзейшы з'ездзіць... Сваіх* <u>*турбот*</u> ***повен рот***. В. Праскураў).

Зразумела, што правільнасць выкарыстання ФА вызначаецца і паводле такіх паказчыкаў, як вызначэнне ў слоўніку лексіка-граматычнай і сінтаксічнай функцыі, замацаванай за фразеалагізмам, і дзякуючы прыведзеным у слоўніку стылістычным паметам, якія суправаджаюць ФА і складаюцца з функцыянальна-стылёвай і экспрэсіўна-ацэначнай афарбоўкі. Так, напрыклад, адзначаецца аднолькавае ўжыванне ў безасабовым значэнні такіх дзвюх ФА, як *імя ... легіён* і *да хваробы*, але для правільнага і дакладнага выкарыстання іх носьбіт мовы можа кіравацца адзначанымі ў слоўніку суправаджальнымі стылістычнымі паметамі, якія для гэтых ФА розныя: для першай – *кніжн.*, для другой – *праст.*, на аснове чаго дыферэнцыруецца ўжыванне кожнай з іх з улікам маўленчай сітуацыі, што азначае немагчымасць замены іх адна другой у адным і тым жа кантэксце.

Яшчэ ў слоўніку адным паказчыкам дыферэнцыяцыі выкарыстання ФА з'яўляецца выдзяленне і падача сінанімічных радоў ФА, дзякуючы якім "забяспечваецца больш глыбокае пранікненне ў сэнсавую структуру растлумачанага фразеалагізма, значна паўнейшы яго каментарый" [1, с. 27]. Так, на прыкладзе ФА семантычнага поля 'многа, у вялікай колькасці' ў слоўніку выдзяляюцца тры сінанімічныя групы ФА. Першыя дзве групы сінонімаў аб'ядноўваюць ФА, якія збліжаюцца на аснове выдзялення валентна абмежаванага значэння, агульнага для іх у кожнай групе ФА і іх спалучэння з пэўным словам-найменнем таго, з чым звязана вялікая колькасць. Да іх адносяцца ФА, якія ўказваюць на: 1) многа грыбоў, ягад ці грыбоў і ягад (*хоць вазамі вазі; хоць граблямі грабі/заграбай; хоць касой касі; хоць касу закладвай/закладай*) і 2) многа грошай (*куры не клююць; хоць сцены ў хаце абклейвай/клей*).

А трэцяя група сінанімічных фразеалагізмаў уключае ўсе астатнія 58 ФА семантычнай групы 'многа, у вялікай колькасці', але яны не збліжаюцца паводле такога паказчыка, які паслужыў асновай вызначэння сінанімічных ФА ў дзвюх першых групах сінонімаў. Вось толькі некалькі прыкладаў ФА: 1) *валіцца цераз горла*, у выкарыстанні якога на першае месца выходзіць не столькі абазначэнне вялікай колькасці чаго-небудзь (дарэчы, гэта могуць быць, як правіла, канкрэтныя прадметы), колькі выказванне адмоўнага стаўлення да чалавека, які мае такую колькасць ці жадае гэтага, што асабліва выразна выяўляецца у маўленні, напрыклад: *Усё ў яго ёсць,* ***цераз горла валіцца****, а яму аніяк не хапае, каб яго трасца хапіла!* А. Шлег; 2) *дай бог/божа кожнаму*, якая, па-першае, можа азначаць вялікую колькасць абстрактных і канкрэтных прадметаў; па-другое, у супрацьлегласць папярэдняй ФА, станоўча ацэньвае вялікую колькасць чаго-небудзь у каго, напрыклад: [Каця] *не такая, каб спавядаца кожнаму... Не! Гордасці ў яе –* ***дай божа кожнаму***... П. Місько; 3) *не кот наплакаў*, пры ўжыванні якой улічваецца не столькі вялікая колькасць, паколькі яна можа быць адносна вялікай, а перакананне ў тым, што яна дастатковая і інш. Нават гэтыя адзінкавыя прыклады сведчаць, што прыведзеныя ФА не могуць быць, як у першых двух групах сінанімічных ФА, узаемазамяняльнымі, г.зн. для гэтай групы ФА ёсць свае крытэрыі ўжывання. Акрамя таго, на нашу думку, у складзе трэцяй групы сінанімічных ФА, пададзеных у слоўніку, даволі выразна выдзяляюцца ФА з агульным значэннем 'празмерна, занадта многа, больш чым трэба': *адбою няма; валіцца цераз горла; вышэй галавы; вышэй вушэй; да Масквы ракам не перастаўіш; з горла лезе; з горла прэ*.

Як відаць, паказчыкі размежавання, дыферэнцыяцыі ў выкарыстанні ФА з агульным значэннем 'многа, у вялікай колькасці', якія акрэсліваюцца матэрыялам слоўніка, па-першае, паслядоўна не вытрыманы, па-другое, не ахопліваюць усе ФА, а значыць, не з'яўляюцца ўніверсальнымі, што ў пэўнай ступені тлумачыцца мэтай і задачамі тлумачальнага слоўніка фразеалагізмаў, галоўнае для якога – прадставіць фразеалагічнае багацце беларускай літаратурнай мовы. Па форме выражэння аднолькавых паводле значэння фразеалагізмаў.

Думаецца, што асновы дыферэнцыяцыі ў выкарыстанні ФА і прычыны ўзнікнення могуць быць выяўлены і яны ўзаемазвязаны, калі падысці да аналізу ФА з боку іх асноўнай ролі і назначэння – быць захавальнікамі і сродкамі перадачы мудрасці многіх пакаленняў беларусаў, тых своеасаблівых правілаў жыцця, ацэнкі і характарыстыкі, выражэння адносін да акаляючай рэчаіснасці ў разнастайнасці яе праяўлення, што яднае нас, робіць прадстаўнікамі

пэўнага народа. Вызначым наяўнасць-адсутнасць карэляцыі паміж значэннем ФА і той мадэллю вобразнага складніка іх, тым вобразам, што ляжыць у аснове іх унутранай формы, іх ужываннем і той інфармацыяй, якая эксплiцытна ці імплiцытна прысутнічае ў семантыцы ФА і якая кіруе выбарам, месцам ужывання ФА, паколькі мяркуем, што пры наяўнасці розных выражэнняў аднаго і таго ж мы ўсё ж маем справу "з рознымі канцэптуальнымі варыянтамі і адпаведна з рознымі семантычнымі структурамі" [4, с. 71]. Для аналізу возьмем групу ФА, якія аб'яднаны агульным значэннем 'страх' і з якіх найбольш адзначаюцца тыя, якія характарызуюць суб'ект і маюць агульнае значэнне 'хто-н. адчувае моцны жах, страх': *кроў ледзянее; кроў у жылах стыне /застыла; сэрца ледзянее /ледзянела; зуб на зуб не пападае; мароз па скуры; мурашкі бегаюць /прабягаюць / бягуць па целе; валасы становяцца дыбам; вочы на лоб лезуць; душа ў пятках*; *калені /лыткі дрыжаць /трасуцца; кідае /кінула ў <халодны> пот; паджылкі трасуцца; скура пашэрхла; скура шэрхне; сэрца абрываецца; у пяткі кальнула.* Усе яны з'яўляюцца вербальнымі сродкамі выражэння таго адчування, як чалавек у "наіўнай карціне свету" ўспрымае пэўную сітуацыю і ацэньвае яе як пагрозу для сябе, у выніку чаго ўзнікае эмоцыя страху. Заўважым, што колькасць ФА з адным значэннем з'яўляецца адпаведнікам разнастайнасці фізіялагічных адчуванняў чалавека, а паколькі такіх адчуванняў некалькі, то адпаведна павялічваецца колькасць адзінак для іх абазначэння.

Усе пералічаныя ФА перадаюць пачуццё страху, якое для чалавека можа праяўляцца ў бескантрольных фізіялагічных рэакцыях, суадносных з холадам, амярцвеннем, дрыжаннем і іншымі фізічнымі зменамі, якія чалавекам разглядваюцца як характэрнае знешняе праяўленне, ці, паводле тэрміна Л.Н. Іарданскай, з'яўляюцца сімптомнымі [5, с. 7]. У залежнасці ад таго, якія сімптаматычныя выражэнні канцэптуалізаваны, можна меркаваць пра адчуванне і праяўленне страху, але, што вельмі важна, у гэтых моўных адзінках выяўляюцца і тыя адносіны, характарыстыкі, станоўчыя ці адмоўныя ацэнкі, якія яны выражаюць і якія такім чынам зафіксаваны ў ФА. Вобразны складнік ФА дазваляе правесці семантычную дыферэнцыяцыю і адпаведна дыферэнцыяцыю выкарыстання.

Так, паводле ацэнкі з пералічаных ФА выдзяляюцца тыя, у якіх асабліва выразна выяўляецца ідэя холаду, вобраз застывання органаў чалавека, што адчувае і такім спосабам выражае страх. У іх няма адмоўнай характарыстыкі асобы, паколькі гэтыя ФА адлюстроўваюць такую сітуацыю, калі страх выклікаецца аб'ектыўнымі прычынамі, для маўленчай асобы яны з'яўляюцца вельмі сур'ёзнымі, магчыма, нават небяспечнымі для жыцця. Тут пачуццё страху можна было б абазначыць словам жах (заўважым, што гэта, як правіла, адлюстравана ў семантыцы такіх ФА ў лексікаграфічнай крыніцы, як, напрыклад, ФА *кроў ледзянее; кроў у жылах стыне /застыла; сэрца ледзянее /ледзянела* і інш. Пра гэта сведчаць і прыклады ўжывання: ***Ледзянее кроў**, калі я думаю, што гэтыя адборныя фашысцкія галаварэзы могуць апынуцца там, дзе жыве Саша.* (І. Шамякін); *А цяпер куды ні кіне дзед пагляд сваіх вачэй, ажно **кроў у жылах стыне**, боль як вугалем пячэ.* (А. Астрэйка).

Такога тыпу страх, а адпаведна і яго канцэптуалізацыя ў ФА, выяўляецца паводле назіранняў нават пры ўспрыманні толькі паведамлення, інфармацыі пра падобную сітуацыю, падзею, абставіны і пад. ці пры ўспамінах чалавека, які перажыў іх, на што падказваюць прыклады ўжывання адпаведных ФА, напрыклад: *Ажно **сэрца ледзянее**, / Як успамінаю.* (Я. Купала); *Дзве гадзіны мы гутарылі з настаўніцай. Пачуў я тады такія гісторыі, што **сэрца ледзянела**.* (Л. Прокша).

Як відаць, ва ўсіх прыведзеных вышэй ілюстрацыях выкарыстаны ФА з ідэяй холаду для характарыстыкі чалавека, які не ўспрымаецца як палахлівы, баязлівец, тым больш "заяц", а таму гэтыя адзінкі не выражаюць асуджэння, не нясуць адмоўнай канатацыі, паколькі пачуццё страху, якое чалавек адчувае, апраўдваецца знешнімі абставінамі і з'яўляецца знешне матываваным. На аснове гэтага і з улікам практыкі выкарыстання можна з упэўненасцю меркаваць, што ўсе пералічаныя ФА могуць замяняць адна другую, яны толькі рэпрэзентуюць розныя спосабы ўспрымання і адчування такога тыпу страху.

Па-рознаму ўспрымаюцца і адпаведна выкарыстоўваюцца ФА, пабудаваныя паводле метафарычнай мадэлі "страх – 'фізічная слабасць", у выніку чаго яны падзяляюцца на тры падгрупы. Першую падгрупу складаюць ФА для абазначэння страху як рэакцыі на знешняе

праяўленне яго прычыны. Яны больш блізкія да групы ФА з ідэяй холаду, паколькі выражаюць сапраўдны страх, што выклікаецца знешнімі прычынамі, часцей не залежнымі ад чалавека, а таму не нясуць адмоўнай характарыстыкі. Так, выкарыстанне ФА *скура пашэрхла*; *скура шэрхне*; *сэрца абрываецца/ападае*; *сэрца як/чуць не выскачыць* абумоўлена неабходнасцю абазначыць страх, але выразнай адмоўнай характарыстыкі асобе, якая перажывае яго, няма. Вось чаму яны не нясуць адмоўнай характарыстыкі, пра што і сведчаць прыклады выкарыстання: *гэткая немата не меней страшная, чым гвалтоўная часіна, калі блізка страляюць ці паляць. Вусцішна. Аж* ***скура шэрхне.*** (Г. Далідовіч), дзе выразна ідэнтычнасць выкарыстання ФА *шэрхне скура* з такімі ФА, як *сэрца ледзянее, кроў стыне* і інш.

Другую падгрупу ФА для абазначэння страху складаюць наступныя: *валасы/волас становяцца/падымаюцца/устаюць дыбам/дыба/дуба/дубка*; *вочы на лоб лезуць/палезуць/вылазяць/вылазілі*; *кідае/кунула ў <халодны>пот; лыпаць вачамі/-ыма*, якія выяўляюць двухпланавасць ацэнкі і адпаведна ўжывання ў залежнасці ад прычыны страху, рэпрэзентаванага ў іх: выкліканы знешняй пагрозай ці ўнутраным станам, такой рысай характару чалавека, як баязлівасць, палахлівасць. У выніку яны могуць даваць як станоўчую, так і адмоўную ацэнку чалавеку з яго прычынай страху, “тыпам” адчування і праяўлення яго. Гэта азначае, што прыведзеныя ФА могуць ужывацца з рознымі мэтамі і мець розныя характарыстыкі, як, напрыклад, у наступных кантэкстах: *Андрэй пачуў, як у яго* ***падымаюцца дыбам валасы*** *і па спіне пабег шорах.* (І. Пташнікаў) і *І* ***сталі валасы дубка*** *ў небаракі Янука.* (К. Крапіва), дзе выкарыстанне ФА *падымаюцца дыбам валасы* характарызуецца адсутнасцю адмоўнай ацэнкі і асуджэння такога праяўлення страху, а ФА *сталі валасы дубка* – наяўнасцю адмоўнай ацэнкі героя, паколькі далейшы кантэкст раскрывае яго як баязліўца.

А трэцяя падгрупа ФА, унутраная форма якіх выяўляецца праз метафарычную мадэль ‘страх – фізічная дысфункцыя’ (*душа ў пятках*; *душа ў пяткі <схавалася, ускочыла>; калені /лыткі дрыжаць /трасуцца; паджылкі трасуцца; у пяткі /у пяты кальнула /закалола; цямнее /зелянее ў вачах // цямнела /пацямнела /пазелянела ў вачах*; *язык адняўся*; *язык прысох /прыліп <да зубоў /да паднябення>*), ілюструе пачуццё страху як пераўвялічанае пачуццё, якое такім на самой справе не з’яўляецца і якое па гэтай прычыне не можа быць станоўча ацэненым. З дапамогай такіх ФА чалавек характарызуецца як палахлівы альбо які такім прытвараецца, бо яму не пагражае бяда, няшчасце ці іншая знешняя сур’ёзная прычына, што выклікае ўзнікненне страху-жаху. Чалавек сам стварае, нагнятае свой страх ці прыкідваецца баязлівым, што зноў жа падлягае асуджэнню. Гэта выразна падмацоўваюць прыклады ўжывання такіх ФА ў мове адных асоб для ацэнкі і характарыстыкі другіх. Напрыклад: *– А не перадумаў? – усё гэтак жа крыва ўсміхаючыся, Валерый глядзеў ва ўпор. –* ***Паджылкі не трасуцца****?* (“Звязда”); *Тут у Міколы і* ***язык адняўся****. Ён баяўся зірнуць у акно, бо быў упэўнены, што ў акне ўжо тырчаць страшная галава.* (Я. Колас).

Калі ж пэўная асоба гаворыць пра сябе, выкарыстоўваючы названыя ФА, то яны ўжываюцца з яўнай іроніяй, напрыклад: [Грачанік:] *Тады ўсе мы былі смелыя. А цяпер паклічуць на бюро –* ***калені дрыжаць****.* (І. Шамякін).

Па-рознаму выяўляецца ацэнка ў групе кампаратыўных ФА (*як агню*; *як авечы хвост; як асінавы ліст; як чорт ладану*, *як чорт крыжа*), дапоўнім яшчэ ФА *пад завязку*, аб’яднаных агульным значэннем ‘вельмі моцна, панічна (баяцца каго-, чаго-н.)’. Кожная з прыведзеных ФА дакладна мае сваё месца выкарыстання і выконвае сваю ролю ў ацэнцы чалавека. Гэта выразна выяўляецца ў залежнасці ад унутранага вобраза, ад параўнання тыпу страху і выпрацаванага ў свядомасці чалавека эталона, стэрэатыпа яго ўяўлення.

Агонь – сапраўдная пагроза, а таму ён выступае эталонам высокай ступені праяўлення страху ў ФА *як агню*, што і падмацоўвае прыклад ужывання гэтай ФА ў маўленні: *Махнач* ***як агю*** *баяўся Бародкі, і таму Лемяшэвіч вырашыў пайсці на хітрыкі.* (І. Шамякін), дзе рэзкага асуджэння і выразнай адмоўнай ацэнкі асобы, якая баіцца, не назіраем, паколькі для страху маецца прычына, ёсць пагроза чалавеку, праўда, бытавога характару, якую можна абысці, ад якой можна перасцерагчыся, што і абумоўлівае адпаведнае выкарыстанне ФА ў бытавых зносінах.

Амаль гэтак жа характарызуе чалавека ФА *як асінавы ліст*, хаця тут выяўляецца адрозненне з улікам выражэння высокай ступені праяўлення страху чалавекам праз яго дры-

жанне, трымценне, а як вынік адрозненне ў спалучальнасці гэтай ФА толькі з дзеясловамі *дрыжаць, трымцець* і падобных, і ў выкарыстанні з мэтай яшчэ і перадаць фізічны стан баязлівага ці запалоханага чалавека, напрыклад: *Згадаў* [Верасоўскі] *свой першы ўрок – дзівак, ён тады так хваляваўся, дрыжаў* ***як асінавы ліст*** *і нічога не помніў, што трэба гаварыць вучням.* (Я. Сіпакоў).

Параўнанне чалавека з авечым хвастом – гэта паказчык прыніжэння яго годнасці, і такія асацыяцыі, адлюстраваныя ў ФА *як авечы хвост*, выяўляюць выток не толькі выражэння высокай ступені праяўлення страху, але найперш адмоўнага стаўлення да такіх паводзін чалавека, рэзкага асуджэння да такога пачуцця, што падмацоўваецца і маўленчай практыкай: *Зрабілася холадна, і голая душа затрэслася* ***як авечы хвост***. (М. Захаранка).

Размоўныя ФА *як чорт ладану* і *бы/як чорт крыжа* таксама выяўляюць высокую ступень боязі, страху, але ў іх адлюстравана ўяўленне чалавека пра моц і сілу хрысціянскіх сімвалаў – крыжа і ладану, а таму тут ацэнка не з'яўляецца істотнай, тут важней падкрэсліць ступень праяўлення страху, што ўжо само за сябе гаворыць аб перабольшванні прычыны страху, а таму і адпаведнае бытавое выкарыстанне гэтых дзвюх ФА. Напрыклад: *Усе закаханыя страшэнныя эгаісты... Вось таму і я кахання баюся як чорт ладана.* (І. Шамякін), дзе няма асуджэння ці адмоўнай ацэнкі асобы з-за яе страху, створанага самім чалавекам, але выяўляецца пераўвелічэнне прычыны страху, што дазваляе паказаць найвышэйшую ступень інтэнсіўнасці яго праяўлення і такім чынам ацаніць асобу.

З асуджэннем, а часцей з іроніяй ці жартам выкарыстоўваюцца ФА са значэннем 'уцякаць, ратавацца ад небяспекі ўцёкамі' – *падмазваць пяткі /пяты; паказваць пяткі; рваць кіпці*, дзе нават парадак пералічэння іх як бы выражае нарастанне інтэнсіўнасці дзеяння ўцекача і ўзмацненне экспрэсіўнай ацэнкі, што істотна ўплывае на іх выкарыстанне. У прыведзеных ФА саматычны кампанент *пяткі, пяты, кіпці* выступаюць квазісімвалам 'сродак пазбягання прычын страху'.

Найбольш выразна і паслядоўна адзначаецца адмоўная канатацыя, рэзкае асуджэнне асобы, нават грубая насмешка ў адносінах да чалавека пры выкарыстанні ФА *заячая/заечая душа* 'вельмі баязлівы чалавек'; *задаваць труса* 'баяцца, палохацца'; *труса святкаваць* 'баяцца, палохацца', якія заўсёды характарызуюць чалавека толькі негатыўна і служаць для выражэння неадабральных адносін да яго, паколькі тут знайшло яўнае выражэнне падабенства чалавека з зайцам, трусом, якія ў народным уяўленні асацыіруюцца і выступаюць эталонамі боязі, палахлівасці, страху. Адпаведна гэта падмацоўваецца іх ужываннем у маўленні: *"Я ж цябе паваджу, сліхняк! – падумаў Дзямбо. – Прымушу, заечая душа, некалькі разоў угару, высалапіўшы язык, плесціся"*. (І. Гурскі).

Такім чынам, фразеалагізмы як унікальныя моўныя адзінкі беларускай мовы, якія адлюстроўваюць, захоўваюць і перадаюць пэўную інфармацыю ад пакалення да пакалення, звязаны з архаічнымі і параўнальна "старымі" ўяўленнямі, як, напрыклад, ФА з агульным значэннем 'страх', дзе адлюстраваны стан узбуджэння і напружання са спецыфічнымі саматычнымі і псіхічнымі праяўленнямі. Аналіз усіх выяўленых ФА беларускай мовы, аб'яднаных значэннем 'страх', адкрывае адну цікавую заканамернасць: паколькі пачуццё страху не выяўляецца візуальна, непасрэдным назіраннем, то ў мове для наймення страху ў ФА замацавалася фіксацыя пэўных сімптомных рэакцый, фізічнага стану чалавека ці жывёл (у апошнім выпадку назіранні за паводзінамі авечкі, зайца, труса). Менавіта асацыяцыя страху з пэўнымі рэакцыямі арганізма ці фізічным станам чалавека сталі асновай фарміравання ў наіўнай карціне свету ўяўленняў пра гэтую эмоцыю, якая з "нябачных" феноменаў пераходзіць у "бачныя". Такая заканамернасць выяўляецца дзякуючы ўстанаўленню ўнутранай формы ФА, вобразнай асновы гэтай эмоцыі чалавека.

Устанаўленне ўнутранай формы ФА са значэннем 'страх', іх вобразнай асновы тлумачыць прычыну іх шматлікасці і выяўляе асновы іх дыферэнцыяцыі паводле выкарыстання, калі патрэбна не толькі абазначыць пачуццё, але, што найбольш важна, даць пэўную ацэнку страху і яго носьбіту, вызначыць прычыну страху і ступень яго інтэнсіўнасці, на аснове чаго выразіць адносіны, даць характарыстыку асобе, якая перажывае гэтае пачуццё.

Вызначана, што ФА з ідэяй холаду, ці ўтвораныя па метафарычнай мадэлі ‘страх – холад’, называюць страх як пачуццё не залежнае ад самога чалавека, як вынік вельмі моцнага ўздзення знешніх абставін, якія не могуць не выклікаць моцных эмацыйных пачуццяў, а таму ўжыванне ФА тыпу *сэрца ледзянее* і пад. не нясуць асуджэння чалавеку, які адчувае страх такога тыпу, і адмоўна яго не ацэньваюць.

Наадварот, тыя ФА, унутраная форма якіх выяўляе мадэль ‘страх – фізічная дысфункцыя’, часцей за ўсё негатыўна ацэньваюць носьбітаў такога тыпу праяўлення гэтага пачуцця, паколькі ў гэтых адзінках страх найбольш часта ўспрымаецца як пачуцці пераўвялічанае і не апраўданае рэальнай пагрозай для чалавека, такі страх вызначае ў пэўнай ступені ўшчэрбнасць чалавека, а таму ФА тыпу *душа ў пятках*; *душа ў пяткі <схавалася, ускочыла>; калені /лыткі дрыжаць /трасуцца; паджылкі трасуцца* і інш. нясуць адмоўную ацэнку, асуджэнне, часта ўжываюцца з іроніяй (*лыткі трасуцца*).

ФА, аб’яднаныя агульным значэннем ‘вельмі моцна, панічна (баяцца каго-, чаго-н.)’(*як агню*; *як авечы хвост; як асінавы ліст; як чорт ладану*, *як чорт крыжа*), закліканы хутчэй для выражэння інтэнсіўнасці праяўлення пачуцця страху, але і тут назіраецца дыферэнцыяцыя паводле ўжывання ў залежнасці ад унутранага вобраза, выкарыстанага ў іх аб’екта параўнання: асуджэнне, здзек, насмешка (*як авечы хвост*) і неадабрэнне страху з-за пераўвелічэння бытавых яго прычын (*як агню; як асінавы ліст; як чорт ладану; як чорт крыжа*).

Толькі для адмоўнай характарыстыкі, для негатыўнай ацэнкі чалавека выкарыстоўваюцца субстантыўная ФА *заячая/заечая душа* і дзеяслоўныя ФА *задаваць труса* і *труса святкаваць*, дзе выразна выяўлена і акрэслена асацыяцыя чалавека з трусом ці зайцам як эталонамі страху.

Як можна меркаваць, менавіта вызначэнне ўнутранай формы, вобразнага складніка ФА дазваляе, па-першае, растлумачыць узнікненне пэўнай колькасці, здавалася б, аднолькавых паводле значэння моўных адзінак, а на самой справе праілюстраваць багацце моўных сродкаў для выражэння самых розных адценняў, нюансаў у ацэнцы, адносінах, характарыстыцы да аднаго і таго ж, тым самым стаць крыніцай пазнання разумовых працэсаў, мыслення чалавека, спосабу выражэння яго ўяўленняў пра свет; па-другое, вызначыць асновы іх дыферэнцыяцыі ў маўленчай дзейнасці чалавека.

Літаратура

1. Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў. У 2 т. Т. 1. А-Л / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 672 с; т. 2. М-Я / І.Я. Лепешаў: Мінск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 704 с.

2. Телия, В.Н. Культурно-национальные коннотации фразеологизмов (от мировидения к миропониманию) / В.Н. Телия // Славянское языкознание. XI междунар. съезд славистов. Доклады российской делегации; Сб. докладов /Отделение лит-ры и языка РАН; Отв. ред. Н.И. Толстой. – М.: Наука, 1993. – 351 с.

3. Мокиенко, В.М. Славянская фразеология / В.М. Мокиенко. – М.: Высшая школа, 1989. – 287 с.

4. Добровольский, Д.О. Образная составляющая в семантике идиом / Д.О. Добровольский // Вопросы языкознания. – 1996. – № 1. – С. 71-93.

5. Иорданская, Л.Н. Лексикографическое описание русских выражений, обозначающих физические симптомы чувств / Л.Н. Иорданская // Машинный перевод и прикладная лингвистика. Вып. 16. – М.: МГПИИЯ, 1972. – С. 3-21.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 81.161. 3' 372' 373.46

Лексіка-семантычная трансфармацыя тэрміна ў спецыяльнай і агульнаўжывальнай лексіцы беларускай мовы
(на матэрыяле тэхнічнай тэрміналогіі)

Л. М. Мінакова

У артыкуле вывучаецца лексіка-семантычная трансфармацыя тэрміналагічных адзінак у спецыяльнай і агульнаўжывальнай лексіцы беларускай мовы.
Ключавыя словы: трансфармацыя, трансфармацыйны метад, дэтэрміналагізацыя, метафарызацыя, генералізацыя, метанімізацыя, сінекдахальны перанос, архісема, асноўны кампанент значэння, дыферэнцыяльны кампанент.

The lexical and semantic transformation of terminological units in special and everyday Belarusian vocabulary is studied in the article.
Keywords: transformation, transformational method, determinologization, metaphorization, generalization, metonymization, synecdoche transfer, archiseme, basic meaning component, differential component.

Тэрмін *трансфармацыя* (лац. transformatio) актыўна выкарыстоўваецца ў розных галінах навукі, тэхнікі, мастацтва. *Трансфармацыя* ў грамадстве – сацыёлага- паліталагічнае паняцце, якое абазначае якасныя пераўтварэнні грамадскай арганізацыі [1, с. 512]; *трансфармацыя* ў генетыцы – змена спадчынных уласцівасцей клеткі ў выніку пранікнення ў яе чужароднай ДНК, адзін са спосабаў абмену генетычным матэрыялам [1, с.512]; *трансфармацыя* ў мастацтве – тэатральны або цыркавы нумар, заснаваны на хуткім пераўвасабленні артыста, змене касцюма, грыма, парыка і пад. [2, т.5 (ч.1), с. 509]; *трансфармацыя* ў тэхніцы – пераўтварэнне электрычнага току пры дапамозе трансфарматара [2, т.5 (ч.1), с. 509]. Усе дэфініцыі тэрміна аб'ядноўваюцца агульным значэннем 'пераўтварэнне, ператварэнне, відазмяненне'.

Упершыню тэрмін *трансфармацыя* ў лінгвістыку прыйшоў з імем З. Харыса ў пачатку 50-ых гг. 20 ст. Даследчыкам быў прапанаваны метад прадстаўлення сінтаксічнай структуры сказа, заснаваны на вывядзенні складаных сінтаксічных структур з больш простых з дапамогай невялікага набору правіл пераўтварэння. Вучоны прапануе аперацыі, шляхам якіх сказы з дзеясловамі незалежнага стану можна перабудаваць у пасіўныя канструкцыі і наадварот, ядзерная дзеяслоўная структура сказа падвяргаецца пэўнаму віду наміналізацыі. Гэтыя аперацыі З. Харыс, у адпаведнасці са сваёй схільнасцю да матэматычных тэрмінаў, назваў *трансфармацыямі*. Пазней ён і яго вучні працягвалі вызначаць і вывучаць мноства падобных суадносін паміж тыпамі сказаў і іх частак. Так узнік трансфармацыйны метад даследавання, у аснове якога ляжалі наступныя палажэнні: 1) сінтаксічная сістэма мовы можа быць разбіта на рад падсістэм, з якіх адна з'яўляецца ядзернай, або зыходнай, а ўсе астатнія – яе вытворнымі. Ядзерная падсістэма – гэта набор тыпаў элементарных сказаў, г.зн. простых сцвярджальных сказаў з дзеясловам абвеснага ладу незалежнага стану, якія не змяшчаюць мадальных слоў, аднародных членаў, азначэнняў, акалічнасцей, інфінітываў, дзеепрыметнікаў, дзеепрыслоўяў і г. д.; 2) кожны ядзерны сказ апісвае элементарную сітуацыю, а тып ядзерных сказаў – клас элементарных сітуацый; 3) любы складаны сінтаксічны тып атрымліваецца з аднаго або некалькіх ядзерных сказаў прымяненнем да іх упарадкаванага набору абавязковых і факультатыўных трансфармацый. Трансфармацыі або зусім не змяняюць зместу ядзерных сказаў, або змяняюць яго нязначна і строга акрэсленым чынам, так як яны захоўваюць нязменным лексічны склад ядзернага сказа і сінтаксічныя адносіны паміж лексемамі. Колькасць трансфармацый невялікая, а разнастайнасць сінтаксічных тыпаў атрымліваецца за кошт разнастайных камбінацый трансфармацый, што прымяняюцца да розных набораў ядзерных тыпаў. Уявіць сінтаксічную структуру сказа – значыць указаць, якія ядзерныя тыпы ляжаць у

яго аснове, якія трансфармацыі і ў якім парадку на яго ўздзейнічалі. Так як у працэсе трансфармавання элементарныя сітуацыі, абазначаныя ядзернымі сказамі, застаюцца нязменнымі, лічылася, што пытанне аб разуменні складаных сказаў і нават звязных тэкстаў можна звесці да пытання аб тым, як разумеюцца ядзерныя сказы [3, с. 69-77].

Пазней усе тэарэтычныя пасылкі трансфармацыйнага метаду, асабліва прынцып семантычннай інварыянтнасці трансфармацый, падвяргаліся крытычнаму перагляду, і ён перастаў выкарыстоўвацца як спосаб прадстаўлення сінтаксічнай, а тым больш семантычнай структуры сказа. Тым не менш трансфармацыйны метад захаваў пэўнае значэнне як адзін з эксперыментальных прыёмаў дэманстрацыі сінтаксічнага і семантычнага падабенства і адрознення паміж складанымі моўнымі аб'ектамі праз падабенства і адрозненне ў іх трансфармацыйных патэнцыялах (наборах дапушчальных імі трансфармацый). У гэтай якасці трансфармацыйны метад выкарыстоўваўся ў сінтаксісе, словаўтварэнні і семантыцы. Пры гэтым арсенал трансфармацый быў значна пашыраны за кошт таго, што ў азначэнні трансфармацыі была знята ўмова нязменнасці лексічнага складу сказа і ўмова нязменнасці сінтаксічных адносін паміж лексемамі.

Думка, што ў аснове разнастайнасці сінтаксічных тыпаў у натуральных мовах ляжыць адносна простая сістэма ядзерных тыпаў, што падвергліся пераўтварэнню з дапамогай невялікай колькасці трансфармацыйных правілаў, паслужыла зыходным момантам для развіцця Н. Хомскім канцэпцыі граматыкі параджэння. Трансфармацыйная граматыка параджэння, у сваю чаргу, дала імпульс даследаванням у галіне семантыкі, "інтэрпрэтуючай семантыкі", склонавай граматыкі і інш. і стымулявала распрацоўку фармальных мадэлей мовы. Існуе адрозненне паміж ранейшым паняццем трансфармацыі, прапанаваным З. Харысам, і сучаснай канцэпцыяй трансфармацыйнага правіла, выкарыстанай у працах Н.А. Хомскага, М.Хале, Р.Б.Ліза і інш. У еўрапейскай лінгвістычнай традыцыі аналагам трансфармацыйнага метаду з'яўляецца канцэпцыя сінтаксічнай (функцыянальнай) транспазіцыі (работы Ш. Балі, О. Есперсена, А. Фрэя, Л. Тэньера, Е.Курыловіча і інш.).

У сучасным мовазнаўстве трансфармацыяй называюць: 1) адзін з метадаў параджэння другасных моўных структур, які характарызуецца заканамерным змяненнем асноўных мадэлей (або ядзерных структур); канстатацыю суадносін ядзернай і вытворнай мадэлей, якія з'яўляюцца асновай іх узаемных пераўтварэнняў; 2) сімвалічна выражаныя морфасінтаксічныя адпаведнікі паміж падобнымі сказамі і фразамі, што выяўляюцца ў даным корпусе [4, с. 480]; заканамерную замену адной моўнай мадэлі (структуры) іншай пры захаванні тоеснага ці блізкага значэння [5, с. 149]. Даследаванне данай з'явы на лексіка-семантычным і структурна-граматычным узроўнях знайшло адлюстраванне ў працах Ю.Д. Апрэсяна, В.Г.Гака, М.Г. Комлева, А.С. Кубраковай, Д.Н. Шмялёва і інш. Трансфармацыйны метад у тэрміналогіі часткова аналізаваўся ў працах А.А. Рэфармацкага, Б.М. Галавіна, В.П. Даніленка, Р.Ю. Кобрына, Д.С. Лотэ, В.М. Прохаравай, А.В. Супяранскай, Л.А. Антанюк, В.П. Краснея, Т.В. Капейко і інш.

Паколькі тэрмін і яго ўласцівасці разглядаюцца намі на фоне агульнамоўных заканамернасцей, а тэрміналогія – як падсістэма агульналітаратурнай мовы, мэта артыкула – аналіз лексіка-семантычных пераўтварэнняў тэрміна ў межах адной галіны тэрміналогіі, на міжгаліновым узроўні (пры ўзаемадзеянні моўных адзінак некалькіх галіновых тэрміналогій, не выходзячы за межы тэрміналогіі ў цэлым), на міжсістэмным узроўні (пры ўзаемадзеянні спецыяльнай і агульнаўжывальнай лексікі беларускай мовы).

У лексіка-семантычных адносінах сутнасць трансфармацыі заключаецца ў наданні тэрміналагічнай адзінцы новай семантычнай функцыі пры захаванні яе знешняй формы. Спецыяльнае слова пры гэтым можа пераходзіць у разрад агульнаўжывальнай лексікі, губляючы строгую канцэптуальнасць, адназначнасць, набываючы іншую ўнутраную форму і прагматычныя ўласцівасці, якіх раней было пазбаўлена. Узнікае новая моўная адзінка, што патрабуе ўжо не дэфініцыі, а тлумачэння. У межах дэтэрміналагізацыі, на думку Э.В. Кузняцовай, вылучаюцца тры этапы. "Першым этапам з'яўляецца агульнае пашырэнне ўжывання тэрмінаў як у звычайных карэспандэнцыях, так і ў спецыяльных матэрыялах папулярызатарскай накіраванасці. Другі этап засваення тэрміна звязаны ўжо з яго пераасэнсаваннем. Тэрмін ужыва-

ецца ў незвычайным кантэксце з незвычайным, пераасэнсаваным значэннем. Трэці этап – гэта поўная дэтэрміналагізацыя слова, калі тэрмін страчвае і сваё спецыяльнае значэнне, і сваю экспрэсіўнасць, становіцца адным з вытворных значэнняў” [6, с. 176-177].

Адным са шляхоў дэтэрміналагізацыі слова з’яўляецца шлях ад метафарычнага выкарыстання да развіцця ў ім устойлівага значэння, якое ў “Тлумачальным слоўніку беларускай мовы” вызначаецца як пераноснае, вытворнае ад спецыяльнага. Семантычныя зрухі ў намінацыях такога тыпу можна ўявіць наступным чынам: “вобразнае пераасэнсаванне – пераноснае ўжыванне – пераноснае значэнне” [7, с.87]. Метафарызацыі падпарадкоўваюцца моўныя адзінкі ўсіх галіновых тэрміналогій, не выключэнне ў гэтым плане і тэхнічная тэрмінасістэма. У сферу метафарычнага пераасэнсавання пранікаюць спецыяльныя назвы са значэннем прадметнасці: *баласт* ‘груз, які забяспечвае ўстойлівасць і асадку карабля, а таксама груз для рэгулявання вышыні палёту аэрастата’ > ‘пра што-небудзь лішняе, непатрэбнае’ [2, т.1, с.331] ; *барометр* ‘прылада для вымярэння атмасфернага ціску’ > ‘тое, што з’яўляецца паказчыкам змен у чым-н.’[2, т.1, с.345] ; *механізм* ‘унутраная частка машыны, прылады, апарата і пад., якая прыводзіць іх у дзеянне; машына, прыстасаванне для чаго-н.’ > ‘унутраны лад, сістэма чаго-н.’[2, т.3, с.146]; *прэс* ‘машына, прыстасаванне для апрацоўкі матэрыялаў ціскам’ > ‘пра тое, што прыгнятае, прыціскае каго-, што-н.’[2, т.1, с. 507]; *рэгулятар* ‘прыбор для рэгулявання дзеяння чаго-н. (машыны, механізма і пад.)’ > ‘тое, што рэгулюе, накіроўвае развіццё чаго-н.’[2, т.4, с. 749]; якасці, уласцівасці: *механічны* ‘які дзейнічае пры дапамозе механізмаў, машын; які апрацоўваецца пры дапамозе механізмаў; звязаны з вырабам, рамонтам машын і механізмаў’ > ‘які дзейнічае без удзелу свядомасці, аўтаматычны; міжвольны’ [2, т.3, с.146] ; ‘*мікраскапічны* зроблены, даследаваны пры дапамозе мікраскопа’ > ‘вельмі маленькі, нязначны па велічыні, памерах’[2,т.III,с.153]; дзеяння, выражаныя назоўнікамі *аварыя* ‘пашкоджанне якога-н. механізма, машыны і пад. у час дзеяння, руху’ > ‘ няўдача, нечаканае парушэнне чаго-н. у ходзе якой-н. справы; няшчасце’[1, т.1, с. 97] ; *разгон* ‘рух з паступова нарастаючай скорасцю; скорасць, набытая кім- , чым-н. у выніку такога руху’ > ‘разбег, шырыня, размах у дзеяннях, дзейнасці’ [1, т.4, с.591]; дзеясловамі: *буксаваць* ‘круціцца, не рухаючыся з месца (пра колы аўтамабіля, паравоза і пад.); пра аўтамабіль і пад., у якога колы круцяцца на адным месцы’ >’не рухацца наперад, таптацца на адным месцы’ [2, т.1, с. 417] ; *падключыцца* ‘далучыцца да сістэмы забеспячэння электрычнасцю, газам і інш.’ > ‘уключыцца ў работу, прыняць удзел у чым-н.’[2, т. 3, с.535] і інш.

Другі шлях трансфармацыі тэрміна не звязаны з метафарычнасцю. Гэта – генералізацыя, абагульненне спецыяльнага значэння ў працэсе выкарыстання. Напрыклад, тэхнічныя тэрміны *акумулятар* ‘прыбор для накаплення энергіі з мэтай далейшага яе выкарыстання’ [2, т.1, с.218]; *габарыт* ‘гранічна знешнія абрысы прадметаў (збудаванняў, машын, станкоў і пад.) ; адлегласць ад рэйкавага шляху да лініі будынкаў, якая забяспечвае свабодны праход поезда’ [2, т.2, с. 7] ; *параметр* ‘велічыня, якая характарызуе якую-н. істотную ўласцівасць прадмета або з’явы (напрыклад, электраправоднасць цела і г.д.)’ [2,т.4, с. 44] набываюць адпаведна генералізаванае значэнне: *акумулятар* ‘той (тое), хто (што) штосьці збірае, на чымсьці засяроджваецца, канцэнтруецца’; *габарыт* ‘аб’ём, велічыня чаго-н.’; *параметр* ‘некаторая велічыня, пэўны паказчык’.

Спецыяльныя адзінкі тыпу *стандарт* пры трансфармацыі набываюць адначасова і генералізаванае, і пераноснае значэнне: ‘нарматыўна- тэхнічны дакумент, якім вызначаюцца адзінкі велічынь, тэрміны і іх азначэнні, патрабаванні да прадукцыі, вытворчых працэсаў і г.д.’ (тэхн.); ‘узор, шаблон, трафарэт’(генерал.); тое, што не мае ў сабе нічога арыгінальнага, своеасаблівага’ (перан.) [2, т.5 (ч.), с.303].

Кампанентны аналіз семантыкі першаснага (тэрміналагічнага) і другаснага (неспецыяльнага) значэнняў намінацый паказвае, што паміж імі існуе строга заканамерная сувязь. Пры даным аналізе выдзяляюцца асноўны кампанент /АК/ значэння, які звычайна адпавядае азначэнню бліжэйшага роду або класа прадметаў, і дыферэнцыяльныя прыметы, другарадныя кампаненты /ДК/, якія канкрэтызуюць асноўны кампанент і суадносяцца з відавымі адрозненнямі прадметаў. У працэсе відазмянення асноўны лексіка-семантычны кампанент спецыяльнага значэння слова можа захоўвацца і набываць новыя дыферэнцыяльныя прыме-

ты (*аўрал* ‘сумесная /ДК/ работа /АК/ на марскім судне /ДК/ , у якой удзельнічае /ДК/ уся каманда /ДК/’ > ‘празмерна спешная /ДК/ работа /АК/ усяго калектыву /ДК/ , выкліканая адсутнасцю /ДК/ планамернасці /ДК/ у працы /ДК/’), што ўплывае на істотныя змены семантычнага аб’ёму слова. У радзе выпадкаў дыферэнцыяльны кампанент пераўтвараецца ў асноўны (*робат* ‘аўтамат /АК/, які выконвае /ДК/ складаныя дзеянні /ДК/, падобныя да дзеянняў /ДК/ чалавека /ДК/’ > ‘пра чалавека, які /АК/ дзейнічае, працуе /ДК/ механічна /ДК/, падпарадкоўваючыся чужой волі /ДК/’) або застаецца дыферэнцыяльным кампанентам (*руль* ‘прыстасаванне /АК/ для кіравання /ДК/ рухам судна /ДК/, самалёта /ДК/, аўтамабіля /ДК/ і пад.’ > ‘пра органы /АК/ кіравання /ДК/, кіраўніцтва /ДК/ чаго-н. /ДК/’).

Дзякуючы тэхнічнай тэрміналогіі ўзбагачаецца не толькі лексіка, але і фразеалогія беларускай мовы. Так, у выніку пераасэнсавання спецыяльнага значэння наступных тэрмінаў-словазлучэнняў узніклі наступныя фразеалагізмы: *выводзіцца на арбіту* ‘станавіцца вядомым’ (паходзіць з тэрміналагічнага словазлучэння, якое ўжываецца ў галіне касманаўтыкі) [8, с. 83]; *даваць (даць) газу* ‘прымушаць каго-н. быць больш энергічным’ (узнік у выніку пераасэнсавання састаўнога тэрміна, які ў маўленні шафёраў абазначае ‘паскараць рух машыны, павялічыўшы паступленне гаручага’ [8, с. 107]; *спускаць (спусціць) на тармазах* ‘спыняць, уладжваць што-н. непрыемнае ціха, паступова, бясшумна’ (утварыўся ў выніку пераасэнсавання тэрміналагічнага словазлучэння, якое ў маўленні чыгуначнікаў і шафёраў ужываецца, калі гавораць пра адзін з відаў манеўравання пры ваджэнні лакаматываў, аўтамашын – выкарыстанне тармазоў пры крутым спуску) [8, с.351]. Адны фразеалагізмы ў працэсе трансфармацыі ў большай ці меншай ступені захавалі сувязь з тэхнічнай тэрміналогіяй, дэтэрміналагізаваліся не поўнасцю: *даць газу* ‘паскорыць рух, павялічыць паступленне гаручага’[2, т.2, с.154]; *на поўным газе* ‘на самай вялікай скорасці’[2, т.2, с.12]. Другая частка фразеалагічных адзінак цалкам страціла семантычную сувязь са спецыяльным значэннем, падверглася поўнай дэтэрміналагізацыі: *даць задні ход* ‘адмовіцца ад сваіх думак, намераў, імкненняў’[2, т.2, с.154]; *падкруціць* (*закруціць*) *гайку* (*гайкі)* ‘павялічыць патрабаванні, зрабіць іх больш строгімі, суровымі’ [2, т.3, с.537].

Лексіка-семантычная трансфармацыя аб’ядноўвае таксама адзінкі адной галіны тэрміналогіі. Гэта найчасцей выяўляецца ў працэсе метанімізацыі, сутнасць якой заключаецца ў пераносе назвы з аднаго прадмета на другі на аснове сумежнасці. Пры метанімічным пераносе другасныя значэнні ў тэхнічнай тэрміналогіі вынікаюць з асацыятыўных сувязей, што ўзнікаюць пры намінацыі адной моўнай адзінкай: а) дзеяння і месца, дзе адбываецца дзеянне: *аб’езд* ‘дзеянне паводле дзеясл. *аб’язджаць – аб’ехаць*’> ‘месца з часовай дарогай, па якім можна аб’ехаць’[2, т.1, с. 45]; *прабег* ‘дзеянне паводле дзеясл. *прабягаць – прабегчы*’ > ‘знаходжанне якога-н. сродку аўтамабільнага транспарту ў дарозе, у эксплуатацыі’; ‘адлегласць, пройдзеная якім-н. транспартным сродкам’[2, т. 4, с.299]; б) дзеяння і прадметаў або іх частак, што ажыццяўляюць гэта дзеянне: *абсталяванне* ‘дзеянне паводле значэння дзеясл. *абсталёўваць – абсталяваць*’ > ‘сукупнасць прыстасаванняў, прылад, механізмаў і пад., неабходных для выканання пэўнага віду работ’ [2, т.1, с. 79]; *перадача* ‘дзеянне паводле значэння дзеясл. *перадаваць – перадаць* ‘> ‘механізм,які перадае рух ад адной часткі машыны, прыстасавання да другой’ [2, т.4, с.177]; в) дзеяння і яго выніку: ‘дзеянне паводле значэння дзеясл. *злучаць – злучыць* і *злучацца – злучыцца*‘ > ‘аб’ект, які складаецца са злучаных паміж сабой элементаў’ [2, т.2, с. 483]; *маркіроўка* ‘дзеянне паводле значэння дзеясл. *маркіраваць*‘ > ‘знак, кляймо, марка на таварах, вырабах’ [2, т.3, с. 109]; г) прадмета і дзеяння, якое ўтварае гэты прадмет: *гудок* ‘механічнае прыстасаванне для падачы сігналаў шляхам гудзення’ > ‘працяжны, аднастайны гук, сігнал, пададзены з дапамогай механічнага прыстасавання’ [2, т.2, с.92]; *званок* ‘механічнае або электрычнае гукавое сігнальнае прыстасаванне для падачы гукавых сігналаў, падобных на гукі гэтага прадмета’ > ‘гукавы сігнал, створаны гукавым сігнальным прыстасаваннем’ [2, т.2, с. 437]; д) асобы, што выконвае дзеянне, і прыстасавання, пры дапамозе якога гэтае дзеянне выконваецца: *падборшчык* ‘рабочы, які займаецца падборкай чаго-н.’> ‘прыстасаванне ў камбайне для падбору каласоў, а таксама машына для збору бавоўны, збожжа і інш.’ [2, т.3, с.514] ; *пашыральнік* ‘той, хто пашырае што-н.’ > ‘прыстасаванне для пашырэння, расшырэння чаго-н. у машынах, механізмах’ [2, т.4, с. 149];

е) установы або прадпрыемства і калектыву, які працуе там: *аўтабаза* ‘транспартнае прадпрыемства па арганізацыі перавозак на аўтамабілях, а таксама месца стаянкі, захавання запасных частак і рамонту аўтамабіляў’ > ‘працоўны калектыў аўтабазы’ [2, т.1, с.301]; *аўтакалона* ‘прадпрыемства аўтатранспарту’ > ‘працоўны калектыў прадпрыемства’ [2, т.1, с. 301]; ж) сродкаў перамяшчэння і іх месцазнаходжання: *аўтапарк* ‘сукупнасць аўтамабільнага рухомага саставу’ > ‘аўтатранспартнае прадпрыемства са стаянкай і тэхнічным абслугоўваннем пасажырскага транспарту’ [2, т.1, с. 302]; з) заводаў і марак іх вырабу: *БелАЗ*, *ВАЗ, ГАЗ, ЗІЛ, КамАЗ, КрАЗ, МАЗ* і інш.

У семасіялагічным аспекце пры метанімічным пераносе адбываецца з’яўленне ў слове новай архісемы, што змяшчае асноўны кампанент /АК/ значэння. Папярэдняя архісема ў большасці выпадкаў ператвараецца ў дыферэнцыяльны кампанент /ДК/ значэння: *аўтапрадпрыемства* ‘прадпрыемства /АК/, якое ажыццяўляе /ДК/ перавозку /ДК/ грузаў /ДК/ і людзей /ДК/ і падтрымку аўтамабіляў /ДК/ у прыгодным для эксплуатацыі /ДК/ стане /ДК/’ > ‘працоўны /ДК/ калектыў /АК/ прадпрыемства /ДК/’; *спецыфікацыя* ‘вызначэнне і пералік /АК/ спецыфічных асаблівасцей /ДК/ чаго-н./ДК/; размеркаванне /АК/ на разрады, групы /ДК/ ў адпаведнасці са спецыфічнымі асаблівасцямі /ДК/; класіфікацыя /АК/ > ‘тэхнічны дакумент /АК/, у якім ёсць пералік /ДК/ часцей і дэталей /ДК/ якога-н. вырабу /ДК/, а таксама ўказанні /ДК/ на іх колькасць /ДК/, вагу /ДК/, сорт /ДК/ і пад.; дакумент /АК/ з пералікам /ДК/ умоў /ДК/, якім павінен адпавядаць /ДК/ заказаны прадмет /ДК/. Значна радзей пры з’яўленні новай архісемы дыферэнцыяльны кампанент першаснага значэння захоўваецца: *раскідвальнік* ‘той, хто /АК/ займаецца раскідваннем /ДК/ чаго-н. /ДК/’ > ‘прыстасаванне /АК/ для раскідвання /ДК/ чаго-н./ДК/’.

Як вядома, да метаніміі традыцыйна адносіцца і сінекдаха, хаця паміж імі існуе і пэўнае адрозненне. Сінекдаха – замена назвы цэлага назвай асобнай яго часткі або наадварот. Пры сінекдахальным пераносе вытворнае значэнне новых сем не набывае, аднак функцыі сем пры гэтым мяняюцца. “Катэгарыяльна-лексічная сема першаснага значэння становіцца звычайнай, дыферэнцыяльнай, адна з сем намінатыўнага значэння набывае статус катэгарыяльна-лексічнай семы. Функцыя актуальных сем у вытворным значэнні залежыць ад тыпу сінекдахі: “частка – цэлае” або “цэлае – частка”. У першым выпадку семы першаснага значэння адыходзяць на задні план, выступаючы ў якасці імпліцытных сем, у другім – семы першаснага значэння захоўваюцца ў структуры вытворнага” [9, с. 9]. Уласна метанімічны перанос заснаваны на ўдзеле двух розных сумежных дэнататаў і назва аднаго з іх пераносіцца на другі. Сінекдаха выкарыстоўвае адзін дэнатат, і для яго абазначэння бярэцца назва адной або некалькіх функцыянальна важных для данай рэаліі частак: *агрэгат* ‘канструктыўнае спалучэнне ў адно цэлае некалькіх машын, апаратаў для эфектыўнай сумеснай работы’ > ‘складаная частка машыны, апарата, якая ўяўляецца як адзінае цэлае, напрыклад, рухавік аўтамабіля, каробка перадач’[2, т.1, с.107]; *інструмент* ‘усякая прылада для выканання якой-н. работы’ > ‘сукупнасць прылад для якой-н. работы’[2, т.2, с.548]. Даны тып лексіка-семантычнага пераўтварэння таксама адбываецца ў межах адной галіны тэрміналогіі.

У радзе назваў у працэсе трансфармацыі развіваецца міжгаліновая мнагазначнасць: *дыяфрагма* ‘1) мышачная перагародка, якая аддзяляе грудную поласць ад брушной (у млекакормячых жывёл і чалавека); 2) прыстасаванне для змянення дыяметра дзеючай адтуліны ў фота- ці кінааб’ектыве; 3) вертыкальная сценка з бетону, металу і пад. у целе земляных ці камененакідных плацін для забеспячэння іх воданепранікальнасці; 4) кальцавая перагародка ў трубаправодзе для стварэння перападу ціску, каб вызначыць расход вадкасці, газу і пад.’[2, т.2, с. 228] (акрамя тэхнічнай тэрміналогіі, даная лексема выкарыстоўваецца ў будаўнічай, анатамічнай, кіна- і фоталексіцы); *шып* ‘1) востраканцовы цвёрды выступ, нарасць на целе ў некаторых жывёл; 2) выступ на колах, гусеніцах аўтамашын, які садзейнічае счэпліванню з глебай, служыць для лепшага ўпору для руху; 3) канцавая вострая частка вала, якой ён абапіраецца на падшыпнік’[2, т.5(2), с. 429] (лексема належыць тэхнічнай і заалагічнай тэрміналогіі). Для выяўлення спецыфічных асаблівасцей значэнняў полісемантаў мы таксама даследуем іх з пункту погляду сукупнасці семем або лексіка-семантычных варыянтаў. Дэфініцыі даз-

валяюць вызначыць агульныя сэнсавыя інварыянты ‘перагародка’, ‘востраканцовы выступ’, якія дапаўняюцца дыферэнцыяльнымі семантычнымі прыметамі.

Як бачым, сутнасць і ўнутраны механізм працэсу семантычнага пераўтварэння дастаткова поўна выяўляе кампанентны аналіз значэнняў слова, які ставаіць на мэце раскладанне значэння на мінімальныя семантычныя часткі. Паміж лексіка-семантычнымі варыянтамі многазначнага слова захоўваецца цесная сэнсавая сувязь: другасная намінацыя можа змяшчаць у сабе ядзерныя або / і дыферэнцыяльныя семы першапачатковай і адначасова набываць новыя, што істотна ўплывае на змену семантыкі слова. Трансфармацыя тэрміна на лексіка-семантычным узроўні спрыяе пашырэнню семантычнага аб’ёму наймення, павелічэнню колькасці лексічных варыянтаў слова. Даны працэс актыўна садзейнічае развіццю слоўна-фразеалагічных сувязей з агульнаўжывальнай лексікай, узбагачэнню лексічных рэсурсаў беларускай літаратурнай мовы.

Літаратура

1. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 15: Следавікі – Трыо / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 2002. – 552 с.

2. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т. – Мн.: выдавецтва “Беларуская Савецкая энцыклапедыя” імя Петруся Броўкі, 1977 – 1984. – Т. 1-5. Зараз і ў далейшым спасылкі робяцца на гэта выданне, у дужках – адпаведны том і старонка.

3. Лиз, Р.Б. Что такое трансформация?/ Р.Б. Лиз // Вопросы языкознания. – 1961.– № 3. – С. 69-77.

4. Ахманова, О.С. Словарь лингвистических терминов / О.С. Ахманова. – М.: Советская энциклопедия, 1969. – 608 с.

5. Сцяцко, П.У. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П.У. Сцяцко П.У., М.Ф. Гуліцкі, Л.А. Антанюк.– Мн.: Вышэйшая школа, 1990. – 222 с.

6. Кузнецова, Э.В. Лексикология русского языка: Учебное пособие для филологических факультетов университетов / Э.В. Кузнецова. – М.: Высшая школа, 1989. – 216 с.

7. Капанадзе, Л.А. Взаимодействие терминологической и общеупотребительной лексики/ Л.А. Капанадзе // Развитие лексики современного русского языка. – М.: Наука, 1965. – С. 86-103.

8. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мн.: БелЭн, 2004. –448 с.

9. Бирих, А.К. Метонимия в современном русском языке (семантический и грамматический аспект). Автореферат дис. … кандидата филологических наук: 10. 02. 01 / Ленинградский государственный университет. – Л., 1987. – 18 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 81.161.1'367.32

Речевой акт сообщения как синтаксическое средство имплицитного выражения оценки

Т. Н. Полевая

В статье впервые в сопоставительном плане рассматриваются белорусские и английские публицистические материалы с целью выявления способов имплицитного выражения оценки. Выявлена роль речевого акта сообщения и установлены наиболее используемые способы имплицитного выражения оценки в публицистике двух языков.
Ключевые слова: Речевой акт сообщения, имплицитность, мелиоративная оценка, пейоративная оценка, публицистический дискурс.

For the first time Belarusian and English journalistic materials are compared in order to reveal the ways of implicit estimation expression. The role of the message speech act is revealed and the most commonly used ways of implicit estimation expression in journalism of the two languages are set out.
Keywords: message speech act, implicity, meliorative estimation, pejorative estimation, journalistic discourse.

На современном этапе развития лингвистики появляется все большая необходимость в исследованиях, проводящихся на стыке различных отраслей знания, а также объединяющих в себе элементы смежных наук. После этапа исследования языка как отдельной системы в XX и XXI веке начался новый этап – изучение языка в тесной связи с разнообразными экстралингвистическими факторами, включающими говорящего, его собеседника(-ов), ситуацию общения и др. Так, в середине XX века возникла теория речевых актов (Дж. Остин, Дж. Серль), объединяющая в себе элементы лингвистики, риторики и психологии. Согласно данной теории, всякий речевой акт рассматривается как единство трех аспектов – локуция (собственно речепорождение), иллокуция (цель, с которой совершается акт говорения) и перлокуция (тот эффект, которого достигает говорящий).

Развитие массовых коммуникаций и тенденции глобализации делают наиболее актуальным направлением исследование возможностей влияния на сознание адресата при помощи различных языковых единиц. Одной из основных целей влияния на аудиторию является формирование определенного оценочного мнения, что достигается посредством имплицитного выражения авторского оценочного мнения и созданием определенных условий для восприятия данного мнения среди адресатов. В этой связи особый интерес представляет анализ речевых актов с точки зрения их оценочного потенциала, т.е., изучение речевых актов как способа имплицитного выражения оценки.

В научной литературе встречается термин «косвенный речевой акт», использующийся для описания речевых актов, выражающих две цели одновременно. Как пишет Дж. Серль, «*предложение, содержащее показатели иллокутивной силы для одного типа иллокутивного акта, может произноситься для осуществления, кроме того, иллокутивного акта другого типа*», т.е., «*одновременно имея в виду другую иллокуцию с другим пропозициональным содержанием*» [1, с. 196]. Возникает вопрос: поскольку рассматриваемый вид речевого акта также реализует две цели одновременно – описывает некоторое положение вещей и выражает оценочное отношение – может ли он считаться косвенным? Тем не менее, Дж. Серль подчеркивает, что в косвенных речевых актах определяющим фактором является то, что именно имплицируемая цель является основной в процессе коммуникации. Т.е., при совершении косвенного речевого акта его основной целью является вторая, не выраженная буквально цель, и адресат реагирует именно на нее. Так, некоторые формулы вежливости по своей сути представляют вопросы, т.е., директивы, направленные на получение информации, однако их фактической целью является побуждение к определенному действию, риторические вопро-

сы, также будучи директивами по форме, являются экспрессивами по сути (терминология Дж. Серля [2]). Таким образом, поскольку исследуемый вид речевых актов в качестве своей основной функции имеет именно сообщение о какой-либо ситуации, и адресат сознательно реагирует на него, а имплицируемое оценочное суждение является вторичным, следует признать нецелесообразность описания подобных речевых актов как косвенных.

Целью данной статьи является описание и анализ способов имплицитного выражения оценки посредством речевого акта сообщения в публицистическом дискурсе английского и белорусского языков.

Анализ встречающихся в публицистическом дискурсе речевых актов сообщения позволяет выделить 4 наиболее используемых способа имплицитного выражения оценки, различающихся как языковыми, так и внеязыковыми характеристиками: 1) сообщение о действиях автора статьи, субъекта цитирования и под.; 2) сообщение о характеристике действий; 3) сообщение об эмоциях автора, субъекта цитирования и под.; 4) сообщение об отношении автора статьи, субъекта цитирования и под. к предмету речи.

Рассмотрим вышеназванные способы имплицитного выражения оценки на примерах из современных белорусских и англоязычных (английских и американских) печатных средств массовой информации.

1. Сообщение о действиях автора статьи, субъекта цитирования и под.

СІС – Булыка, А.М. Слоўнік іншамоўных слоў: У 2 т. Т.1: А–Л – 736 с., т.2: М–Я – 736 с. – Мн.: БелЭн., 1999.

ТСБМ – Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5-ці т. / Пад гал. рэд. К.К.Атраховіча (Кандрата Крапівы). – Мн.: БелСЭ. 1977.– Т.1 – 608 с.; 1987 – Т.2 –768 с.

Ф. – Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка : В 4 т. – 2-е изд., стер. М.: Прогресс, 1987 – Т.4 – 860 с.

ЭСБМ – Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. – Мн.: Навука і тэхніка, 1978 – Т.1 – 440 с.; 1985 – Т.3 – 408 с.; 1988 – Т.4 – 327 с.; 1990 – Т.6 – 287 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 821.162.1 Міцкевіч 030=161.08:81'255.4

Моўна-выяўленчыя адметнасці перакладаў балад Адама Міцкевіча на ўсходнеславянскія мовы

К. Л. Хазанава

Мэта артыкула – аналіз лексіка-семантычнай і эмацыянальна-экспрэсіўнай эквівалентнасці балады А.Міцкевіча "Czaty" (у перакладзе "Ваявода") і яе перакладаў на беларускую мову Янкам Купалам і на рускую мову А. С. Пушкіным. У артыкуле прасочваюцца выяўленчыя трансфармацыі перакладу балады на беларускую мову паводле супастаўлення перакладнога тэксту ў зборніку Я. Купалы "Шляхам жыцця" (1913) і пазнейшага варыянту перакладу, перапрацаванага беларускім паэтам да 850-годдзя з дня смерці А.Міцкевіча (1940). Аўтар артыкула даследуе лексічныя разыходжанні паміж польскамоўным арыгіналам і беларускімі перакладамі балады, пры гэтым адбываецца супастаўленне з рускім перакладам. Асаблівая ўвага надаецца спосабам дасягнення эмацыянальна-экспрэсіўнай эквівалентнасці ўсходнеславянскіх перакладаў польскамоўнаму арыгіналу.
Ключавыя словы: пераклад, арыгінал, лексіка-семантычная эквівалентнасць, вар'іраванне, эмацыянальнасць, экспрэсіўнасць, нацыянальна-гістарычны каларыт.

The purpose of the article "Linguistic and visual features of translations of Adam Mitskevich's ballads into the East Slavic languages" is the analysis of lexical-semantic and emotional and expressive equivalence of Mitskevich's ballad "Czaty" (translated "Leader") and its translations into the Belarusian language by Yanka Kupala and into the Russian language by Alexander Pushkin. The article traces the visual transformation ballad translation into the Belarusian language by comparing the translated text in Y. Kupala's "Along life's road" (1913) and his later version of translation changed by the 850th anniversary of Adam Mitskevich's death (1940). The author of the article investigates the lexical differences between the Polish original and the Belarusian translations of the ballad, also comparing with the Russian translation. Particular attention is given to the ways of achieving emotional and expressive equivalence of East Slavic translations and the Polish original.
Keywords: translation, original, lexical and semantic equivalence, variation, emotion, expressiveness, national and historical coloring.

Адам Міцкевіч нарадзіўся на Навагрудчыне, сябе лічыў ліцвінам, чароўную паэзію стварaў па-польску. На ўсходнеславянскія мовы творы Адама Міцкевіча пачалі перакладаць амаль адразу пасля іх узнікнення.

Цікавасць для лінгвістычнага даследавання ўяўляе супастаўленне перакладаў аднаго паэтычнага твора на беларускую і рускую мовы. Мэтазгоднасць падобнага даследавання павялічваецца, калі аб'ектам даследавання з'яўляюцца пераклады выдатных паэтаў, геніяў нацыянальных літаратур. Так, зараз маюцца ў наяўнасці пераклады Міцкевічавых вершаў, зробленыя прызнанымі майстрамі паэтычнай творчасці. Звернемся да ўсходнеславянскіх перакладаў балады А. Міцкевіча "Czaty" (у перакладзе "Ваявода").

Мэта нашага даследавання – аналіз лексіка-семантычнай і эмацыянальна-экспрэсіўнай эквівалентнасці балады А.Міцкевіча "Czaty" і яе перакладаў на беларускую мову Янкам Купалам і на рускую мову А. С. Пушкіным.

"Цяжкая праца – перакладаць Міцкевіча.. Гэты вялікі паэт можа спалучаць розныя тоны і не апынуцца ў дысгармоніі!" [1, с. 287]. І міцкевічаўскія "яркасць і багацце фарбаў свету" [1, с. 287] мусяць паўстаць у перакладным іншамоўным тэксце.

Грунтоўнасць творчай працы Я. Купалы-перакладчыка і яго нястомныя пошукі лепшых беларускіх адпаведнікаў польскіх моўных сродкаў дазваляе ўбачыць першадрук перакладу беларускага паэта. Назіраць шлях выяўленчых трансфармацый, пройдзены Я. Купалам як перакладчыкам балады А. Міцкевіча, дае магчымасць супастаўленне перакладнога тэксту ў зборніку "Шляхам жыцця" (1913) і пазнейшага варыянта перакладу, перапрацаванага да 850-годдзя з дня смерці А. Міцкевіча (1940).

Вар'іраванне перакладаў балады Міцкевіча *"Czaty"* пачалося ў загалоўку. Дакладнае вызначэнне польскага *czaty* – 'вартаванне', 'засада', 'пільнаванне'. У першасным варыянце

перакладу Я. Купала даў назву *“Удагонку”* [2, с. 410], што было заснавана на змесце балады, але не рэалізавала семантыку арыгінальнай назвы. Пазнейшая назва перакладу – паводле сацыяльнай прыналежнасці героя – “*Ваявода*” [2, с. 338] – абумоўлена імкненнем ужыць у якасці намінацыі субстантыў і падказана назвай вольнага перакладу балады на рускую мову А. С. Пушкіным [3, с. 323].

Лексічныя разыходжанні варыянтных перакладаў абумоўлены таксама жаданнем Я. Купалы зрабіць тэкст балады больш зразумелым беларускім чытачам: *Masz tu z prochem* ***leszczyńskim*** *sakiewkę* [4, с. 98] – *На, тут з порахам* ***гданскім*** *сакеўку* [2, с. 412] – *На! тут з порахам* ***свежым*** *машонка* [2, с. 340]. Я. Купала змяніў гатунак пораху на больш знаёмы беларусам: *leszczyński – гданскі*. Дакладнасць вызначэння тыпу пораху не адыграла ролі ў перадачы семантычнай і стылістычна-вобразнай напоўненасці арыгінала. Таму канчатковы варыянт беларускага перакладу абазначыў іншую ўласцівасць пораху (*свежы*).

Часам ранні і позні пераклады неаднастайныя ў вобразных адносінах: *On nie kochał, nie jęczał* [4, с. 97] – *А ён з каменным сэрцам* [2, с. 411]. Фразеалагізм *з каменным сэрцам* ‘жорсткі, суровы’, заснаваны на метафарычным азначэнні, валодаў адмоўнай ацэначнасцю, выразіў нянавісць гаворачага да аб’екта гаворкі. Аднак мова арыгінала не мела фразеалагічнай адзінкі. Крыніца арыгінальнай экспрэсіўнасці – антытэза: *Będę kochał i jęczeł daleki*; *On nie kochał, nie jęczał* [4, с.97] – страцілася. Пазнейшы пераклад выкарыстаў набліжаную да арыгінала канструкцыю: *І любіць, і цярпець буду здаля, – Не любіў ён нікольки* [2, с.338]. Супрацьпастаўленне *суб’ект – аб’ект гаворкі*, такім чынам, адноўлена, і выразнасць перакладу створана падобнымі да арыгінала сродкамі.

Захаванне ў дадзеных радках перакладу супрацьпастаўлення неабходна і з пункту погляду семантычнай эквівалентнасці, і ў адносінах перадачы эмацыянальна-экспрэсіўнага зместу балады, які грунтуецца на проціпастаўленні *стары багаты муж-ваявода – малады каханак*.

Дарэчы, захаваў кантраст і А. С. Пушкін: *Сколько лет тобой страдал я, Сколько лет тебя искал я!.. не искал он, не страдал он* [3, с. 324]. Хоць лексіка-семантычная эквівалентнасць на ўзроўні слоў тут адсутнічае, зменены часавыя параметры дзеяння (у арыгінале балады – *będę kochał i jęczeł* – будучы час, у рускім перакладзе – *страдал, искал* – мінулае дзеянне), але пераклад перадаў і сэнсавую, і стылістычную напоўненасць арыгінала менавіта дзякуючы канструкцыі супрацьпастаўлення.

Балада А. Міцкевіча “Czaty” – твор, які на працягу ўсяго тэксту трымае ў напружанні. Аўтар дасягае такога ўздзеяння рознымі моўнымі сродкамі. Напачатку ахоплены падазрэннямі жонкавай здрады *wojewoda* ***zdyszany****, Bieży w zamek* ***z wściekłością i trwogą*** [4, с. 96]. Я.Купала ўжыў іншы эпітэт і пакінуў акалічнасці: ***Бледны*** *ўбег ваявода У палац свой* ***са злосцю й трывогай*** [2, с. 338]. Першыя маркеры эмацыянальнага ўзбуджэння персанажа захаваны ў беларускім перакладзе. Далей А. Міцкевіч стан ваяводы перадаў праз указанне на яго дзеянні: *spórzał w loże swej żony, Pójrzał, zazdrżał.. wzrok opuścił ku ziemi, I rękami drżącemi Siwe wąsy pokręca I duma* [4, с. 96]. Купалаўскі пераклад паслядоўна перадаў кожны рух, апісаны арыгіналам: *У пасцель жонкі глянуў, Глянуў там.. Ў дол патупіўшы вочы, Увесь дрыжыць, утось мармоча, Вусы тузае, думае дзіка* [2, с. 338].

Эмацыянальнасць польскага *zazdrżał* ‘задрыжаў’ у арыгінале ўзмацніў выраз *rękami drżącemi* ‘дрыжачымі рукамі’. Гэтае семантычнае напаўненне ў беларускім перакладзе перадаў дзеяслоў *дрыжыць*, а інтэнсіўнасць нервовасці адлюстравана ў выразе *штось мармоча* і акалічнасці *дзіка*, адсутнымі ў арыгінале і дабаўленымі перакладчыкам. Удалы адпаведнік падабраў Я. Купала да польскага *wzrok opuścił ku ziemi*: выраз *.. у дол патупіўшы вочы* ўтрымлівае стражытнарускую лексему *долъ* ‘ніз, ніжні край’, *долу* ‘уніз’ [5, с. 463].

І тут прасочваецца азнаямленне Я. Купалы з перакладам А. С. Пушкіна. У рускім перакладзе ўзбуджанасць ваяводы перададзена не праз указанне на яго дзеянні, а праз эпітэты: *И,* ***мрачнее чёрной ночи****, Он потупил* ***грозны*** *очи* [3, с. 323]. Верагодна, што Я. Купала выкарыстаў лексему *патупіўшы* (вочы) услед за пушкінскім *потупил* (очи).

Вядома, што нервовасць чалавека адзначаецца перш за ўсё ў яго вачах, рухах і руках. Перакладчыкі балады ўслед за аўтарам арыгінала ўказалі на вочы ваяводы (*wzrok opuścił ku ziemi – .. у дол патупіўшы вочы – потупил грозны очи*), яго рухі і, натуральна, не забылі пра

рукі, якія ў ваяводы таксама неспакойныя: *rękami drżącemi Siwe wąsy pokręca – Вусы тузае – стал крутить свой сівый ус*.

Аднолькавыя высновы аб эмацыянальнай напружанасці дзеяння рэцэптары арыгінала і перакладу мусяць дапускаць паводле розных паведамленняў тэкстаў "Ваяводы": *I z twych ustek różanych, i z twych liców rumianych, Mnie wsbronione słodycze* [wojewoda] *wysysał* [4, с.97] – *Твае – мне на загубу – Цалаваць шчочкі, губы Будзе ён* [ваявода] *пацалункам уражым* [2, с.339]. Беларускамоўны тэкст захаваў сітуацыю арыгінала шляхам указання на іншыя яе ўласцівасці. Пераклад Я. Купалы мае адрозную ад арыгінала накіраванасць апісання. У тэксце А. Міцкевіча ўтваральнік гаворкі (*Pan młody*) выказаўся адносна сябе і сваіх пачуццяў. Словы арыгінала выразілі шкадаванне і крыўду (*mnie wsbronione*), пяшчоту і замілаванне (эпітэты *różany*, *rumiany*; метафара *słodycz.. ustek*) і нянавісць да саперніка (пераносна-вобразнае ўжыванне дзеяслова *wysysać*). Апошняе пачуццё з перыферыйнага ў эмацыянальна-экспрэсіўным малюнку мовы арыгінала воляю перакладчыка стала асноўным (фразеалагізм *на загубу* 'шкодна', эпітэт *уражы* 'варожы'). Колькасна невялікае выяўленне ў перакладзе беларускага паэта знайшло каханне героя (дэмінутыўная суфіксацыя – *шчочкі*).

Адметна, што ў перакладзе А. С. Пушкіна на рускую мову гэтыя радкі апушчаны. Хутчэй за ўсё рускі паэт палічыў больш вартым даць у сваім перакладным тэксце пранізліва-шчымлівыя словы маладога юнака, закліканыя ў нейкай меры апраўдаць трагічны фінал балады: *Серебром лишь побряцал он, И ему ты отдалась Я скакал во мраке ночи Милой панны видеть очи Руку нежную пожать* [3, с. 324].

Цікава, што ў беларускім перакладзе балады эмацыянальны акцэнт у большай ступені зроблены на перадачу пачуццяў узбуджэння, нервовасці, адчаю і менш – на адлюстраванне кахання і замілаванасці маладых людзей. Так, у купалаўскім тэксце адсутнічае зваротак арыгінала: ***Kochana****! Więc już wszystko, jam wszystko utracił* [4, с. 96] – *дык усё, што было, ўжо далёка*! [2, с. 339].

Эмацыянальная дыслакацыя беларускага перакладу сведчыць аб імкненні Я. Купалы як перакладчыка пераўвасобіць тэкст балады беларускімі моўнымі сродкамі з улікам псіхалагічна-перцэптыўных асаблівасцей беларускага чытачоў.

Не сустракаем зваротак і ў рускім перакладзе: *всё пропало, Чем лишь только я, бывало, Наслаждался, что любил* [3, с. 324].

Разам з тым, неабходна адзначыць, што Я. Купала даволі дакладна абапіраецца на тэкст арыгінала пры перадачы ў беларускім тэксце балады пачуццяў закаханых: *Nawet twoje westchnienia, nawet ręki ściśnienia* [4, с. 97] – *і тваё уздыханне, і тваё прывітанне* [2, с. 339]. А.С.Пушкін дадаў у гэтыя радкі трапныя мастацкія азначэнні: ***Белой*** *груди воздыханье,* ***Нежной*** *ручки пожиманье* [3, с. 324].

Імкненне Я. Купалы напоўніць свой пераклад беларускімі моўнымі сродкамі і такім чынам палепшыць успрыманне балады беларускімі чытачамі ляжыць у аснове змяненняў фразеалагічнага ладу арыгінала, якія суправаджаліся зрухамі канататыўнага зместу перакладу адносна арыгінала: *Tyś mu wszystko przedała* ***na wieki*** [4, с. 97] – *Ты яму прадалася* ***без жалю*** [2, с. 339]. Эмацыянальнасць выслоўя МА *na wieki* 'назаўсёды' была другаснай, апасродкаванай часавым параметрам. Фразеалагічная адзінка арыгінала праз указанне на тэрмін перадала адносіны гаворачага да дзеяння, ускосна выразіўшы яго незадавальненне і жалобу. У беларускім перакладзе фразеалагізм *без жалю* 'не шкадуючы' адлюстраваў пачуцці непасрэдна. Эмацыянальнасць склала і семантычнае, і канататыўнае напаўненні фраземы. Акрамя таго, спалучэнне *без жалю* выразіла адносіны да дзеяння не суб'екта гаворкі, а яе аб'екта.

У рускім тэксце балады фразеалагізмы ўвогуле адсутнічаюць: *Серебром лишь побряцал он, И ему ты отдалась* [3, с. 324]. Тут эмацыянальнасць і экспрэсіўнасць закладзена перакладчыкам у дзеяслоў *отдалась*.

У перакладзе Я. Купалы сустракаюцца выпадкі замены фразеалагічным спалучэннем нефразеалагічнай моўнай адзінкі: *Ona jeszcze* ***nie słucha*** [4, с. 98] – *Яна ўсё шчэ* ***як глуха*** [2, с. 340]. У семантычным плане дзеяслоў *nie słuchać* 'не слухаць' і фразеалагізм *як глуха* 'не чуць' супалі. Аднак застылае параўнанне ў аснове фразеалагізма зрабіла мову беларускага перакладу вобразна і эмацыянальна насычанай. Параўнанне аформлена на аснове вобразнай аналогіі,

пашыранай у беларускай вусна-паэтычнай творчасці. Няпоўная структура кампаратыва, адсутнасць у тэксце прыкметы параўнання і пазатэкставае яе выяўленне ў свядомасці чытачоў садзейнічала працэсуальнай дакладнасці і натуральнай вобразнасці беларускага перакладу.

А. С. Пушкін прааналізаваў эмацыянальны стан маладой жонкі ваяводы, і таму ў рускім перакладзе не знаходзім дакладных лексічных адпаведнікаў польскаму тэксту, але нервовае напружанне, аб якім апавядае А. Міцкевіч, захавана: *Панна плачет и тоскует* [3, с. 324].

Выкарыстанне Я. Купалам адзінак народна-гутарковага маўлення спрыяла арганічнаму ўваходжанню перакладнога верша ў беларускую літаратурна-моўную прастору: *zimny dreszcz mię* [kozaka] *przechodził* [4, с. 98] – Я [казак] ўздрыгнуў, *як на лёдзе* [2, с. 341]. Метафару арыгінала (*зімовае дрыжанне на мяне надышло*) перакладчык перавыразіў устойлівым параўнальным выслоўем *як на лёдзе*. Прыкмета кампаратыўнасці, як і ў папярэднім выпадку, фармальна адсутнічае. Непасрэднае суаднясенне суб'екта параўнання з аб'ектам парадзіла паралелізм неаформленых асацыяцый прыкмет суб'екта з прыкметамі аб'екта (*як на лёдзе* 'хістка', 'няроўна', 'холадна'). Магчымасць выбару рэцыпіентам аднаго з патэнцыяльных семантычных кампанентаў параўнальнага фразеалагізма стала галоўнай крыніцай экспрэсіўнасці беларускга перакладу. Замену метафары на фразеалагізм вымагаў улік стылістычнага кампанента мовы як характарыстыкі дзеючых асоб. Даслоўная перадача метафарычнага выказвання зрабіла б мову простага слугі-казака афіцыйнай, кніжнай, што ўнесла б у мову перакладу стылявую блытаніну. Параўнальная фразема ўсталявала стылістычную эквівалентнасць перакладу і арыгінала. Рускі пераклад захаваў метафару арыгінала: *плачут очи, Дрожь берёт* [3, с. 324].

Гэты самы персанаж у творы кажа: *jakiś bies mię napada* [4, с. 98]. Я. Купала ўжыў народна-гутарковы прастамоўны адпаведнік: *нейкі чорт мною смыча* [2, с. 340]. Пераклад слоў казака на рускую мову таксама паказаў яго прыналежнасць да простага народа шляхам выкарыстання размоўнай лексемы *не можно: Пан мой, целить мне не можно* [3, с. 324].

У купалаўскім перакладзе назіраем моўныя сродкі, накіраваныя на стварэнне ў мове балады гістарычнага каларыту. Так, у тэксце А. Міцкевіча заканамерна ўжываецца клічная форма назоўнікаў: *Hej kozaku, ty chamie* [4, с. 96], *panie* [4, с. 98]. І хаця форма клічнага склону не з'яўляецца марфалагічнай нормай беларускай літаратурнай мовы, у беларускім перакладзе яна захоўваецца і нясе свой стылістычны цяжар: *Гэй, казача, ты хаме* [2, с. 338], - *Пане*! [2, с. 340], ..*Кінь, хаме, кракаць*! [2, с. 340].

У перакладзе балады на рускую мову клічная форма заменена на назоўны склон. Аднак гісторыка-нацыянальны каларыт арыгінала ў перакладзе А.С.Пушкіна перадаюць лексемы *пан* [3, с. 324], *хлопец* [3, с. 323], *панна* [3, с. 324], *сивый* (ус) [3, с. 324], успрыняўшы якія рускамоўны перцыпіент адразу ж уявіць сабе месца дзеяння твора.

Акрамя змен, выкліканых імкненнем перакладчыка адлюстраваць нацыянальна-культурны беларускі моўны кампанент, у перакладзе Я. Купалы назіраюцца лексіка-семантычныя разыходжанні з польскім арыгіналам, абумоўленыя творчай індывідуальнасцю і самабытнасцю перакладчыка: *Wyżej.. w prawo.. pomału* [4, с. 98] – *Управа.. вышэй.. цэль дбайна*!.. [2, с. 340]; *Pierwej musi, w łeb dostać Pan młody* [4, с. 98] – *Жаніха змяту перш назаўсёды* [2, с. 340]. Эмацыянальна-семантычны змест прыслоўя арыгінала *pomału* 'памалу', 'асцярожна' выразіла словазлучэнне *цэль дбайна*. Спалучэнне арыгінала *pan młody* заменена словам *жаніх*, фразеалагізм *w łeb dostać* 'забіць' – словам *змяту*, якое патрабавала дадатку акалічнасці часу *назаўсёды*.

Апора на мову арыгінала і, разам з тым, індывідуальная творчасць перакладчыка назіраецца ў радках А. С. Пушкіна: *Цель ей в лоб.. Левее.. выше. С паном справлюсь сам. Потише: Прежде я; ты погоди* [3, с. 325].

Часам Я. Купала змяняў абставіны дзеяння: *Wojewoda z kozakiem*, ***przyklękneli* za *krzakiem*** [4, с. 98] – *З казаком ваявода* ***Прыкуцнулі* ля *ўхода*** [2, с. 340]. Калі лексему *przyklęknąć* 'стаць на калені' можна лічыць суадноснай лексеме *прыкуцнуць* 'схавацца ў кутку' паводле іх супадзення ў семе 'прыладкавацца', наяўнай у абедзвюх частках гэтай міжмоўнай паралелі, то словы *krzak* 'куст' і *ўход* 'уваход' не з'яўляюцца адпаведнымі. У бела-

рускім перакладзе ўзнікла новая канкрэтная лакалізацыя падзей. А.С. Пушкін захаваў у сваім тэксце месца дзеяння арыгінала. Хаця даслоўная лексічная адпаведнасць зноў адсутнічае: *А сквозь ветви те глядят* [3, с. 324].

У іншых радках купалаўскага перакладу ўказанне на месцы дзеяння замяніла часавую акалічнасць арыгінала: *Ja na wiernym koniku,* ***przy księżyca promyku,*** *Biegę tutaj* [4, с. 97] – *Я на коніку верным* ***Гэтым полем бязмерным*** *Сюды мкнуся* [2, с. 339]. Словазлучэнне *przy księżyca promyku* 'пры праменьчыку месяца' паведаміла аб начным часе дзеяння, а словазлучэнне беларускага перакладу ўказала на вялікую прастору, якую пераадолеў суб'ект руху. Дарэчы, начныя абставіны падарожжа маладога каханка зафіксаваў рускі пераклад: *Я скакал во мраке ночи* [3, с. 324].

Перакладам Я. Купалы і А. С. Пушкіна ўласціва спалучэнне нацыянальнай характэрнасці, перададзенай шляхам захавання сэнсу слоў з яскравасцю беларускай і рускай фразеалогіі, а таксама з адценнямі беларускага і рускага прастамоўя.

Разам з тым, нельга не заўважыць у перакладзе Я. Купалы і асобныя паланізмы, якія не ўвайшлі ў лексічны склад беларускай літаратурнай мовы, але ўжываюцца ў беларускіх гаворках: *кабеціна* [2, с. 338] – у арыгінале *niewiasta* [4, с. 97], заплаціў *гатоўкай* [2, с. 339] – у арыгінале z *gory* zapłacił [4, с. 97].

Праведзенае супастаўляльнае даследаванне эмацыянальна-экспрэсіўнай і лексіка-семантычнай эквівалентнасці перакладаў балады А. Міцкевіча на ўсходнеславянскія мовы паказала, што перакладчыкі, выкарыстаўшы розныя моўныя сродкі, стварылі перакладныя тэксты балады, роўныя па сваіх лексіка-стылістычных уласцівасцях арыгіналу. Пераклад Я. Купалы на беларускую мову і пераклад А. С. Пушкіна на рускую мову з'яўляюцца паўнапраўнымі рэпрэзентантамі міцкевічаўскай балады ў беларускамоўным і рускамоўным асяроддзях, адпаведна. Перакладчыкі абыходзіліся з польскамоўным тэкстам творча, не стваралі даслоўны пераклад. У выніку ў А.С. Пушкіна атрымалася больш вольнае пералажэнне арыгінала. Разам з тым, рускі паэт пакінуў у перакладзе моўныя паказальнікі нацыянальна-гістарычнага каларыту арыгінала. Пераклад Я. Купалы больш блізкі да арыгінала. Аднак і ў беларускамоўным варыянце балады знаходзім шматлікія прыкметы купалаўскага творчага таленту.

Літаратура

1. Рыльский, М. Искусство перевода / М.Рыльский. – М.: Советский писатель, 1986. – 336 с.

2 .Купала, Янка. Збор твораў: у 7 т. Т. 3. Вершы, пераклады / Янка Купала; Акад. навук БССР; Ін-т літаратуры імя Янкі Купалы – Мн.: Навука і тэхніка, 1974. – 501 с.

3. Пушкин, А.С. Сочинения: в 3 т. Т. 1. / А.С.Пушкин. – М.: Государственное издательство художественной литературы, 1955. – 500 с.

4. Mickiewicz, Adam. Ballady i romanse / Adam Mickiewicz. – Lipsk: F.A.Brockhaus, 1852. – 113 s.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 821.161.3.08 Сачанка

Дыстантны лексічны паўтор як сродак выяўленчай выразнасці ў прозе Б. Сачанкі

М. М. Хмяльніцкая

У артыкуле даследуецца дыстантны лексічны паўтор і яго функцыі ў прозе Б.Сачанкі.
Ключавыя словы: дыстантны лексічны паўтор, інтэграцыйная функцыя, экспрэсіўная функцыя, дыяфара, анафара, анадыплозіс, паўтор, экспрэсівізацыя.

The article investigates the distant lexical repetition and its functions in B. Sachenko's prose.
Keywords: distant lexical repetition, integration function, expressive function, diaphor, anaphor, anadiplosis, repeat, expressivization.

Дыстантны лексічны паўтор – гэта ўзнаўленне ідэнтычных слоў, канструкцый на адлегласці ў межах сказа або звышфразавага адзінства: *Ліза не загінула, не – была жывая. І ўвесь час, як потым даведаўся Глеб, шукала яго. Шукала ў тым горадзе, дзе яна вырасла і дзе сустрэла сваё каханне, шукала ў вёсцы, дзе нарадзіўся Глеб і жылі некалі яго бацькі, шукала ўсюды, дзе толькі можна было. І знайшла, калі ён служыў пад Масквою...* [1, с. 10].

Дыстантны лексічны паўтор (ДЛП) у мове прозы Барыса Сачанкі – актыўны сінтаксічны сродак экспрэсіўнасці творчай манеры празаіка. З яго дапамогай пісьменнік імкнецца забяспечыць унутранае адзінства тэксту, захаваць яго цэласнасць, актуалізаваць галоўнае, уздзейнічаць на пачуцці, каб выклікаць пэўны эмацыянальны настрой у адрасата і захаваць яго на працягу ўсёй гутаркі.

ДЛП шматфункцыянальны. Гэта звязана з частатой ужывання (напрыклад, на с. 164 зборніка апавяданняў «Горкая радасць вяртання» злучнік **і** паўтараецца 25 разоў, часціца **не** – 15); месцам у сказе, яго аналагам, у звышфразавым адзінстве, прызначэннем.

Функцыі лексічнага паўтору ў прозе Барыса Сачанкі разнастайныя. Да найбольш пашыраных можна аднесці наступныя:

• Інтэграцыйная функцыя. Сказ – адносна самастойная адзінка. У апошні час лінгвістаў цікавіць значэнне слова, якое ўзнікае ў кантэксце. Толькі вывучэнне тэксту дазваляе вызначыць механізм злучэння сумежных слоў і сказаў, актуалізацыю сувязей між імі з дапамогай лексічных, лексіка-граматычных і іншых сродкаў.

Асацыятыўнае значэнне, якое слова можа набываць у тэксце, рэалізуецца ў большай ці меншай ступені ў залежнасці ад семантычнай адлегласці паміж сістэмным (узуальным) і кантэкстуальным (аказіянальным) значэннем. Сапраўдны вобраз ствараецца ў межах звышфразавага адзінства: *Калісьці... Хто можа сказаць цяпер, што было калісьці тут, дзе сядзім мы поплеч і ціха мілуемся, марым пра наша недалёкае светлае заўтра?...* [1, с. 122]. Цікавасць выклікае першы сказ. У кантэксце дадаецца сэнс, рэалізуецца не толькі асноўнае семантычнае ядро значэння, але і дадатковыя сузначэнні, якія закладзены ў самой назве апавядання «Калісьці…», у першым яго сказе: *Калісьці тут грымеў бой. Ірваліся бомбы, снарады, свісталі асколкі і міны. Скрыгатала жалеза, вялізнымі чорнымі кустамі ўзлятала ў паветра то тут, то там зямля. Захліпаліся ў нейкім адчайным перастуку кулямёты, дзыўкалі кулі. Крычалі, прасілі помачы параненыя. І ўсюды пахла, смярдзела порахам. Порахам і смерцю…* [1, с. 122]. Наяўнасць шматкроп'я ў апошнім сказе, як і ў самой назве абразка, будзіць уяўленні пісьменніка і чытача. Гэта звязана непасрэдна з ужываннем слова «калісьці», новыя адценні значэння якога нараджае сказ: ад вобразнасці – да канкрэтызацыі.

Інтэграцыя слова тэкстам адбываецца паступова: напрыклад, абразок «Шчасце»:

– *Шчасця! Шчасця!*

Як хочам, як прагнем усе мы шчасця!

А што такое шчасце?...

Ці не таму і не знаходзіць яго сёй-той, колькі ні жыве, бо не ведае сам, чаго шукае?.. [1, с. 109].

Першы сказ і другі – кантактны лексічны паўтор назоўніка ў няпоўным сказе, што стварае вобраз, які атрымае далейшае развіццё ў наступных сказах. Адсутнасць галоўных членаў сказа, ужыванне клічніка асабліва падкрэсліваюць катэгарычнасць выказвання. Наступны сказ – прагрэсіўнае развіццё апавядання: адбываецца канкрэтызацыя гэтай непаўнаты. Сказ-абзац звязвае паміж сабою дыстантны паўтор назоўніка *шчасце,* як і наступны (зноў жа) сказ-абзац, які быццам вяртае чытача да першага сказа. Такая кальцавая сувязь стварае цэльнасць тэксту, падказвае нам, што пра ўсё гэта апавядальнік думаў не раз.

Экспрэсіўная функцыя пэўнага знака ўзмацняецца ў выніку вылучэння якога-небудзь канкрэтнага яго значэння на фоне астатніх. Звычайна гэта дасягаецца шляхам парцэляцыі: *Таму ён, Косцік, і насіў заўсёды пры сабе запіску. Запіску да яе, Тасі. Запіска штодзень перапісвалася, мяняліся словы і сказы, аставалася нязменным толькі адно – пачуццё. Пачуццё да яе, Тасі. І ўчора запіска была пры ім. І ён памкнуўся быў перадаць запіску ёй, Тасі. Але...* [2, с. 55]. Расчляненне павышае інтаніраванасць тэксту: прачытанне, нават унутранае, становіцца перарывістым, колькасць лагічных акцэнтаў павялічваецца, што надае данаму тэксту адценне размоўнасці, а паўтор, надзелены асобай сілай уздзеяння, «выконвае ролю сэнсавага цэнтра» [3, с. 9].

Дыяфара – стылістычны прыём, сутнасць якога «ў звароце назад, да таго, што нядаўна прагучала, і паўтор яго ў змененым, часцей за ўсё, узмоцненым значэнні» [4, с. 244]: – ... *Я верыў, як тысячы, мільёны, таксама Гітлеру, фашыстам... Ды як, як верыў!..* [1, с. 33]. У чытача яшчэ на слыху *верыў*, але зварот да яго ў наступным сказе надае адценне жалю і расчаравання. Таму, як слушна заўважае Я.В. Клюеў, дыяфара – «драматычная фігура», якая вельмі «дыялагічная»: падхват пытання субяседніка, пытанне да сябе самога – узмацненне суб'ектыўна-мадальных значэнняў: *Можна было і лепшае што-небудзь згатаваць, – сказала, уздыхнуўшы, маці, падсаджваючыся таксама да стала. – Але няма дзеля каго». – «А сабе?» – «Сабе? – усміхнулася сарамліва, квола, аднымі куточкамі губ маці. – Эх, як нарадзіліся вы ў мяне, дзеці, я ніколі нічога сабе не рабіла. Усе дзеля вас, дзеля вас.. »* [1, с. 177].

Анафара – стылістычны прыём, для якога характэрны паўтор аднолькавых слоў, спалучэнняў у пачатку сказаў: *Прыехала яна – Вольгачка, Волечка – да іх у вёску на другім годзе вайны. Прыехала, каб працаваць у школе* [1, с. 230]. Дзеяслоў *прыехала* знаходзіцца ў пачатку сказа – адной з асноўных сінтаксічных пазіцый. Такое словаразмяшчэнне заслугоўвае ўвагі, бо Волечка, дзяўчо, ніякая не настаўніца, але, «каб з голаду не пухнуць, згадзілася вучыць дзяцей» там, у чужой вёсцы, у такі складаны час. Канечне, *прыехала* – і адразу змяніла жыццё Лявону, які з першага моманту адчуў, зразумеў (і не памыліўся!): гэта – лёс.

Гэта ж чортведама што... Забралі зямлю... Забралі коней, валоў, кароў... Забралі тое, чым жыў, што выношваў у душы столькі гадоў, пеставаў, як самае дарагое і запаветнае... [2, с. 30]. Наяўнасць дзеяслова *забралі* ў пачатку сказаў узмацняе напружанасць моманту, перадае хваляванне героя. *Яна [Алена] чакае грошай, чакае зямлі, чакае, каб ясна было – забяруць у астрог, асудзяць Халімона ці не. Яна проста жыць болей не можа так, у чаканні* [1, с. 232]. Займеннік *яна* выступае сродкам не толькі злучэння сказаў, але і «расчляненне» іх, стварае эмпірычную канкрэтнасць, адзіную, непаўторную сітуацыю.

Паўтор можа быць выражаны службовым словам. Найчасцей сустракаецца злучнік *і: Да размовы з братам, Косцікам, Іван доўга рыхтаваўся. І так, і гэтак меркаваў, прыкідваў, як і пра што гаварыць. Некалькі разоў раіўся з жонкаю, гутарыў з дырэктарам школы Андрэем Макаравічам Сушчэнем. І сам сабе Іван наказваў, і іншыя разумныя людзі паўтаралі...* [1, с. 70].

Выкарыстанне злучальнага спалучальнага злучніка *і* ў прозе Барыса Сачанкі даволі частая з'ява: *І Іван Кузьміч згадаў, што і вырас ён у такім лесе – хадзіў і па ягады, і па грыбы, і па арэхі* [ГРВ, 125], што робіць мову аўтара адрывістай, дапамагае перадаць роздум героя над гармоніяй жыцця: *Так і не пазваніў у той дзень каму б там ні было Іван Кузьміч, так*

ні да каго і не паехаў, нікому ні ў чым не прызнаўся, не папрасіў дапамагчы. Тое ж было і назаўтра, паслязаўтра... [1, с. 115].

Паўтор злучніка *і* не толькі ўносіць у сказ адценне размоўнасці, але і выражае далучальную сувязь: *Падышло і яшчэ некалькі чалавек. Хоць Іван Кузьміч напачатку іх і не пазнаў, але потым быццам павалока з вачэй спадала, успамінаў былых сваіх аднавяскоўцаў, а то і сяброў. І гаварыў з імі, распытваў пра іх жыццё-быццё, сам пра сябе тое-сёе расказваў. На радасці, што сустрэліся, выпівалі, хадзілі гуртам ад кампаніі да кампаніі, набліжаліся да магіл былых сваіх таварышаў, стаялі, успаміналі... І хоць Іван Кузьміч і не ахвотнік да выпіўкі быў, а ўсё ж назбіраўся, прыгубляючы то тут, то там чарку, то за сустрэчу, то за супакой душы. І бачыў, адчуваў Іван Кузьміч, што яго не забылі ў Ліпаўцы, помніяць. І рады, шчыра рады, што прыехаў, прыйшоў сёння разам з усімі на могілкі. І ён, Іван Кузьміч, таксама быў рады, забыўся на ўсе свае нялёгкія думкі і крыўды. Не, не ўсё яшчэ страчана! Іван Кузьміч зноў быццам стаў тым, кім і быў, - звычайным чалавекам, такім, якімі былі на могілках у той дзень усе* [1, с. 146].

Дыстантны лексічны паўтор утварае стылістычную фігуру *полісіндэтон* – шматзлучнікавасць: ...*Улетку да самай восені няўпраўка. Не паспееш з жнівом скончыць – лён трэба браць, каноплі. А там, глядзіш, і на бульбе гіч пачарнела, зжоўкла – капаць трэба бульбу. Каня ў плуг – і ... І падворваць, і выбіраць, і на воз грузіць, і вазіць, і сушыць... Важданіны з бульбай да самых халадоў хапала, бо яе трэба і перабіраць, і ў капцы закапаць. Ды так, каб і не згніла, і не змерзла* [1, с. 116].

Анадыплозіс – гэта падхват слоў, спалучэнняў, сказаў у межах розных сінтагмаў: *Сёння здаецца, што праўда на баку етага, а заўтра... Заўтра і сам не ведаеш, дзе праўда, дзе няпраўда* [2, с. 31]. Адна з асноўных яго функцый – стварэнне моцнага семантычнага эфекту: «*А можа, ніколі ўжо і не пабачу ўсяго гэтага... Бо вайна – гэта перш за ўсё слёзы і смерць... Слёзы і смерць блізкіх і знаёмых, слёзы і смерць соцень, тысяч людзей...*» [2, с. 116]. У творах Барыса Сачанкі анадыплозіс выконвае і функцыю экспрэсіўнага выдзялення слова: *Што Косцік вырас неслухам, Мікалай вінаваціў сябе. Сябе і Хору* [2, с. 34]; *Вось пайшоў, можа, і не вернецца. А цяпла бацькавага з сабою не панёс... Не панёс...* [2, с. 136].

Падпарадкавальныя сродкі сувязі: *што, дзе, каб* – акрамя канкрэтызацыі слоўнага вобраза надаюць сказу і функцыю экспрэсіўнага выдзялення: – *Косцік, Косцік, чаму ты ні з кім не раішся, робіш што заманецца, што табе ў галаву ўзбрыдзе?.. Не каму ж небудзь, а табе самому давядзецца за ўсё адказваць! – уздыхае, круціць і круціць галавою Параска* [2, с. 90]; *«Дзе ж, дзе ж ён? » – мучыла пытанне* [2, с. 66]; *«Каб неяк разумна спалучыць адно з адным. Каб і ў атрадзе людзі былі, і ў вёсцы... »* [2, с. 55].

Паўтор – «аб'ект паралогікі, якая кантралюе колькасць і якасць парушэнняў логікі» [4, с. 238], якія могуць стаць «вытокамі эмацыянальнага ўздзеяння тэксту» [5, с. 19]: *«Можа, не па тэлефоне... Машыну выклікаць ды паехаць... Але да каго, да каго ехаць, хто зразумее мяне, як сябе, хто маё гора прыме, як сваё?»* [4, с. 144]; *«Званіць?.. Але каму?.. Хто абароніць, заступіцца, хто не дасць, каб мяне вызвалілі ад пасады, хто паможа?..»* [4, с. 114]. Ужо само па сабе рытарычнае пытанне перадае ўзрушанасць героя, а паўтор слоў завастрае ўвагу чытача, прымушае яго разважаць, выклікае пэўныя асацыяцыі.

Барыс Сачанка неаднаразова выкарыстоўвае ў мове твораў паўторы ўласных назоўнікаў: *Багата чаго змянілася і ў жыцці краіны, і ў жыцці людзей, і ў жыцці самога Івана. Ліквідавана эксплуатацыя чалавека чалавекам, завод у Гудове стаў уласнасцю дзяржавы, Іван Дарошка з найміта-рабочага вырас у кіраўніка – старшыню сельсавета. Звычка ж не спазняцца, прыходзіць на працу заўсёды ў час у Івана Дарошкі асталася* [2, с. 40]. Такая пабудова тэксту сведчыць пра лексічны зрух ва ўласным назоўніку (параўн.: Іван – звычайны рабочы, пасля – старшыня сельскага савета). Зразумела, што неаднаразовае ўжыванне назоўніка падкрэслівае важнасць і важкасць данай пасады, гаворыць пра гонар і гордасць Івана, які, нягледзячы на змену статуса, застаецца чалавекам з простай сялянскай натураю, выдзяляе спецыфічную экспрэсіўную афарбоўку словаформы: *Іван Дарошка падняўся з-за стала, бо адчуў: размова скончана, Вера Сымонаўна выказала ўсё, што было ў яе на душы, што хацела выказаць, і збіраецца пакінуць баковачку. Але Вера Сымонаўна не*

спяшалася выходзіць. Яна засяроджана пра нешта думала, думала, потым раптам папрасіла... [2, с. 46].

Асаблівую экспрэсіўнасць канструкцыі надае ўжыванне займеннікаў з указальным значэннем: *Яна, Ганна, не хацела карчаваць гэтай паляны, у цяжку хадзіла, на шостым ці на сёмым месяцы. Але ён, Мікалай, быў няўмольны, настояў на сваім – трэба, пакуль ніхто не захапіў, захапіць паляну... Тады, у той парны, па-вясновому волкі, туманны дзень, ён, Мікалай, толькі ўдваіх з жонкаю, Ганнаю, прыйшлі сюды, на паляну* [2, с. 68]. Пастаноўка займенніка побач з уласным назоўнікам садзейнічае інтанацыйнаму разрыву, ускладняе і пашырае сінтаксічныя, інфармацыйныя і стылістычныя магчымасці сказа, канцэнтруе ўвагу чытача на асобе, падказвае аўтарскія адносіны да яе. Параўн.: *Вера Сымонаўна павярнулася тварам да Івана, і Іван зноў убачыў перад сабою тую Веру Сымонаўну, якую дагэтуль яму даводзілася разы два-тры бачыць з прэзідыумаў розных пасяджэнняў і сходаў, – сціплую, спакойную і ... прыгожую. Надта прыгожую, як адзначыў пра сябе Іван* [2, с. 45 – 46]. У гэтых сказах Барыс Сачанка наўмысна не ўжывае прозвішча героя, каб чытач зразумеў, што ў данай сітуацыі перад намі (і гэта галоўнае) не старшыня сельскага савета, а мужчына, які зачараваны прыгажосцю жанчыны, любуецца яе хараством.

Такім чынам, дыстантны лексічны паўтор Барыс Сачанка выкарыстоўвае як шматфункцыянальны сродак, з дапамогай якога забяспечваюцца адзінства тэксту, актуалізацыя пункту погляду пісьменніка, канкрэтызацыя пэўнай семы як сродак выражэння эмоцый таго, хто гаворыць, і для ўздзеяння на эмацыянальную сферу слухача.

Літаратура

1. Сачанка, Б. Горкая радасць вяртання. Аповесці, апавяданні / Б.Сачанка. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 352 с.

2. Сачанка, Б. Выбраныя творы. У 3 т. Т.1. / Б.Сачанка. – Мінск.: Маст. літ., 1993. – 590 с.

3. Гарифуллин, В.З. Экспрессивно воздействующая функция средств внутритекстовой связи / В.З. Гарифулин // Речевое воздействие в сфере массовой коммуникации. – М.: Наука, 1990. – С. 5–12.

4. Клюев, Е.В. Риторика (Инвенция. Диспозиция. Элокуция): Учеб. пособие для вузов / Е.В. Клюев. – М.: «Издательство ПРИОР», 1999. – 272 с.

5. Болотов, В.И. Эмоциональность текста в аспектах языковой и неязыковой вариативности / В.И. Болотов. – Ташкент: Изд–во «Фант» Узбекской ССР, 1981. – 116 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 811.161.3’221.22 : 81’42

Структурна-семантычная парадыгма невербальных сродкаў зносін у мастацкім тэксце

А. М. Чарнышова

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці вербалізацыі міміка-жэставых і прасторавых адносін у мастацкім тэксце, выяўляецца абумоўленасць выкарыстання мнагазначнай кінемнай лексікі ў аўтарскім тэксце, аналізуюцца асаблівасці сінаніміі і варыянтнасці паравербальнага элемента ў мастацкім тэксце ў цэлым.
Ключавыя словы: паравербальныя сродкі зносін, кінесіка, кінема, жэст, міміка, мнагазначнасць, сінанімія, варыянтнасць.

The article discusses the features of verbalization of facial and gesture expression and spatial relationships in a literary text, detects the reasoning for the use of polysemous kinematic vocabulary in an author’s text, and analyzes the features of synonymy and variants of paraverbal element in a literary text as a whole.
Keywords: paraverbal means of communication, kinesics, kinematics, gesture, facial expression, polysemy, synonymy, variation.

Маўленне як цэласны акт зносін уключае розныя тыпы паводзін чалавека: вербальныя (слоўнае афармленне маўлення), акустычныя (гукавое афармленне маўлення), міміка-жэставыя і прасторавыя паводзіны, якімі суправаджаецца маўленне [1, с. 159-160].

Міміка-жэставыя і прасторавыя паводзіны называюцца паравербальнымі, або паралінгвістычнымі, сродкамі камунікацыі. Вывучэнне суадносін вербальных і невербальных элементаў камунікацыі, спосабаў моўнага выражэння міміка-жэставых і прасторавых паводзін чалавека лічыцца адной з цікавых праблем сучаснай камунікатыўнай лінгвістыкі.

Мэта артыкула – выяўленне і аналіз візуальнай і тактыльнай сістэм невербальных сродкаў зносін у аўтарскім тэксце, вызначэнне лексічных асаблівасцей гэтых сродкаў пры стварэнні мастацкага вобраза.

Найбольш значнымі сярод невербальных сродкаў з’яўляюцца кінесічныя сродкі – зрокава ўспрымальныя рухі другога чалавека, якія выконваюць выразна-рэгулятыўную функцыю падчас зносін. Да кінесікі адносяцца выразныя сродкі руху, што праяўляюцца ў паставе, жэсце, міміцы, позірку [1, с. 164]. Таму ўсе моўныя адзінкі, якія абазначаюць такія кінесічныя камунікатыўныя сродкі, называюць кінемамі (у шырокім сэнсе кінетычнай, або кінемнай, лексікай). Цікавым і пакуль што мала распрацаваным пытаннем функцыянальнай стылістыкі і лінгвістыкі тэксту з’яўляецца вывучэнне спосабаў моўнага выражэння невербальных сродкаў зносін персанажаў мастацкага твора.

Усе пісьменнікі, без выключэння, маюць у сваім творчым “арсенале” кінетычную лексіку, якая істотна дапаўняе характарыстыку створаных імі мастацкіх вобразаў. Ул. Караткевіч, В. Быкаў, І. Мележ – пісьменнікі, чые творы насычаны яскравым кінемным матэрыялам і могуць быць узяты за ўзор пры разглядзе моўнага выражэння паравербальных сродкаў зносін у мастацкім творы.

Як вядома, паравербальныя сродкі зносін адрозніваюцца сваёй разнастайнасцю. Яны характарызуюцца неадназначнасцю як у фармальным, так і ў семантычным плане. Кожны жэст ці мімічную выяву чалавек можа трактаваць па-свойму, але, з другога боку, самі паравербальныя дзеянні нясуць пэўнае значэнне, якое ўкладвае ў яго рэцыпіент. Таму інтэрпрэтацыя такіх пазамоўных элементаў як ў жыцці, так і ў мастацкім тэксце з лінгвістычнага пункту погляду дастаткова складаная справа.

Змест кінемы – семантычна двухпланавы. У ім спалучаюцца літаральнае і сімвалічнае значэнні. Гэта дае падставу сцвярджаць, што паравербальныя сродкі камунікацыі з’яўляюцца

свайго роду знакамі. Як і іншыя знакавыя сістэмы, кінемы-знакі валодаюць шэрагам фармальных, структурных і семантычных уласцівасцей. Яны маюць такія семантычныя характарыстыкі, як полісемія, сінанімія і варыянтнасць.

Пры стварэнні кінем, якія адлюстроўваюць невербальныя зносіны персанажаў, аўтар павінен памятаць, што некаторыя адзінкі з устойлівым значэннем мы можам выкарыстоўваць толькі ў пэўнай сітуацыі (часта гэта фразеалагізмы). Многія структурна і вербальна падобныя кінемы ў пэўным кантэксце маюць сваё значэнне, якое не супадае з сімвалічнай семантыкай пэўнага жэста ці мімічнай выявы. Гэта гаворыць пра тое, што ў залежнасці ад кантэкстуальнай абумоўленасці многія невербальныя сродкі зносін характарызуюцца мнагазначнасцю. Гэта такія адзінкі, якія інтэрпрэтуюцца толькі ў пэўным, дакладна ўсталяваным значэнні. Часцей за ўсё аўтар стварае іх самастойна менавіта для свайго твора.

Мнагазначныя кінемы значна адрозніваюцца ад кінем адназначных. І справа нават не ў тым, што некаторыя адзінкі маюць адно значэнне, а іншыя – два і больш. Мнагазначнасць падобных моўных адзінак звязана з тым, што абазначаная імі мімічная або жэставая з'ява можа мець розныя вытокі, матывацыю і праяўляцца ў залежнасці ад сітуацыі зносін.

Мнагазначнымі з'яўляюцца многія словазлучэнні, якія называюць разнастайныя жэсты і рухі цела. Раскрыццю іх значэння садзейнічае кантэкст, таму іх ужыванне можна назваць кантэкстуальна абумоўленым.

У мастацкіх творах сустракаюцца прыклады такой кантэкстуальна абумоўленай мнагазначнасці кінем. Напрыклад, у раманах Ул. Караткевіча: *"паківаць (ківаць) галавой":*

1) вітаць: *Ён ласкава, са старамоднай галантнасцю ківає яму галавой і адразу праходзіць да бацькоў* [2, с. 85];

2) асцерагаць: *Раўбіч глядзеў на Загорскага. І Загорскі, асцерагаючы яго, адмоўна паківаў галавою*[2, с. 228];

3) не пагаджацца: *Франс падышоў да яе санак, дзе сядзеў на козлах далёкі госць Усяслаў Грыма, асабліва нязграбны ў ваўчыным футры, і сказаў нешта. Вусны лялечнага наіўнага роціка Ядвіні сціснуліся. Яна адмоўна паківала галавой* [3, с. 8];

4) выказаць дакор: *Князь паківаў галавой: "Аддалі, называецца. Адно цікава было б ведаць: чаму цябе там для душы навучылі? У што ты верыш, акрамя "лусне пан па шчацэ – падстаў другую"?"* [2, с. 187];

5) згадзіцца: *"– Самы цудоўны баль, які я калі-небудзь бачыў, – адказвае за яе важны, як прыдворны, Франс."А яна не адказала, толькі кіўнула галавой* [2, с. 124].

"Тупаць нагамі":

1) выказаць пратэст: *Яна, захлынаючыся ад крыку, пабегла да іх, густа ссоўваючы нагамі пясок… Дзяўчынка крычала ўжо зусім без голасу і часта тупала нагамі, не заўважаючы, што зайшла ў ваду* [2, с. 18];

2) капрызіць: *А ў доме Наталля закаціла Майцы і Франсу скандал. Тупала нагамі, плакала і крычала. " Брыдкая, злая! – плакала Наталля. – І ты брыдкі, злы, нядобры!"* [3, с. 27].

"Паціснуць плячыма":

1) не разумець каго-небудзь: *Дырэктар паціснуў плячыма. Хто, сапраўды, разбярэцца ў рахунках гэтых юных вандалаў?*[2, с. 337];

2) супакойваць: *Басяцкі непаразумела зірнуў на Лотра. Той паціснуў плячыма – нічога, маўляў глупства, бывае – і пакруціў пальцам ля лба. "То за што цябе выгналі? – спытаў Лотр."* [5, с. 78];

3) не ведаць чаго-небудзь: *"Гэта што ж было? – у непаразуменні спытаў Зянон." Дудар і Вястун паціснулі плячыма. Мечнік Турай плюнуў. "Самазванцы, - грэбліва сказаў Кляонік. – А брыда гэта, хлопцы."* [5, с. 59].

"Махнуць рукою":

1) перастаць звяртаць увагу: "*Кахайце яго, Ірына. Вам пашанцавала. Ён вялікі ў каханні чалавек. Махніце рукой на ўмоўнасці, на дабрабыт. Усё гэта лухта!"* [4, с. 245];

2) не згадзіцца з кім-небудзь: *"Ну не, – махнуў рукою Грынкевіч. – Што я, не чуў гэтых занудаў?"* [4, с. 78];

3) адрачыся ад чаго-небудзь: *Гары яно гарам і дзядзькавае тое і пакорнае, – і, махнуўшы рукой, пайшоў да дзвярэй* [2, с. 31];

4) прымірыцца з безвыходнасцю становішча: *“Кіньце, генерал... Загоршчыну, вядома, шкада. Дык давайце я пад распіску аддам вам за яе грошы. Га? І нязручна не будзе. На імперыялах пячаткі няма, адкуль яны...” І, унутрана прыміраючыся з усім, махнуў рукой”*[2, с. 180];

5) выказаць агіду: *“А – а, – сказаў немец. – Ён і ф мінулы гот такой ша штука фыкінуў”. “Тфу, каўбаса, - махнуў рукою Турай”*[5, с. 90];

6) указаць на аб’ект: *Шырокае аблічча Юлляна было бледнае. Ён махнуў рукой у бок мядзянага бору: “Гані.”*[3, с. 275];

7) выразіць абыякавасць: *Не даваць жа выспятка, не таптаць было святую птушку. Зянон махнуў рукою. “Разява, – зарагатаў ля крамы рыбнік.”* [5, с. 35];

8) сігналізаваць пра пачатак дзеяння: *Кірык Вястун махнуў рукою. У шчыліну пад заслонай пачалі торкаць бярвенні, складаць сістэму падважнікаў, павольна ўздымаць жалезную пліту, кастром падкладаючы пад яе плаху за плахай.*[5, с. 101];

9) спыніць таксі: *“Ну, тады на выстаўку”. “Згода, – кіўнула яна. Ён махнуў рукою зялёнаму вочку, што бегла вуліцай.”* [4, с. 206].

У аповесцях В. Быкава: *“адным вокам”*:

1) крыху, нядоўга: *Але ён [Ляўчук] сцяў у сабе зачаткі маладушных пачуццяў – калі прыехаў, дык трэба ісці, хоць зірнуць адным вокам, павітацца і ўпэўніцца, што жыве чалавек, які і для яго азначае нямала.* [6, с. 11];

2) спадцішка: *Даніла ўсё моршчыў расчырванелы, у чорным валоссі твар, адным вокам пазіраючы на ўзрыўчатку.* [6, с. 407].

У раманах І. Мележа: *“прытуліць”*:

1) выказаць пяшчоту: *Дзіўна паслабелымі рукамі схапіла, прытуліла яе [Верачку], яшчэ цёплую.* [6, с. 32];

2) выразіць шчасце, любасць, замілаванне: *Яўхім абняў Хадоську, яна аддана прытулілася, аж затрапятала ад шчасця.* [7, с. 119].

“Абняць”:

1) развітацца: *Апейка абняў яго на развітанне, нясмела, нязграбна* [10, с. 91];

2) выразіць прыхільнасць: *І яшчэ чула яна, які ён добры, бяссілы перад ёю, Міканор, якога так не любіў і пабойваўся яе бацька. Ён, праўда, не аддаў руку, калі яна хацела ўзяць, - знарок, з мужчынскага гонару, сціснуў дужэй. Абняў дужаю рукой. І ўсё ж Хадоська чула сябе мацнейшаю, варухнула непрыхільна плячыма, і ён нехаця выпусціў.* [8, с. 64].

“Пераступіць з нагі на нагу”:

1) быць вінаватым: *Глушак вінавата пераступіў з нагі на нагу. “Пляце сам не ведае што”.* [10, с. 151];

2) не ведаць, што сказаць: *“Чаго ад народу адстаеш!” – падмацаваў Башлакова Дубадзел. Гаспадар пераступіў з нагі на нагу, адвёў позірк. Адвёў з нудою: чуў ужо такое. І адказваў не раз. Чаго ж тут гаварыць попусту.* [10, с. 130].

Мнагазначнасць падобных моўных адзінак звязана з тым, што абазначаная імі мімічная або жэставая з’ява можа мець розныя вытокі і розную матывацыю. Прыведзеныя вышэй прыклады яшчэ раз сведчаць аб тым, што беларускія пісьменнікі добра арыентаваліся ў паравербальных катэгорыях і стварылі вельмі цікавыя характары і сітуацыі, у якіх і змаглі ў поўнай меры выявіць разнастайнасць матывацыі кінемнай лексікі і аздобілі лексічную сістэму сваіх твораў, надаючы ім тым самым статус цэласнай моўнай структуры.

Для паравербальных сродкаў камунікацыі, акрамя мнагазначнасці, характэрны сінанімія і варыянтнасць. У творах беларускіх пісьменнікаў дадзеныя з’явы таксама атрымалі дастатковае пашырэнне.

Варыянты аб’ядноўваюць адзінкі, падобныя па значэнні і структурным афармленні, якія могуць замяняць адна адну без істотных змен семантыкі і стылістыкі сказа. Варыянты адной і той жа адзінкі выкарыстоўваюцца ў мастацкіх творах з неістотнымі трансфармацыямі і практычна не змяняюць склад лексем. Варыянтнасць невербальных сродкаў вызначаецца часцей за ўсё зменамі ў такіх марфемах, як прэфікс і суфікс, радзей ў каранях.

Як слушна адзначае Н.Г. Слыхалава, “варыянтамі кінем можна лічыць іх лексіка-граматычныя разнавіднасці, тоесныя па значэнні і ступені семантычнай спаянасці. Адрозненні варыянтаў кінем могуць быць большымі або меншымі, аднак яны не павінны парушаць тоеснасці кінемы як адзінкі. Вар’іраванне дзеяслоўных кампанентаў у складзе кінемы ў шэрагу выпадкаў прыводзіць да мадыфікацыі семантыкі кінемы” [9, с. 7].

Варыянты падзяляюцца на фармальныя і лексічныя. Да фармальных варыянтаў адносяцца кінемы, у складзе якіх зменлівы кампанент адрозніваецца фанетычна, марфалагічна ці словаўтваральна: *вочы слізганулі – вочкі слізганулі; зірнуць у вочы – зазірнуць у вочы; ашчэрыў зубы – вышчэрыў зубы; схапіцца за галаву – хапацца за галаву*; *бурчаў – буркнуў*; *уздрыгваў – дрыжаў*; *узняў вочы – прыўзняў вочы* і інш. Да лексічных варыянтаў адносяцца кінемы, у склад якіх уваходзяць зменлівыя кампаненты, што характарызуюцца рознай ступенню семантычнай блізкасці: *таіцца старонняга вока – затуліцца ад старонняга вока; ухмыляцца вачыма – смяяцца вачыма*.

Больш пашыранымі з’яўляюцца лексічныя варыянты кінем, якія адрозніваюцца адным ці двума кампанентамі. У мастацкіх тэкстах сустракаюцца наступныя прыклады: *Клава ляжала на баку і вялікімі, поўнымі самоты вачамі пазірала ў хвойнік* [6, с. 43] і *А яна на момант засяродзілася, акругліла вочы, услухалася, толькі цяпер усвядоміўшы, што ім пагражала* [6, с. 97]; *Антон беглым позіркам акінуў зямлянку* [6, с. 194] і *Задыхаючыся, Ляўчук слізгануў па ім позіркам і не ўбачыў нікога* [6, с. 171]; *Ганна раптам павяла вачыма: вунь тое месца, дзе яны начавалі ў тую ноч* [7, с. 9] і *Ганна павяла позіркам – твары былі недавольныя зацятыя* [7, с. 62]; *Яна [Ганна] адштурхнула яго [Яўхіма], упала на дамавіну зноў* [10, с. 62] і *Ганна злосна таўханула свінню парэпанай нагой* [7, с. 62]; *Пілат паказаў рукою на крыж і агаласіў: “А вось уліце яму воцату ў рот, каб не думаў пакутваць за чалавечы рот. Прынясіце цвікі з асіны для сабачага сына”* [5, с. 46]; *Шырокае аблічча Юлляна было бледнае. Ён махнуў рукой у бок мядзянага бору: “Гані.”* [3, с. 275], *Але Даніла, як і раней, нязручна сядзеў на сваім кажусе і толькі нахабнавата ўхмыляўся маленькімі сярод чорнага дрымучага касмыцця вачмі* [6, с. 376] і *Здавалася яму, жартоўна ад таго, што яе вочы заўжды смяяліся* [6, с. 33].

Варыянты асобных лексем не нясуць дадатковай інфармацыі ці экспрэсіі, а выкарыстоўваюцца аўтарам часцей для таго, каб не паўтараць адну і тую ж адзінку па некалькі разоў у тэксце (пазбегнуць таўталогіі), разнастаіць мову твора.

Іншая справа сінанімічнасць. Сінонімы прадстаўляюць найменні, якія адрозніваюцца напісаннем, але маюць аднолькавую семантыку. Гэтыя адзінкі пашыраюць твор з пункту погляду мастацкіх сродкаў і стылістычнага ўспрымання, робяць яго прачытанне цікавым.

Як адзначае Н.Г. Слыхалава, “сінанімія кінем ахоплівае сінанімію неаднародных саматычных адзінак, у якіх адно і тое ж значэнне, як правіла, узнікае на аснове абагульнення розных саматызмаў. У дадзеным выпадку прынцып узаемазамяняльнасці сінанімічных кінем прысутнічае на вузка семантычным узроўні, што дае нам права называць большасць дадзеных адзінак кінемамі з адным прадметна-лагічным зместам. Значную групу сінонімаў складаюць структурныя сінонімы, якія ўяўляюць сабой адзінкі аднаго структурнага тыпу, дзе сінанімічнай замене можа падвяргацца кампанент, які складае семантычную аснову выразу ” [9, с. 7].

Са шматлікіх слоў-сінонімаў, якія ёсць у мове, пісьменнік пры стварэнні мастацкага вобраза “выбірае” адно, але самае патрэбнае, якое найбольш дакладна перадае яго думку або малюе вобраз. Значэнне сінанімічных паравербальных сродкаў у мастацкім творы заключаецца і ў тым, што яны надаюць мове шматфарбнасць, большую выразнасць, робяць яе багатай на розныя адценні. Такія замены і пераўтварэнні і складаюць асабісты аўтарскі стыль.

Сінанімія праяўляецца паміж рознымі тэматычнымі групамі кінем. Такія кінемы могуць выражаць **развагу, роздум**: *схаваць твар у далоні, ссунуць бровы, ашчаперыць пальцамі галаву*; **разгубленасць:** *развесці рукамі, паціснуць плячыма, перамінацца з нагі на нагу, закрыць вочы рукою* і інш.

Прыклады дадзеных сінанімічных адзінак разнастайныя і дастаткова пашыраныя ў раманах беларускіх пісьменнікаў. Так, напрыклад, мы можам знайсці ў раманах І. Мележа наступныя сінанімічныя кінемы са значэннем **пяшчоты**: *Яўхім спакойна, упэўнена абняў яе [Хадоську] за плечы і тады заўважыў побач Ганну* [7, с. 58]; *Ганна прыпала сваімі вуснамі да яго [Васіля]* [7, с. 39]; *Маці прытуліла Хадосьчыну галаву, пацалавала* [10, с. 57]. У рама-

нах Ул. Караткевіча мы таксама знаходзім наступныя прыклады са значэннем **прывітання**: *На тэрасу падымаецца гнуткі і станісты стары ў мундзіры палкоўніка... Пра гэтага Алесь ведае... Але стары прыемны. І ён не мучыць яго, Алеся. Ён ласкава, са старамоднай галантнасцю ківае галавой і адразу праходзіць да бацькоў.* [2, с. 85]; *Сыпанулі насустрач людзі, хутчэй неслі дзяцей у дом, расхутвалі. Алесь сустракаў гасцей. Алесь то паціскаў руку Франсу, то схіляўся да Майкі, то цалаваў маленькую Наталку.* [2, с. 241]; *Яна не адразу пазнала яго... Алесь схіліўся і пацалаваў ёй руку. "Я вельмі ўзрадаваны,- голас чамусьці асекся. Мы так даўно не бачыліся.* [2, с. 344]; *"Але. Пазнаёмцеся", - буркнуў Іван. Сабіна зрабіла рэверанс, і малахітавая сукенка нібы заструменілася.* [2, с. 38]; *І толькі калі улан падышоў і адказыраў, Леановіч спакойна кінуў недакурак сігаркі ў раку і адразу ж закурыў новую.*[4, с. 33]; са значэннем **радасці**: *У наступны момант моцныя рукі бесцырымонна схапілі яго, падкінулі ўгору і зноў спаймалі, і легкаважны голас весела пракрычаў нешта незразумелае... "Mon petit pzince Zagorski!"* [2, с. 50]; *Пылок ляцеў проста ў вочы коням задняй тройкі. Наталля, смеючыся і закочваючы вочы, пляскала далонькамі і спявала.* [3, с. 14]; *Алесь ішоў, калі раптам нешта неўсвядомленае прымусіла радасна задрыжаць яго веі. Ён усміхнуўся – перад яго ганкам стаялі ў святочных уборах Кагуты.* [2, с. 72]; *У яе трэсліся вусны. "Двайняты! Князюхна, мілы!"* [3, с. 158]; *Твар яго [Вайвадса] аж ззяў ад шчасця* [4, с. 49]; са значэннем **злосці**: *Я ўжо сказаў, што мой бацька дрыжыць ад злосці, калі нехта толькі ўспомніць ваша імя, князь.*[3, с. 331]; *Вочы сталі іранічныя і трошкі злосныя: убачыў, што гожы падлетак хоча пакласці на ліру срэбны паўрубель. "Здурэў, ці што?" – спытаў ён.* [2, с. 267]; *Расстрыга страшна круціў вачыма. "На беззаконні! Язык мой – звонам у роце!". "А вось мы табе зубы выб'ем, – сказаў яму Пархвер. – Тады языку твайму ў роце куды вальней боўтацца будзе"* [5, с. 44].

Такім чынам, у творах беларускіх пісьменнікаў (І. Мележа, В. Быкава, Ул. Караткевіча) з'явы мнагазначнасці, сінаніміі і варыянтнасці кінетычных адзінак выражаны дастаткова вялікай колькасцю прыкладаў. Пры аналізе гэтых адзінак можна адзначыць, што мнагазначнасць – больш характэрная з'ява для паравербальных сродкаў зносін, і што значэнне кожнага з іх магчыма высветліць толькі ў кантэксце. Сінанімія кінетычных адзінак назіраецца як у межах адной тэматычнай групы, так і паміж рознымі тэматычнымі групамі. Асабліва яскрава сінанімічныя кінемы прадстаўлены ў творах Ул. Караткевіча. Гэта дазваляе аўтару пашырыць межы невербальнай камунікацыі персанажаў, зрабіць яе шматвобразнай і шматаспектнай. Увогуле з'явы сінаніміі і варыянтнасці кінемнай лексікі ў творах пісьменнікаў прызваны разнастаіць, узбагаціць мову мастацкага твора, зрабіць яе выяўленчай і выразнай.

Літаратура

1. Кузнецов, И.Н. Риторика / И.Н. Кузнецов.– Мн.: ТетраСистемс, 2003.– 560с.
2. Караткевіч, Ул. Каласы пад сярпом тваім: Раман. Кн. Першая / Ул.Караткевіч.– Мн.: Юнацтва, 1981.– 381с.
3. Караткевіч, Ул. Збор твораў. У 8 т. Т. 5. Каласы пад сярпом тваім: Раман, кн. 2 / Ул.Караткевіч.– Мн.: Маст. літ., 1989.– 527с.
4. Караткевіч, Ул. Нельга забыць: Раман / Ул.Караткевіч.– Мн.: Маст. літ., 1982.– 335 с., іл.
5. Караткевіч, Ул. Выбраныя творы. У 2-х т. Т. 2. Хрыстос прызямліўся ў Гародні (Евангелле ад Іуды): Раман / Ул.Караткевіч.– Мн.: Маст. літ., 1980.– 400 с.
6. Быкаў, В. Збор твораў у 4 тамах. – Т. 3 / В. Быкаў. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1982. – 356 с.
7. Мележ, І. Людзі на балоце / І. Мележ. – Мн.: Народная асвета, 1968. – 403 с.
8. Мележ, І. Подых навальніцы / І. Мележ. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1973. – 407 с.
9. Слыхалова, Н.Г. Соматические речения со значением эмоций в русском языке (на материале произведений Михаила Булгакова): автореферат дис. на соиск. уч. степ. канд. фил. наук: 10.02.02 / Н.Г. Слыхалова. – БГУ.– Мн., 2002.- 20 с.
10. Мележ, І. Завеі, снежань / І. Мележ. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1978. – 407 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 811.161.3'28'373.4 (476.2. – 37 Лоеў)

Назвы посуду і начыння ў гаворках Лоеўшчыны

С. В. Чайкова

У артыкуле аналізуюцца назвы посуду і начыння ў гаворках Лоеўшчыны: падаецца прадметна-тэматычная класіфікацыя дыялектных адзінак гэтай групы ў залежнасці ад прызначэння (кухонны, сталовы посуд, посуд для вадкасцей), а таксама матэрыялу (драўляны посуд); вызначаны фанетычныя, словаўтваральныя варыянты, лексічныя сінонімы, адзначаны мнгазначныя словы і амонімы, прадстаўлены народныя фразеалагізмы, у склад якіх уваходзяць некаторыя дыялектызмы.
Ключавыя словы: гаворкі Лоеўшчыны, дыялектызмы, назвы посуду і начыння, кухонны посуд, сталовы посуд, посуд для вадкасцей, драўляны посуд, фанетычныя і словаўтваральныя варыянты, лексічныя сінонімы, мнагазначныя словы, амонімы, народныя фразеалагізмы.

The article analyzes the names of dishes and utensils in Loev region dialects: it gives the subject-thematic classification of the group dialectal units depending on the purpose (cookware, tableware, kitchen utensils for liquids) and on the material (wooden utensils); it defines phonetic, word formation variants, lexical synonyms, polysemous words and homonyms, folk idioms composed of some dialectisms.
Keywords: Loev region dialects, dialectisms, names of dishes and utensils, cookware, tableware, kitchen utensils for liquids, wooden utensils, phonetic and word formation variants, lexical synonyms, polysemous words, homonyms, folk idioms.

Вывучэнне дыялектных слоў з'яўляецца сёння не толькі ўласна філалагічнай, але і культуралагічнай задачай, таму што беларускія дыялекты ўяўляюць сабой значную частку гісторыі беларускага народа.

Лоеўшчына – старажытная частка Палесся, што размешчана па Дняпры і нізоўі Сожа. Геаграфічнае палажэнне гэтага краю (на стыку некалькіх дыялектных груп) абумовіла багацце і разнастайнасць яго гаворкі, якая займае берагавое становішча ў палескай групе беларускіх дыялектаў. Досыць цікавая ў дыялектных адносінах лексіка Лоеўскага раёна – неад'емная частка народна-дыялектнай мовы беларусаў, якая з'яўляецца крыніцай папаўнення і ўзбагачэння літаратурнай мовы.

Характэрныя для мясцовай гаворкі сельскага насельнітва гэтага рэгіёна найменні зафіксаваны ў "Дыялектным слоўніку Лоеўшчыны", які з'явіўся крыніцай нашага даследавання [3]. У дадзеным слоўніку зафіксаваны лексічныя з'явы народнай мовы, шырока прадстаўлены розныя лексіка-тэматычныя групы лексікі хатняга ўжытку, сярод якіх назвы посуду. (Некалькі дыялектных адзінак адзначаны ў "Матэрыялах для дыялектнага слоўніка Гомельшчыны" [1]).

Узнікненне назваў посуду абумоўлена цэлым шэрагам такіх экстралінгвістычных фактараў, як узровень развіцця сродкаў вытворчасці, наяўнасць сыравіны, з'яўленне новых прадметаў матэрыяльнай культуры. Згодна з "Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы" [2] *по́суд* – гэта 'гаспадарчае начынне для прыгатавання і падачы ежы, пітва', *пасудзіна* – 'асобны прадмет посуду, у які можна наліць, насыпаць ці пакласці што-небудзь' [2, IV, с.293-294], *начы́нне* 'сукупнасць прадметаў хатняга, гаспадарчага і пад. ужытку' [2, III, с.340]). У лоеўскіх гаворках зафіксавана шматлікая колькасць дыялектных адзінак посуду: кухоннага, сталовага, плеценага, драўлянага, посуду-тары, а таксама пасудзін рознага прызначэння: для захавання харчовых і нехарчовых прадуктаў, перавозкі грузаў і інш.

Аб'ектам нашага даследавання з'явіліся дыялектныя адзінкі кухоннага, сталовага посуду і начыння, а таксама *асобных* пасудзін, менавіта тых, што прызначаны для трымання або захавання прадуктаў харчавання і прыдатных у ежу вадкасцей.

Прадметна-тэматычную класіфікацыю найменняў такога віду ў залежнасці ад прызначэння можна прадставіць наступным чынам:

1. Кухонны посуд, які ў гаворках Лоеўшчыны адзначаны найменнямі гаршчкоў, чыгуна, ско́варады, місак, чайніка, сальніцы, таксама назвамі кухоннага начыння – таўкача, тарак і рэшата.

Літаратурная адзінка *гаршчо́к* ужываецца з тым жа значэннем, што і ва ўнармаванай мове – ‘круглая выпуклая гліняная пасудзіна са звужаным дном для гатавання стравы’ [2, II, с.35]; акрамя таго, адзначаны фанетычны варыянт ***го́ршчык***: *Хто скажа гаршчо́к, а болей го́ршчык* [3, с.89], а таксама лексічны сінонім ***варэ́йка*** (памянш. ***варэ́чка***): *О тую варэ́йку солонікаў наварым*; *Пастаў варэ́йку на прыпечак*; *Во на стале чыгункі, варэ́чка стаіць* [3, с.64-65].

Зафіксаваны шматлікія дыялектныя назвы маленькіх гаршчкоў, а менавіта: ***кула́к***: *Сабе вот екі маленькі кула́к зварыць, дроў трохі падкіне, дак і хата не награваецца* [3, с.171]; ***лязко́ўка*** (***лезко́ўка***) (памянш. ***лезко́вачка***, ***лязко́вачка***, ***ляско́вачка***): *Купі бо там маленькую лезко́ўку*; *Абедалі у сталовай, дак у лезко́вачках м’яса жаранае давалі*; *Прыставіла сёдні баршчу адну лesко́вачку: ніхто яго цепер і есці не хоча* [3, с.185]; ***махо́тка***: *Вот у мене екая махо́тка. Децям варыла у ёй* [3, с.191]; ***стаўбу́нчык***: *Баба, а ты толькі стаўбу́нчык баршчу наварыла?* [3, с.340].

Для наймення гаршчкоў, аплеценых дротам, выкарыстоўваецца лексема ***апле́цень***: *Як у сетку усадіш горшчок, дак ета апле́цень* [3, с.35]. Верхняя частка гаршчка называецца ***ве́нцы***: *Ве́нцы – рубчык самы на гаршчку* [3, с.66].

Для вясковага побыту неабходнай кухоннай пасудзінай з’яўляецца *чыгу́н* (‘гаршчок са сплаву жалеза з вугляродам’ [2, V/2, с.325]). Маленькі чыгунчык на Лоеўшчыне мае назву ***чыгуне́ц***: *У чыгун пастаўляю вады – у большы, а не у чыгуне́ц – маленькі называецца, менчы* [3, с.413].

Для наймення металічнай пасудзіны круглай формы для смажання – *патэльні*, або *ско́варады* [2, V, с.146] – ужываецца назва ***бля́ха***: *Высып зерне на бля́ху*; *Уставіла бля́ху ігруш у печ, каб сохлі* [3, с.53].

Дзе́жку (згодна з тлумачальным слоўнікам – ‘драўляная, крыху звужаная к верху пасудзіна з прамых клёпак (для заквашвання цеста, салення і пад.)’ [2, II, с.166]) для рошчыны называюць ***пе́кальніцай***: *А хлеб рашчыняюць у пе́кальніцы*; *Мая пе́кальніца чуць-чуць ліпіць, скора рассыпіцца* [3, с.260], а дзежку для бліноў – ***блінцо́ўкай*** (памянш. ***блінцо́вачка***): *Блінцо́ўка – дзежка, дзе блінцы рашчыняюць*; *Блінцо́вачку пастаў на печ* [3, с.53].

Шырокую і глыбокую, круглай формы, пасудзіну для яды [2, III, с.163] – *мі́ску* – можна аднесці як да сталовага, так і кухоннага посуду. Для кухоннага прызначэння, а менавіта для выпечкі, выкарыстоўваецца вялікая міска, якая мае назву ***лаха́ня***: *Паскі пеклі у лаха́ні. Дай бо мне лаха́ні паску пасадіць* [3, с.177]; вялікая і глыбокая міска для кухні – гэта ***мако́тра***: *Мако́тра – глыбокая міска з гліны* [3, с.187].

Трэба адзначыць, што ў сучаснай унармаванай мове назвы *макацёр* і *макатра́* маюць значэнне ‘гліняная пасудзіна, вузкая ўнізе і шырокая зверху, у якой звычайна труць мак, ільняное і канаплянае семя і інш.’[2, III, с.87], між тым, у гаворках Лоеўшчыны гэтыя лексемы, прадстаўленыя дыялектнымі фанетычнымі варыянтамі ***мако́тра*** (памянш. ***мако́трык***), ***мако́цер***, выкарыстоўваюцца для наймення любых місак: *У мако́тры сметану держаць*; *Назбірала у мако́цер сыру*; *Купіла тры гладышкі, адну міску і мако́цер* [3, с.187], а прызначэнне *макацёра* выконвае ***махо́тка***: *На свята пеком, дак мак тром у махо́тцы* [3, с.191].

На́крыўка (‘тое, чым накрыта што-небудзь’ [2, III, с.261]) для каструль і гаршчкоў прадстаўлена намінацыямі ***по́крыўка*** (*Накрый по́крыўкай кайструлю*) і ***по́крышка*** (*Накрываюць по́крыўкай горшчо́к* [3, с.271].

Назва *ча́йніка* (‘пасудзіны з носікам і ручкай, у якой заварываюць чай або гатуюць ваду’ [2, V/2, с.287]) ужываецца ў памяншальным акцэнтна-словаўтваральным варыянце ***чайнічо́к***: *Чайнічо́к купіла беленькі з сінімі цветочкамі*; *Завары чай у чайнічку*; *Зава́рыць траву у чом-нібудь, а тады у чайнічо́к вулле і п’е гарачы, як чай* [3, с.406).

Невялікая пасудзіна для трымання солі ў літаратурнай мове мае назвы *сальні́ца* і *саля́нка* [2, V, с.30], а ў дыялектным слоўніку Лоеўшчыны зафіксаваны словаўтваральны варыянт ***сало́нка*** (***соло́нка***): *Соло́нка разбілася, трэба новую купіць*; *Насып солі у соло́нку* [3, с.317].

Прадмет кухоннага ўжытку ў выглядзе ‘металічнай пласцінкі з дзіркамі, якая служыць для раздрабнення, расцірання чаго-небудзь’, у беларускай літаратурнай мове мае найменне *та́рка* [2, V, с.479], аднак на Лоеўшчыне ўжываюцца найменні-сінонімы ***дра́чка***: *Падай дра́чку, таранікаў натарым* [3, с.107], ***цярту́шка*** (***цярту́шка***) (памянш. ***цярту́шачка***): *Трэба*

драчы садраць на цертýшку; *Сашка прыбегла, узела шчотку і цяртýшку*; *А то на цертýшачку можна падраць* [3, с.406].

Назва прылады ў выглядзе качалкі з патоўшчаным круглым канцом, якой таўкуць што-небудзь, – *таўкáча* [2, V, с.483] – у лоеўскіх гаворках мае словаўтваральны варыянт ***таўкáчка***: *Беры таўкáчку да патаўчы кортóшку* [3, с.356]. Вялікая драўляная лыжка, якой мяшаюць у гаршку, – гэта ***мяшáнка***: *Мешáнку памый, а то засохне* [3, с.198].

Адзін з прадметаў кухоннага начыння – *рэ́шата* (‘рэч хатняга ўжытку для прасейвання мукі і пад. у выглядзе шырокага абруча з сеткай’ [2, IV, с.766]) – на Лоеўшчыне называецца ***пóцітак***: *Еечкі берыце у пóцітку. Пóцітак ета рэшата* [3, с.274].

2 Сталовы посуд, які прадстаўлены дыялектнымі назвамі місак, талеркі, а таксама найменнямі сталовага начыння – лыжак, відэльцаў і ножыка.

У лоеўскіх гаворках для наймення *міскі* ўжываюцца як літаратурныя назвы ***міска*** і ***міса*** (‘вялікая міска’ [2, III, с.162]): *Што вы краснае есце у мі́сцы?*; *Бабі сто годоў, дак ена возьме бутылачку віна, налле у міску, накрышыць хлеба і есць*; *У сенцах мі́са стаіць, берыце* [3, с.194], так і дыялектная назва ***палýмісак*** (‘невялікая міска’): *Купіла сабе ў Лоеві две міскі і палýмісак* [3, с.245]; для драўляных місак існуе намінацыя ***кагáнка***: *А што было дзелаць, калі пасуды ні было, то с кагáнкі так елі, што за вушамі трашчала, а ціпір усе на тарэлачцы паднясі* [1, с.189-190];

Неабходным сталовым посудам з’яўляецца *талéрка*. Яе назва прадстаўлена рускім варыянтам, што ўзнік у выніку метатэзы, – ***тарэ́лка***: *Деўкі, берыце на тарэ́лцы наліснікі*; *Тарэ́лкі даставай, будам абедаць* [3, с.356].

Для назвы ‘прадмета сталовага прыбора для зачэрпвання рэдкай або рассыпістай ежы’ [2, III, с.64] – *лы́жкі* – выкарыстоўваецца варыянт ***лóжка*** (памянш. ***лóжачка***): *Лóжкі новые купілі*; *Лóжку з дерава робяць, з ліпы*; *Усе маленькіе лóжачкі пагнулі* [3, с.181]; акрамя таго, зафіксавана лексема ***ядáлка*** (***едáлка***): *Вазьмі чыстую ядáлку*; *Саберы са стала едáлкі* [3, с.429].

Сталовы прыбор у выглядзе ручкі з доўгімі зубамі [2, I, с.489] прадстаўлены словаўтваральнымі варыянтамі літаратурнай назвы *відэ́лец* – ***відёлак***, ***відёлка*** (***відзёлка***): *У нас кажуць відёлка, а у Баршчоўцы відёлак, а то ешчэ ві́лка* [3, с.67].

У лоеўскіх гаворках існуе намінацыя для зламанага ножыка – ***карнáчык***: *У мяне такі лоўкі карнáчык, што я за пяць мінут чугунок бульбы ім аблуплю* [1, с.213].

3 Посуд для вадкасцей. У беларускай літаратурнай мове ўжываецца вялікая колькасць назваў посуду для вадкасцей (*бáнка*, *біклáга*, *бітóн*, *бýтля*, *гарлáч*, *глáдыш*, *гляк*, *збан*, *кáрэц*, *кóўш*, *кілі́шак*, *кóнаўка*, *кýбак*, *слóік*, *чáрка*, *шкля́нка* і інш.). Між тым, у лоеўскіх гаворках зафіксавана шмат лексем, якія не маюць адпаведнікаў ва ўнармаванай мове. Адны з іх выкарыстоўваюцца для наймення пасудзін, прызначаных для вады, другія – для захавання вадкіх харчовых прадуктаў: малака, квасу, алею, гарэлкі і г.д.

Для вады або іншых напіткаў прызначана невялікая драўляная ці металічная пасудзіна *біклáга* [2, I, с.374], для наймення якой у гаворках Лоеўшчыны выкарыстоўваецца фанетычны варыянт ***баклáга***: *Баклáгу для піцця на поле бралі*; *Баклáга дераўяная для вады*; *У баклáгу налі гарэлкі* [3, с.44].

Назва *гля́ка* (памянш. *глячóк*) – ‘нізкай глінянай пасудзіны з выпуклымі бакамі і вузкім горлам’ [2, II, с.61] – прадстаўлена фанетычным варыянтам ***глёк***: *Глёк для вады, для поснога масла*; *Пагледела, як сава у глёк*; *Гладышка – без вушак, глёк з вушкамі* [3, с.85].

Для назвы ***слóіка*** (‘невялікая шкляная або гліняная пасудзіна’ [2, V, с.206] выкарыстоўваецца лексема ***бáнка***: *Поўную бáнку накідайце малака*; *Як молоко у бáнцы лежыць, а ты не хочыш его есці, дак ета ты не голодная* [3, с.46], для наймення менавіта шклянога слоіка – ***сцякля́нка*** (***сцекля́нка***): *Улі сабе малака з сцекля́нкі* [3, с.46).

Бляшаная з накрыўкай пасудзіна для пераносу і захавання малака і іншых вадкасцей – *бітóнчык* [2, I, с.377] – у пэўных вёсках Лоеўшчыны можа называцца ***бары́лачка***: *На табе бары́лачку малака, занесі цёццы Мар’і: да ее унукі прыехалі* [3, с.47]. (У сучаснай беларускай літаратурнай мове *бары́ла* мае значэнне ‘заднёная з двух бакоў невялікая бочачка для напіткаў’ [2, I, с.346]).

У літаратурнай мове *казáн* – гэта ‘кацёл з круглым дном і шырокім верхам’, *казанóк* – ‘невялікі казан; кацялок’ [2, II, с.574], *кацёл* (памянш. *кацялóк*) – ‘металічная пасудзіна акруглай формы і розных памераў для награвання вады, гатавання ежы і пад.’ [2, II, с.668]. “Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны” падае лексемы ***казáн*** са значэннем ‘кацёл’: *Казáн – здаровы кацёл*; *Казáн меду набралі*; *Раней такіе булі вісокіе, нача чыгуны з дужкамі – казаны́* [3, с.146], а для назвы *кацялкá* выкарыстоўваецца дыялектны словаўтваральны варыянт ***казанéц***: *Наліла малака казанéц да дала кіслага* [3, с.146].

Літаратурная лексема *карэ́ц* мае значэнне ‘драўляная або металічная пасудзіна з ручкай для зачэрпвання вады, квасу’ [2, II, с.654], аднак назва ***карэ́ц*** у лоеўскіх гаворках ужываецца толькі для медных кружак: *Калісь булі кружкі медяные, дык ета карэ́ц.* (У ваенныя і пасляваенныя гады – кружкі з гільзы: *Карэ́ц – медны з гільзы у войну делалі* [3, с.154].

Назва невялікай, звычайна з ручкай, фарфоравай, глінянай ці іншай пасудзіны для піцця, якая ў літаратурнай мове мае найменне – *кýбак* [2, II, с.718], адзначана дыялектнай лексемай ***кýхлік***: *У кýхлік молоко наліваюць, чай п’юць*; *О-о у мене вада е у кýхліку* [3, с.173]; *Выпі з кýхліка малака* [1, с.173].

На Лоеўшчыне выкарыстоўваецца як літаратурнае найменне ***глады́ш*** (***глады́шка***) (памянш. ***глады́шачка***) (згодна з Тлумачальным слоўнікам – гэта ‘збан без ручкі’ [2, II, с.55], а збан у сваю чаргу – гэта ‘высокая гліняная пасудзіна, якая звужаецца ўверсе і мае звычайна ручку і носік’ [2, II, с.426]: *Да палавіны глады́шкі наліла*; *Деўкі, берыце молоко у глады́шцы дай піце*; *Як пойде у заём, дак і масла е, а хочыш, дак пастаў глады́шачку на творóг* [3, с.85]), так і дыялектныя лексемы ***кры́нка***: *Я натапіла две кры́нкі малака*; *Я надаіла кры́нку малака* [3, с.168], ***гі́рка*** ‘збан з адбітым горлам’: *Гі́рка – абабітая гладышка*; *А ета што там у гі́рцы?* [3, с.84].

Назва *бутэ́лькі* (‘шкляная пасудзіна для вадкасцей, звычайна цыліндрычнай формы з вузкім горлам’ [2, I, с.425]) прадстаўлена дыялектнай намінацыяй ***пля́шка*** (памянш. ***пля́шачка***): *Пустые яшчыкі з пустымі пля́шкамі*; *Узела шэсць пля́шак, да каўбас, да сцягно*; *Пля́шачку віна возьме*; *Дам табе пля́шачку гарэлкі і іді* [3, с.270], а таксама рознымі найменнямі ў залежнасці ад памеру. Так, для назвы вялікай бутэлькі, якая ў літаратурнай мове адзначана лексемай *бýтля* [2, I, с.425], выкарыстоўваецца словаўтваральны варыянт ***бýталь***: *У нас бýталь девяць паўлітраў*; *Сеголета паставіла поўны бýталь вішань, а да весны не буде: деці поцегаюць* [3, с.60], сінанімічныя адзінкі: ***журáў*** (трохлітровы буталь): *Цэлы журáў гарэлкі наліў* [3, с.116] і ***манáх*** (бутля ад 3 да 6 літраў): *Деўкі дасталі маю настойку у манáсі і усю вупілі – цэлых п’яць літраў*; *Цэлы манáх масла ружэйнага наліў* [3, с.189). Маленькая бутэлька мае найменне ***байстручóк***: *Е усякіе пляшкі: велікая пляшка – трохчэцвертная, сотка – байстручóк*; *Налі бо у байстручóк малака дзіцяці* [3, с.44].

Чáрка (памянш. *чáрачка*) – ‘невялікая шкляная пасудзіна на ножцы для піцця спіртных напіткаў’ [2, V/2, с.298] – на Лоеўшчыне носіць назву ***кóнік***: *Кóнік – ета калісь чарк*а [3, с.162].

Раней алей выраблялі самі сяляне, і таму зразумелым з’яўляецца вялікая колькасць назваў ёмістасцей для яго захавання. Пасудзіны для гэтага важнага прадуктаў харчавання былі драўляныя – ***паставéц***: *У пост налівалі алею поўны паставéц* [3, с.254], ***насóк*** (***носóк***): *Калісь самі білі алей да у наскі́ налівалі* (ужываецца таксама і для трымання гарэлкі: *Носóк – дераўяная бочачка, у екую наліваюць гарэлку* [3, с.209]; гліняныя – ***ты́ква***: *Ты́ква – пасуда для алею*; *Алей б’юць і наліваюць у ты́кву* [3, с.364]; ***алéйнік***: *Трэ було новы алéйнік купіць* [3, с.33]. (Дарэчы, у літаратурнай мове бутэлька, бляшанка, каністра для алею мае назву *алéйніца*, а ***алéйнік*** (разам са словам *алéйшчык*) з’яўляюцца назвамі асобы – ‘спецыяліста па вытворчасці алею’ [2, I, с.223].

Сярод народна-бытавых назваў посуду адзначана мнагазначнасць. Так, лексема ***бля́ха*** мае некалькі значэнняў: 1) ‘патэльня’; 2) ‘тонкае ліставое жалеза’: *От зайграў: бля́хі – шчэ ж хата не цячэ*; 3) ‘верхняя частка пліты’: *Ідзі пачысці бля́ху, а то смурод ідзе*; *Бля́ха расколалась, трэба масцера зваць, заменіць* [3, с.53]. ***Махóтка*** – гэта: 1) ‘маленькі гаршчок’ і 2) ‘макацёр’: *На свята пеком, дак мак тром у махóтцы* [3, с.191]. Лексема ***мі́ска*** ўжываецца са значэннямі ‘мі́ска’ і ‘таз’: *Пойдіш у баню, дак вазьмі большую міску*; *То у місці лісты да храпы ляжаць, пачысці храпы детям, заберы корові лісце і храпы* [3, с.194]. Дыялектная наміна-

цыя ***дра́чка*** мае тры значэнні: 1) ‘тарка’; 2) ‘ручныя жорны’: *Колас я додому прынесла, дак поўпуда було, а тады на дра́чку да помолола да хлеба напекла*; 3) ‘спецыяльная прылада ў цесляроў’: *Дра́чка трошкі загнутая, ведеш па ніжнему дераву, захватуеш верхнее, калі прыдерэш, дак ены шчыльна прылегаюць* [3, с.107]. Слова ***пля́шка*** (памянш. ***пля́шачка***) выкарыстоўваецца як для наймення бутэлькі, так і для назвы шкла для лямпы: *Пачысці пля́шку да надень на лампу*; *Запалі лампу. – Де тая пля́шка, шчо учора купіла?* [3, с.270]. На Лоеўшчыне паланізм ***га́рнец*** у выніку метанімічнага пераносу стаў мнагазначным словам і ўжываецца ў значэнні ‘вядро’: *Тады ж делалі дераўяные га́рнецы майстры, а цепер зелезные* і ў значэнні ‘мера сыпучых рэчаў (¼ вядра)’ [3, с.82].

Даволі распаўсюджанай у разглядаемай групе дыялектнай лексікі з’яўляецца з’ява аманіміі. Аманімічнымі з’яўляюцца наступныя пары слоў, сярод якіх адна з лексем – найменне посуду:

байстручо́к[1] ‘маленькая бутэлька’ і ***байстручо́к***[2] ‘пазашлюбнае дзіця’: *Бач екі байстручо́к ужэ вурас, да гледзіць маткі* [3, с.44];

жура́ў[1] ‘трохлітровы буталь’ і ***жура́ў***[2] ‘журавель’: *Ходзіць жура́ў па поплаву*; *Журавы́ лецяць пад сонцам і курлычуць* [3, с.116];

ко́нік[1] ‘чарка’ і ***ко́нік***[2] ‘цвыркун’: *На траву вунь сколькі ко́нікаў прыгае*; ***ко́нік***[3] ‘варэнік’: *Заўтра будам з вішань ко́нікі делаць*; *Ко́нікі маленькіе, лепяцца кулачкамі*; *Два ко́нікі прынёс, што пекуць із сырам* [3, с.162];

ляско́вачка[1] ‘маленькі гаршчок’ і ***ляско́вачка***[2] ‘дзіцячая гульня’: *Хаді гуляць у леско́вачку* [3, с.186];

мяша́нка[1] ‘вялікая драўляная лыжка, якой мяшаюць у гаршку’ і ***мяша́нка***[2] ‘тоўчаная бульба, пюрэ’: *У нас меша́нку делаюць*; *Наварыла меша́нкі да затаўкла салам – ежце*; *Вам солонікаў наварыць ці меша́нкі зделаць?* [3, с.198].

Дыялектная назва маленькага гаршчка ***кула́к***[1] узнікла як метафарычны перанос па памеры ад наймення *кулак*[2] са значэннем ‘кісць рукі з прыгнутымі к далоні пальцамі’ [2, II, с.751], назва посуду з гліны для алею ***ты́ква***[1] – як перанос па форме ад наймення *ты́ква*[2] (руск.) – *гарбуз* (бел.) – са значэннем ‘буйны круглы або авальны плод агароднай расліны сямейства гарбузовых з паўзучым сцяблом’ [2, II, с.30].

Некаторыя аналізуемыя адзінкі ўваходзяць у склад народных фразеалагізмаў, а іменна лексемы *гаршчок*: ***гаршчкі́ павыяда́ць*** – ‘прагна паесці’: *Казала: зяць пабагату есць, навару, дак гаршчкі́ павуеда́е* [3, с.83] і *тарэ́лка*: ***тарэ́лкі павыяда́ць*** – ‘з’есці ўсё’: *Шчоб я с сего места не устала: усе тарэ́лкі павуеда́ў* [3, с.356].

Акрамя вышэйпададзеных груп посуду, у асобную групу мэтазгодна вылучыць **драўляны посуд.** У дадзеным артыкуле мы разгледзім асобныя найменні пасудзін з дрэву: што не былі прааналізаваны вышэй і што ўжываюцца менавіта для захавання прадуктаў харчавання.

Як вядома, вырабы з дрэва як асноўнага віду матэрыялу спрадвеку займалі ў гаспадарчым побыце беларусаў значную частку. Нягледзячы на тое, што з’явілася шмат начынняў з іншых, альтэрнатыўных, матэрыялаў, тым не менш, многімі драўлянымі рэчамі беларусы карыстаюцца і сёння.

Самая вялікая колькасць дыялектных адзінак зафіксавана для наймення *бочкі* (згодна з Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы гэта ‘вялікая цыліндрычная пасудзіна з двума плоскімі днішчамі, зробленая з выпуклых драўляных клёпак, сціснутых абручамі, або з бляхі’ [2, I, с.397]), а менавіта: ***шча́нь***: *На зіму ставаім две шча́ні капусты і гуркоў*; *Муку калісь у шча́ні хавалі, а цепер колькі трэба, купляем у магазіне* [3, с.424], ***асі́наўка*** (‘вялікая бочка з асінавай клёпкі’): *Намалаціли цэлую асі́наўку жыта* [3, с.37], ***лубя́нка*** (***луб’я́нка***) (‘вялікая бочка, у якую ссыпалі зерне’): *Зразу прывезлі зерно і высыпалі у чатыры луб’я́нкі*; *Калісь зерно ссыпалі у луб’я́нкі* [3, с.181], ***бары́ла*** (‘невялікая бочачка’): *Прывезуць бочку піва, шчэ гарэлкі бары́ла, а бары́ла гаварыла: калі мене не вуп’еце, то па постаці пакачусь да да каплі разваллюсь* (З нар. песні) [3, с.47].

Са значэннем *дзе́жка* (‘драўляная, крыху звужаная к верху пасудзіна з прамых клёпак’ [2, II, с.166]) ужываецца найменне ***ўсы́пішча*** (‘дзежка, у якую ссыпаюць зерне’): *Усы́пішча – тое, што усыпная дежка*; *У усы́пішча жменяю ячменю нанасіў* [3, с.382].

У беларускай унармаванай мове намінацыя *ку́бел* (памянш. *кубе́лец*, *кубёлак*) ужываецца са значэннем ‘дзежка з вушкамі і векам, звычайна для захоўвання прадуктаў і рэчаў’ [2, II, с.748]. У гаворцы жыхароў Лоеўшчыны ўжываецца літаратурная лексема *ку́бел* з памяншальным варыянтам *ку́блік* у значэнні ‘бочка з векам для сховы сала’: *Ку́бел – дежка з вушкамі і засаўка, накрываецца кружок такі – века*; *У ку́бел сала складаем*; *Ку́блы былі круглые із верхам*; *Ку́бел мёду Дятлы накачалі*; *Кублік сала наклалі, а засталася паўку́бліка* [3, с.169].

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы падае літаратурную лексему *скры́ня* з двума значэннямі: ‘вялікая чатырохвугольная (звычайна драўляная) пасудзіна для складвання ці ссыпання чаго-небудзь’ і ‘прадаўгаватая пасудзіна (звычайна з акенцам) для перавозкі сельскагаспадарчых матэрыялаў, прадуктаў і пад.’ [2, V/1, с.185]. У дыялектнай мове Лоеўшчыны з першым значэннем ужываюцца сінанімічныя лексемы ***пак*** (‘скрыня для мукі, збожжа’): *У нас заўсёды мука у пака́х стаіць* [3, с.240] і ***су́дня*** (‘скрыня для збожжа’): *У су́дню ссыпалі проса* [3, с.345].

Такім чынам, зыходзячы з прааналізаванага матэрыялу, можна зрабіць вывад, што ў гаворках Лоеўшчыны побач з нарматыўнымі найменнямі посуду і начыння функцыянуюць вузкарэгіянальныя, мясцовыя, дыялектныя назвы, што адрозніваюцца ад літаратурных адпаведнікаў гукавымі, словаўтваральнымі і граматычнымі паказчыкамі; шырока ўжываюцца лексічныя сінонімы; сярод пададзеных дыялектызмаў шмат мнагазначных слоў і амонімаў; некаторыя лексемы ўваходзяць у склад народных фразеалагізмаў.

Вывучэнне дыялектных назваў посуду дазваляе ўдакладніць моўную карціну свету, лепш зразумець сваю родную мову, бо кожнае мясцовае найменне ўяўляе сабой гістарычную з’яву народнага жыцця.

Літаратура

1 Матэрыялы для дыялектнага слоўніка Гомельшчыны [Тэкст] – У кн. : Беларуская мова і мовазнаўства. Міжвуз. зборнік. – Вып. 4 : Беларуская мова : Е – К.– Мінск : Выдавецтва БДУ імя У.І. Леніна, 1976. – 276 с.

2 Тлумачальны слоўнік беларускай мовы [Тэкст] : у 5 т. / Пад агульнай рэдакцыяй акадэміка АН БССР К.К. Атраховіча (Кандрата Крапівы). – Мінск : выдавецтва “Бел. Сав.Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі”, 1977–1984.

Т.1 : А – В / [Рэд. тома М.П. Лобан] – 1977. – 608 с.

Т.2 : Г – К / [Рэд. тома А.Я. Баханькоў] – 1978. – 768 с.

Т.3 : Л – П / [Рэд. тома П.М. Гапановіч] – 1979. – 672 с.

Т.4 : П – Р / [Рэд. тома Г.Ф. Вештарт, Г.М. Прышчэпчык] – 1980. – 768 с.

Т.5 : Кн. 1. С – У / [Рэд. тома М.Р. Суднік] – 1982. – 663 с.

Т.5 : Кн. 2. У – Я / [Рэд. тома М.Р. Суднік] – 1984. – 608 с.

3 Янкова, Т.С. Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны [Тэкст] / Т.С. Янкова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – 432 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 12.02.11

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 398:72

Клець як мастацкі вобраз у беларускай каляндарна-абрадавай паэзіі

А. Г. Алфёрава

У артыкуле прыводзяцца матэрыялы, у якіх раскрываюцца асаблівасці ўспрымання клеці як мастацкага вобраза ў кантэксце каляндарна-абрадавых песень. Падкрэсліваецца важнасць гэтай пабудовы ў духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў, спецыфіка яе паэтычнага асэнсавання.
Ключавыя словы: каляндарна-абрадавая паэзія, міфа-паэтычныя ўяўленні, медыятар, міфалагічны персанаж, абрадавае дзеянне, гаспадарчыя пабудовы, клець.

The article gives materials revealing the perception features of a crate as an artistic image in the context of the calendar and ceremonial songs. It emphasizes the importance of this building in the Belarusians' spiritual and material culture, the specifics of its poetic descriptions.
Keywords: calendar and ceremonial poetry, myths and poetic representations, mediator, mythological character, ceremonial action, house constructions, crate.

Жылыя і гаспадарчыя пабудовы, іх структура і генезіс прыцягвалі да сябе ўвагу многіх даследчыкаў. Але асноўныя працы, прысвечаныя жыллю і асабліва гаспадарчым пабудовам, усё ж такі выступаюць прыярытэтам этнографаў і ў пэўнай ступені гісторыкаў і этналінгвістаў. У кожным этнаграфічным даследаванні асобны і даволі значны раздзел прысвячаўся клеці. А. Харузін у працы "Славянское жилище в Северо-Западном крае" адзначаў, што клець увогуле можна лічыць "першапродкам" хаты: "Клець толькі папярэднічала хаце, маючы ў сваю чаргу іншых, у сэнсе жылля, папярэднікаў, з якіх бліжэйшым была, верагодна, хіжа – зямлянка, замененая клеццю... Верагодна дапусціць, што клець была заменена хатай, жыллём самастойным" [11, с. 269]. Да прымітыўнага жылля перыяду агульнасці славянскіх плямён адносяць клець А. Бломквіст [2, с. 22], А. Лакотка [1, с. 225]. Этымалогію назвы даследчыкі звязваюць са значэннямі "будынак, пакой, келля, кладоўка", а таксама з асаблівасцямі пераходу ад слупавай да зрубнай канструкцыі (клетка) [8, с. 53].

Зразумела, што асаблівая ўвага да гэтай пабудовы непасрэдна вынікае з яе шматфункцыянальнасці. У першую чаргу клець мела гаспадарчае прызначэнне і служыла для захоўвання зернявых, ураджаю. У той жа час у летні перыяд клець выконвала функцыю жылой пабудовы: у ёй начавалі гаспадары. Менавіта ў клець пасля вяселля адпраўляліся маладыя, якія жылі там некаторы час, па сведчаннях А. Харузіна, нават да нараджэння дзіцяці [11, с. 272]. На двары магло быць некалькі клецяў, "па колькасці жанчын у доме, асабліва снох". Сумяшчэнне гаспадарчых і жылых функцый у міфапаэтычнай свядомасці выклікала нават уяўленне, што ў клеці жыў свой ахоўнік – клетнік: "Ён таксама прыносіў тут карысць, бо любіў прасушваць хлеб, перасыпаючы яго са жмені ў жменю" [9, с. 129]. У той жа час у параўнанні з хатнікам клетнік усё ж такі выконваў функцыі "дамавіка-гаспадара", а не ахоўніка сямейнага дабрабыту.

Адметнасць і цікавасць фальклору заключаецца ў тым, што ён дапамагае напоўніць рэальны свет, што акружае чалавека, у тым ліку і аб'екты матэрыяльнага побыту, самабытнай паэзіяй, хараством. Таму цікавымі ўяўляюцца даследаванні, што дапамагаюць спалучыць рэальнасць (а ёй у дачыненні да жылля, як адзначалася, займаецца этнаграфія) і міфапаэтычныя ўяўленні (а сфера іх захавання – фалькларыстыка). Свет рэальны і свет мастацкі, маючы шмат агульнага, у той жа час характарызуюцца і адметнымі ўласцівасцямі. Напрыклад, асноўная мэта каляндарна-абрадавых песень, прымеркаваных да пераломных гадавых перыядаў, заключалася ў тым, каб пры дапамозе вербальных сродкаў (замацаваных формул, прыгавораў, пажаданняў) паспрыяць будучаму добраму ўраджаю і, як следства, багаццю і дабрабыту сям'і. У выніку выканання пэўных рытуальна-абрадавых дзеянняў, па народных уяўленнях, можна было дапамагчы свету і прасторы (у тым ліку свайму двару, паселішчу) набыць гармонію, трываласць і ўстойлівасць. А паколькі найбольш блізкім для чалавека і ас-

ноўным для яго было менавіта бліжэйшае асяроддзе бытавання (уключала ў сябе навакольны ландшафт – лес, поле, луг, раку, возера, ручай; паселішча, вуліцу, двор, хату і гаспадарчыя будынкі), то і аб'екты гэтага асяроддзя цалкам падпарадкоўваліся напрацаваным і назапашаным у фальклоры формулам.

Мэта артыкула – на прыкладзе каляндарна-абрадавай паэзіі прасачыць міфапаэтычныя ўяўленні, звязаныя з клеццю, высветліць трансфармацыю гэтага вобраза ў мастацкім свеце каляндарна-абрадавай паэзіі.

У каляндарных песнях асноўнай характарыстыкай клеці будзе яе навізна: *"Да ці дома сам пан гаспадар? / Святы вечар!... / Да ці дома, дома да яго дачка? / Ой, нам казалі, што няма дома, / А ў* ***новай клеці*** *белы хусты качае"* [6, № 228]; *"Між* ***клеткамі****, між* ***новымі****... / Расце рожа чырвоная"* [3, № 259]; *"Купала на Йвана! / Братава залву на ноч звала: / Да ў мяне клетка новая"* [7, № 745]. Такі эпітэт становіцца цалкам зразумелы, калі ўзгадаць функцыю кожнага з цыклаў: калядныя песні, што выконваліся ў адпаведны перыяд, былі прымеркаваны да стварэння новага свету (пераход ад старога да новага года); блізкія да іх і валачобныя песні першапачаткова звязваліся з надыходам вясны, пачаткам новага земляробчага цыкла. Купальскія песні, прымеркаваныя да перыяду летняга сонцавароту, таксама адзначалі змену двух гадавых цыклаў. У такі памежны час у міфапаэтычнай свядомасці ўвесь свет нібы ствараўся нанава, гэта значыць павінен быў набыць гарманічнасць і ўпарадкаванасць.

На гаспадарчым двары клець магла або звязвацца з жылым звяном, або стаяць асобна. У некаторых варыянтах каляндарна-абрадавых песень яна таксама мае адасобленае становішча і нават у пэўнай ступені сапраўды можа ўяўляцца старажытным першапачатковым жыллём: *"На том беразе / Стаіць клетачка"* [6, № 590]. У адной з юраўскіх песень клетка ўвогуле знаходзіцца ў міфічным бары з незвычайнымі ўласцівасцямі: *– Юр'я, сыры бор гарыць! / – А што ў тым бару стаіць? / – Стаіць новая клетка"* [4, № 210].

Паколькі асноўным клопатам беларуса-земляроба быў багаты ўраджай, ад якога залежаў дабрабыт сям'і да пачатку наступнага земляробчага цыклу, то асноўнай характарыстыкай клеці ў каляндарных песнях, асабліва калядных, валачобных і жніўных, будзе з'яўляцца яе паўната (напоўненасць зернем): *"Ў клеці – карбамі, у пячы – пірагамі"* [6, № 259]; *"У тваёй клеці а насыпіста"* [3, № 109]; *"Поўны клеці карабамі"* [5, № 1]; *"Толькі магу я – у полі капамі, / А ў гумне стагамі, / А ў клеці засекамі"* [5, № 3 г]. На тое, што падобныя вобразы ў песнях выконвалі магічную прадуцыравальную функцыю, паказвае заўвага збіральнікаў: "Выконваючы такога роду песенькі, сыпалі па хаце зярнятамі і тым самым утваралі абрад "засявання"" [6, заўв. да № 605].

У той жа час і вобраз галоднай вясны перад пачаткам новага земляробчага года таксама пазначаецца праз вобраз клеці, але ўжо з адваротнай характарыстыкай – пустатой:

Вясна красна,
Што ж ты нам прынясла?
– З пунькі сянцо
Вынесла, вынесла,
З току саломку
Вытрасла, вытрасла,
З клеці зярно
Вымела, вымела [4, № 98].

На багацце гаспадаркі, заможнасць гаспадара ўплывае і тое, якія канкрэтна будынкі стаяць у яго на двары. Так, у дбайнага працаўніка павінны прысутнічаць усе віды гаспадарчых пабудоў, па якіх і будзе размеркавана яго дабро: *"У слаўнага пана, [пана] Пятра / Ёсць клетачкі і паветачкі"* [3, № 95]. А ў адной з купальскіх песень сустракаецца і вобраз клеці з прыбудовамі, што таксама ў кантэксце мастацкага свету дапамагае нешматлікімі выразнымі сродкамі стварыць уяўленне пра трываласць і надзейнасць пабудовы: *"Прыйдзі ка мне ноч начаваці, / Да цябе ў мяне ніхто не ўкрадзе: / Да ў мяне клетка з перакляткамі"* [10, № 472].

Каляднікі і валачобнікі заўсёды ўспрымаліся як медыятары паміж двума светамі, таму лічылася, што яны валодаюць незвычайнымі здольнасцямі і могуць паўплываць на будучы ўраджай і дабрабыт сям'і. Таму ў калядных і валачобных песнях важным структураўтваральным элементам выступаюць пажаданні (а калі сустрэнуць неадпаведны прыём – то і праклёны) гаспадарам. Таму адным з кампанентаў калядных і валачобных песень становіцца загад да гаспадароў ісці ў клець і прынесці пачастунак гасцям і іншым міфалагічным персанажам (напрыклад, казе): *"Ты ж, гаспадынька, не будзь такая, / Як была барабаніха, / А будзь лас-*

кава, запалі свечачку, / Запалі свечачку да пайдзі ў клетачку, / Да набяры мачку на талерачку" [6, № 545]; *"Гаспадарочак, слічны паночак... / Чаго спіш, ляжыш, вылягаешся... / Вазьмі свечачку, ідзі ў клецечку, / Ідзі ў клецечку па гарэлачку"* [3, № 128].

Так, у песнях пацвярджаецца яшчэ адна функцыянальная прызначанасць гэтай гаспадарчай пабудовы – захаванне прадуктаў: *"Каўбаса з клеці, а кішка з печы"* [Зп, № 138]; *"Скавародку ў печ, па яечкі – ў клець"* [3, № 52].

Акрамя ахарактарызаваных уласцівасцей клеці, якія падпарадкоўваліся абрадавым дзеянням і функцыям, у песнях, прымеркаваных да каляндарных цыклаў, вобраз клеці часам нясе значную псіхалагічную нагрузку. Так, у адным з варыянтаў, што выконваліся на Купалле, адбываецца супастаўленне клеці бацькоўскай і цесцевай, пад якія дзяўчаты сеюць гарох:

Набяром, сястрыцы,
Жоўтага пясочку
І пасеем, сястрыцы,
Пад таткаву клетку.
А знаці, пазнаці,
Пясочак не ўзыдзець –
Нам у таткі не быці,
Вянкоў не насіці...
Набяром, сястрыцы,
Белага гарошку
І пасеем, сястрыцы,
Пад цесцеву клетку...
Гарошак узыдзе –
Нам у свёкаркі быці... [10, № 380]

Такім чынам, асноўная функцыянальная прызначанасць клеці ў каляндарна-абрадавых песнях, у першую чаргу, заключаецца ў яе багацці, што сведчыць пра заможнасць сям'і, гаспадарлівасць і працаздольнасць яе членаў. У меншай ступені ў падобных песнях выражана маркіраванасць клеці як жылля дзяўчыны або маладых (такія рысы прасочваюцца часцей у каляндарна прымеркаваных варыянтах).

Літаратура

1. Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 т. / навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – Т. 4. – Кн. 1. Беларускае народнае дойлідства / А.І. Лакотка. – 495 с.

2. Бломквист, Е. Э. Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов (поселения, жилища и хозяйственные строения) / Е. Э. Бломквист // Восточнославянский этнографический сборник. Очерки народной материальной культуры русских, украинцев и белорусов в XIX – начале XX в. / отв. ред. С. А. Токарев. – М., 1959. – Т. 31. – С. 3 – 458.

3. Валачобныя песні / склад.: Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей; склад. муз. часткі В І. Ялатаў; рэд. тома К. П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.

4. Веснавыя песні / склад.: Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей; рэд. тома К. П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 608 с.

5. Жніўныя песні / уклад. А. С. Ліса; уклад. муз. часткі В. І. Ялатаў; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 816 с.

6. Зімовыя песні / уклад., сістэматызацыя тэкстаў, уст. арт. і камент. А. І. Гурскага; рэд. М. Я. Грынблат. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 736 с.

7. Купальскія і пятроўскія песні / уклад. А. С. Ліса, С. Т. Асташэвіч; уклад. муз. часткі Г. В. Таўлай; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 631 с.

8. Лакотка, А. І. Сцежкамі дзядоў: этнагр. нарыс / А. І. Лакотка, С. В. Барыс. – Мінск: Народная асвета, 1986. – 174 с.

9. Ленсу, Я. Ю. Таямніцы беларускай хаты / Я. Ю. Ленсу. – Мінск: Беларусь, 2007. – 167 с.

10. Паэзія беларускага земляробчага календара / уклад., сістэматызацыя тэкстаў, уст. арт. і камент. А. С. Ліса. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 613 с.

11. Харузин, А. Н. Славянское жилище в Северо-Западном крае. Из материалов по истории развития славянских жилищ / А. Н. Харузин. – Б.г., Б.м. – С. 163 – 501.

Институт искусствоведения,
Этнографии и фольклора им. К. Крапивы
НАН Беларуси

Поступило 12.07.2010

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 398.9(=161.3):133.4:81.161.3'42

Семантыка структурных кампанентаў матыву зварот замаўляльніка

С. А. Вяргеенка

У артыкуле на прыкладзе аднаго з самых распаўсюджаных матываў беларускіх лекавых замоў разглядаюцца пытанні вызначэння ролі матыву ва ўтварэнні сюжэта і структуры замоўнага тэксту.
Ключавыя словы: замова, функцыянальная група, матыў, структурныя кампаненты, сэнсавы ўзровень, канстантны кампанент, суб'ект, прэдыкат, сюжэт, структура.

In this article on the example of one of the most common motifs of the Belarusian treatment spell the author defines the role of motive in the creation of spell plot and structure.
Keywords: spell, functional group, motif, structural components, semantic level, constant component, subject, predicate, plot, structure.

Праблема тэарэтычнага асэнсавання паняцця "матыў", без выкарыстання якога цяжка суадносіць катэгорыі "тыпалагічнае" і "адметнае" ў структуры і функцыянальнасці замоўных матываў, з'яўляецца найменш распрацаванай у айчыннай фалькларыстыцы, нягледзячы на тое, што менавіта фалькларысты першапачаткова найбольш сур'ёзна займаліся даследаваннем сутнасці катэгорыі "матыў". Спецыяльных даследаванняў, якія былі б прысвечаны класіфікацыі і характарыстыцы асобных замоўных матываў, у айчыннай фалькларыстыцы не праводзілася. Да разгляду замоўных матываў звярталіся расійскія даследчыкі. Т. Агапкіна, напрыклад, вылучае спецыяльныя, міжфункцыянальныя матывы, што "дазваляе ў дэталях убачыць сюжэтны склад кожнай функцыянальнай групы палескіх замоў" [1, с. 19], прапануе аб'яднаць некалькі матываў (сярод іх: "Вытокі і характарыстыкі хваробы", "Выгнанне хваробы з частак цела", "Няхай хвароба не шкодзіць чалавеку і яго целу", "Хваробе не быць ніколі", "Выгнанне хваробы ў далёкія, пустынныя месцы", "Выгнанне хваробы туды, дзе нічога не адбываецца", "На "тым" свеце/там, куды адсылаюць хваробу, яе чакаюць у госці, там пір, адпачынак і весялосць" [1, с. 96-97]), якія "сустракаюцца ў самых розных групах лекавых замоў і нават у замовах сацыяльна-бытавой і гаспадарчай накіраванасці" [1, с. 96], што, на думку даследчыцы, дае магчымасць "вылучыць іх у асобны сюжэтны тып, названы... "ўніверсальны тып замоў". Універсальнасць абумоўлена... яго прынцыповай поліфункцыянальнасцю, а аб'яднанне ў адзін тып некалькіх матываў тлумачыцца высокім узроўнем іх звязанасці адзін з адным, паколькі ў большасці выпадкаў пры з'яўленні аднаго з матываў, які ўваходзіць у гэты тып, можна чакаць і іншых" [1, с. 96]. У. Кляус, хоць і не гаворыць аб прынцыповай нязгодзе адносна прадстаўленай Т. Агапкінай умоўнай класіфікацыі замоўных матываў, аднак выказвае сумненне наконт вылучэння сярод матываў "універсальных" і "міжфункцыянальных", бо і тыя, і другія, на яго погляд, поліфункцыянальныя. "Наўрад ці можна таксама, – працягвае думку даследчык, – цэлы шэраг матываў, аднесеных аўтарамі да "спецыяльных", вызначыць менавіта такім чынам, бо зварот да больш шырокага ўсходнеславянскага матэрыялу паказвае іх поліфункцыянальнасць" [2, с. 82]. Вопыт класіфікацыі замоўных матываў Т. Агапкінай і вялікі фактычны матэрыял, запісаны ў розных раёнах Гомельшчыны, дазваляе вылучыць наступныя матывы: спецыяльныя (характэрныя для канкрэтнай функцыянальнай групы, напрыклад, матыў "Узнаўленне цэласнасці" ў замовах "Ад звіху"), міжфункцыянальныя (якія сустракаюцца ў некалькіх функцыянальных групах, напрыклад, матыў "Вытокі хваробы" ў замовах "Ад суроку", "Ад пужання" і інш.) і ўніверсальныя (якія сустракаюцца ў розных тэматычных групах, напрыклад, матыў "Зварот замаўляльніка…" ў групе лекавых, гаспадарчых, сямейна-бытавых замоў). Для аналізу замоўных матываў прапануецца наступная схема:

– вызначэнне функцыянальнай ролі матыву ў замоўным тэксце;
– вызначэнне рысаў асобных структурных кампанентаў матыву (канстантнасць, імпліцытнасць);
– характарыстыка структурных кампанентаў матыву:
– суб'екта (улічваючы яго іпастась, функцыянальную скіраванасць);

– дзеяння суб'екта (пазітыўнае, негатыўнае);

– аб'екта, на які накіраваны дзеянні суб'екта;

– акалічнасцей дзеяння (у першую чаргу ў дачыненні да міфалагічных уяўленняў, якія прысутнічаюць у гэтым структурным кампаненце).

Найбольш частотным матывам у беларускіх лекавых замовах з'яўляецца матыў "Зварот замаўляльніка ...". У яго межах можна вылучыць асноўныя групы персанажаў, што дазволіць канкрэтызаваць аналізуемы матыў на аб'ектным сэнсавым узроўні і прадставіць зробленую на аснове аб'ёмнага фактычнага матэрыялу класіфікацыю субматываў і мікраматываў. У якасці субматываў вышэйназванага матыву выступаюць наступныя: "Зварот замаўляльніка да хрысціянскіх персанажаў", "Зварот замаўляльніка да язычніцкіх персанажаў", "Зварот замаўляльніка да персанажаў, у якасці якіх выступаюць прыродныя і касмічныя аб'екты", вылучэнне якіх на аб'ектным сэнсавым узроўні абумоўлена ў межах названага матыву канстантнасцю такіх структурных матыўных кампанентаў, як суб'ект і дзеянне.

З мэтай вызначэння функцыі, якую выконвае матыў "Зварот замаўляльніка…" ў замоўным тэксце, неабходна ўдакладніць месца і ролю кожнага субматыву, які рэалізуецца праз мікраматыў. Улічваючы вялікую колькасць тэкстаў з аналізуемым матывам, для аналізу выбраны найбольш распаўсюджаныя субматывы і мікраматывы, сярод якіх "Зварот замаўляльніка да Прачыстай Маці". Папулярнасць мікраматыву "Зварот замаўляльніка да Прачыстай Маці" тлумачыцца мерай засвоенасці гэтага вобраза пэўным супольніцтвам. На прафанным узроўні чалавек перш за ўсё звяртаецца за дапамогай да маці, тое ж назіраецца і на ўзроўні сакральным. Боская Маці ўяўлялася маці-заступніцай, самым блізкім чалавекам для ўсяго народа.

Праведзены аналіз лекавых замоў з матывам "Зварот замаўляльніка …" дае падставы сцвярджаць, што вылучаны субматыў "Зварот замаўляльніка да хрысціянскіх персанажаў" выконвае як структураўтваральную, так і сюжэтаўтваральную функцыі. Доказам першай (структураўтваральнай функцыі) з'яўляецца прысутнасць субматыву "Зварот замаўляльніка да хрысціянскіх персанажаў" у малітоўных уступах або ў зачынах: "*Госпаду Богу памалюся, Святой Прэчистай Божьей Мацери пакланюся. Святая Прэчистая Божья Мацер и Святый отче Никола, стань мне на помаш пристрек угавараць*" – Лоеўскі раён Гомельскай вобласці [1, с. 155, № 242], "*Госпадзі Божа, васкресні маю малітву, вазлюбі, вазнесі да Госпада Бога і Мацеры Прачыстай. Вячэрняя ілі утренняя зорачка, Прачыстая Матачка, прыступісь на помач, святы (панядзельнічак, уторнічак) на ратуначак*" – Кармянскі раён Гомельскай вобласці [3, с. 43], "*Госпаду Богу памалюся і матары Божай прыкланюся, – прыступіця і памажыця рабе божай. Сыботачка-мамачка, як ты свет аснавала, жаркае сонейка і яснае месячка, і зоры-зараніцы і божыя памашніцы, прыступіця і памажыця рабе божай*" – Старадарожскі раён Мінскай вобласці (вар. Лепельскі раён Віцебскай вобласці, Ганцавіцкі раён Брэсцкай вобласці) [4, с. 238, № 806]. Названы субматыў характэрны таксама для замоў іншых усходнеславянскіх традыцый, напрыклад, рускай: "*Господи Иисусе Христе, Сыне Божий, помилуй нас*" [5, с. 46, № 57], "*Господи Боже, благослови*" [5, с. 59, № 103]. У рэдкіх выпадках аналізуемы субматыў выкарыстоўваецца і ў чэшскіх замовах, аднак, у адрозненне ад іншых славянскіх традыцый, зварот не дапаўняе малітоўны уступ, гэтыя два сегменты ўжываюцца паасобку: "*Přesvatá Bohorodičko, prosím tě o pomoc. Svatý Otče, Antoníne, vyléčil jsi Hospodina Boha z veliké bolesti, od lámání v kostech ze 70 částí těla*…" ("*Пресвятая Богородица, прошу тебя о помощи. Святой Отец, Антонин, ты исцелил Господа Бога от сильной боли, от ломоты в костях в 70 частях тела*…") [6, с. 98, № 51], або "*Bože, račiž počíti, já N. Počínám vodu dělati*…" ("*Боже, соблаговоли начать, я Н. (имярек) начинаю воду делать*…") [6, с. 131, № 149]. З прыведзеных вышэй прыкладаў вынікае, што разам з хрысціянскімі персанажамі ў малітоўных уступах або зачынах прысутнічаюць і характэрныя ўвогуле для фальклорных тэкстаў персанажы, найменні якіх выражаны назоўнікамі, што "абазначаюць элементы ландшафту і дрэвы, назвы звяроў і птушак, нябесных свяціл і іншых крыніц святла, розных матэрыяльных прадметаў" [7, с. 344]. Для замоўнага жанру ўвогуле, як адзначаў У. Даль, характэрна "недасведчанае змяшэнне духоўных і мірскіх – святых і прымхлівых паняццяў" [8, с. 34]. Паводле меркавання даследчыка Б. Працэнкі, у прыватнасці, тэксты данскіх замоў "указваюць на своеасаблівае спалучэнне язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў пры пе-

равазе апошніх у зачынах. “Героямі” гэтай часткі замоў выступаюць, з аднаго боку, Ісус Хрыстос і Багародзіца, Гаўрыіл і Міхаіл-Архангел, Самуіл і Ілля-прарок і г. д., з другога – зара-зарніца, змей-змеявод … месяц малады і інш.” [9, с. 43]. Традыцыя выкарыстання ўласных імёнаў хрысціянскіх персанажаў характэрна для агульнаславянскага кантэксту: у тэкстах рускіх замоў сустракаюцца святыя Ілья, Лазар, Пётр, Павел, Анціпій, Панцелеймон і інш. [5]; ва ўкраінскіх – Мікола, святыя Юрый, Панцелеймон, Пятро, Павел [1]; у балгарскіх – апосталы Фама, Кузьма, Дзям’ян, святыя Георгій, Атанас, Пётр, Ілья, Іван, Мікалай і інш. [10]. Наяўнасць уласных імёнаў хрысціянскіх персанажаў у беларускіх лекавых замовах, а таксама ў замоўных тэкстах іншых славянскіх традыцый дазваляе не пагадзіцца з меркаваннем К. Вяльмезавай адносна таго, што “святыя замоўныя персанажы, якіх называюць па імёнах”, уласцівы толькі для “чэшскай замоўнай традыцыі” [11, с. 96]. Варта падкрэсліць, што хрысціянскія і агульнафальклорныя вобразы ўжываюцца з характэрнымі для кожнага з іх эпітэтамі: “святы”, “прысвяты”, “божы” “прачыстая”, сонейка “яснае”; месяц “красны”; зоры (зара) “вячэрняя, ранішняя”; вецер “ціхі”.

Субматыў “Зварот замаўляльніка да хрысціянскіх персанажаў”, які ў большасці выпадкаў дапаўняе малітоўны ўступ або зачын, выконвае структураўтваральную функцыю, па сутнасці з’яўляецца этыкетнай формулай благаславення і не нясе асаблівай сэнсавай нагрузкі. У сувязі з гэтым можна пагадзіцца з меркаваннем Г. Барташэвіч адносна таго, што “ў большасці выпадкаў хрысціянскія напластаванні кранулі не сам дух і сутнасць замовы, колькі асобныя фармальныя моманты” [12, с. 122]. Просьба замаўляльніка звычайна мае выгляд абагуленых стэрэатыпных формул, накшталт “прыступі, дапамажы”. Асноўнае дзеянне, скіраванае на пазбаўленне ад хваробы, у гэтых замоўных тэкстах выконваюць персанажы Ісус Хрыстос, Пятро, Павел, анёлы, хвароба, замаўляльнік, бабка, птушкі, жывёлы і г. д., якія становяцца суб’ектамі іншых матываў.

Зрэдку сустракаюцца такія тэксты лекавых замоў, у якіх менавіта субматыў “Зварот замаўляльніка да хрысціянскіх персанажаў” з’яўляецца пачаткам развіцця сюжэта: “*Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай матцы пакланюся. Божая маць, прыдзі к нам і дапамажы нам. Прачыстая Божая матка ішла, залаты бручык нясла. Бручык, іспусціся, жыватак, суніміся: падуманы, пагаданы, прыстрэчны, пасмешны, паньскі, хлапочы, дзявочы. Каб ні ачыналася, ні заміналася ні з поўні, ні сходу, ні маладзіком, ні ва векі вякоў*” [13, с. 139, № 343]. У замове, запісанай у Рагачоўскім раёне, Прачыстая Маці з’яўляецца таксама аб’ектам звароту замаўляльніка ў названым субматыве і суб’ектам у матыве “Спосабы пазбаўлення ад хваробы”: “*Памалюся сённяшняму дзянёчку, святому чацвярочку, святой мамачцы Прачыстай. Стань ты, мамачка Прачыстая, рабе божай (імя) на помач. Ішла маць Прачыстая па залатому масту, залатой трасцінай папіралася. К ёй наўстрэчу – Ісус Хрыстос. – Куды ты ідзёш, маць Прачыстая? – Іду к рабе божай (імя) на помач, вымаўляць, выгаварваць спужанне, здрыганне: начное, дзянное, полуночнае, з нутрэй, з пячаней, з жыл, з костачак, з сустаў. Па касці не хадзі, касці не ламі, сэрца не тамі, пасля мене, пасля духу майго*” [13, с. 196-197, № 526].

У некаторых выпадках субматыў “Зварот замаўляльніка да хрысціянскіх персанажаў” з’яўляецца працягам развіцця сюжэта. Так, у замове, запісанай у в. Шастовічы Петрыкаўскага раёна, Прачыстая Маці знаходзіцца на Міфалагічным цэнтры (у дадзеным выпадку гэты персанаж з’яўляецца суб’ектам дзеяння ў матыве “Міфалагічны цэнтр…”), дзе выконвае пэўныя дзеянні, яе сустракае замаўляльнік і звяртаецца з просьбай аб дапамозе: “*Ішла па-за рэчкай да па-за шэрымі барамі, трапіла на царкву адну ў Самаране. Там маці Прачыста была. Маць Прачыста піва-віно варыла, удар-звіх гаварыла. Удар-звіх гаварыла, матку Прачысту прасіла. – Матка Прачыста, стань на помашч, памажы! У рабы божай (імя) удар-звіх загавары. Каб не балела, не пухла, не зудзела, не бялела і не чарнела! Адбяры, адвяжы, напусці, адпусці на балоты, густыя чароты, каб у рабы божай (імя) больш не палілася, а ўсё загаілася…*” [13, с. 100, № 201].

Такім чынам, аналізуемы субматыў выконвае (хоць і зрэдку) сюжэтаўтваральную функцыю, яго можна лічыць “матывам-сітуацыяй” (Б. Пуцілаў), з ім “звязана ўвядзенне

герояў у апавяданне... і задаюцца адносіны паміж персанажамі, у межах якіх выяўляецца асноўная сюжэтная калізія” [14, с. 146].

Літаратура

1. Полесские заговоры (в записях 1970-1990 гг.) / сост., подготовка текстов и коммент. Т. А. Агапкиной [и др.]. – М.: Издательство “Индрик”, 2003. – 752 с.

2. Кляус, В. Теоретические проблемы систематизации заговорно-заклинательного фольклора / В. Кляус // Фольклористика в контексте наук о традиционной духовной культуре. Вопросы теории и методологии. Сборник материалов тематического блока XIV Международного съезда славистов (Македония, Охрид, 2008 г.). – М.: Государственный республиканский центр русского фольклора, 2008. – С. 76-86.

3. Крыніц кармянскіх перазвоны (абрады і песні ў сучасных запісах) / укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца, уступны артыкул В. С. Новак; пад рэд. І. Ф. Штэйнера. – Гомель : Гомельскі цэнтр навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 2000. – 210 с.

4. Замовы / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г. А. Барташэвіч; рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 597 с.

5. Русские заговоры. / сост., предисл. и примеч. Н. И. Савушкиной; ил. и оф. Е. А. Трофимовой. – М. : Пресса, 1993. – 368 с.

6. Вельмезова, Е. В. Чешские заговоры. Исследования и тексты / Е. В. Вельмезова. – М.: Индрик, 2004. – 280 с.

7. Топорков, А. Л. Эпитеты в Олонецком сборнике заговоров XVII века / А. Л. Топорков // Признаковое пространство культуры / отв. ред. С. М. Толстая. – М.: «Индрик», 2002. – С. 338-376.

8. Даль, В. И. О повериях, суевериях и предрассудках русского народа / В.И. Даль. – СПб.: Издательство «Литера», 1994. – 480 с.

9. Проценко, Б. Н. Из наблюдений над структурой текста донских заговоров / Б. Н. Проценко // Этнолингвистика текста. Семиотика малых форм фольклора: тезисы и предварительные материалы к симпозиуму. – М., 1988. – С. 42-43.

10. Сборник болгарских народных заговоров / сост., пред. и комм. И. Ф. Амроян. – Тольятти : ТГУ, 2005. – 138 с.

11. Вельмезова, Е. В. Об именах персонажей чешского лечебного заговора / Е. В. Вельмезова // Славяноведение. – 2002. – № 6. – С. 94-101.

12. Барташэвіч, Г. А. Магічнае слова: Вопыт даслед. светапогляд. і маст. асновы замоў / Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 128 с.

13. Таямніцы замоўнага слова / уклад., сістэм. тэкстаў, уступны арт., каментарыі і рэдаг. І. Ф. Штэйнера, В. С. Новак. – Гомель : Беларускае Агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1997. – 320 с.

14. Путилов, Б. Н. Мотив как сюжетообразующий элемент / Б. Н. Путилов // Типологические исследования по фольклору. Сборник статей памяти В. Я. Проппа (1895-1970). – М., 1975. – С. 141-155.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 13.05.10

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 398:392.5(=161) – 057.6:330.12

Мотив изобилия и благосостояния в невербальном тексте современной городской свадьбы

Л. Л. Ермакова

Данная статья посвящена выявлению и анализу ментальных, ритуальных и иных маркеров свадебной обрядовой одежды и свадебной ритуальной еды, которые носят невербальный характер и демонстрируют обрядовую реализацию культа изобилия, плодородия и благосостояния.
Ключевые слова: еда, изобилие, плодородие, обряд, одежда, ритуал, свадьба

The article is devoted to education and analysis of mental ritual and other markers of wedding and ceremonial clothes and food that have inverbal character and demonstrate ritual realization of affluence, fertility and welfare cults.
Keywords: food, affluence, fertility, rite, clothing, ritual, wedding.

Исследование особенностей функционирования наиболее характерной символики и атрибутики современного традиционного, в том числе и городского свадебного обряда неоднократно привлекало наше внимание [1, 2, 3]. Есть все основания утверждать, что современная урбанистическая культура, переживая стадию активной ритуализации, не только решительно вбирает в себя общеевропейские черты, но и демонстрирует явно выраженный интерес к элементам традиционной народной культуры. Городская сфера как открытая система коммуникаций в равной степени удовлетворяет запросы и потребности всех слоёв населения. В большей степени это относится к семейно-бытовой обрядности и в первую очередь касается бракосочетания. Пышная свадьба – характерная примета ритуально-обрядовой сферы жизни белорусских городов в XXI веке.

Современная гомельская свадьба является этому хорошим примером. Опираясь на традиции и сохраняя опыт трансляции трехчастной структуры (предсвадебная, собственно свадебная и послесвадебная обрядность), она в полной мере отвечает и вызовам времени, раскрывая потенциалы и возможности крупного культурно-промышленного центра. В этом смысле гомельской свадьбе присущи и новации: свадебный поезд с экипажем и конным эскортом, состоящим из профессиональных наездников и наездниц, свадебные лимузины, а также свадебный автобус и даже троллейбус и т. д. При этом предпочтение отдаётся испытанным традиционным атрибутам и ритуалам.

Особый интерес представляет выявление и анализ ментальных, ритуальных и других невербальных маркеров свадебной обрядовой одежды и свадебной обрядовой пищи гомельчан. Современные невесты, вступающие в первый брак, по-прежнему предпочитают длинные закрытые платья белого цвета. Белый цвет в традиционной культуре является символом чистоты и непорочности (цельности). Наблюдения показывают, что данная характеристика соотносится не только с одеждой, но и со всем нарядом в целом. Представление «длинный и белый» тождественно представлению «долгий и счастливый», что в свою очередь трансформируется в представление «целостный и богатый». Это поддерживается не только длиной платья, но и длиной фаты, покрывающей голову невесты, длинными перчатками, скрывающими её руки и, наконец, обувью закрытого типа. На определенном этапе в женскую туфельку кладут деньги. Гармоничный, цельный наряд дополняется украшениями, легкой сумочкой-кошельком, которая крепится к руке и букетом. Всё это в свою очередь завершает образ достатка, благосостояния и благополучия (сведения получены от Михайловой В. А., 1991 г. р.).
Этим представлениям не противоречит и костюм современного жениха. В системе левый/правый оппозиция белый/черный в современной картине мира параллельна оппозиции женский/мужской. Гендерные отличия на колористическом уровне представляются молодо-

жёнам и их окружению несомненно актуальными. Значимость маркировки половых различий объясняется прежде всего первостепенной важностью для человеческого сообщества факта обеспечения молодой семьей продолжения рода.

Однако реальное современное обрядотворчество свидетельствует о возможных и допустимых колебаниях. Так, в летнее время предпочтения всё более отдаётся костюмам светлых тонов, чаще всего серым (стальным) и бежевым (кофейным), к которым тщательно подбираются сорочки и галстуки. Креативные невесты также делают попытку расширить цветовой спектр, но, как правило, выбор падает на красный цвет (и его оттенки, чаще розовый), который, как известно, в народной культуре связан с символикой плодородия. Более того, традиционный женский свадебный наряд практически у всех восточнославянских народов в течение многих веков имел предпочтительно красный цвет. «Стихийный» возврат к традициям прошлого дает знать о себе и в некоторых выявленных нами случаях, когда в наряде невесты наблюдается сочетание белого и красного, например, красный веночек в прическе на голове, укороченное пышное белое платье с длинными рукавами и длинные сапоги-ботфорты красного цвета. В сознании современных девушек свадебное платье нередко ассоциируется с бальным нарядом, в результате чего предельно оголяются плечи, а юбка состоит из нескольких слоёв. При всей своей альтернативности эти наряды специфически также маркируют традиционные зоны, связанные с рациональным верхом и продуцирующим низом, опять-таки смещая акценты в сторону продуцирующего низа. Подобные исключения только подчеркивают общее правило: невеста должна быть в наряде белого цвета. Так, В. У. Тернер писал: «В ритуалах, связанных с жизненными кризисами, белым смывается состояние ритуальной смерти, т. е. преодолевается пограничное состояние между двумя периодами активной социальной жизни» [4, с.65].

В 70 – 80-е годы прошлого столетия у гомельчан белый наряд невесты повторялся и в убранстве куклы, которую крепили на капот машины, в которой ехала невеста (записано от Медведевой З. И., 1950 г. р.). Обрядовые свадебные куклы хорошо известны у восточных славян, с древних времён они выполняли функцию оберега, в эффективности которого никто не сомневался [5, с. 42]. В наши дни куклы, как и пара белых голубей из папье-маше, заменены скрещенной парой «золотых» колец. В последнее время машины предпочитают убирать переплетенными белыми и желтыми шарами и лентами, гладкими или украшенными атласными цветочками. В актуализировавшейся оппозиции живой/мертвый кукла и голуби явно проиграли, нежелание их использования в качестве атрибутов объясняется сложившейся приметой, согласно которой неживая кукла сулит несчастье будущему ребенку, а бумажные голуби – к разлуке (записано от Михайловой В. А., 1991 г. р). Более того, в моду вошло приглашение для участия в свадебном ритуале детей, одетых подобно жениху и невесте.

Значимость цвета в современной картине мира подтверждает и записанная нами от информатора шуточная народная колористическая интерпретация одежды, которую по такому случаю предпочитают выбирать гости. Человек, который ведёт церемонию предлагает лучше узнать друг друга по цвету праздничного костюма. Он поясняет семантику цвета одежды тех, кто пришел на праздник. Общеизвестные и вполне нейтральные характеристики часто перемежаются с шуточными и порой недвусмысленными намёками. «Люди, которые пришли в красных платьях, это люди, радостные, красивые, независимые. Они ценят полноту жизни, всегда готовы к любви, т. е. к сочувствию взаимопониманию, предпочтение отдают отдыху или каникулам на море. Люди в белом – часто наивные, но честные, с незапятнанной репутацией, добрые и порядочные. Предпочитают отдыхать среди снежных равнин и белых медведей. Чёрный цвет одежды говорит о том, что перед нами талантливые люди, которые способны околдовать абсолютно всех. Любят черную икру и чёрный кофе. Сексуально привлекательны и плодовиты во всём. Отдыхать любят на даче у поклонников. Одежда синего цвета гарантирует их обладателям благородное происхождение. Это верные люди, они переживают за всех и за всё. Отдыхать любят везде, лишь бы лететь самолётом или плыть на корабле» (записано от Мажоровой А. В., 1955 г. р. и Михасёвой Т. А., 1991 г. р.).

Функция белого в свадьбе как обряде перехода совпадает, как мы видим, с ритуальной функцией воды, которая обладает одновременно очистительными и плодоносящими свойст-

вами, воспринимаемыми также как магическое стимулирование богатства. Этим объясняются и выявленные случаи обливания или обрызгивания свадебного поезда (записано от Галайдиной Н. А., 1956 г. р.). Отсюда обливаниям предпочитаются полные или частичные ритуальные дублёры: обсыпание зерном, конфетами, лепесками цветов и др.

Прагматизм и рационализм становятся естественными спутниками традиционных обрядов. Брачная одежда европейского образца относительно недавно вытеснила традиционный костюм: в 19 веке эту моду перенимают высшие слои общества, а в течение 20 столетия на ментальном уровне она постепенно была принята всеми слоями населения. В наши дни в ритуальной одежде молодые регистрируют свой брак, венчаются, посещают памятные места.

Мотив богатства и наделения долей тесно связан в народной культуре с традицией поклонения предкам. Особенно ярко типологическое единство дедов и космических сил проявляется в тех случаях, когда в обрядах обнаруживается поминальная тематика. Обязательное посещение памятников воинам, погибшим в годы Великой Отечественной войны, других мемориалов тесно связано с «культом умерших» или «культом предков». По мнению О. А. Седаковой, эти традиционные термины, «переводя содержание обряда в чисто человеческий, социальный, «семейный» план, модернизируют и упрощают сами архаические представления «человеческого» и «природного», «смерти» и «жизни», богатство которых обеспечено их нечленораздельностью и логической непроясненностью» [6, с. 34].

Поклонение умершим сегодня в окказиональной обрядности – это порой не столько обращение к предкам с просьбой «помогать» (в архаическом варианте – «не вредить»), сколько дань уважении и памяти, благодарность за отвоёванную возможность жить в мире и радости, покое и достатке, т. е. счастливо. Номинальная жертва в виде букетов цветов неосознанно преподносится молодожёнами прежде всего с целью сохранения порядка и равновесия в природном и человеческом мире. Для белорусов, потерявших в последней мировой войне каждого третьего жителя, это воспринимается как высшее благо. Мотив приобретения новых благ трансформируется в мотив поддержания балланса позитивных сил, что и рассматривается как само по себе великое благо, способствующее процветанию и изобилию.

Мотив изобилия в современной свадьбе поддерживается также богатым и разнообразным пиром, учитывающим и максимальное количество приглашенных, и разнообразие подаваемых блюд, и их качественный состав. Так как молодые в это время находятся, как правило, в режиме воздержания, застолье адресовано прежде всего членам рода, гостям. При этом часто контролируется признак чет/нечет. Нечет чаще связывается с семантикой жизни и оперирует утроениями. Современному гомельскому застолью присуще преобладание разнообразной сытной пищи, с обязательным включеним холодных и горячих блюд, завершается застолье непременным употреблением сладостей. Причём особое внимание уделяется свадебному меню, обязательно ведётся самое тщательное его обсуждение, экономить не принято, более того, просматривается очевидное стремление к избыточности, что выражается даже в накоплении продуктов «прозапас», «на случай, если не хватит еды». Это имеет своё объяснение. Как известно, еда, приготовление еды, угощение во всех архаичных традициях теснейшим образом связаны с культом предков, с представлениями об ином мире. Свадебный пир как образ рая на земле становится специфическим гарантом по обеспечению помощи и поддержки предков [6, с. 114]. Наряду с обильной едой принято и обильное питьё. Переедание (обжорство) и опьянение восходят также к архаической символике обилия и связаны с семантическим мотивом доли. Архаическая символика вина как метафоры крови связывает вино с хлебом, что в свою очередь также соотносит их со сферой иного мира.

Хлебу и его ритуальным заменителям – зерну и блинам – отводится особая роль и в современной свадьбе. Хлеб выполняет инструментальную функцию как метафора жизненной силы (обсыпание зерном) и объектную функцию: воплощает на предметном уровне достаток (богатый каравай, больших размеров торт). Кроме вина, хлеб как магический предмет может выступать совместно с зерном (рожь, пшеница, а также гречка, рис, пшено), водой, рушником (полотенце, полотно), огнем (свечи), солью, медом и деньгами. Хлебом благословляют жениха и невесту в родительских домах, хлебу кланяется молодая пара в ЗАГСе, с хлебом-

солью встречают молодых родители перед началом свадебной банкета и т. д. По наблюдениям специалистов по традиционной культуре, хлеб в ситуации с невестой может использоваться не только как символ плодородия и общего благосостояния, но и в качестве символической замены ребенка – участника свадьбы [7, с. 136]. Зерном и деньгами неоднократно осыпают молодых. Благополучие семьи всегда тесно связывалось с наличием детей, поэтому и осыпание зерном в наши дни имеет не только общее продуцирующее значение, но и нередко сопровождается приговорами или конкретными пожеланиями, связанными с деторождением.

Обрядовая трапеза обязательно маркирует также каждую сцену в новом локусе обрядовых действий, предшествующих застолью: приглашением к столу завершается выкуп невесты, обязательное угощение ждет гостей в банкетном зале ЗАГСа, молодожёны устраивают небольшой пикник «на природе» для своих сверстников и др. Помимо значимости «пищевой жертвы» как таковой, следует отметить и важность включающихся при этом защитных механизмов функционирования традиционной народной культуры, которые требуют подобных повторов, реализуя важное явление, способствующее сохранению традиций, явление изоморфизма.

Инвариант свадебного обряда, который сегодня бытует в Гомеле, даёт основание утверждать наивысшую степень важности для современного человека структурной стабильности модели мира, которая была выработана предшествующей традиционной культурой, а это, в свою очередь, позволяет во всей полноте увидеть дошедшие до нас архаичные представления, в том числе архетипичные мотивы и древнюю символику, соответствующую обрядам перехода.

Литература

1. Ермакова, Л. Современная обрядовая практика малых городов Гомельщины: особенности ветковской свадьбы / Л. Ермакова // Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае у літаратуры: Міжнар. навук. чытанні, прысвеч. памяці Івана Навуменкі: зб. навук. арт. / М-ва адук. Рэсп. Беларусь, УА «ГДУ імя Ф. Скарыны», Гомельскі абл. Савет депут., Гомельская спеціяліз. слав. бібл.-ка; редкал.: І Ф.Штэйнер (гал. рэд.) [і інш.] – Гомель: ЦДІР, 2009. – С. 146-149.

2. Ермакова, Л. Л. Мифологический код каравайного обряда: современное прочтение // Известия Гомельского государственного университета имени Ф.Скорины. – № 3 (54). – Ч.2. – Гомель, 2009. – С. 21-26.

3. Ермакова Л. Л. Структурно-функциональная составляющая матримониальных отношений жителей современного Добруша // Христианский гуманизм и его традиции в славянской культуре: сборник научных статей, посвяў. 200-летию со дня рожденения Н. В. Гоголя. Вып .1. / редкол.: Т. Н. Усольцева (гл. ред.) [и др.]; м-во образования РБ, Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель: ГГУ им Ф. Скорины, 2009. – С. 99-102.

4. Тернер В.У. Проблема цветовой классификации в примитивных культурах (на материале ндембу) / В.У. Тернер // Семиотика и искусствометрия. – М.: Наука, 1977. – С. 50-82.

5. Котова И. Н., Котова А. С. Русские обряды и традиции. Народная кукла / И. Н. Котова. – Спб.: “Паритет”, 2006. – 240 с.

6. Седакова О. Е. Поэтика обряда. Погребальная обрядность восточных и южных славян / О. Е. Седакова. – М.: “Индрик”, 2004. – 320 с. (Традиционная духовная культура славян. Современные исследования.)

7. Плотникова А. А. Невеста и ребёнок в свадебном обряде южных славян / А. А. Плотникова // Родины, дети, повитухи в традициях народной культуры / Сост. Е. А. Белоусова; Отв. С. Ю. Неклюдов. (Серия «Традиция – текст – фольклор»). – М.: Российск. гос. гуманит ун-т, 2001. – 130-151.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 26.02.10

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 392.5 (=161.3):133.43 (476.2)

Сімволіка прадметаў у шлюбнай варажбе (на матэрыялах Гомельшчыны)

А. А. Кастрыца

У артыкуле разглядаецца сімволіка прадметаў у шлюбнай варажбе, прымеркаванай да розных каляндарных свят (Каляды, Пасха, Троіца).
Ключавыя словы: варажба, сімволіка, семантыка, сакральны прадмет, рытуальнае дзеянне.

In article the symbolics of subjects in the matrimonial guessings dated by various calendar holidays (by Koljady, Easter, Trojtsa) is considered.
Keywords: fortune-telling, symbols, semantics, sacral item, ritual act.

Значнае месца ў традыцыйнай духоўнай культуры славянскіх народаў займала варажба, якая, паводле народных уяўленняў, дапамагала прадвызначыць будучыню, вырашыць нейкія спрэчныя пытанні, падрыхтавацца да не заўсёды спрыяльных жыццёвых сітуацый. Л. М. Вінаградава, вядомая даследчыца фальклору, трапна заўважыла, што “ў аснове шматлікіх спосабаў варажбы ляжаць універсальныя вераванні ў тое, што пры выкананні пэўных умоў (выбар часу і месца, пэўныя паводзіны варожачага, выкарыстанне пэўных “варажбітных” прадметаў і інш.) чалавек можа пры дапамозе звышнатуральных сіл атрымаць знакі, у якіх зашыфраваны яго будучы лёс, і ён павінен правільна растлумачыць іх. Такімі знакамі могуць быць снабачанні; гукі, якія даносяцца выпадкова, вымаўленыя кім-небудзь словы; адлюстраванне на гладкай паверхні (у люстэрку, вадзе, шкле); абрысы ценяў, слядоў, умяцін; формы, якія прымае растоплены воск, волава, выліты ў ваду бялок, выпечаны хлеб; паводзіны жывёл і насякомых; стан распукнуўшыхся, зялёных ці завянуўшых раслін; цотная або няцотная колькасць аб’ектаў; датыкальныя адчуванні (дакрананне голай ці калматай рукі, гладкай ці шурпатай паверхні); выпаўшы жэрабя (выдзяленне аднаго сімвалічнага прадмета з мноства іншых); колер, памер, вільготнасць або сухасць прадметаў варажбы; знікненне ці захаванне пакінутай на ноч па-за домам рытуальнай ежы; размяшчэнне кінутых прадметаў і інш.” [4, с. 484].

У нашым артыкуле звернемся да сімволікі прадметаў у шлюбнай варажбе, якія нясуць у сабе шмат інфармацыі, надзелены разнастайнай сэнсавай афарбоўкай і вялікай колькасцю значэнняў, што, як вядома, з’яўляецца неад’емнай часткай самой сутнасці сімвала. Па словах Х. Э. Керлота, “мноству сімвалічных аб’ектаў, звязаных агульным рытмам, адпавядае полівалентнасць іх значэнняў, размеркаваных на аснове аналогіі кожнае на сваім узроўні рэальнасці” [3, с. 59].

Прадметы-сімвалы ў межах тэкстаў шлюбнай варажбы, зафіксаваных на тэрыторыі Гомельшчыны, умоўна можна падзяліць на некалькі тэматычных груп: прадметы побыту і блізкія да іх (венік, замок, лыжка, запалкі, люстэрка, лялька, нож, кніга, грошы і інш.), прадметы адзення і ўпрыгожання чалавека (боцікі, галаўны ўбор, вянок, стужка, пярсцёнак і да т. п.), прадукты харчавання, абрадавыя стравы (бліны, зерне, хлеб, соль, цукар, цыбуля і інш.), аб’екты жывёльнага і расліннага свету (авечка / баран, карова, курыца; бяроза, падарожнік), аб’екты прыроды (агонь, вада, зямля).

Звернемся да прадметаў першай тэматычнай групы. Так, варожбы з люстэркам – “сімвалам алюстравання і падваення рэчаіснасці” [3, с. 321] – адны з найбольш папулярных на тэрыторыі Гомельшчыны. Варажылі (пераважна ноччу) *у склепе* (“З зеркалам гадалі ў пограбі...”((в. Малейкі Брагінскага р-на)), *лазні, на гары (паддашку)* (“На зеркала гадалі ў пограбе, на чардаке, можна ў цёмнай хаце...” (в. Пакалюбічы Гомельскага р-на)), месцах, якія асэнсоўваліся як звязаныя з іншасветам. Здольнасць адлюстроўваць прадметы – адна з самых распаўсюджаных функцый люстэрка – абумоўлівае яго значэнне (узнаўленне свету рэальнага і ўяўнага) і ў той жа час разнастайнасць выражаемых ім ідэй. Гледзячы ў люстэрка, дзяўчаты

шукалі ў ім выяву будучага мужа (“У стакан ставілася свечка. І ета ставілі *перад зеркалам* і *глядзелі* ў яго. Калі *хто будзе ісці*, *то*, значыць, яго *судзьба*” (в. Малейкі Брагінскага р-на)). Такім чынам, рэальныя якасці люстэрка ператварыліся ў магічныя ўласцівасці сакральнага прадмета, надзеленага звышнатуральнай магчымасцю – быць мяжой паміж “тым” і “гэтым” светамі. Па словах Х. Э. Керлота, “яно служыла для выклікання духаў пры дапамозе ажыўлення ва ўяўленні вобразаў, якія былі ім ўспрыняты некалі ў мінулым, або з дапамогай знішчэння адлегласці, калі яно адлюстроўвае тое, што было аб’ектам, што знаходзіцца прама перад ім, а зараз перамясцілася далей” [3, с.210].

Варажба з люстэркам не абмяжоўвалася толькі пільным угляданнем у яго. Люстэрка магло быць выбраным прадстаўнікамі жывёльнага свету – пеўнем або курыцай, якія, паводле народных уяўленняў, з’яўляюцца своеасаблівымі вешчунамі і звязаны адначасова са светам жывых і мёртвых. Выбранае птушкай люстэрка абяцала *мужа-прыгажуна* (“Як павернецца к зеркалу пятух, то муж *будзе красівы...*” (в. Міхнаўка Брагінскага р-на)), *мужа-“бабніка”* (“Калі ў зеркала глядзіцца – *бабнік...*” (в. Шарыбаўка Буда-Кашалёўскага р-на)) або *мужа-“задаваку”* (“Куды курыца паверніцца ці падойдзе, судзілі аб будучым мужы. Люстэрка – *задавака...*” (в. Карма Добрушскага р-на); “А яшчэ ў хату прыносілі петуха. Калі ён ...сматрэў у зеркала – *фанабэрысты* будзе муж” (г. п. Лоеў)). Негатыўная, у большасці выпадкаў, сімволіка люстэрка хутчэй за ўсё абумоўлена ўспрыманнем яго ў якасці жаночага атрыбута, які да мужчыны не меў ніякага дачынення. Такім чынам, простыя ідэі, выражаныя з дапамогай сімвала, які нясе ў большай ступені эмацыянальную афарбоўку, набываюць новае значэнне, пашыраюць яго ад прыватнага да агульнага.

Пры дапамозе *веніка* і *смецця* дзяўчаты маглі даведацца аб тым, куды “пойдуць замуж” (“*Венікі* перакідвалі чэраз вароты: у якую сторану ўкажа, *адтуль і* прыйдзе *твой мужык* (в. Сінск Лоеўскага р-на)), які характар у будучага мужа (“І яшчэ, дзяўчаты ехалі на *веніку* ці на *качарге* на перакростак і абрашчалі ўніманія на то, з якога боку чутны сабачы лай і які. Напрымер, калі задзірасты, звонкі – жаніх *малады*, калі глухі, грубы – жыць *будзе са старым,* калі здалёку – будзе жаніх здалёку, зблізку – будзе зблізку жаніх” (г. п. Уваравічы Буда-Кашалёўскага р-на); які лёс напаткае (“На Ражджаство *падмятуць хату*, мусар, смецце сабіраюць у вузялок і нясуць на ростанькі. Цераз галаву кінуць, дзе што пачуеш, *тое і будзе*. У якім баку сабака забрэша, *туды замуж пойдзеш*. Еслі доскі *загрукаюць*, значыцца, *памрэ дзеўка* (в. Неглюбка Веткаўскага р-на)). Безумоўна, што ў аснове вышэйпрыведзеных тэкстаў варажбы ляжаць міфалагічныя ўяўленні аб веніку як прадмеце, што надзелены дэманічнымі і апатрапеічнымі ўласцівасцямі, смецці як “сімвале-маркёры іншасвету” (паводле Т. В. Валодзінай). Акрамя гэтага, некаторыя сімвалы ў вышэйпрыведзеных тэкстах варажбы з’яўляюцца ўяўнымі і заснаваны на фанетычных асацыяцыях (сабачы брэх звонкі – жаніх малады, брэх грубы – стары і да т. п.).

Выбраная дзяўчынай падчас варажбы *лялька* сімвалізавала незаконнанароджанае дзіця (“Разлажвалі кучкі: хлеб, грошы, соль, куклу, спічкі і кальцо. Усё гэта пакрыць бумажкамі. Потым па адной вызываюць каждую дзяўчыну, і хто за што возьмецца... *Кукла – родзіць* дзіцёнка *ў дзеўках...*” (в. Карма Добрушскага р-на)), выбраны *нож* – бандыта або задзіраку (“Калі знойдзе *нож – бандыт...*” (в. Ударнае Лельчыцкага р-на); “Калі возьмецца за *нож – біцца будзе*” (в. Гацкое Чачэрскага р-на)), *спічкі* – курашчага (“Спічкі – курашчы...” (в. Карма Добрушскага р-на)), *грошы* – багатага (“У 12 часоў бралі з насеста курыцу, ставілі на стол. …Калі манеты *клюе – багаты будзе...*” (в. Шарыбаўка Буда-Кашалёўскага р-на)). Пры дапамозе сімвалаў, безумоўна, вырашаюцца тлумачальныя і творчыя задачы. У гэтай сувязі Х. Э. Керлот пісаў пра “сістэму надзвычай складаных адносін”, сцвярджаючы, што “...адным з дамініруючых фактараў яе заўсёды з’яўляецца палярнасць, што аб’ядноўвае фізічны і метафізічны свет” [3, с. 14].

Звернемся да прадметаў адзення і ўпрыгожання чалавека, якія выкарыстоўваліся ў шлюбнай варажбе. Вялікай папулярнасцю крысталіся боцікі, якія маглі прадказаць *хуткасць замужжа* (“Дзеўкі гадалі на ботах**.** Хто первая дойдзе да парога, тая первая і замуж выйдзе” (п. Зялёны Буда-Кашалёўскага р-на)) і *яго напрамак* (“…цераз вароты перакідвалі ўжо той сапог. Ды куды носам стане – туды дзеўка замуж пойдзе” (в. Зарэчча Брагінскага р-на). У дадзеных прыкладах абутак, прадмет цесна звязаны з дарогай, трэба разглядаць як своеасаб-

лівы сімвал жыццёвага шляху чалавека. У сувязі з гэтым можна сцвярджаць, што кіданне ботаў дзяўчынамі асэнсоўвался як перамяшчэнне за межы “сваёй” прасторы, лічы, за межы хаты бацькоў, а гэта значыць, як патэнцыяльнае замужжа.

Шапка, якая “сімвалізуе мужчынскі пачатак і звязаныя з ім прадукавальныя захады” [1, с.563], таксама выкарыстоўвалася ў варожбах: “Шапку лажылі пад галаву бацькіну. І тады прысніцца муж твой” (г. п. Лоеў).

Вянок і пярсцёнак, як і некаторыя іншыя прадметы, што маюць форму кола, з’яўляюцца ў варажбе сімвалам шлюбу, аб’яднання дзяўчыны і хлопца. Так, рух вянка па вадзе на Купалле і Тройцу абяцаў пэўныя зрухі ў дзявочым жыцці – *замужжа*”; “На Тройцу вянкі кідалі ў ваду. Каля *вянок* патоне, то будзе нейкае няшчасце, а калі *паплыве* – дзяўчына *хутка выйдзе замуж*” (в. Кажановічы Жыткавіцкага р-на)), указваў *на час,* калі адбудзецца гэта падзея і *накірунак* (“Дзеўкі венкі плелі да кідалі на воду, каб узнаць котора перва замуж пойдзе. Чый *венок плыве ўперад*, то та *дзеўка раньшэ пойдзе*” (в. Азяраны Жыткавіцкага р-на)).

Пры дапамозе пярсцёнка (калечка) дзяўчаты *варажылі аб часе* (“Бралі стакан, налівалі ў яго вады, прывязвалі да вырванага валаска пярсцёнак і трымалі яго над стаканам з вадой: *колькі разоў* стукнецца, у *столькі гадоў* выйдзеш *замуж*” (г. Буда-Кашалёва)) *і характары замужжа* (“Па чарзе бралі жменю зерня і глядзелі, *якое кальцо пападзецца*. Калі *меднае*, то будзе жыць дзеўка *бедна* і пападзе ў бедную сям’ю. Калі *сярэбранае*, то будзе замужам за хлопцам з харошай, але *небагатай сям’і*. Калі *кальцо з камнем* – выйдзе замуж *за багатага хлопца*. *Залатое* – будзе жыць з багатым *у багатай сям’і*” (в. Пагост)).

Сімваламі замужжа выступалі ў варожбах, заснаваных на выцягванні жэрабя, прадукты харчавання, абрадавыя стравы: бліны, зерне, хлеб, соль, цукар, цыбуля і інш., пры дапамозе якіх спрабавалі даведацца аб:

• часе замужжа (“У гэты дзень пяклі блінцы. Дзяўчаты выносілі па аднаму блінцу і клалі іх у радок. Кожная запамінала, дзе яе блінец. Патом выпускалі сабаку. Чый *первым блінец з’есць*, тая *першая і выйдзе* замуж” (в. Жгуна Буда Брагінскага р-на); “Вытасківаюць *каласок* і глядзяць: калі ў ім *парнае чысло зярнят*, то дзеўка *скора замуж* пойдзе, а еслі няпарнае – ешчо ў дзеўках пасядзіць” (в. Стара-Краснае Рэчыцкага р-на); “Яшчэ бралі *лукавіцы* і садзілі ў зямлю. Чыя *лукавіца першая прарасце*, тая *раньша* за ўсіх і *замуж* пойдзе” (в. Ліскі Рэчыцкага р-на);

• імені будучага мужа (“А то яшчэ *блінец* бралі да на вуліцу ішлі. Каго ўстрэніш, дак пыталіся імя. Якое імя скажа, дак ета ўжэ ў мужыка твайго такое імя будзе” (в. Чамярысы Брагінскага р-на));

• характары і сацыяльным статусе будучага мужа (“Каждая дзеўка хоча знаць прызванне, прывычкі, узрост, становішча жаніха. Для гэтага *кармілі кашай пеўня*. Калі *старанна дзёўб* кашу певень – значыць муж *будзе спакойны*, трудалюбівы, калі ж певень пераходзіў ад міскі з зернем, да міскі *з вадой* – значыць муж будзе *п’яніца*” (г. п. Уваравічы Буда-Кашалёўскага р-на)).

І бліны, якія суадносяцца ў фальклорнай традыцыі з іншасветам, і зерне, надзеленае ў народзе прадукавальнай семантыкай, хлеб, што валодае ўстойлівай сімволікай дабрабыту, і цыбуля, соль, цукар, асноўныя якасці якіх у фальклорных тэкстаў становяцца метафарычным і (горкая цыбуля – горкае жыццё, цукар – добрае, салодкае жыццё, соль – няўдалае, салёнае жыццё), сімвалізуюцца не выпадкова: яны не проста маюць адносіны да паўсядзённага жыцця чалавека, яны падтрымліваюць жыццё чалавека. Варта прыгадаць меркаванне С. Талстой: “…той ці іншы бытавы прадмет, тая ці іншая асоба прыцягваюцца да рытуальнага дзеяння на аснове адной са сваіх рэальных уласцівасцей або функцый” [5, с.17]. Разнастайныя значэнні вышэйназваных прадметаў-сімвалаў з’яўляюцца ўнутрана звязанымі і гарманічна змешчанымі ў значэнні саміх прадметаў, якія належаць духоўнаму свету таксама. Па словах Х. Э. Керлота, “у сімвалізме кожная дэталь валодае якім-небудзь сімвалічным значэннем і спосаб, якім арыентаваны сімвал, таксама патрабуе ўвагі” [3, с. 65].

Прыродныя аб’екты сімвалізваваліся ў адпаведнасці са сваімі асноўнымі якасцямі. Так, вада абяцала – ваду ў выглядзе слёз (“У навагоднюю ноч, каб даведацца аб сваім жыцці

ў гэты год, бяруць 4 стаканы: адзін поўны вады, другі з грашыма, трэці пусты і чацвёрты з калечкам. Потым дзяўчыне завязваюць вочы і, перамяшаўшы, даюць выцягнуць: калі з *вадой – будзе* год *плакаць*...” (в. Букча Лельчыцкага р-на**),** а зямля – смерць (“адыход да зямлі”) (“Яшчэ кладуць ленту, зямлю, зерне і тарэлкамі накрываюць. Як паднімеш *тарэлку з зямлёй*, хутка *мужык памрэ*...” (в. Ведрыч Рэчыцкага р-на); “На Каляды дзяўчаты варажылі. Бралі тры тарэлкі і лажылі пад іх хлеб, зямлю, персцень. *Зямля – смерць*...” (в. Віць Хойніцкага р-на)). Папярэднія прыклады варажбы дазваляюць сцвярджаць, што некаторыя вобразы, створаныя па аналогіі, напоўнены разнастайным зместам і часцей за ўсё па некаторых сваіх уласцівасцях і характарыстыках набліжаны да звычайных пачуццёвых уражанняў.

Сімвалізуючы пэўныя якасці жывёл, спрабавалі даведацца *аб магчымасці замужжа* ў надыходзячым годзе (“Хадзілі ноччу ў хлеў і лавілі авечак: калі дзеўка злавіла *барана* – выйдзе *замуж, авечку – не*” (г. п. Уваравічы Буда-Кашалёўскага р-на); “На багатую куццю, перад новым годам, дзяўчаты хадзілі гадаць. Хадзілі і лавілі *петуха*. Закрывалі ў бані. Калі ён *закрычыць,* то, значыць, *выйдзеш* замуж, а калі *не закрычыць*, то *не выйдзеш* у гэтым годзе” (в. Жгуна Буда Брагінскага р-на)), *аб узросце* (“Калі злавіла *старую авечку* – муж будзе *стары* ці *ўдавец*, маладую – *малады*” (г. п. Уваравічы Буда-Кашалёўскага р-на); *знешнім выглядзе* (“Хадзілі ў сарай *карову* мацаць. Хто намацае... за пысу – *красівы*, а за зад – *грыбаты*” (в. Гацкое Чачэрскага р-на)), *характары* (“Петушка зернем кармілі: калі той упарта дзюбаў, то мужык *спакойны*, *прыладзісты* будзе, а калі певень не хоча есці, а піць хоча, ну, дык *з п’яніцай жыць* век цэлы” (в. Рагі Гомельскага р-на)) і *заможнасці будучага мужа* (“На ўсе 3 куцці хадзілі *кароў* мацаць. Закрыеш вочы і за што ўхваціш: за рогі – жаніх будзе *багаты*; за сярэдзіну – *пасярэдзіне*; за хвост– *пастух*” (в. Буда-Люшава Буда-Кашалёўскага р-на); “Заходзілі ў хлеў і бралі карову. Калі ўхвацішся за рогі, то выйдзеш замуж *багата*. Калі за хвост, то *бедна*” (в. Макаўе Гомельскага р-на)). Атаясамліваючы з’явы жывога і нежывога свету, чалавек выкарыстоўваў не толькі апісанні прадметаў, дзеянняў, якасцей, але і вялікае значэнне надаваў аналогіям, магічным вобразам і сімвалам. Як трапна адзначыў даследчык фальклорнай спадчыны А. Гурскі, “з цягам часу дыялектыка свядомасці і мыслення, шматвекавы працоўна-вытворчы вопыт абумовілі ўсё больш глыбокае пранікненне чалавека ў сутнасць рэчаў і з’яў, а разам з тым у свядомасці яго шырылася кола асацыятыўных сувязей паміж імі, пабудаваных на параўнанні асобных прадметаў, іх якасцей, уласцівасцей, функцый і да т. п.” [2, с. 15]. Такім чынам, пры дапамозе пэўных якасцей прадметаў чалавек параўноўваў, абагульняе ў і ідэнтыфікаваў аб’екты навакольнай рэчаіснасці, менавіта таму канкрэтныя ўласцівасці прадметных атрыбутаў сталі асновай механізму стварэння вобразна-сімвалічных асацыяцый, адлюстраваных у варажбе.

Літаратура

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск: Беларусь, 2004. – 592 с.

2. Гурскі, А. І. / А. І. Гурскі. Беларускія загадкі: Даследаванне жанру. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. – 80 с.

3. Керлот, Хуан Эдуардо. Словарь символов / Хуан Эдуардо Керлот. – М.: «REFL-book», 1994. – 608 с.

4. Славянские древности: этнолингвистический словарь: В 5 т. / Под ред. Н. И. Толстого. – М.: Международные отношения, 1995. – Т. 1.

5. Толстая, С. М. Категория признака в символическом языке культуры // С.М. Толстая. Признаковое пространство культуры. – М.: Индрик, 2002. – С. 7-20.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 14.04.10

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 398 (=81):316/722 "19"

Влияние информатизации на социодинамику восточнославянского фольклора

А. В. Морозов

Осуществлена спецификация развития фольклорного творчества у восточных славян под влиянием информатизации и определены первоочередные задачи по сохранению и популяризации традиционного народного творчества с учётом геополитических и культурных аспектов глобализации.
Ключевые слова: глобализация, традиционная культура, фольклор, постфольклор, субкультурная дифференциация, меморат.

The specification of folk art development among east Slavs under the influence of the information technologies has been worked up and the main tasks for preservation of Slavonic traditional people art have been determined with taking into account the geopolitical and cultural aspects of globalization.
Keywords: globalization, traditional culture, folklore, postfolklore, subcultural differentiation, memorat.

Последняя четверть XX столетия определила приоритетную тенденцию глобализации всех сфер жизнедеятельности человечества. Эта тенденция содействует взаимосближению цивилизаций и культур, однако она жестко нивелирует, а временами и провоцирует уничтожение разноэтнических традиционных культур, которые на протяжении многовековой истории существования человечества воплощали своеобразие и неповторимость каждого народа мира. В связи с этим в 2003 году Генеральная конференция ЮНЕСКО приняла Конвенцию об охране нематериального культурного наследия народов мира, реализация положений которой предусматривает задачи разработки методических инструкций и методологических пособий по сбору, эталонной фиксации на современных электронных носителях и активное включение в мировое научное, образовательное и творческое пространство традиционных аутентичных нематериальных ценностей славянских народов.

В современных условиях нет альтернативы стремлению восточнославянских народов к взаимопониманию и сотрудничеству, в том числе на основе всестороннего изучения эволюции и трансформации собственных традиций с учетом общего культурно-исторического опыта. Игнорирование и недооценка социокультурного разнообразия народов, в частности отрицание специфики восточных славян как особого мира со своей цивилизационной идентичностью и самобытной ментальностью, чревато не только обеднением или искажением исторической картины, потерей целого пласта научного знания, но и серьезными катаклизмами в социальной практике (яркий пример – неудачи радикальных социально-экономических реформ первой половины 90-х гг. в Беларуси, России и Украине).

Многовековая история фольклора – это, прежде всего, история выделения человека из мира природы и формирования как существа социального и творческого. Данный сложный и противоречивый процесс находит свое выражение, с одной стороны, в развитии эстетически оформленных идей гуманизма, а с другой – в нормативных образцах личности, которые реализуются людьми и в буднях, и в праздниках. Отдельные гуманистические установки, рожденные жизненным опытом, сохранились в преданиях, сказках, пословицах и поговорках всех без исключения народов. Специфика фольклора разных народов определяется историческими условиями формирования той или иной этнической общности, особенностями ее общественной жизни, взаимосвязями с природой. Различия в традиционной устно-поэтической культуре придают многообразие историческому процессу, красочность, так как фольклор каждого народа обладает свойством неповторимости, уникальности. Социодинамика и творческие потенции традиционного фольклора как основы духовной культуры восточных славян связаны с выполнением разнообразных функций: эстетической, аксиологической, нормативной, мировоззренческой, воспитательной, игровой. Межпоколенная передача

апробированных культурно-историческим опытом и представленных в традиционном фольклоре правил, норм, традиций, эстетических канонов – залог устойчивости и жизнеспособности любого государства.

Фольклорная традиция непрерывна, и проводить резкую границу между народной культурой дописьменного времени и современности – значит лишать фольклор статуса искусства. Действительность не только является объектом художественного изображения, но и во многом обуславливает способы существования и новые модификации фольклора. Анализируя взаимодействие деревенского и городского фольклора, Р. М. Ковалёва справедливо подчёркивает: «Дифференциация фольклора по линии деревня (провинция) – город началась не сегодня и даже не в XIX веке, а гораздо раньше, в незапамятные времена, от которых осталось мало письменных свидетельств. Но, как выяснилось, она сопровождалась взаимообменом художественными открытиями и текстами-эталонами. Наличие двух социально отличных полюсов фольклорного процесса и коэволюция, т. е. процесс совместного развития устного поэтического творчества города и деревни, при неравновесии традиционного и нового в каждом из полюсов явились условием динамически устойчивой целостности фольклора» [1, с. 240]. Городской фольклор русских, украинцев и белорусов в большей или меньшей степени опирается на национальные традиции и в то же время имеет много общих черт, особенно в песенном репертуаре, значительную часть которого составляют фольклоризированные произведения поэтов.

Вместе с тем, современное фольклорное творчество опосредовано сущностными характеристиками этносоциального развития славян в условиях глобализации (универсализация ценностей, урбанизация, информатизация и межкультурное взаимодействие наряду с самоидентификацией и возрождением традиций в рамках национальных государств).

Как нами было показано в докладе на XIV Международном съезде славистов [2], основная закономерность функционирования фольклора восточных славян на современном этапе историко-культурного развития – преобладание в народном творчестве принципиально новых явлений постфольклора городского населения, которые активно взаимодействуют с массовой культурой по содержанию и стилистике, функциональности и ценностным ориентациям. При этом сама массовая культура воспроизводит целый ряд родовых свойств фольклора (его дидактическую и социально-адаптивную направленность, тенденцию к утрате авторского начала, господство стереотипа и т. д.), что весьма облегчает подобную связь. Современные формы постфольклора обладают повышенной способностью к тематической и эстетической интернализации своей продукции (тогда как традиционный фольклор локален и регионален), наконец свою продукцию она воспроизводит «серийно», в виде немыслимых для устного творчества идентичных копий, чему способствует распространение постфольклорных явлений посредством Интернета).

Семантика и аксиологические значения современного песенного и прозаического творчества белорусов, русских и украинцев претерпевают значительные изменения в условиях доминирования информационной культуры и изменения среды функционирования посредством дальнейшей субкультурной дифференциации восточнославянских социумов. Наличие вербальной специфики – арго и сложившегося фольклора – служит наиболее яркими и легко фиксируемыми признаками существования субкультуры, а часто и её единственными внешними проявлениями. Кроме того, наблюдается нарастающий эффект этносоциальной «ареальности» фольклорных явлений с присущей каждому из них специфической семантикой. Ярко проявляется тенденция к большей творческой активности микросоциума: круг носителей фольклорного репертуара и соответствующих аксиологических значений часто оказывается меньше, чем конкретная социальная среда; можно говорить о наличии репертуара/распространённости и соответствующей семантики не только в рамках какой-либо субкультуры, но и одной компании, скрепляемой общими интересами. В создании постфольклорных произведений наиболее активна молодёжь, которая реализует свой творческий потенциал в следующих модификациях: студенческом, туристском, фанатском и солдатском фольклоре, творчестве программистов, блоггеров, антиглобалистов и т. д.

Для постфольклорной формы народного творчества понятие «устности» уже не является основополагающим. Сущностные характеристики посттрадиционного фольклора детерминированы семиотическими (общность ценностных ориентаций, символики, культурного кода, картины мира) и поведенческими свойствами (ритуалы, правила, нормы, модели и стереотипы поведения) городских субкультур Беларуси, России и Украины, которые могут быть классифицированы по принципу консолидации соответствующих общностей: половозрастным; социально-профессиональным и (или) досуговым; этническим и (или) религиозным; территориальным. В современных социокультурных условиях утилитарно-практический характер семантики и аксиологических значений (в широком контексте) традиционных произведений сменяется развлекательностью постфольклорных произведений с чётко выраженной гедонистической, рекреационной и (или) манифестационной направленностью.

Проведённый анализ показал, что для социодинамики постфольклора восточнославянских народов характерно:

– пересечение литературных и собственно фольклорных традиций;

– отражение реалий современной жизни в текстах произведений всех жанров;

– активное использование традиционных песенных жанров в репертуаре современных профессиональных исполнителей;

– резкое увеличение удельного веса городского фольклора в его различных модификациях, связанных с потребностями субкультур;

– изменение жанрового состава – выдвижение на первый план жанровых комплексов либо относительно недавнего происхождения (например, городские песни и анекдоты), либо существенно модифицированные – современные мемораты и предания (в том числе неомифологические);

– «серийное» воспроизведение постфольклорных произведений с помощью современных электронных средств информации, прежде всего в Интернете.

Нарастающий процесс формирования глобального информационного общества приводит к тому, что стираются элементы культурной дифференциации. Происходит становление единого (в смысле общего) пространства, т. е. действуют тенденции, ведущие к единообразию мировой экономики и культуры. Формируются не только глобальные экономические сети, но и происходит соответствующая социокультурная адаптация, приводящая к расширению общемировой культуры. Однако эти тенденции не отменяют социокультурного разнообразия, а также самобытности «малых» и «больших» культур. Наряду с универсализацией одних аспектов или сетей взаимодействия, глобализация дает простор разнообразию других объектов или субъектов. Более того, плюрализм, присущий постиндустриальному, информационному обществу, означает не только сохранение прежнего разнообразия, но и усиливающийся спрос на такое разнообразие: наблюдается процесс «этнического возрождения» отдельных народов и цивилизационных полюсов. Важнейшее значение в условиях глобализации всех сфер жизнедеятельности различных социумов приобретает проблема выявления потенций и перспектив позитивного диалога культур и установления механизмов налаживания устойчивого взаимоотношения между отдельными народами и цивилизационными полюсами.

Идентифицированные социокультурные условия функционирования позволяют уточнить важнейшие предпосылки творческого межкультурного взаимодействия восточных славян в сфере фольклора. Наряду с наличием этнической и (или) межгосударственной близости (территориальной, исторической, языковой, религиозной, ментальной) к ним относятся следующие характеристики современной социодинамики славянской культуры:

– активизация межкультурных связей на различных уровнях: межнациональном, региональном, субкультурном, личностном (в том числе посредством Интернета);

– внутренняя потребность во взаимодействии в духовной сфере, определяемая реалиями социокультурной жизни конкретного социума;

– по преимуществу толерантное отношение представителей восточнославянских этносов к культуре и традициям друг друга.

Фольклористам нужно эффективнее использовать достижения информатизации, “компьютерной” революции. В условиях стандартизации и нивелировки ценностей первостепенное значение имеет реализации задачи формирования единого славянского культурно-

информационного поля по фольклорному творчеству и его регионального, национального и транснационального опосредования с помощью современных электронных средств информации. В этой связи основополагающее значение имеет консолидация усилий фольклористов по выработке современных технологий сбора, сохранения, обработки и разнообразного использования фольклорных архивов и коллекций наших стран. В качестве первоочередных представляется решение следующих задач:

I. Перезапись зафиксированных фольклорных ценностей на современные носители электронной информации (необходимо переходить от устаревших, аналоговых систем к современным, цифровым);

II. Создание в каждой стране эталонной базы данных по фольклору для дальнейшего включения в Национальные списки нематериального культурного наследия;

III. Определение ареалов бытования зафиксированных явлений нематериальной культуры славянских народов (картографирование);

IV. Создание мультимедийных компакт-дисков компаративного характера по отдельным видам нематериального наследия;

V. Разработка основных положений, принципов сохранения, систематизации, изучения и паспортизации нематериального наследия белорусов;

VI. Пропаганда политики ЮНЕСКО по сохранению нематериального наследия и распространению международных материалов по данной проблематике;

VII. Сотрудничество с соответствующими организациями и учреждениями по изучению и сохранению нематериального культурного наследия славянских народов.

Проблема сохранения и связанная с ней проблема актуализации восточнославянского фольклора согласуется с гуманистической миссией образования и просвещения, которая заключается во внесении в общественную жизнь духовных ценностей, норм и идеалов в качестве смыслообразующего начала человеческого бытия, в налаживании диалога культур, открытии перспектив социокультурного развития на базе сочетания национальных и общецивилизационных ориентиров и интересов. Социальная политика, которую П. А. Сорокин называл “социальной медициной” и даже “учением о счастье” [3, с. 30], должна быть более прогнозируемой и избавленной на длительную перспективу от шараханий от одних идеалов и ценностей к другим. Происшедшая на протяжении последних десятилетий ментальная диффузия должна постепенно смениться перекомпановкой духовно-смысловых констант ментальности и ценностных ориентаций, актуализацией тех из них, которые будут способствовать созиданию во благо восточнославянских народов и улучшению морального климата. Только при эффективном применении опыта многовековой культуросозидающей деятельности белорусов, русских и украинцев неотъемлемые сферы духовной культуры восточных славян – политическая и правовая культура – смогут выработать новые ценности и традиции, которые станут альтернативой современному однополярному миру.

Литература

1. Ковалёва, Р. М. Горизонты развития белорусской фольклористики: диалектика научной интеграции и предметной дифференциации // Фалькларыстычныя даследаванні: Кант-экст. Тыпалогія. Сувязі: зб. арт. Вып. 6. / пад. навук. рэд. В. В.Прыемка, Т. А.Марозавай. Мінск, 2009.

2. Марозаў, А. У. Фальклорная творчасць і сучасныя культурныя працэсы ў славянскіх краінах // Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка: XIV Міжнар. з’езд славістаў (Охрыд, 2008). – Мінск, 2008. – С. 307-320.

3. Сорокин, П. А. Человек. Цивилизация. Общество. – М., 1992.

Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі
і фальклору імя К. Крапівы
НАН Беларусі

Поступило 21.01.10

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 398.3:551.5(=161.3)(476.4)

Жывая і мёртвая вада ў беларускіх замовах і чарадзейных казках

Я. А. Ненадавец

У артыкуле аналізуецца матыў “жывой” і “мёртвай” вады ў беларускім фальклоры, згадваюцца шматлікія вуснапаэтычныя варыянты. Падкрэсліваецца, што гэтая тэрміналогія сустракаецца толькі ў беларускіх замовах і чарадзейных казках.
Ключавыя словы: архетып, вада, замова, магічныя словы, чарадзейная казка.

The article analyzes the motif of “living” and “dead” water in the Belarusian folklore, it states poets’ numerous examples. It is emphasized that terminology can be found only in Belarusian spells and fairy tales.
Keywords: archetype, water, spell, magic words, fairy tale.

Так павялося, што з даўніх часоў людзі былі перакананы ў адным: вада можа быць жывой, гаючай. Не выключана, што аналогія магла ўзнікнуць тады, калі ў іхнім усведамленні адбываўся падзел усёй прыроды, яе стыхій і з'яў на добрых і злых. Гэта было своеасаблівай заканамернасцю, бо тады нельга было ім зразумець, чаму ў адных выпадках вада дапамагала («ажыўляла», «жывіла»), а ў другіх наадварот – нейтралізавала, калі ўвогуле не забівала, «мярцвіла» і таму ўспрымалася за мёртвую. Адбываўся падзел і самой воднай прасторы на «жывую» і «мёртвую». Усё склалася па аналогіі, і калі вада бегла, цякла (рухалася, а значыцца, перамяшчалася), то яна надавала жыццёвыя сілы, аднаўляла здароўе хвораму ці канаючаму – жыццё. Стаячая ж вада, здавён ведалі першапродкі, не толькі не дапамагала («не ўлівала сілы»), але і ўвогуле небяспечная была для ўжывання («можа загубіць чалавека», «звесці са свету»), таму яна і «мёртвая». Калі ў свядомасці людзей гэта ўмацавалася, то тэрмін «жывая вада» сталі выкарыстоўваць у вуснапаэтычных творах, дзе ён ужываўся ў значэнні ‘некага ажывіць’, а тэрмінам «мёртвая вада» – там, дзе трэба было атруціць, звесці са свету, прымусіць пакутаваць, хварэць і г. д.

Часта архетып вада ў такіх варыянтах ужываўся ў замовах. Да яе звяртаюцца амаль што ва ўсіх групах замоў. Толькі ў глабальным плане водная прастора выглядае наступным чынам: *«На сінім-сінім моры,на жоўтым пясочку...»*, *«На моры вялікімі, на бяздонным акіяні...»*, *«Цераз сіняе мора-акіян ляжала кладка дубовая, з дашчок цясовых...»*, *«... і кідаецца шэра вутка ў мора-акіян пад камень Латар».* Зразумела адно, што перад намі паўстае не канкрэтна-ўказаная водная прастора, да якой можна наблізіцца, а глабальна-міфічнае ўяўленне, да якога чалавек так і не здолее падысці бліжэй, бо калі толькі ён зробіць крок да яе, то яна адразу ж, на столькі і аддаліцца, бо гэта будзе ўяўная, а не рэальная водная прастора. Яна, хутчэй за ўсё, уведзена ў замовы для таго, каб у большасці выпадкаў падкрэсліць «святасць», «магічнасць» і ўсемагутнасць згаданага жанру.Часта менавіта на такім міфічным «моры-акіяне» знаходзіцца першапасаджаны (біблейскі) дуб, голле якога можа накрыць палову зямлі, і тады там паўстае цемра (вось яно тлумачэнне надыходу ночы і замена яе днём). Менавіта там жылі шматлікія хтанічныя, дэманалагічныя персанажы, якія ў абавязковым парадку прысутнічаюць пры выкананні замовы. Гэта там (*«На моры, на акіяні, на святой рацэ Іардані...»*) паселены і хрысціянскія святыя, якія сталі галоўнымі дзеючымі асобамі замоў, што адносяцца ўжо не да язычніцкага перыяду, а да часу ўвядзення хрысціянства. Паводле міфалогіі, адтуль вылятае птушка («чорная», «злая», «лютая», «смяротная»), якая асацыіруецца з бязлітаснай хваробай. Але характэрная асаблівасць – такая хвароба, паводле замоў, вяртаецца не туды, адкуль з'явілася на белы («Божы») свет, а ў нейкае адваротнае месца. Такім з'яўляюцца «ніцыя лозы», «гнілыя балоты», «пустыя пяскі», «глухія лясы» – гэта, значыцца, прастора (зямля), дзе ніхто ніколі не жыў і не жыве, і таму такая

хвароба ўвогуле болей там нікому не стане пагражаць: *«Таму ссылаю вас, бясы, нячыстая сіла, на зялёныя мхі, на глыбокія і страшныя балоты, на смярдзючыя калоды, на захворваючыя воды, ідзе ўсё хрысціянскае стрэблен-вынішчана»*.

Старадаўні чалавек хацеў падкрэсліць, што ягоная справа датычыцца нейкіх вузка гаспадарчых аспектаў, і імкнуўся адпаведна ўжываць замовы, дзе гаворка вялася не пра «акіян-мора», а пра лакальна-акрэсленую тэрыторыю і ўжывалася тая водная прастора, якая ўсім была вядома з даўніх часоў, не з'яўлялася міфічна аддаленай, а наадварот, яе выразна ўяўлялі, бо яна і працякала недзе паблізу, тым самым акрэслівала месца дзеяння, якое толькі мела адбыцца ці ўжо на самой справе адбылося, і вымаўленне замовы – гэта вынік (станоўчы ці адмоўны) таго самага дзеяння. *«Дабрыдзень,святая крыніца Іарданная. У той крыніцы ёсць тры чараўніцы: адна мядова, друга вінова, трэцяя малочна. Ні прыйшла вады ўзяць, а прыйшла армянскі сыр узяць»* [1, с. 86]. Тут, здавалася б, нічога незвычайнага няма, акрамя таго, што крыніца носіць біблейскую назву – «Іарданная», і гэта падкрэслівае непарыўную сувязь замовы з хрысціянскай рэлігіяй, як і «трыадзінасць» самой крыніцы: «мядова», «вінова», «малочна». Але ж па аналогіі з цячэннем самой крыніцы цякуць і тыя тры міфічныя крыніцы, бо яны, паводле перакананняў нашых продкаў, з'яўляюцца таксама ўсведамленнем той жа воднай прасторы. Проста для іх «задобрывання» яны становяцца «мядовай», «віновай», «малочнай», і гэта дае ўпэўненасць таму, хто вымаўляе замову, што такім шляхам ён схіліць духаў вады ці саму ваду да сябе і яна дапаможа. Даволі часта «крынічанька» або вада з яе выступаюць у замове на пярэдні план і тады да іх звяртаюцца раней, чым да Бога, боскіх святых, апосталаў і г. д. *«Святая крынічанька, сцюдзёная вадзічанька, святая прачыстая панахвідніца ішла з сіняга мора аблакамі, з цёмнага леса ляскамі праз сырое карэнне, праз цвёрдае каменне, на трыдзевяць ключы замыкала, Госпада Бога прызывала: «Прыхадзі Гасподзень, на помач». Што будзець вам, то будзець і мне. Аташлём балезні, дзе пташкі не лятаюць, дзе звяры не збягаюць, дзе сонца не свеціць, дзе луна не ходзіць, толькі адзін міласцівы Гасподзь Бог усё гэта разбіраець, ды нам на дапамогу выступаець»* [1, с. 359]. Акрамя таго, што тут наперад самога Бога выступае *«крынічанька, сцюдзёная вадзічанька»*, мы можам смела сцвярджаць, што зачын твора – гэта яго язычніцкая аснова, калі наіўны чалавек звяртаўся ў першую чаргу да стыхіі, да таго, што яму было незразумелым. Але, як бачым, гэтая язычніцкая аснова арганічна спалучылася з біблейскімі святымі і самім Госпадам Богам. Нядзіўна, што такое своеасаблівае зліццё ў замовах розных рэлігійных плыняў забаранялася хрысціянскай царквой, Тым не меней, яна не здолела цалкам перамагчы язычніцтва ў пакланенні вадзе, яе шанаванні і абагаўленні, а толькі напластоўвалася на яго, і ў такім выглядзе яно дайшло да сённяшняга часу.

Адзначым наступную акалічнасць: у замовах, накіраваных супраць урокаў («Ад урокаў», «Ад нагавору», «Ад прымаўкі», «Ад стацця» і інш.), найбольш звяртаецца ўвага на цудадзейную здольнасць самой вады. Потым ужо магчымасці гэтыя нібы замацоўваюцца словамі ці дзеяннямі святых («Госпада», «Бога», «Госпада Бога», «Багародзіцы»).

«Вадзіца-царыца, бегла ты з мора сы вастока, будзе табе слава да века, змывала ты сырое карэнне, белае каменне, так ізмый етай карове (трэба сказаць етай каровы масць) крокі, прыгаворы прыдуманыя, прыгаданыя, прысмешныя, натужныя, наносныя, вадзяныя, ветраныя… Цякла рэчка цераз мора, прабівала каменныя берагі, прапускала ключы вадзяныя. Так прапусці етай каровы ключы малачаныя, пабочныя, падбрушныя, бакавыя, задавыя. Як у крыніцах і ў азёрах і ў калодзезях вадзіца прыбывала, так прыбудзь у етай каровы малачко з жылачак, з вымечка ў цыцачкі, з цыцачак у даёначку рабе Божай (імя сваё). Яна цябе кормя, яна цябе поя, яна табе дабра жалае. Прылюбі, Госпадзі, мой дух. Амінь» [1, с. 294-295].

Як відаць нават з гэтага прыкладу, сама хвароба, урок, «зглаз» падаюцца як нешта жывое, існуючае ў жывым свеце (дакладней, у міфічным, бо хоць і малюецца яно ў вуснапаэтычных творах з нейкімі рэальнымі рысамі, па падабенству, усё роўна ствараецца нешта фантастычнае). Гэтая непажаданая істота, зразумела ж, насуперак волі чалавека, прыходзіць да яго самога, чапляецца да ягонай жывёлы, наводзіць страх ці паморак на гаспадарку. Яе трэба

выгнаць любой цаной і пажадана, каб найхутчэй і назаўсёды, і не важна ўжо, якім метадам будзе карыстацца варажбіт, шэпчучы замовы па просьбе канкрэтнага гаспадара: пагражаць фізічнай расправай, дамаўляцца да нейкіх задавальняючых умоў або вымывання (змывання, злізвання, знішчэння) вадою, якая таксама не ведае сабе ніякіх перашкод на сваім шляху. Здзіўляе дасканалае веданне не толькі мясцовай геаграфіі, але і будовы арганізма (не надта важна – чалавека ці жывёлы). Не выключана, што нежаданне гэтае нішто іншае, як своеасаблівы практычны набытак раннеязычніцкіх «хірургаў» («костаправаў», «кровастрымальнікаў», «кровапушчалынікаў»). Мы звярталі ўвагу на тое, як традыцыйна разгортваецца дзеянне ў замовах, – зварот да язычніцкай стыхіі, а потым «ачышчальная вада» саступае месца хрысціянскім святым ці нават самому «Госпаду Богу», або, наадварот, святыя пачынаюць дзеянне («завязваюць»), а потым ужо ідзе імітацыя «расправы» над хваробаю («урокамі»). Усё павінна было адбывацца нібы само па сабе («чаргою»), але яна фіксавалася, пацвярджалася пэўнымі замацоўваючымі «этапамі», даходлівымі любому чалавеку сродкамі, якія павінны былі знаходзіцца пад рукою.

Звернем увагу на беларускія чарадзейныя казкі, у першую чаргу на тыя вуснапаэтычныя творы, дзе гаворка вядзецца пра ўсемагчымых асілкаў, якія ўступаюць у паядынкі з цмокамі, змеямі, гадамі і адпаведна раняцца самі ці раняць, а то і забіваюць іхніх паплечнікаў (сяброў, братоў), і яны вымушаны ратаваць ад смерці ці нават вяртаць да жыцця пры дапамозе «жывой» вады. Назва яе можа быць рознай, у большасці выпадкаў яна – «гаворачая», бо нясе ў сабе само паняцце жыцця («жывучая», «ажыўляючая». «здароўчая», «здараўляючая» і г. д.). Абавязкова агаворымся, што ў такіх выпадках вада нясе людзям не здароўе, вынослівасць, моц, якія патрэбны ім у звычайным (будзённым) жыцці для выканання простай, але надзвычай цяжкай працы, а сілу, магутнасць, фантастычнасць. Зрэдку на гэта ў казках так прама і ўказвалася: *«Так яны (людзі старыя – Я. Н.):*

– Вазьмі вядры і прынясі поўна.

Ён прынёс і кажа:

– Піце.

– Папрабуй сам напіцца.

Ён як узяў, так адразу цэла вядро выпіў. [2, с. 98].

Тут галоўны герой казкі для ўзмацнення сілы, набыцця незвычайнай магутнасці, п'е ваду (многа вады), бо іменна многа сілы павінна прыбавіцца («льецца вада» – «уліваецца сіла»). Але ж ёсць сведчанні, дзе персанаж п'е не ваду, а саму сілу: *«Выпіў ён (Іван-царэвіч. – Я.Н.) сілы – і яшчэ тры лавы збіў»* [2, с. 131], або такі казачны асілак знясілена прыпадае да бочкі з сілай: *«Прыйшоў ён к склепу, адмкнуў, увайшоў у гэты склеп, ажно там стаяць бочкі па правай руцэ і па левай. Іванька-царэвіч узяў у той бочцы, што стаяла па правай руцэ, крант адпусціў і выпіў сілы. І здзелаўся крэпкім»* [2, с. 126].

Нярэдка перад тым, як адправіцца ў далёкую дарогу, галоўны герой даведваецца ад нейкага выпадковага памочніка, сябрука, таварыша, што *«ёсць моцная і слабая вада»*, можа здорава дапамагчы ў цяжкіх выпадках. Трэба толькі своечасова запасціся такой вадкасцю, каб (супернік, праціўнік) не заўважыў ці не ўбачыў, бо ён можа проста сам здабыць яе з цудоўнай крыніцы (калодзежа, мора-возера скрасці тую, якая ўжо назапашана станоўчым героем і знаходзіцца ў нейкім сасудзе*: «І давай жа біцца, кралевіч як сціснуў змея, аж косці затраскацелі, ледзьве змей вымавіў: «Падай вады!» Так жонка дала яму слабое вады, а брату моцнае вады, так кралевіч яшчэ дужэйшы зрабіўся, а змей чыста аслабеў... І давай зноў лупіцца, і кралевіч так прыціснуў змея, што ён мог вымавіць: «Падай вады!» Яна дала змею слабае, а брату моцнае вады. Тады кралевіч яго дарэшты забіў...»* [2, с. 31]. Пасля таго, як станоўчы персанаж забіваў або перамагаў свайго ворага, ён бязлітасна сек цела забітага суперніка на дробныя часткі: галовы адсякаў ад тулава, языкі вырываў, бо чамусьці спрадвеку лічылася, што цмок ці цуда-юда кусае языком, і кідаў усе гэта ў ваду ці за ваду, якая павінна была ўяўляць сабою нейкую мяжу роду-племені, куды ніхто не меў права, без дазволу на тое, уварвацца. У паасобных выпадках галоўны герой не толькі здрабняе, але да ўсяго яшчэ і спальвае цела змея, тым усё гэта (што засталося) кідае ў ваду і менавіта вада зносіць нечыстоту,

ачышчае пэўную тэрыторыю (зямлю): «*Сабралі яны* (браты. – *Я. Н.) усе галовы спалілі на асінавых дравах, а попел на быстру рэчку пусцілі*» [2, с. 54]. Мала таго, што галовы спалілі, але ж спалілі іх не на звычайным вогнішчы, а на асінавых дровах. Асіна ж, як агульнавядома, увасабляе сабою прывід нячыстага (нячыстых духаў, нячысцікаў), пры яе дапамозе ад гэтага ўсяго і пазбаўляюцца, бо ўжываць дрэва якой-небудзь іншай, «чыстай» пароды катэгарычна забаранялася.

Сапернікі казачнага героя ідуць на розныя хітрыкі, стараюцца перамагчы яго любым чынам, калі не *ў* адкрытым, роўным баі, то падманам, хітрасцю давесці персанажа да такой ступені, калі ён не будзе здольным супрацівіцца: *«Кінуў ёй (бабе – Я. Н.) бухон хлеба ў мяліцу, а сам давай скарэй уцякаць. З'ела змяя хлеб-соль, яе і разабрала. А яны не п'юць такой вады, якую п'юць людзі; дык яна і пабегла ў сваю старану. Там было такое возера, адкуль усе яны бралі ваду. Вось яна піла-піла адтуль ваду, піла-піла, выпіла палавіну возера. Тады ўзнова пагналась за Сучкіным сынам. Гналась, гналась – вот даганяе!»* [2, с. 54]. Тут нават існуе нейкае міфічнае (без назвы і ўказання канкрэтнага месца) «нячыстае возера», адкуль усе гэтыя пачвары, ворагі станоўчых персанажаў бяруць ваду для сваіх патрэб. Нельга забываць і пра тое, што некаторыя з такіх крыніц (вадаёмаў) могуць служыць пасткай для сумленных людзей, трапіўшы ў якую яны ці гінуць, ці назаўсёды развітваюцца з воляй і становяцца палоннымі: *«Тады як цапнуў паліцай - булавой па гэтаму абрубцу, ён яго зламіў. Тады коўшчычак палажыў і другі раз як цапнуў, – нічога здзеся не стала: ні крыніцы, ні абруба, ні коўшчыка, толькі рэзаная кроў пацякла руччом. А ім не стала ні жару, ні палу, і піць не захацелась. Тады апяць пабяжалі яны»* [2, с. 106].

Ва ўсіх астатніх, зафіксаваных намі выпадках вада з'яўляецца «жывой», «зрастушчай», «жывушчай» і г. д. Цудадзейныя ўласцівасці такой вады не даюць загінуць галоўнаму герою і яго таварышам, болей таго, ведаючы пра тое, што ім моцна дапамагае вада, дзейнічаюць без аглядкі і больш упэўнена, бо іхні вораг такой падтрымкай, у самую цяжкую і катастрафічную хвіліну, не валодае. *«І зрубіў яму Таратурак усе яго дванаццаць галоў, і прабіў доўгамерным кап'ём яго рацівае сэрца, і праліў гарачую кроў. Січас гэта дзела вазнала Самііхліда Міхайлаўна, што ён, прыехаўшы да Слана Іванавіча ташчыць гэты дзве бутылі вады, і яму падаець і сама з ім на добрага каня садзіцца, і ўязджаюць з гэтых мястоў. Прывёз Таратурак Слану Іванавічу жывой і мёртвай вады і жану ягоную, і прылажылі яны яго галаву к тулаву, і палілі жывой вадой і лілі із бутылі ў вуста, і ў чэцверць гадзіны Бог збавіў, і ён жывой стаў»* [2, с. 112].

У адной з чарадзейных казак станоўчы герой вымушаны карыстацца для ажыўлення не жывой вадой, а жывою кроўю: *«Воўк узяў самае старшае кручаня, схапіў і сказаў крукам:*

– Прынясі мне жывушчай крыві, так аддам вам кручаня.

Яны прыняслі яму жывушчай крыві. Ён узяў тую кроў, памазаў таго каня і конь устаў. Потым падышоў да таго чалавека, што забіты, памазаў яго кроўю, і стаў жывы». [2, с. 485].

Такім чынам, гаворачы аб выкарыстанні ў вуснапаэтычных творах «жывой» і «мёртвай», а таксама «замоўленай» вады, адзначым, што ўжывалася такая тэрміналогія толькі ў двух жанрах – замовах і чарадзейных казках, у іншых яна не сустракаецца.

Літаратура

1 Замовы. – Мінск, 1992.
2 Чарадзейныя казкі. У 2 ч. Ч. 1-2. – Мінск. – 1973-1978.

Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі
і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі

Поступило 24.12.09

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 39:2–264 (=161.3)

Міфалогія беларусаў: уяўленні пра сусвет

В. С. Новак

У артыкуле на багатым аўтэнтычным матэрыяле асэнсоўваюцца міфалагічныя ўяўленні беларусаў, звязаныя з зоркамі, стыхіямі свету, засцярогамі ад маланкі і навальніцы, і дэманструецца паэтычнасць міфалагічнага светапогляду беларускага народа.
Ключавыя словы: традыцыя, міфалагічныя ўяўленні, мясцовая спецыфіка, сімволіка, зоркі, вада, агонь, зямля

On the basis of rich authentic material the article interprets the Belarusians' mythological concepts associated with the stars, the elements of nature, and the protection from lightning and thunderstorm. The poetic mythological world outlook of the Belarusian people is shown in the article.
Keywords: tradition, mythological concepts, local specificity, symbols, stars, water, fire, earth.

Глыбокае асэнсаванне асноў духоўнай культуры славян немагчыма без вывучэння фактычнага матэрыялу міфалагічных аповедаў, якія, як сведчаць палявыя экспедыцыйныя даследаванні, адрозніваюцца багаццем мясцовых асаблівасцей, паэтычнасцю ўспрымання з'яў навакольнага свету. Прадстаўлены ніжэй сінхронны зрэз сучаснай міфалагічнай традыцыі беларусаў, звязанай з сусветам, – яскравае пацвярджэнне ўстойлівага характару бытавання рэгіянальна-лакальных міфалагічных уяўленняў пра зоркі і стыхіі свету.

Зоркі, паводле міфалагічных уяўленняў жыхароў Гомельшчыны, "падобныя на рассыпанае зерне або на мноства жукоў-светлякоў, што ўзняліся высока-высока" (запісана ў г. Гомель ад Медзінай Тамары Фёдараўны, 1941 г. н.). Асэнсаванне зорак як душ памерлых людзей – надзвычай устойлівая традыцыя міфалагічнай свядомасці беларусаў. У шматлікіх міфалагічных аповедах гаворыцца аб тым, што зоркі – гэта своеасаблівыя "знакі чалавека на зямлі"(запісана ў г. Гомель ад Шкурко Адама Ігнатавіча, 1928 г. н.). "Менавіта гэтае атаясамленне зорак і душ ляжыць у падваліне ўяўленняў пра сувязь зорак і лёсаў людзей, заснаваных на іх гаданнях і прадказаннях" [1, с. 195]. Паводле народных уяўленняў, "неба цвёрдае, а да яго прылеплены звёзды. Звёзды на небе – то душы людзей" (запісана ў в. Саўгасная Буда-Кашалёўскага раёна ад Габрусевай Кацярыны Лагвенаўны, 1932 г. н.). Зыходзячы са сведчанняў Евы Васільеўны Пясоцкай, 1937 г. н., жыхаркі в. Вулька-2 Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці, зоркі – гэта не столькі "людзі, што родзіліса", колькі гэта "вочкі Бога, які глядзіць за намі, а як хто саграшыў, то зорачка падае". "Божымі свечачкамі" называюць зоркі жыхары в. Сякерычы Петрыкаўскага раёна: "Зоркі – гэта божыя свечачкі. Гавораць, як Бог сатварыў Адама, так і першая зорка паявілася. Зорка – гэта жызнь чалавека" (запісана ад Кісель Ніны Адамаўны, 1932 г. н.). Такое ж паэтычнае асэнсаванне атрымалі зоркі ў міфалагічнай традыцыі в. Лядцы Гомельскага раёна: "Зоркі – гэта домікі ангелаў. І калі ўвечары свецяць тыя звёздачкі, то кажуць, што гэта ангелы адкрылі свае акошачкі" (запісана ад Кашлаковай Матроны Зосімаўны, 1927 г. н.).

З'яўленне зоркі на небе звязвалі з нараджэннем дзіцяці, а згасанне – са смерцю чалавека: "Калі загаралася зорка на небе, то казалі, што нарадзілася дзіця, а калі патухала – што памірае чалавек" (запісана ў в. Мікітаўка Брагінскага раёна ад Данчанка Васіліны Ціханаўны, 1944 г. н.). Зыходзячы з народных вераванняў, калі "коціцца зорачка, то гэта нехрышчонае дзіця, якому Бог нідзе не дае месца на тым свеце. Калі бачыш такую зорку, трэба перахрысціцца і сказаць: "Ідзі ў рай, каб Бог яго прыняў да сябе" (запісана ў в. Мікітаўка Брагінскага раёна ад Данчанка Васіліны Ціханаўны, 1944 г. н.). Жыхары в. Сінічына Буда-Кашалёўскага раёна перакананы, што колькасць людзей на зямлі вымяраецца колькасцю зорак: "Колькі зорак на небе, столькі людзей на зямлі" (запісана ад Раманоўскай Лідзіі Іванаўны, 1933 г. н.).

З хуткасцю падзення зоркі звязвалі час смерці чалавека: “Падае зорка, значыць, памёр чалавек. Падае хутка – чалавек памёр быстра, не мучаўся на зямлі” (запісана ў в. Юшкі Калінкавіцкага раёна ад Рагальскай Марыі Міхайлаўны, 1930 г. н.). Па мігценні зорак вызначалі, якім быў чалавек пры жыцці, як сябе паводзіў у розных сітуацыях і ў адносінах з іншымі людзьмі: “Калі чалавек многа грашыць, то яго зорка чуць блісціць, а калі мала, то яна свеціць ясна-ясна” (запісана ў в. Перасвятое Рэчыцкага раёна ад Грабок Анастасіі Паўлаўны, 1936 г. н.). Па яркасці мігцення зорак меркавалі аб працягласці жыцця чалавека: “Чыя зорка большая, ярчэйшая, значыцца, той болей і пражыве” (запісана ў в. Асінаўка Светлагорскага раёна ад Рудніцкай Наталлі Сяргееўны, 1931 г. н.). З чым звязана забарона “паказваць пальцам на зоркі”, невядома: “На зоркі не можна паказваць пальцам, а еслі паказал, то яго трэба ўкусіць тры разы” (запісана ў в. Вулька-2 Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Якубовіч Аляксандры Іванаўны, 1936 г. н.).

На пытанне, як узніклі зоркі, жыхары г. Бабруйск Магілёўскай вобласці адказалі, што іх стварыў Бог (запісана ад Маскалёвай Людмілы Мікалаеўны, 1939 г. н.), а ў жыхароў в. Балотня Рагачоўскага раёна склалася меркаванне, што “зоркі на небе – гэта Бог агні зажог” (запісана ад Бужан Марыі Аляксандраўны, 1938 г. н.). Па ступені яркасці зоркі вызначалі якасці характару чалавека: “Калі зорка падала, але гарэла ярка, то чалавек быў чысты, добры, а калі гарэла цьмяна, то ён шмат грашыў” (запісана ў г. Гомель ад Драбышэўскай Надзеі Іванаўны, 1928 г. н.).

Шматлікія міфалагічныя ўяўленні звязаны з засцярогай ад маланкі і навальніцы. Паводле народных вераванняў, “маланка з громам – гэта калі Ілля-прарок па небу катаецца, кола грукоча, дык гром грыміць. Маланка – гэта ён злуецца” (запісана ў в. Краснаўка Светлагорскага раёна ад Паўлаўцовай Людмілы Уладзіміраўны, 1950 г. н.).

Варта падкрэсліць, што ў кожнай мясцовасці можна сустрэць па-мясцоваму адметныя праявы гэтых народных вераванняў, у якіх арганічна паяднаны як язычніцкія, так і хрысціянскія элементы. Што датычыць апошніх, то найбольш папулярным сродкам у народзе з’яўлялася запальванне свечкі на Крашчэнне і прагаворванне адпаведнай малітвы: “Каб засцерагчыся ад маланкі, трэба запаліць свечку ад Крашчэння і памаліцца Богу” (запісана ў г. Васілевічы Рэчыцкага раёна ад Сохар Алены Марцінаўны, 1944 г. н.). Каб маланка не спаліла хату, як пацвердзілі жыхары в. Сінск Лоеўскага раёна, трэба было “асвяціць у цэркві свечкі і запаліць іх у навальніцу” (запісана ад Прымак Фёклы Кузьмінічны, 1916 г .н.). Здаўна ў народзе лічылі, што калі будзеш працаваць на Ілью (2 жніўня), то можа здарыцца бяда: “Каб чалавека не ўбіла маланкай, на Іллю (2 аўгуста) не трэба працаваць, бо ліха будзе” (запісана ў в. Краснаўка Светлагорскага раёна ад Паўлаўцовай Людмілы Уладзіміраўны, 1950 г. н.). Устойлівым з’яўляецца меркаванне аб тым, што чалавеку пры жыцці грашыць нельга, інакш Бог можа раззлавацца і наслаць гром і маланку: “Бог зліўся, калі людзі многа грашылі” (запісана ў в. Асінаўка Светлагорскага раёна ад Цвірчанка Надзеі Станіславаўны, 1929 г. н.); “Гром злуецца на людзей, каб яны пакаяліся і болей не грашылі” (запісана ў в. Скепня Жлобінскага раёна ад Мельнікавай Алены Рыгораўны, 1923 г. н.).

У некаторых мясцовасцях Гомельшчыны з мэтай засцярогі ад маланкі выконвалі звычай абходу хаты з іконай “Неапалімая купіна”. У в. Уборак Лоеўскага раёна верылі, што “ў час маланкі нужна аббегці вакол хаты з этай іконай” (запісана ад Бярнацкай Валянціны Мікалаеўны, 1953 г.н.). Да ліку прасцейшых спосабаў засцярогі ад маланкі ў в. Івольск Буда-Кашалёўскага раёна адносяцца закрыванне юшкі ў печцы і забарона сядзець каля акна: “Каб засцярэгчыся ад грому і маланкі, трэба было закрыць юшку ў пячы і адкрыць шторы. Ля вакна нельга было сядзець”(запісана ад Малчанавай Ніны Сцяпанаўны, 1941 г.н.). Зыходзячы з народных вераванняў жыхароў в. Гарывада Рэчыцкага раёна, каб пазбегнуць боязі маланкі, прадугледжаны такія магічныя дзеянні, як асвячэнне галінкі вярбы на Вербніцу і яе спальванне: “У царкоўны празнік “Вербнае” трэба пасвяціць вярбу і паставіць гэтую вярбу на вакно ў вуглік у кожнай комнаце. А яшчэ, як бачыш, што надвігаецца навальніца, адкрый комін у печы ці грубе, запалі гэтую святую вярбу трошкі, каб душок толькі з яе прайшоў, і закрый комін, і тады не страшна ніякая маланка” (запісана ад Грабцэвіч Раісы Ульянаўны, 1937 г. н.).

Міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з агнём, таксама маюць багатую мясцовую спецыфіку. Сакральны характар прыроды агню раскрываецца ў аповедах, звязаных з яго паходжан-

нем. Устойлівым з'яўляецца меркаванне аб тым, што святы агонь той, які атрыманы ў выніку трэння аднаго кавалка дрэва аб другі. У народнай свядомасці існуе некалькі версій з'яўлення агню, паводле адной з якіх менавіта Бог паслаў на зямлю агонь: "Агонь Бог даў людзям, калі яны скіталіся. Калі ён выгнаў первага чалавека з раю, то чалавек пачаў дрыжаць ад холаду. І тады чалавек па загаду Бога ўзяў два кускі дрэва і стаў іх церці. І так дабыў агонь" (запісана ў в. Скепня Жлобінскага раёна ад Мельнікавай Алены Рыгораўны, 1923 г. н.). "Па адной з версій, агонь упершыню трапіў на зямлю разам з Перуном. Бог паслаў яго на зямлю, каб пакараць чорта, які спакусіў першых людзей свету – Адама і Еву. Чорт схаваўся за ясенем, а Бог перуном запаліў яго. З таго часу людзі пачалі разводзіць агонь і карыстацца ім" [1, с. 17]. Амбівалентны характар народных уяўленняў, звязаных з агнём, пацвярджаецца канкрэтнымі аповедамі. Паводле сведчанняў Анастасіі Паўлаўны Грабок, 1936 г. н., з в. Перасвятое Рэчыцкага раёна, "агонь чалавека сагравае. Пішчу на ём можна варыць. А можа і спаліць, пажар нарабіць". З засцерагальнай сімволікай агню звязаны дзеянні з ім у Чысты чацвер: "Святы агонь прыносяць з цэрквы ў хату ў Чысты чацвер пасля малебні. Данесці неабходна запаленым ад цэрквы. Дома неабходна, не паліўшы свет, над дзвярыма зрабіць свечкай тры красты, якія ахоўваюць цэлы год ад небяспекі" (запісана ў г. Васілевічы Рэчыцкага раёна ад Сохар Алены Марцінаўны, 1944 г. н.). Агонь як адна з касмічных стыхій свету супрацьстаіць вадзе. "У многіх міфалогіях, у тым ліку і ў беларускай, вада звязваецца з пачаткам стварэння Сусвету, дзе яна сімвалізуе Хаос" [1, с. 57].

Паводле мясцовых народных уяўленняў, "вада – гэта малодшая сястра зямлі, агонь – гэта іхні брат" (запісана ў в. Залессе Чачэрскага раёна ад Карпенкінай Ганны Якаўлеўны, 1941 г. н.). "Сімволіка вады звязана, з аднаго боку, з яе прыроднымі ўласцівасцямі – свежасцю, празрыстасцю, са здольнасцю ачышчаць, з хуткім рухам, з другога боку, з міфалагічнымі ўяўленнямі аб вадзе як аб "чужой" і небяспечнай прасторы. Падобная дваістая ацэнка вады як аздараўляючай і адначасова смертаноснай стыхіі праявілася ў казачных матывах жывой і мёртвай вады" [2, с. 388].

У народных вераваннях адрозніваюць жывую і мёртвую ваду, пры гэтым жывой вадой называць "тую ваду, якая цячэ з крыніц. Людзі памыюцца ёй і здаравейшыя стануць. Яна ісцэляюшчая" (запісана ў в. Перасвятое Рэчыцкага раёна ад Грабок Анастасіі Паўлаўны, 1936 г. н.). Зыходзячы з народных вераванняў, мёртвай з'яўляецца тая вада, якой звычайна "мылі пакойніка, яна мёртвая. Таму што ў ёй засталося тое зло ад гэтага чалавека. Яе нада была выліваць вельмі далёка ад хаты" (запісана ў в. Залессе Чачэрскага рёна ад Карпенкінай Ганны Якаўлеўны, 1941 г. н.). Жыхары в. Калініна Буда-Кашалёўскага раёна верылі, што жывой вадой як святой карысталіся пры вылячэнні цяжкіх хвароб: "Все цяжолыя балезні лечацца святой вадой. Эту ваду бралі з трох цэркваў. Так гаварылі старыя людзі. Ваду набіралі моўчкі" (запісана ад Паплаўнай Лідзіі Мікалаеўны, 1951 г. н.). Мёртвай у народзе лічылі "стаячую ваду".

Вадой як ачышчальным сродкам карысталіся ў знахарскай практыцы: "Каб зняць порчу, знахаркі загаворвалі ваду і давалі піць, а то і вылівалі пад асіну ці бярозу" (запісана ў г. Гомель ад Караленка Вольгі Фёдараўны, 1933 г. н.). Асаблівае магічнае значэнне набывала вада, якую асвячалі на свята Вадохрышча: "Такую ваду давалі піць хвораму і паміраючаму, ёй апрыскваюць новую хату (вуглы асабліва). Святой вадой асвячалі труну, перш чым пакласці нябожчыка. Трэба ў гэтае свята з самай раніцы памыцца, каб увесь год быць здаровым" (запісана ў в. Бальшавік Гомельскага раёна ад Логвінавай Марыі Мікалаеўны, 1924 г. н.). Пасвечанай вадой прынята было апырскваць кожны куток у хаце, каб "не было якіх-небудзь нячысцікаў" (запісана ў в. Вішнёўка Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці ад Нарвілась Наталлі Уладзіміраўны, 1940 г. н.). Сярод устойлівых народных вераванняў, звязаных з вадой, вылучаецца, напрыклад, вера ў цудадзейную сілу пасвечанай вады, якая "можа стаяць шмат часу і не сапсавацца" (запісана ў в. Кісцяні Рагачоўскага раёна ад Касцючэнка Т.Н., 1970 г. н.).

Забароны пляваць і кідаць у ваду нечыстоты абумоўлены сакральнасцю яе прыроды, а таксама тым, што "вада – мяжа паміж "гэтым" і "тым" светам, шлях у іншасвет, месцазнаходжанне душ памерлых і нячыстай сілы, што тлумачыцца сувяззю вады з пачатковым першабытным хаосам" [1, с. 58]. "Вада – у народных уяўленнях адна з першых стыхій сусвету,

крыніца жыцця, сродак магічнага ачышчэння. Разам з тым водная прастора асэнсоўвалася як мяжа паміж тым і гэтым светам, шлях у іншасвет, месца знаходжання нячыстай сілы і душ памерлых” [2, с. 386].

У народных вераваннях беларусаў зямля асэнсоўваецца як адзін з элементаў, які мае дачыненне да стварэння свету. “У касмаганічных паданнях падкрэсліваецца, што першай Бог стварыў менавіта зямлю” [1, с. 200]. Жыхары в. Юшкі Калінкавіцкага р-на перакананы, што зямлю стварыў Бог, аднак “нячыстая сіла іе і на зямлі, і на небі” (запісана ад Бандарэнка Лізаветы Яўменаўны, 1932 г. н.). У шматлікіх міфалагічных аповедах сцвярджаецца, што зямля мае круглую форму, а паняцце “край свету” выступае ў кантэкстах рознай семантычнай скіраванасці: “Ідуць на край свету, каб ніхто не найшоў, каб уцекці ад непрыятнасцей” (запісана ў в. Шырокае Буда-Кашалёўскага р-на ад Цітовай Надзеі Васільеўны, 1939 г. н.); “Край свету ўсюды, а ідуць на край свету з гора” (запісана ў в. Пучын Брагінскага р-на ад Балобан Евы Рыгораўны, 1929 г. н.).

Паводле міфалагічных уяўленняў беларусаў і іншых народаў, зямля мела яскрава выражаны жаночы пачатак, што пацвярджаецца сведчаннямі саміх жыхароў: “Усе ўяўлялі зямлю ў вобразе прыгожай жанчыны, якая была вельмі мудрая” (запісана ў в. Залессе Чачэрскага р-на ад Карпенкінай Ганны Якаўлеўны, 1941 г. н.).

Асэнсаванне зямлі як маці, “карміцелькі”, абумовіла сакральнасць яе прыроды. “Аб гэтым сведчаць шматлікія забароны і рэгламентацыі паводзінаў людзей у дачыненні да зямлі: яе нельга біць калом, розгай, бізуном, калупаць нагой” [1, с. 201].

Устойлівай з’яўляецца забарона кідаць на зямлю якія-небудзь нечыстоты, пляваць: “Таксама на зямлю нельга пляваць – у гэтага чалавека магла ўзнікнуць якая-небудзь цяжкая хвароба” (запісана ў в. Залессе Чачэрскага р-на ад Карпенкінай Ганны Якаўлеўны, 1941 г. н.).

Асэнсаванне фальклорных матэрыялаў, звязаных з міфалагічнымі ўяўленнямі беларусаў пра сусвет, пераконваюць, наколькі багатымі і шматстайнымі з’яўляюцца лакальна-рэгіянальныя праявы агульнаэтнічнай міфалагічнай традыцыі.

Літаратура

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.

2. Славянские древности. Этнолингвистич. словарь: в 5 т. Т. 1 : А-Г-М / под общ. ред. Н.И. Толстого. – М.: Международные отношения, 1995. – 584 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 21.01.10

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 393 (=161.3) (476.2 – 2 Ветка)

Пахавальныя звычаі і абрады Веткаўшчыны

А. М. Палуян

У артыкуле разглядаюцца пахавальныя абрады і звычаі жыхароў Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці, аналізуюцца міфалагічныя ўяўленні, адлюстраваныя ў іх, вызначаецца маральна-этычная функцыя, роля традыцыйных вераванняў у эстэтычным выхаванні асобы.
Ключавыя словы: пахавальная абраднасць, язычніцкія і хрысціянскія элементы пахавання, вербальны код, міфалагізаваная народная свядомасць, анімістычныя вераванні і ўяўленні.

The article deals with the funereal customs and traditions of the Vetka district inhabitants of the Gomel region; it analyzes the mythological ideas reflected in them; it determines moral and ethical function and the role of traditional beliefs in the aesthetic education of a person.
Keywords: funereal customs, pagan and Christian elements of burial, verbal code, mythologized national consciousness, animistic beliefs and views, funeral ritual meal of the Slavs.

Нельга не пагадзіцца са сцверджаннем, што людзі сталі людзьмі толькі тады, калі пачалі хаваць сваіх памерлых сваякоў. Беларусы верылі, што смерць – гэта канчатковы вынік існавання чалавека на зямлі, і пасля яе ён пераходзіць у зусім іншы свет. Акрамя таго, існавала павер'е, што пахаваны ў зямлю нябожчык садзейнічае захаванню яе як родавага месца пражывання і адначасова спрыяе яе нараджальнай сіле [5, с. 74].

"Пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў, як слушна сцвярджае Т. І. Кухаронак, змяшчае ў сабе многія архаічныя рысы, звязаныя з народнымі ўяўленнямі пра замагільнае жыццё, пра душу, пра магчымасць зносін з нябожчыкам. Гэты шматгранны рытуал складаўся з разнастайных па функцыянальнай і семантычнай нагрузцы абрадавых дзеянняў пры строгай іх паслядоўнасці ў часе" [2, с. 354].

Пахавальна-памінальныя цырымоніі, на думку В. Я. Пятрухіна, мелі велізарнае сацыяльна-камунікатыўнае значэнне і павінны былі "ўключыць" выбыўшых з калектыву памёрлых у адзіны сацыяльны арганізм, адначасова продкі як бы "дапамагалі" ажыццяўляць "сувязь" жывых з замагільным светам [4, с. 20].

Актуальнасць нашага даследавання абумоўлена тым, што менавіта ў пахавальным абрадавым комплексе беларусаў Веткаўшчыны надзвычай шырока прадстаўлены народжаныя шматвяковым вопытам і паўсядзённым жыццём народа разнастайныя міфалагічныя ўяўленні, рацыянальныя веды пра чалавека, з'явы і аб'екты рэчаіснасці, а спецыфікацыя аксіялагічнай прыроды пахавальных звычаяў, прыкмет і павер'яў прадыктавана самім жыццём, у якім яны выступаюць своеасаблівым маральна-этычным кодэксам і з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай практычнай народнай мудрасці.

Даследаванне пахавальнага комплексу жыхароў Веткі і Веткаўскага раёна ўлічвае шэраг тэарэтычных і практычных аспектаў. Сярод тэарэтычных аспектаў вылучаюцца наступныя: вызначэнне характару, часу, месца і механізмаў узнікнення шэрагу абрадавых дзеянняў, прыкмет, павер'яў, забарон. Да практычных аспектаў адносяцца ступень захаванасці традыцыйных пахавальных звычаяў і абрадаў Веткаўшчыны ў народнай памяці, працягласць у часе і трансфармацыя ў працэсе бытавання, абумоўленасць іх выкарыстання канкрэтнымі індывідуальнымі перажываннямі чалавека, калектыўным вопытам народнай мудрасці.

Смерць успрымалася як пераход ад адной формы існавання да другой, гэтак жа як і нараджэнне ці вяселле. Таму тут дзейнічалі "адшліфаваныя стагоддзямі абрадавыя коды, якія пэўным чынам будавалі абрадавую рэчаіснасць, прадпісваючы кожнаму члену сям'і, роду, вясковай абшчыне структуру абрадавых паводзін" [2, с. 354].

Нашы продкі верылі, што смерць забірае людзей не па свайму выбару, а тых, каго Бог ёй прызначыць: *Смерць не выбірае чалавека, а Бог выбірае, каму памерці* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.).

Момант смерці ўспрымаўся як знаходжанне ў лімінальнай зоне, якую трэба было хутчэй пакінуць. Абрадавыя дзеянні для аблягчэння выхаду істоты з лімінальнай зоны былі шмат аналагічныя тым, што здзяйсняліся пры нараджэнні: *Каб лягчэй хвораму было памерці, то чыталі над ім Васкрэсную малітву* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.); *Када страшна паміраў, то адкрывалі вокны, штоб дух скарэй адляцеў* (в. Старое Сяло, Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.).

Перад пахаваннем нябожчыкаў абавязкова абмывалі і пераапраналі ва ўсё чыстае, "бо смерць і пахаванне разглядаліся як вяртанне ў матчына ўлонне" [1, с. 201]. Змена статусу індывіда адбывалася пры выкарыстанні рытуальнай функцыі вады: *Як памрэ чалавек, воду на акно ставілі, каб душа магла напіцца і памыцца.* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.).

Вада ў свядомасці беларусаў, у тым ліку і жыхароў Веткаўшчыны, – гэта ачышчальны сродак, без якога немагчымы пераход чалавека ў "той" свет. Абмываць і апранаць нябожчыка запрашалі сталых людзей. Разыходзіліся меркаванні веткаўчан аб тым, хто павінен мыць і адзяваць пакойніка – свае ці чужыя: *Былі і ёсць людзі, якія мыюць пакойніка, адзяваюць, прычытаюць* (в. Стаўбун, Чуяшова Г. Ф., 1930 г. н.); *Мыюць нябожчыка чужыя людзі* (в. Малыя Нямкі, Азаранка Г. І., 1932 г. н.); *Як памрэ чалавек, яго памыюць. Мые той, каго пазавуць. Самі радзіцелі, блізкія родственнікі мыць не далжны. Памыюць, потым у гроб паложаць* (в. Навасёлкі, Царыкава В. Г., 1934 г. н.); *Жонка, сын або дачка не мылі памерлага, не апраналі* (в. Брылёва Гомельскага р-на, Гарбузава М. Я., 1929 г. н., перасяленка з в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на); *Када чалавек памірае, яго нада абязацельна памыць. толькі не свой, а суседзі, ці каго папросюць. Яны (суседзі) яго памыюць, еслі мужчыну, то мужчыны, жэнщчыну – жэнщчыны, прыбяруць* (в. Старое Сяло. Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.); *Мыюць пакойніка абязацельна родственнікі, чужым нельга, адзяваюць тожа родстваннікі* (в. Старое Сяло, Малажэўская Т. А., 1934 г. н.); *Як пакойнік ляжыць у доме, яго мыюць і адзяваюць толькі свае* (в. Залаты Рог, Лук'яненка В. Ц., 1935 г. н.); *Калі паміраў хто, было вялікае гора яго сям'і. Пакойніка прыбіралі свае, родныя. Больш ніхто не должан быў мыць яго, адзяваць* (в. Залаты Рог, Чайкова К. Ц., 1930 г. н.).

Паколькі памерлы змяняў свой статус, пераходзіў з аднаго стану ў другі, то і апраналі яго ў спецыяльна падрыхтаванае адзенне: *У людзей была такая адзежда, якая ляжала на смерць, а на вялікія святы, там на Вялікдзень або на Ушэсце, яе пранашвалі* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.); *Памірае чалавек, яго адзявалі ў смярцёнае адзенне. Яно хранiцца 10 год. Адзявалі па возрасту. Калі памёрла дзевушка да замужжа, яе ў свадзебнае плацца адзявалі* (в. Колбаўка, Кавалёва Е. П., 1930 г. н.).

Памытага і апранутага нябожчыка клалі на лаўку, галавой пад абразы: *Калі паміраў гаспадар, то ставілі труну каля акна, якое выходзіць на вуліцу, а калі гаспадыня, то каля акна, якое выходзіць на двор* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.).

Адразу пасля смерці люстэрка завешвалі белым палатном: *Када паміраў у доме чалавек, абязацельна завешывалі зеркала, патаму што нельзя. А то можа застацца душа ў зеркалі* (в. Старое Сяло, Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.); *Калі ўмірае чалавек, дык трэба завесіць все зеркала, штоб яны душу пакойніка не забралі* (в. Старое Сяло, Малажэўская Т. А., 1934 г. н.). Люстэрка ў народных уяўленнях – сімвал "падваення" рэчаіснасці, мяжа паміж светамі. Люстэрка ў месцы знаходжання прадстаўніка іншага свету (у нашым выпадку нябожчыка, яго душы) адкрывае да таго доступ, робіць яго бачным для людзей. Нябожчыка, які знаходзіўся ў пераходным стане, быў адкрыты да кантакту з іншасветам, неабходна было ізаляваць ад люстэрка. Невыпадковым з'яўляецца і выкарыстанне менавітага белага палатна – гэта найбольш пашыраны ў традыцыйнай беларускай культуры колер, які выступае як апазіцыя чырвонаму, што сімвалізуе жыццёвы пачатак, нараджэнне і статуснае перанараджэнне. У такім разе белы колер "можна трактаваць як сімвал смутку, жалобы, гора, смерці, трансфармацыі, пераходу ў іншы стан, іншы план існавання, сімвал дарогі з аднаго свету ў іншы" [1, с. 46].

На сям'ю разам са смерцю каго-небудзь з яе членаў звальвалася не толькі вялікае гора, псіхічныя і эмацыянальныя перажыванні, але і арганізацыйныя клопаты, матэрыяльныя выдаткі, таму яна з удзячнасцю прымала дапамогу. Напрыклад, з мэтай прадухілення чарговай смерці ў сям'і памерлага забаранялася рабіць дамавіну яго блізкім сваякам, таму труну рабілі і яму капалі толькі чужыя людзі: *Труну тож дзелалі чужыя, сваім няльзя. Потым ім (рабочым) плацілі за*

эта. Просяць чужых усё рабіць, бо калі свае што робяць, то грэх (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г.н.); *Труну з хаты выносяць таксама чужыя людзі, сваім забаранялася* (в. Малыя Нямкі, Азаранка Г. І., 1932 г. н.); *Гроб свае не выносяць і яму не капаюць, а саседзі* (в. Брылёва Гомельскага р-на, Гарбузава М. Я., 1929 г. н., перасяленка з в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на); А *вось гроб ужо выносілі чужыя людзі*. (в. Залаты Рог, Чайкова К. Ц., 1930 г. н.).

Труна разглядалася як жыллё нябожчыка на "тым" свеце, таму яна павінна быць зручнай, каб пакойнік зліўшыся з зямлёй, спрыяў адтуль жывым у іх штодзённых клопатах. Паўсюль на Веткаўшчыне існаваў звычай, які адлюстроўвае веру ў замагільнае жыццё: у дамавіну кладуць рэчы, якія спатрэбяцца для паўнавартаснага жыцця ў іншасвеце, а таксама дробныя грошы для аплаты месца на могілках: *Труну рабілі з любога дзерава. Усё дзеравяннае, а цвікі жалезныя* (жалеза – сімвал трываласці, непарушнасці, надзейнай ахаванасці). *У гроб ложаць грошы, штоб купіл месца. Гроб засцілаюць венікамі, лапкамі, а тады ўжо просцінамі. Набівалі падушку з сенам. З пер'ем не паложаць* (в. Колбаўка, Кавалёва Е. П., 1930 г. н.). *У гроб пакойніку рушнік завязвалі, штоб выціраўся. А кагда гроб апускаюць, дак дзеньгі кідаюць у магілку – там места выкупліюць, штоб пакойнік спакойна ляжаў* (в. Навасёлкі, Царыкава В. Г., 1934 г. н.); *Чалавека харанілі з яго вешчамі, якія ён, кады жыў, любіў* (в. Залаты Рог, Лук'яненка В. Ц., 1935 г. н.).

Згодна з беларускай традыцыяй, памёрлы павінен быў абавязкова адну ноч пераначаваць у роднай хаце. Калі парушыць гэты звычай, то нябожчык будзе ўвесь час прыходзіць да сваёй сям'і і сядзібы. Увесь гэты час пры ім прысутнічалі людзі, як бы сцераглі яго, ціха плакалі, маліліся, размаўлялі. Гэтай ноччу забаранялася галасіць: *Калі памірае, то ўсю ноч бабка чытае "Псалтыр". У гэты дзень людзі ў хаце начуюць, вячэру робяць для ўсіх* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.); *Ложаць у труну. Тада ён (нябожчык) должан яшчэ ноч паляжаць дома, што б радныя з ім прасціліся. На ноч аставаліся толькі самыя блізкія. Звалі з царквы бабу, што чытае малітвы па ім усю ноч* (в. Навасёлкі, Царыкава В. Г., 1934 г. н.).

Смерць была экстрэмальнай сітуацыяй у жыцці сям'і, таму "псіхалагічныя стэрэатыпы абрадавых паводзін адыходзілі на другі план, саступаючы месца непасрэдным жывым эмоцыям, якія найбольш ярка праяўляліся ў межах вербальнага коду (галашэнні)" [2, с. 354].

Галашэнні па нябожчыку – непасрэдны абавязак яго родных і блізкіх, асабліва жонкі і дачок. Яны працягваліся звычайна да таго часу, пакуль памёрлы не быў пахаваны ў зямлю. Галашэннямі суправаджаліся і памінкі па нябожчыку [5, 309-310]: *Бабы, якія галосяць, называюцца галасунцы* (в. Стаўбун, Чуяшова Г. Ф., 1930 г. н.); *Тада ўжэ галасілі. Былі такія бабы, што зналі, што галасіць нада. І ў нас былі* (в. Старое Сяло, Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.); *На могілках галосіць той, каму жалка. Калісьці наймалі, хто ўмее прыгожа галасіць, грошы ім плацілі. Цяпер хто па сваіх прычытае, хто так плача* (в. Данілавічы, Дзмітрачкова Т. К., 1936 г. н., Чуяшкова Л. К., 1933 г. н.); *Вечарам ужо не плакалі, таму што будзе купацца ў слязах казалі. З галашэннямі выносяць гроб нябожчыка. Галосяць і калі вязуць яго да царквы, і на могілкі, калі прашчаюцца з ім перад тым, як апусціць гроб у магілу* (в. Брылёва Гомельскага р-на, Гарбузава М. Я., 1929 г. н., перасяленка з в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на). Але ў час абмывання, апранання і пераносу цела на пасмяротную пасцель у хаце катэгарычна забаранялася галасіць: *Родныя памерлага не плачуць, бо ён будзе ляжаць у вадзе* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.); *Вечарам ужо не плакалі, таму што будзе купацца ў слязах казалі* (в. Брылёва Гомельскага р-на, Гарбузава М. Я., 1929 г.н., перасяленка з в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на). Царква наогул адмоўна ставілася да народных галашэнняў па нябожчыках. Бо, згодна з хрысціянскім вучэннем, чалавек пасля смерці трапляе ў вечнае загробнае жыццё, і трэба гэтаму радавацца, а не плакаць і гараваць.

Нябожчык павінен пераначаваць дома ноч, а потым яго хавалі: *Труну маглі выношваць і мужчыны, і жанчыны* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.). Адыходзіць з хаты разам з нябожчыкам і халодны прывід смерці, таму трэба несці нагамі ўперад: *Назаўтра яго выносілі. Труну неслі тыя, хто яё дзелаў. І нада абязацельна вынасіць нагамі ўперад. Патаму што ён мог сабе каго-небудзь прыглядзець і забраць з сабой на той свет* (в. Старое Сяло, Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.).

А яшчэ неабходна было абсыпаць труну, лаву, людзей, усю хату зернем. Верылі, што ў такім выпадку можна засцерагчыся ад хуткай наступнай смерці ды замовіць памерлага не выносіць з хаты дастатку, міру ды ладу. У пахавальным абрадзе на Веткаўшчыне выкарыстоўваецца найважнейшая збожжавая культура беларусаў, значна міфалагізаваная ў народнай свядомасці, – жыта, якое раўназначна багаццю і раю, а таксама такія сімвалы дабрабыту, шчасця, дастатку, вечнасці і пастаянства, як хлеб і соль: *Калі выносяць пакойніка з хаты, сыплюць жыта* (в. Стаўбун, Чуяшова Г. Ф., 1930 г. н.); *Выносілі нябожчыка нагамі ўперад, абсыпалі зернем. Везлі на кане, а ўперадзе неслі хлеб-соль* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.). Такім чынам, праз выкарыстанне жыта, хлеба і солі веткаўчане спадзяваліся захаваць няспынны рух жыцця, зачын, плоднасць, якую аберагае спагадны свет, дзе жывуць душы продкаў.

Дарогу на могілкі беларусы ў міфалагічным плане ўспрымалі як дарогу на “той свет”, якая злучае прасторы жыцця жывых і памёрлых. “Вербальны код у гэтай частцы пахавальнага рытуалу шчыльна пераплятаўся з акцыянальным абрадавым кодам” [2, с. 359]: нельга абганяць працэсію, бо здарыцца вялікае няшчасце: *Як вязуць на кладбішча, дак нельзя, што б беременная шла (а то не родзіць), што б машына якая не перагарадзіла дарогу.* (в. Навасёлкі, Царыкава В. Г., 1934 г. н.); *Як заходзілі на кладбішча, то на суседнія магілы клалі што-небудзь, каб задобрыць душы продкаў* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.).

На тэрыторыі Беларусі, і Веткаўшчыны ў тым ліку, існаваў звычай своеасаблівага апячатвання магілы: *Потым бацюшку прыводзілі. На кладбішчы бацюшка зямлю пячатае. Як спусцяць гроб у магілу, дак бацюшка бярэ сабе зямлю пячатам – там у цэркві моліцца. Еслі бацюшку не прывазілі, а зямлю ж усё роўна нада пячатаць, дак зямлю самі бралі, у цэркаў неслі* (в. Навасёлкі, Царыкава В. Г., 1934 г. н.). Рабілася гэта дзеля таго, каб нябожчык ужо ніколі не мог выйсці з магілы.

Адметнымі з’яўляліся пахаванні незамужніх дзяўчат: *Калі дзеўкі паміралі, да самага кладбішча неслі гроб на палаценцах; змяняліся хлопцы ды й неслі* (в. Данілавічы, Дзмітрачкова Т. К., 1936 г. н., Чуяшкова Л. К., 1933 г. н.); *Маладую дзяўчыну ложаць у падвянечным плацці* (в. Янова, Таўсцянкова Е. І., 1929 г. н.).

Мелі свае асаблівасці і пахаванні самагубцаў, бо самагубства лічылася ў народзе самым цяжкім грахом. Абрады, якія выкарыстоўваліся пры пахаванні самагубцаў, былі накіраваны на асуджэнне апошніх, на забыццё памяці пра іх:*: Еслі кто сам дзелаў самаўбійства, то яго не адпявалі, не паміналі, а харанілі дажа ні на кладбішчы, а за агароджай* (в. Старое Сяло, Мацюкова Н. Д., 1930 г. н.).

Такім чынам, мы можам зрабіць вывад, што ў цяперашні час ў пахавальных абрадах на тэрыторыі Веткаўшчыны выразна выяўляюцца рысы культу продкаў, генетычна звязаныя з першабытнымі анімістычнымі вераваннямі і ўяўленнямі пра продкаў як ахоўнікаў роду, сям’і.

Літаратура

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мн.: Беларусь, 2004. – 592 с.
2. Беларусы. Т. 5. Сям’я / В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Т. І. Кухаронак і інш. – Мн.: Беларуская навука, 2001. – 375 с.
3. Карский, Е. Ф. Белорусы: научное издание: в 3 т. Т. 3, кн. 1: Очерки словесности белорусского племени. / Е. Ф. Карский. – Минск: БелЭн., 2007 – 584 с.
4. Петрухин, В. Я. Человек и животное в мифе и ритуале: Мир природы в символах мира культуры / В. Я. Петрухин // Мифы, культы, обряды народов зарубежной Азии: / Сб. ст./ – М., 1986. – 254 с.
5. Рыбаков, Б. А. Язычество Древней Руси / АН СССР, Отделение истории, Ин-т археологии. – М.: Наука, 1987. – 782 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 04.02.10

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 39 (=161.1):398.9 (=161.1)(476.1–37 Лаг)

Постаць беларуса ў прыказках і прымаўках Лагойшчыны

Н. М. Панкова

У артыкуле на матэрыяле прыказак і прымавак Лагойскага краю даследуецца постаць беларуса, яго характар, маральныя якасці і жыццёвыя прыярытэты. Адзначаецца, што менавіта прыказкі і прымаўкі з'яўляюцца своеасаблівымі карцінамі жыцця беларускага народа і сведчаннем яго тысячагадовай творчасці.
Ключавыя словы: прыказка, прымаўка, постаць, характар.

Based on proverbs and sayings of the Logoisk region the article investigates the Belarusian identity, his character, moral standards and priorities in life. It is noted that it is proverbs and sayings that are the life original paintings of the Belarusian people and the testament to his thousand-year creative work.
Keywords: proverb, saying, identity, character.

Прыказкі і прымаўкі з'яўляюцца адбіткам ладу жыцця і характару народа, яго гісторыі, маралі і псіхалогіі, нацыянальных традыцый і звычаяў, этнічнага быту і тэмпераменту народа. Сведчаннем таму сталі і запісы фалькларыста і даследчыка вуснай народнай творчасці Адама Варлыгі (сапраўднае імя Язэп Гладкі), ураджэнца вёскі Міхалкавічы, які занатаваў сабраны ім каштоўны фальклорны матэрыял у выданні "Прыказкі Лагойшчыны" (1966) і дадатку да "Прыказак Лагойшчыны" (1972), што і лёг у аснову дадзенага артыкула.

Якім жа паўстае беларус у гэтых выразах? У першую чаргу разважлівым, і вялікая колькасць прыказак і прымавак сведчыць менавіта аб разумным стаўленні нашых продкаў да жыцця: "Не цешся, калі знайшоў, і не смуціся, калі згубіў", "Не зыч ліха другому, каб не давялося самому", "Не будзь ні горак, ні салодак", "Не ўздыхай: чаго няма – таго не хай", "Не хаці (не бяры) чужога і не бойся нічога", "Трэба так жыць, як набяжыць", "Прайшлі зіма і лета, пройдзе і гэта", "Не той чарвяк, што мы з'ядзім, а той, што нас з'есць". Часам гэтая разважлівасць мяжуе з верай у лёс і яго прадвырашанасць: "Не так жывём, як хочам, але як выпадае", "На гэтым свеце, як у карэце: едзеш, калышышся, пакуль не звернешся". І ўсё ж варта адзначыць, што доля песімізму ў гэтых выразах невялікая, тым больш, што сустракаюцца сярод іх і такія: "Плакаў, плакаў – усё Бог аднакаў, а як стаў спяваць – стаў Бог даваць", "Свая воля дае долю", "Уцячэш ні ўцячэш, а пабегчы можна" і інш.

Вызначае беларуса таксама цягавітасць, нейкая жылаватасць, уменне і жаданне працаваць і не абы-як, а добра: "Хто стараецца, той і мае", "Працуй, нябожа, дык і Бог дапаможа", "Пад бокам багацця не вылежыш", "Што ручкі зробяць, тое плечкі зносяць". Як слушна заўважае М. Грынблат, "творца прыказак – сам чалавек працы, і яму добра вядома, што іменна яна ёсць самае неабходнае, аснова існавання" [1, с.31]. Там, дзе другі можа апусціць рукі, беларус будзе цягнуць, тым больш, што земляробчую працу ён заўсёды ставіў на першае месца ў параўнанні з іншымі заняткамі, а яна, як вядома, патрабуе вялікіх намаганняў: "Хлеб кажа да гаспадара: "Кінь стрэльбу й вуду, тады з табой буду". Звяртае на сябе ўвагу і тое, што працавітасць мяжуе ў нашага продка з беражлівасцю, ашчаднасцю: "Хто капейкі не шануе, дык той сам капейкі не варты", "Не хаваўшы малога, не мець і вялікага", "Няхай лепш застанецца, чым не стае". Але нельга ставіць знак роўнасці паміж ашчаднасцю і скупасцю. Наадварот, сквапнасць асуджаецца ў народзе: "У скупога купца ні грошай, ні тавару", "У скупога чорт шапарам", "Скупы шылам сыту мачае (сыта – засалоджаная мёдам вада)".

Беларус шчодры і гасцінны, што і зараз заўважаюць іншаземцы. Ён абавязкова пусціць пераначаваць, небеспадстаўна мяркуючы, што: "Падарожны за сабой хаты не носіць", накорміць госця, пры гэтым прыгаворваючы: "Проша ў кут, дзе ўсе тут", "Чым багаты, тым і рады", "Чым хата багата, тым і рада", "Хлеб на стале, а рукі свае", "Хлеб стала не паесць" (адказ на заўвагу госця, што накраілі шмат хлеба, каб не падумалі, што гаспадары сквапныя). Існаваў нават такі жарт: "Умела гаспадынька гатаваць, ды не ўмела падаць", які ўжывалі гос-

ці, калі кожны раз гаспадыня падавала ўсё лепшыя стравы, а яны ўжо наеліся папярэднімі. Беларус увогуле любіць добра і смачна паесці: “Хоць жывот парушу, але з’есці мушу”, а на святы – яшчэ і выпіць, і патанцаваць: “Піця, жылы, пакуль жывы, а як памром, дык і колам не ўб’ём”, “Танцаваць трэба вучыцца, а работу гора навуча”. Беларусу не трэба чужога, відаць, спрацоўвае прынцып: лепш аддаваць, чым браць: “Чужое дабро не грэе”, “Чужы кусок дзярэ раток”, “Чужое бокам вылазе”. У яго павінна быць сваё, бо “Свайго не меўшы, трэба спаць легчы не еўшы”, а ён ужо з радасцю падзеліцца з тымі, каму гэта патрэбна, бо калі чалавек добры, чаму ж не дапамагчы (“Які госць, такая і чэсць”). Не пажадана было і залазіць у пазыкі: “Пазычай – благі звычай”, “Пазычоны хлеб еш ды аглядайся”.

Сярод вызначальных рыс характару нашых продкаў можна назваць таксама інстынктыўнае адчуванне справядлівасці і несправядлівасці, а адсюль і паважнае стаўленне да людзей: “Што не міла самому – тое не зыч другому”, “У карчме, лазні, касцёле і царкве ўсе людзі роўныя”, “Як пяюць, так і адпяваюць”, “Не май чалавека за паўчалавека”, “Не май хворага за памёрлага, а палага за прапалага”, “Не капай на другога ямы, бо сам у яе увалішся”.

З прааналізаваных прыказкавых выразаў становіцца зразумелым, што беларусам прыродна ўласціва павага не толькі да сваіх землякоў, але і да іншых народаў і краін, а таксама памяркоўнасць да тых, хто думае інакш: “Што край, то і звычай”, “У чужой царкве свячэй не папраўляюць”, “Не ўвесь той свет, што ў вакне”, “У чужым баку вочы па кулаку” (трэба пільна прыглядацца да чужых звычаяў і людзей, калі трапіш у іншую краіну).

Шануе наш продак і родны край (“У родным краі як у раі”), а сваю хату лічыць найлепшым месцам на свеце: “У сваёй хаце і качарга маці”, “У сваёй хатцы нечага баяцца”, “У сваёй хаце й вуглы памагаюць”, “Свая хатка, як родная матка”, “На сваёй лаўцы й памерці добра”.

Беларус не любіць прымусу: “Праз сілу й конь не вязе”, імкнецца да стабільнасці: “Хто коней мяняе, у таго хамут гуляе” і не заўсёды прабачае крыўду: “Цесіль уміраў, усім прабачаў, а яловаму суку не прабачыў” (ёсць такія ворагі ці ўчынкі, якія нават перад смерцю прабачыць нельга).

Што тычыцца беларускай сям’і, то тут варта канстатаваць, што наш продак, з аднаго боку, шчыра верыў у наканаванасць будучай жонкі (мужа) вышэйшымі сіламі (“Суджанаму дзеўка”), а з другога – раіў сур’ёзна ставіцца да выбару сваёй паловы (“Сабаку выбіраюць па псярні, а жонку – па радні”). Пры гэтым часта сур’ёзнасць справы хавалі за гумарам: “Хто ажаніўся, той каецца, а хто не жаніўся, той жаліцца”, “Ажаніўся – тры анучы, не жаніўся – тры анучы”, “Нежанаты б’е жонку, а бяздзетны – дзяцей”. Беларус увогуле вялікі аматар пажартаваць. Іранізавалі і з засядзеўшыхся ў дзеўках паненак (“Хоць за вала, абы дома не была”, “Хоць вох, ды ўдвох”), і з бацькоў (“Сава не родзіць сакала”), і з дзяцей (“Рыхцік увесь бацячка – і крошачкі пабраў”), і з нявестак (“Сем год нявестка была і не ведала, што сучка без хваста”), і з саміх сябе (“Якія мы самі, такія й нашы сані”). Варта звярнуць увагу і на тое, што лічылі нармальнай сітуацыю, калі хлопец старэйшы за дзяўчыну (“Хлопец на кані едзе, а дзяўчына родзіцца і яму згодзіцца”), і з пэўным спачуваннем адносіліся да прымаў (“Прымацкі хлеб сабацкі”, “Надзеў бабскі андарак”).

Немалаважным для агульнага малюнка характару беларуса падаецца і яго імкненне захоўваць у сям’і мір і спакой, а калі і здараецца нешта (“Няма той хаткі, дзе б не было звадкі”), то ні ў якім разе не выносіць гэта на людское абмеркаванне: “У хаце ёсць вушак, у хаце бывае ўсяк”, “Хату мяці, а на вуліцу смецця не насі”. Непрыстойным лічылася і ўмешвацца ў справы іншых сем’яў: “Чымся чужое дзіця біць, дык лепей свой двор падмяці”, “Як хто хоча, так па сваім бацьку і плача”, “Свой біся, сячыся, а чужы не мяшайся”, “Па мне няхай хоць воўк траву есць”.

Дзяцей у беларускай сям’і магло быць шмат. Пры гэтым жартавалі: “У каго дочкі, той ходзіць без сарочкі” (раней за дачку трэба было складаць палотны на пасагу, і бывала, што бацькам не хапала тканіны на ўласнае адзенне), “У каго сынкі, той пячэ блінкі” (калі былі сыны, то расцярэблівалі пасекі, шмат сеялі пшаніцы, і таму было з чаго пекчы бліны).

Біць дзяцей было не прынята, таму калі ўжо дарослы сын (ці дачка) што-небудзь зробіць дрэннае, то прыказвалі: “Тады трэба дзіця біць, як перак лаўкі ляжыць”. А часцей засцерагалі: “Шалы да дабра не давядуць” і выхоўвалі мудрым словам. Пацвярджаюць гэта шматлікія прыказкі і прымаўкі, якія носяць хутчэй рэкамендацыйны, чым прымусовы характар, і

вучаць маладых людзей быць сумленнымі (“Хоць латаная, але не хватаная”), сціплымі (“Не хваліся сам, няхай цябе людзі пахваляць”), праўдзівымі (“Што торба, то не мех, што праўда, то не грэх”), разважлівымі (“Не ўсё тое смачна, што соладка”), цярплівымі (“На хаценне ёсць цярпенне”, “Цярпі, Грышка, спасён будзеш”), беражліва ставіцца да сказанага (“Не пераж-аваўшы слова, не пускай яго на вецер”), уступаць (“Уступі дурню – збавення заслужыш”), спакойна да ўсяго ставіцца (“Палкае сэрца скора перагарае”), дапамагаць іншым (“Рука руку мые і абедзве чыстыя”), быць ветлівым (“Свіння калі адыходзіць ад карыта, дык хоць зарох-кае”), ахайным (“Шануй адзежу дома, а адзежка цябе ў людзях зашануе”), ведаць меру (“Што занадта, таго і свінні не ядуць”), быць уважлівым і не баяцца лішні раз запытацца па-рады (“Слухай вухам, а не брухам”, “Хто пытае, той не блудзе”) і інш.

Характар, на думку беларуса, даецца дзіцяці ўжо пры нараджэнні: “Які выйшаў з люль-кі, такі будзе і да магілкі”, “Як пайшло з рання, дык ідзе да вечара”, а па знешнім выглядзе можна зразумець, які чалавек па натуры: “Пазнаюць сакала па палёту, а саву па пагляду”. Сілу волі наш продак ставіў вышэй за фізічную моц: “Не гэта сіла, што ўтрымае палкага каня, а гэта сіла, хто ўтрымае сваё палкае сэрца”. Нельга пакінуць без ўвагі і мудрае меркаванне пра тых, хто сам мае нейкую загану і думае, што ўсе такія: “Хто сам такі – на другога кладзе знакі”.

Што тычыцца заганных рыс характару чалавека, то можна вылучыць шматлікія выс-лоўі, у якіх прасочваецца ганебнае стаўленне беларуса да дрэнных звычак, якія перашкаджа-юць чалавеку нармальна жыць і працаваць, напрыклад: “Хто табаку нюхае, той у пекла тру-хае”, “Хто табаку кура, той і вочы жмура”. Сурова асуджае ён і зладзейства: “Хто парася ўкраў, таму ў вушшу пішчыць”, “Хто хоча прапасці, няхай ідзе красці”. Безумоўна, на думку нашых продкаў, бываюць і горшыя якасці: ”Горш за злодзея – п’яніца” або “Не так бойся злодзея, як п’яніцу, бо злодзей цягне дамоў, а п’яніца з дому” і вялікая колькасць прыказка-вых выразаў накіравана на выкрыццё менавіта гэтай заганнай звычкі чалавека: “П’янаму й чорт з дарогі саступае”, “П’яніцы й капля дарага”, “Я як п’ян, дык капітан, а як працвераж-ся, дык і свінні баюся”. Ну а горш за п’янства лічылі нашы продкі дурасць (“П’яны праспіц-ца, а дурань ніколі”), а яшчэ ў большай ступені не паважалі ляноту і няўмельства: “У няўмекі рукі калекі”, “Хто па абедзе аддыша, таго Бог за свінню запіша”, “Працуе абы дзень да веча-ра”. З непавагай на Беларусі ставіліся таксама да такіх якасцей характару, як хлуслівасць (“У яго толькі праўды, як у рэшаце вады”), нявыхаванасць (“Пусці свінню за стол, дык яна і ногі на стол”), ганарлівасць (“Расхініся гразь – бруд плыве”, “Шастом галавы не дастаць”), самаў-пэўненасць (“Не маніся ды Богу маліся”, “Ягоныя ўсе козы ў золаце”), языкастасць (“Твой язык разам і таўчэ, і меле”), невуцтва (“Я больш забыўся, як ты ведаеш”), крывадушша (“Спераду цалуе, а ззаду кусае”).

Як бачым, воблік беларуса атрымаўся шматгранны. І хаця “сярод беларусаў, як і паў-сюль, ёсць лайдакі і працаўнікі, “малюскі” і героі, дурні і мудрацы…І кожны паступае адпа-ведна свайму характару, і мудрыя разважаюць мудра і па-свойму, а дурні – як паўсюль” [2, с.64], з прааналізаваных прыказак і прымавак продак паўстае перад намі разумным, кемлі-вым, разважлівым і гасцінным. Ён умее і любіць працаваць, не любіць прымусу, спачувае і да-памагае ў горы і разумна ставіцца да жыцця. Адрознівае яго і назіральнасць, якая дапамагла ў запамінальнай дасціпнай форме перадаць сваю мудрасць не толькі сваім сучаснікам, але і нам, нашчадкам. Таму варта пагадзіцца з народным выслоўем, што “Не дурань здумаў прыказку”.

Літаратура

1. Прыказкі і прымаўкі: у дзвюх кнігах, кн. 1. / Рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 560 с.

2.Караткевіч, У. С. Зямля пад белымі крыламі / У.С. Караткевіч. – Мінск: Народная асвета, 1992. – 192 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 02.02.10

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 398:392.3:81'23:316.477 (476.2–37Хойнікі)

Псіхалінгвістычны аналіз тэкстаў сямейна-абрадавай паэзіі Хойнікшчыны

А. У. Партнова-Шахоўская

Артыкул уяўляе сабой псіхалінгвістычны аналіз тэкстаў сямейна-абрадавай паэзіі Хойніцкага раёна. Аўтар разглядае праблему праграмавання і карэкцыі жыццёвага шляху чалавека, яе адлюстраванне ў народнай творчасці, якая праз магію дакладна падабранага слова,увасобленага ў дзеянні, прызначана закласці маральны падмурак быцця.
Ключавыя словы: абстрактная лексіка, радзіны, паўабстрактныя назвы, псіхалінгвістыка, славесныя формулы, хрэсьбіны.

The article deals with psycholinguistic analysis of family and ritual poetry of the Khoiniki region. The author analyzes programming and correction of a human course of life, its reflection in the folklore that through the magic of precisely chosen words, embodied in an action, is designed to lay the moral foundation of life.
Keywords: abstract vocabulary, birthing ritual, semi-abstract names, psycholinguistics, verbal formula, christening.

Лёс чалавека – гэта шлях з мінулага праз сучаснасць у будучыню. Паразважаем: ці шмат у чалавечым жыцці рэальнага, какрэтнага? Мінулае і будучае – гэта тое, чаго ці ўжо, ці яшчэ няма. Значыць, гэта сфера абстрактнага. Канкрэтнай уяўляецца толькі сучаснасць, якую можна структурыраваць у адпаведнасці з пажаданым напрамкам. А калі сучаснасць звязана не толькі з табой, а яшчэ і з блізкімі людзьмі, дзецьмі… А ты ведаеш, што лёс чалавека вызначаецца задоўга да яго з'яўлення на свет і абумоўлены лёсам і паводзінамі яго бацькоў… Ці не адсюль факт устойлівага захавання ў народнай памяці і цікавасць вучоных да тэарэтычнага асэнсавання звестак па сямейна-абрадавай паэзіі?

Не толькі літаратары, але і лінгвісты могуць знайсці шмат цікавага для даследавання ў фальклорным матэрыяле. Як лёс чалавека ўяўляе сабой перапляценне яго абстрактных уяўленняў і канкрэтных дзеянняў, так і моўная структура тэкстаў сямейна-абрадавай паэзіі вызначаецца заканамернасцямі функцыяніравання ў іх дзвюх семантычных груп лексікі: слоў з абстрактным значэннем і слоў з канкрэтным значэннем. Паспрабуем прааналізаваць гэтыя заканамернасці ў тэкстах хрэсьбіннай абраднасці Хойніцкага раёна.

«Да, хрэсьбіны – абрад вядомы. Хрэсьбіны, ці, інакш кажучы, хрысціны» (запісана ў г. Хойнікі ад Лагвіненка Марыі Васільеўны, 1960 г. н., студэнткай Лагвіненка В. (2005 г.).

Хрэсьбіны (фанетыка-словаўтваральныя варыянты *хрэсбіны, хрысціны, храсціны, крашчэнне*) – узор хрысціянскага абраду з яскрава выражанымі язычніцкімі традыцыямі, якія бяруць свой пачатак у радзінах: «маці імкнулася закрываць немаўлятка "ад чужога вока". Калі хто-небудзь убачыў яго, ён тут жа тройчы сплёўваў назад праз левае плячо і прыгаворваў: "Дай Бог, каб здаровенькім расло!"» (запісана ў г. Хойнікі ад Еўжэнка Любові Аляксандраўны, 1930 г. н., перасяленкі з в. Настолле Хойніцкага р-на, Новак В. С.); «калі нараджалася дзіця, то, каб абараніць яго ад дурнога глаза, яго ўмывалі свянцонай вадой» (запісана ў г. Хойнікі ад Гардзейчык Надзеі Ульянаўны, 1929 г. н., студэнткай Санцэвіч В.). Варта адзначыць, што сэнсаўтваральнымі ў славесных формулах з'яўляюцца ўстойлівыя выразы з метафарычным абстрактным значэннем.

Перш за ўсё паўстае пытанне, актуальнае і сёння: калі трэба хрысціць дзіця? «Пасля радзін ішлі хрысціны. Хрысцілі да года» (запісана ў в. Вялікі Бор ад Харошка Галіны Аляксееўны, 1951 г. н., студэнткамі Бяспалай М., Харошка Н. (2003 г.); «ета ж зараз доўга не хрысцяць, а тады – сёння родзіцца, а назаўтра і хрысцяць» (запісана ў г. Хойнікі ад Хадасок Марыі Адамаўны, 1914 г. н., (перасяленка з в. Дворышчы) студэнткамі Салаўёвай Т., Вайновіч

К. (2001 г.). Як бачым, тэрмін даволі доўгі, але канкрэтна акрэслены – да года, на працягу якога чалавек першы раз праходзіць цыкл свайго жыцця.

Па нашых назіраннях, хрэсьбінная абраднасць мае больш агульных рысаў не з радзіннай, а з вясельнай абраднасцю: у адрозненне ад радзін, сцэнарый якіх быў непрадказальны (і таму, магчыма, трагічны), хрэсьбіны (падобна вяселлю) заўсёды звязаны з радаснымі пачуццямі чалавека. У матэрыялах інфарматараў як па вясельнай, так і па хрэсьбіннай абраднасці выразна прасочваецца хрысціянская сімволіка лічбаў, якія дзеляцца на тры (сімвал адвечнасці жыцця): «тры сваты было…», «брала я шэсць дружак», «гулялі свадзьбу тры дні» (запісана ў в. Вялікі Бор ад Навуменка Ганны Мікалаеўны, 1937 г. н., Навуменка Аляксандра Аляксандравіча, 1940 г. н., студэнткамі Навуменка Н., Новікавай І., Смірновай Н. (2003 г.); «вяселле заўжды было ў суботу» [шосты дзень тыдня], «на трэці дзень гулялі "цыгане зайца"» (запісана ў в. Віць ад Судзенка Вольгі Васіл'еўны, 1952 г. н., (нарадзілася ў г. Данецку) студэнткай Судзенкай Нінай Міхайлаўнай (2002 г.); «перад тым як ехаць у цэркву, абходзілі тры разы маці з бацькам» (запісана ў в. Клівы ад Гардзіенка Марыі Пятроўны, 1919 г. н., студэнткамі Максімчык А., Дыба Г, Сухой Ю. (2003 г.); «у царкве маладых… абводзяць вакруг стала з іконай тры разы» (запісана ў в. Навасёлкі ад Чэкан Васіліны Андрэеўны, 1916 г.н., студэнткамі Клочка А., Руковіч В.); у сваты «ідуць кросны бацька, матка маладога, сам хлопец», бацькі благаслаўляюць дзяльбу каравая «тры разы», «на трэці дзень бабы ўсе прыбіраюцца ў цыганак…» (запісана ў в. Валокі ад Краўчанка Ксені Паўлаўны, 1936 г. н., (нарадзілася на Украіне, з 1947 г. жыве ў в. Валокі) студэнткай Жмачынскай Н.); «у сваты ідуць хросны бацька маладога, два чалавекі з радні, чацвёрты – жаніх», у першы вечар вяселля, калі шукаюць маладую, «выводзяць трох дзяўчат…», бацькі благаслаўлялі маладых «тры разы» па просьбе (якая вымаўлялася «тры разы») трох баб («роднай сястры, крышчонай маці, дзяны – жонкі роднага брата»), пры «прадажы» маладой «сват ложыць два разы грошы. Дважды дружкі адмаўляюцца. На трэйці раз больш грошай ложыць. Дружкі згаджаюцца», «галоўныя сваты…спявалі: "Ацец, маці, благаславіце каравай падзяліці". Ім у адказ: "Бог благаславіць". І так тры разы», свахі «тры разы пяюць песню, тры разы зводзяць свечкі і тройчы цалуюцца» (запісана ў в. Алексічы ад Бандарчук Алены Станіславаўны, 1928 г. н., студэнткай Смусянок Н.); пры сватанні «свечкі тры разы паляць і тры разы тушаць на парозе», песня пры завіванні маладой «пяецца тры разы», «у дванаццаць часоў ночы дзеляць каравай… на тры часткі», «просім каравай дзяліць…адзін раз кажа, фтарой раз, трэці раз» (запісана ў г. Хойнікі ад Хадасок Марыі Адамаўны, 1914 г. н., (перасяленка з в. Дворышчы) студэнткамі Салаўёвай Т., Вайновіч К. (2001 г.); «маці імкнулася закрываць немаўлятка "ад чужога вока". Калі хто-небудзь убачыў яго, ён тут жа тройчы сплёўваў назад праз левае плячо і прыгаворваў: "Дай Бог, каб здаровенькім расло!"» (запісана ў г. Хойнікі ад Еўжэнка Любові Аляксандраўны, 1930 г. н., перасяленкі з в. Настолле Хойніцкага р-на, Новак В. С.); «сягоння ў нас імяніны добрай жаны-гаспадыні, сягоння ў нас госці будуць, госці будуць траякія» (запісана ў г. Хойнікі ад Гардзейчык Надзеі Ульянаўны, 1929 г. н., студэнткай Санцэвіч В.); «дружак была няпарная калічаства», «дзялілі першы каравай да дванаццаці часоў», «ставілі тры чаркі», «было і тры кашы. Сначала давалі бабін боршч, кашу, але над ёй шуткавалі да трох раз» (запісана ў в. Вялікі Бор ад Харошка Галіны Аляксееўны, 1951 г. н., студэнткамі Бяспалай М., Харошка Н. (2003 г.); «чэраз шэсць дней пасля раджэння дзіця выбіралі яму хросных бацькоў, якія аберагалі дзіця ўсё яго жыццё» (запісана ў в. Стралічава Сацура Аляксандры Усцінаўны, 1914 г. н., студэнткай Фяськовай Т.); «дажа еслі родзіць ужэ рожаніца, дак у цэркву дванаццаць дней не хадзіла» (запісана ў в. Казялужжа ад Каральчук Любові Іосіфаўны, 1937 г. н., (перасяленкі з в. Небытаў Хойніцкага р-на) студэнткамі Краўчанка Н., Касцюковай М., Мішынай А. (2003 г.).

У адрозненне ад радзін, у аснове хрэсьбін, падобна вясельнай абраднасці, ляжыць сюжэтная гульня са строгім ралявым размеркаваннем: «Дома хрысціны правілі. Гатовілі ўсё як на свадзьбу. Падаркі дарылі малому» (запісана ў в. Казялужжа ад Каральчук Любові Іосіфаўны, 1937 г. н., (перасяленкі з в. Небытаў Хойніцкага р-на) студэнткамі Краўчанка Н., Касцюковай М., Мішынай А. (2003 г.); «глаўнымі гасцямі былі кум, кума і бабка. За куму бралі ад

бацькі, а ад маці – за кума. А зараз бяруць лучых друзей. За бабу бралі тожа тую, што была пры родах» (запісана ў в. Вялікі Бор ад Харошка Галіны Аляксееўны, 1951 г. н., студэнткамі Бяспалай М., Харошка Н. (2003 г.); «ражалі ў хаце пры бабках. Назначалі бабу, яна завязвала пупавіну. Гэту бабу бралі і на хрэсьбіны» (запісана ў в. Рудыя ад Рудчанка Алены Рыгораўны, 1930 г. н., студэнткай Мацюшэнка А.). У прынцыпах адбору ўдзельнікаў абраду адчуваюцца традыцыі культу сям'і і лёсу з пазіцый як язычніцтва, так і хрысціянскай веры: «калі первая дзевачка, тады кума была замужам, а то казалі, што дзевачка забярэ судзьбу кумы… Кашу дзялілі на ўсіх абязацельна. Хто схваціць чарапок і надзене каму-небудзь на галаву, то яго возьмуць за куму, кума ілі бабу. На хрысцінах кумоў і бабу падымалі, бо гэта буў гонар і раньшэ кумаўе садзілася ў пачоце» (запісана ў в. Вялікі Бор ад Харошка Галіны Аляксееўны, 1951 г. н., студэнткамі Бяспалай М., Харошка Н. (2003 г.); «калі гулялі хрэсьбіны, то прыглашаліс жанатыя мужчыны і жанкі» (запісана ў в. Віць ад Судзенка Вольгі Васіл'еўны, 1952 г. н., (нарадзілася ў г. Данецку) студэнткай Судзенкай Нінай Міхайлаўнай (2002 г.); «кашу варыла баба, перакупвалі кашу, хто болей грошай дасць, абычна кум перакупліваў, а тады ўжо кашу разбівалі і дзялілі на ўсіх, а чарапкі адзявалі незамужнім дзяўчатам, каб хутчэй замуж выйшлі» (запісана ў в. Клівы ад Гардзіенка Марыі Пятроўны, 1919 г. н., студэнткамі Максімчык А., Дыба Г, Сухой Ю. (2003 г.); «потым кашу павінны былі выкупіць, а кум – пабіць кашу. Чарапкамі пакрывалі галовы маладзіцам, у якіх доўгі час не нараджаліся дзеці, або дзяўчатам, якія доўгі час не выходзілі замуж» (запісана ў г. Хойнікі ад Еўжэнка Любові Аляксандраўны, 1930 г. н., перасяленкі з в. Настолле Хойніцкага р-на, Новак В.С.); "кашу разбівалі. Асколкі ад гаршка кідалі ў малодшых, каб ім тожа прыплод быў" (запісана ў в. Рудыя ад Рудчанка Алены Рыгораўны, 1930 г. н., студэнткай Мацюшэнка А.). Сэнсаўтваральнай ў дадзеных тэкстах зноў выступае абстрактная лексіка, якую ўвогуле можна лічыць дамінуючай у хрэсьбіннай абраднасці: "калі бралі за куму, то насілі *хлеб* і *соль*" (запісана ў в. Вялікі Бор ад Харошка Галіны Аляксееўны, 1951 г. н., студэнткамі Бяспалай М., Харошка Н. (2003 г.); "адным з галоўных момантаў на хрэсбінах з'яўляецца падача на стол "*бабінай кашы*" (запісана ў г. Хойнікі ад Еўжэнка Любові Аляксандраўны, 1930 г.н., перасяленкі з в. Настолле Хойніцкага р-на, Новак В. С.). Пры семантычным аналізе гэтых тэкстаў звяртаецца ўвага на метафарычна-пераноснае значэнне паўабстрактных назваў ежы, бо стравы набываюць міфалагічна-сімвалічны сэнс: «частуючы *кашай*, кум гаворыць: "Няхай *Бог* нашага хросніка (імя) гадуе ды *долю* яму гатуе" (запісана ў г. Хойнікі ад Еўжэнка Любові Аляксандраўны, 1930 г. н., перасяленкі з в. Настолле Хойніцкага р-на, Новак В.С.); «як *разбілі кашу*, чарапкі кідалі ў парог, штоб было *дужэйшае* дзіця» (запісана ў в. Вялікі Бор ад Харошка Галіны Аляксееўны, 1951 г. н., студэнткамі Бяспалай М., Харошка Н. (2003 г.); "*вяршок кашы* павінен зрэзаць кум і аддаць хрэсніку ці хрэсніцэ" (запісана ў в. Рудыя ад Рудчанка Алены Рыгораўны, 1930 г. н., студэнткай Мацюшэнка А.).

Частка інфарматараў зазначае, што «спявалі песні для кумы, кума, бабы. Усе падрад, якія зналі» (запісана ў в. Вялікі Бор ад Харошка Галіны Аляксееўны, 1951 г. н., студэнткамі Бяспалай М., Харошка Н. (2003 г.), «песні на храсцінах спяваюць, якія хочаш» (запісана ў в. Клівы ад Гардзіенка Марыі Пятроўны, 1919 г. н., студэнткамі Максімчык А., Дыба Г, Сухой Ю. (2003 г.). Але паколькі па станоўчай эмацыянальнай накіраванасці хрэсьбіны можна параўнаць з вяселлем, якому ўласцівы спецыфічныя песенныя тэксты, то натуральна, што ў большасці мясцовасцей адзначаюцца адпаведныя хрэсьбінныя песенныя тэксты.

Як і ў вясельных песнях, у вышэйпрыведзеных тэкстах няма ўзвышанай абстрактнай лексікі. Гэтая адметнасць можа быць звязана з тым, што хрэсьбінная абраднасць таксама заснавана на прыёме аберагальнай падмены (сакральнасць моманту "хаваецца" за нарачытай прастатой і іранічнасцю дзеяння): "у цэркву едуць толькі кум, кума і дзіця. Радзіцелей не бяруць. У цэркві кума адзяе дзіця ва ўсё сваё" (запісана ў в. Вялікі Бор ад Харошка Галіны Аляксееўны, 1951 г. н., студэнткамі Бяспалай М., Харошка Н. (2003 г.); «бацькі навароджанага ў цэркву не ездзілі, ехалі толькі хросныя бацька і маці» (запісана ў г. Хойнікі ад Гардзейчык Надзеі Ульянаўны, 1929 г. н., студэнткай Санцэвіч В.); "калі неслі "бабіну кашу", то неслі спярва абман" (запісана ў в. Віць ад Судзенка Вольгі Васіл'еўны, 1952 г. н., (нарадзілася ў

г. Данецку) студэнткай Судзенкай Нінай Міхайлаўнай (2002 г.); “была таксама падманная каша, маглі ката пасадзіць у гаршок ці ў каструлю, для смеху” (запісана ў в. Клівы ад Гардзіенка Марыі Пятроўны, 1919 г. н., студэнткамі Максімчык А., Дыба Г, Сухой Ю. (2003 г.); “як хрысцілі, то ў цэркву матак не бралі. Ішлі толькі хросны, хросная, бацька. Таксама была і падманная каша, куру паднасілі ў гаршку. Курыцу ці ката ў гаршок пасадзяць, накрыюць. Шуцяць, а тады ўжэ нясуць кашу нармальную” (запісана ў в. Казялужжа ад Каральчук Любові Іосіфаўны, 1937 г. н., (перасяленкі з в.Небытаў Хойніцкага р-на) студэнткамі Краўчанка Н., Касцюковай М., Мішынай А. (2003 г.); “была падманная каша. Ката садзяць у каструлю. Бывала, што і кроліка садзілі” (запісана ў в. Слабажанка (раней Княжыца, Княжацкая Слабада) ад Корбіт Вольгі Іванаўны, 1914 г. н., студэнткамі Шамонінай В., Валодзькінай Н., Тукуновай Н.); “калі прасілі бабіну кашу, то ў мяшок клалі петуха ці ката, каб пажартаваць” (запісана ў в. Рудыя ад Рудчанка Алены Рыгораўны, 1930 г. н., студэнткай Мацюшэнка А.).

Мы паспрабавалі пранализаваць з пазіцый псіхалінгвістыкі фальклорныя тэксты, у якіх знайшлі адлюстраванне хрэсьбінныя традыцыі Хойнікшчыны. Гэтыя пачатковыя этапы жыцця чалавека прадвызначаюць жыццёвы сцэнарый, які карэкціруецца кожным чалавекам на працягу ўсяго жыцця ў адпаведнасці з абставінамі і тымі маральнымі нормамі, якія былі выхаваны ў сям’і. Сям’я адыгрывае значную ролю ў працэсе дасягнення чалавекам акмеалагічных вяршынь, бо на працягу жыцця рэалізуецца праграма, закладзеная ў дзяцінстве. Гэта добра разумелі нашы продкі. Таму працэс «праграміравання на поспех» пачынаўся задоўга да з’яўлення чалавека на свет. Гульня, заснаваная на магіі дакладна падабранага слова, – вось аснова сямейнай абраднасці.

Літаратура

1. Богоявленская, Т. Б. Психология творческих способностей / Т.Б. Богоявленская. – М.: Академия, 2002. – 305 с.

2. Деркач, А. А. Акмеология: Пути достижения вершин профессионализма / А. А. Деркач, Н. Я. Кузьмина. – М., 1993. – 201 с.

3. Лексіка Палесся ў прасторы і часе / Рэд. В. У. Мартынаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1971. – 216 с.

4. Словарь символов и знаков/ Авт.-сост. Н. Н. Рогалевич. – Минск.: Харвест, 2004. – 512 с.

5. Выкарыстаны матэрыялы з фальклорнага архіва кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Гомельский областной институт
развития образования

Поступило 18.12.09

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 392.3(=161.3):001.891.5(093)

Мадэль традыцыйнай сям'і ў даследаваннях М. Доўнар-Запольскага

В. М. Лебедзева

Артыкул прысвечаны тэме беларускіх шлюбна-сямейных адносін у работах М.В. Доўнар-Запольскага, які адным з першых у айчыннай этнаграфіі прымяніў параўнальны метад даследавання. Вылучыўшы шлюбна-сямейныя адносіны ў самастойны прадмет вывучэння, Доўнар-Запольскі здолеў прааналізаваць такія іх аспекты, як звычаёвае сямейнае права, іерархію статусаў і роляў членаў сям'і, традыцыйную мараль, вясельную абраднасць і яе сімволіку.
Ключавыя словы: этнаграфія, сямейна-шлюбная абраднасць, сватаўство, запоіны, пасад, каравайны абрад, сямейная абшчына, сямейнае выхаванне.

The article is devoted to Belarusian marriage and family relations in M. Dovnar-Zapolskii's works, being one of the first in soviet ethnography who applied the comparative research method. Having separated marriage and family relations as an independent subject of study, Dovnar-Zapolskii has been able to analyze such aspects as their ordinary family law, the hierarchy of statuses and roles of family members, traditional morality, wedding ritual and its symbols.
Keywords: ethnography, family and wedding rituals, courtship, betrothal, round loaf ceremony, family community, family education.

Даследаванні і працы М. Доўнар-Запольскага па праблематыцы сямейных адносін з'яўляюцца адметным фактам станаўлення навуковага беларусазнаўства. Даследчык зафіксаваў багаты этнаграфічна-культурны матэрыял, які храналагічна адносіцца да другой паловы XIX ст., але сваімі каранямі сягае ў глыбокую старажытнасць. На аснове параўнальнага метаду аўтар вылучыў унікальныя рысы беларускай сямейна-шлюбнай абраднасці такія, як запоіны-змовіны, пасад маладых, каравайны абрад, а таксама прапанававаў іх архаічна-сімвалічную інтэрпрэтацыю.

М. Доўнар-Запольскі стаў ледзь не першым прадстаўніком эвалюцыйнай школы этналогіі ў беларусазнаўстве. Ад апісальнасці ён перайшоў да навукова-тэарэтычнага абагульнення этнаграфічных матэрыялаў, як уласных, так і сваіх папярэднікаў і сучаснікаў: А. Кіркора, П. Шэйна, Е. Раманава, П. Дземідовіча. Спрабуючы ўпісаць беларускую традыцыю ў славянска-рэгіянальны і сусветны кантэксты, ён здолеў ідэнтыфікаваць у ёй агульнае і ўнікальнае.

Апісаная і прааналізаваная даследчыкам мадэль сямейна-шлюбных адносін не толькі захоўвае сваю пазнавальную цікавасць, але і мае значэнне для разумення сучасных працэсаў трансфармацыі сям'і, выкліканых найперш канчатковым разбурэннем асноў і сувязей традыцыйнага грамадства. Гэта мадэль здольна таксама даць матэрыял для рэалізацыі важнай праблемы захавання пераемнасці ў нацыянальнай культуры, спалучэння гісторыка-культурных каштоўнасцей і навацый сучаснага інфармацыйнага грамадства.

Сваё даследаванне сямейных адносін на Беларусі М. Доўнар-Запольскі грунтуе на такой крыніцы, як запісы валасных судоў, якія ён лічыць найбольш пэўнымі ў сэнсе захавання звычаёвага сямейнага права і традыцый. Калі ў іншыя сферы судавытворчасці ўсё актыўней пранікала афіцыйнае заканадаўства, то сямейная сфера захоўвала "запаветы бацькоў" менавіта па той прычыне, што "традыцыі сям'і надзвычайна дарагія для селяніна", і ён бароніць іх аўтэнтычнасць [3, с. 2].

Па назіраннях аўтара, нягледзячы на тое, што эканамічныя адносіны XIX ст. усё больш актыўна ўсталёўвалі *малыя* сем'і (бацькі і нежанатыя дзеці), у беларусаў пераважалі архаічныя формы сям'і – *вялікая*, якая складалася з бацькоў разам з жанатымі і замужнімі дзецьмі, а таксама *сямейная абшчына.* У Пінскім павеце апошняя захоўвалася ў найбольш чыстым выглядзе і ўключала 15-25 чалавек у адной гаспадарцы, а на Міншчыне сустракаліся сем'і складам да 50 чалавек.

У сямейнай абшчыне пераважаў варыянт, калі жылі разам родныя браты. Такая абшчына існавала на працягу аднаго пакалення і часцей дзялілася пасля смерці бацькоў дваюроднымі братамі, якія разыходзяцца на асобныя гаспадаркі. Сустракалася таксама абшчына, якая ўключала людзей, не звязаных кроўным радством, члены якой называюцца *сем'янінам*і ці *здольнікамі.* Прычына ўтварэння такой штучнай сямейнай абшчыны – эканамічная. Напрыклад, удава бярэ ў якасці здольніка мужчыну, ці аслабеўшы гаспадар – здаровыя маладыя рабочыя рукі. Статус сем'яніна-здольніка – статус падпарадкаванага, хаця яго маёмасныя правы пацвярджаюцца і традыцыяй, і рашэннямі валасных судоў.

Такога роду сем'і маюць выразна патрыярхальны характар. На чале яе стаіць *"гаспадар", "бацька", "дзядзька"* (для неродных). Ён выконвае некалькі функцый:

1) загадванне ўсімі мужчынскімі работамі і іх размеркаванне. Старэйшыя мужчыны, а таксама гаспадыня, могуць дапускацца да абмеркавання, але толькі ў найбольш важных выпадках. Ніякая работа нікім не можа выконвацца без даручэння гаспадара, ініцыятыва і самастойнасць іншых не ўхваляецца.

2) гаспадар, як правіла, – казначэй сям'і, хаця часам гэтую ролю можа выконваць і гаспадыня;

3) гаспадар кантралюе паводзіны моладзі, пільнуе адносіны да працы, маральнасць сыноў і дачок, карае іх;

4) гаспадар вядзе рэлігійныя абрады: чытанне малітвы, закліканне да вячэры "дзядоў", "кармленне марозу" на Каляды і г. д.

"Воля старэйшага ў сям'і, – адзначае М. Доўнар-Запольскі, – свяшчэнна для ўсяго сямейства, без яго волі не адбываецца нічога важнага". Знакі ўвагі гаспадара – права сядзець за сталом на куту, пад абразамі. Пасля яго малітвы і пачатку ежы могуць есці астатнія.

М. Доўнар-Запольскі адзначае, што, у адрозненне ад вялікарускага "бальшака" ці сербскага "дамачына", улада гаспадара не дэспатычная, а трымаецца, у пэўным сэнсе, на маральным аўтарытэце. У адрозненне ад рускай практыкі, дзе "сам" поўнасцю чыніць суд і расправу, у беларускай сям'і несправядлівасць, прыцясненне, п'янства ці лень гаспадара неадкладна выклікаюць агульны пратэст сям'і, які заканчваецца раздзелам, альбо перадачай улады іншаму старэйшаму мужчыне. Умова захавання ўлады гаспадара – адпаведнасць яго "палітыкі" агульным інтарэсам сям'і. Ад яго патрабуецца прыклад ва ўсіх справах, найперш у працы. Гаспадар абмежаваны ў маёмасных правах, ён не можа прадаць зямлю, а калі гэта зрабіў пры наяўнасці малалетніх дзецей, суд скасуе рашэнне [3, с. 11].

Характэрны прыклад рашэння валаснога суда ў Бабруйскім павеце ў адказ на скаргу малодшых членаў на гаспадара: "Так как в хозяйственном быту необходимо, чтобы один из членов семейства был главой и наблюдал за порядком, а прочие должны подчиняться его власти и исполнять беспрекословно все его законные распоряжения, без чего не может быть порядка в хозяйстве, а потому Осипу (истцу) как младшему против Антона (ответчика) внушить повиновение к Антону как старшему и известному своим хорошим поведением, а за ругательство наказать Осипа 10 ударами розог; а Антонову жену, как дозволившую присвоить себе больше власти, чем указывает законный порядок, посадить на одни сутки в карцер. Антона же, допустившего такое послабление, оштрафовать на 75 коп." [3, с. 21].

У сям'і існуе строгі падзел працы на мужчынскую і жаночую, а ўнутры іх – па ўзросту. Мужчына не будзе рабіць жаночай работы: ніколі не дастане ежу з печы, бялізну з сундука. Для гэтага ёсць гаспадыня, нявестка ці братавая.

Жаночую работу размяркоўвае старэйшая жанчына – найчасцей жонка гаспадара – *"маці", "цётка", "баба", "хаджайка".*

Наогул, адзначае М. Доўнар-Запольскі, становішча жанчыны ў беларускай сям'і нельга назваць прыгнечаным. Яна з'яўлялася поўнай гаспадыняй у сваёй сферы, памочніцай і дарадчыцай мужа. У адносінах да яе традыцыя патрабавала поўнага падпарадкавання і павагі з боку дзяцей. Дзеці знаходзіліся ў яе распараджэнні: дзяўчаты да шлюбу, а хлопчыкі толькі пасля 14 год пераходзілі пад распараджэнне гаспадара. Нявесткі поўнасцю падпарадкоўваліся свякрові. Наогул доля нявесткі трактуецца як найбольш цяжкая ў жыцці жанчыны. У бела-

рускім фальклоры свякроў часта выступае галоўнай перашкодай шчасця маладых, яна здольна ўплываць на сына ў яго паводзінах з жонкай. Драматызм маладой жанчыны, залежнай ад свякрухі, М. Доўнар-Запольскі ілюструе сюжэтам песні, калі маці прымушае сына ссекчы таполю, у якую ператварылася нявестка ад цяжкай працы [7, с. 20].

Па юрыдычным становішчы, жанчына ў выпадку адсутнасці прамых нашчадкаў па мужчынскай лініі магла пераймаць у спадчыну бацькоўскую зямлю і маёмасць, браць апеку над уласнымі дзецьмі да іх паўналецця. Як удзельнік калектыўнай працы жанчына мела права на маёмасць, заробленую разам з мужам, але не на спадчынную маёмасць свайго мужа. Апошняя вярталася ў яго сям'ю.

Можна таксама заўважыць, што жанчыну не каралі цялесна, асноўным пакараннем быў штраф альбо грамадскія работы.

Абсалютнай нормай лічыўся пераезд нявесты ў дом і сям'ю мужа, але існаваў таксама інстытут *прымацтва.* Ён узнікаў у сітуацыі, калі сям'я нявесты не мела работнікаў: калі ў сям'і заставаліся толькі дочкі, сірата-дзяўчына на бацькоўскай зямлі, удава з малалетнімі дзецьмі і т. п. Статус прымака выражаны беларускай прыказкай "Прымачы хлеб – сабачы". Па сваім становішчы прымак быў роўны нявестцы ў сям'і мужа, гэта значыць, не меў права на маёмасць, акрамя той, што прынёс у сям'ю жонкі.

Правы старых і ўдовых бацькоў заключаліся ў тым, што калі бацька састарэў і перадаваў гаспадарку старэйшаму сыну, то ён губляў права распараджацца зямлёй, не мог пярэчыць яе раздзелу, але ў выпадку раздзела меў права на долю. Суды аддавалі большую долю зямлі тым сынам, якія бралі на дагляд бацьку. Маці-ўдава права на надзел не мела, толькі на частку пабудоў, жывёлы, хлеба, якія перадавала найчасцей сыну, у якога сялілася.

Існавала строгае правіла, адпаведна з якім даглядаў бацькоў заўсёды малодшы сын, да якога пераходзіла бацькоўская сядзіба. Матыў такога выбару: малодшы сын мае меншую сям'ю, і праца бацькоў, якой бы малой ні была, – падмога ў гаспадарцы.

Правы ўдаўца і ўдавы значна адрозніваліся. Калі ўдавец меў малалетніх дзяцей, ён, незалежна ад узросту, жаніўся праз некалькі месяцаў. Як правіла, яго другой жонкай станавілася ўдава, а калі дзяўчына, то вельмі бедная, скампраментаваная ці з фізічнымі недахопамі.

Становішча ўдавы залежыла ад яе ўзросту і наяўнасці паўналетніх ці непаўналетніх дзяцей, раздзела сям'і і г. д. У выпадку, калі жанчына станавілася ўдавой пасля раздзела сям'і мужа, яна пераймала зямлю і гаспадарку, а таксама апеку над дзецьмі. Калі ж яна выходзіла замуж на другі надзел, то губляла правы распараджэння маёмасцю, а зямля заставалася ў спадчыну дзецям. У выпадку ж, калі гаспадарка не была раздзелена, то ўдава магла застацца на правах работніцы ў сям'і мужа альбо вярнуцца да бацькоў. Практыка паказвала перавагу другога варыянта. Пры гэтым удава забірала з сабой толькі маёмасць, дадзеную ёй у пасаг, набытую ўласнай працай, а таксама частку набытага разам з мужам. Што датычыць дзяцей, то яна магла ў роўнай ступені пакінуць іх у сям'і мужа ці забраць. У апошнім выпадку сям'я мужа была абавязана выдаць "на выхаванне" дапамогу – разавую альбо часцей пастаянную.

Становішча дзяцей у сям'і характарызавалася іх раннім удзелам у агульнай працы: з 5 год дзеці нянчылі сваіх малодшых сясцёр і братоў, у 7-8 – станавіліся пастухамі і падпаскамі, з 12 год хлопчыкі далучаліся да сельскагаспадарчай працы, а ў 20 – былі гатовымі хлебаробамі. Дзяўчына ў 16-17 год ведала ўсе жаночыя работы.

Юрыдычныя правы дзеці набывалі толькі пасля шлюбу. Але на гэты момант яны павінны былі зарабіць сабе долю маёмасці ўдзелам у агульнай працы. Пасаг дзяўчына рыхтавала сама і з дапамогай маці, у яго уключалася частка грошай, заробленых продажам яе працы, альбо ў наёме.

Асобна М. Доўнар-Запольскі адзначае такі аспект, як *адносіны мужа да жонкі і бацькоў да дзяцей.* Ён падкрэслівае, што жорсткае абыходжанне мужа з жонкай – з'ява рэдкая, нават выключная. Наогул добрае стаўленне мужа да жонкі – норма. Толькі п'янства мужа можа парушыць гэта правіла, але ў такой сям'і парушаны ўсе норавы. Звычай дазваляе жонцы пакінуць мужа за яго жорсткае абыходжанне, што прыроўнена да разводу.

Звычай патрабаваў ад жонкі падпарадкоўвацца мужу, але гэта не было безумоўнае і сляпое падпарадкаванне. Доля ў маёмасці, асобная сфера дзейнасці, удзел у агульных справах надавалі жанчыне пэўную самастойнасць.

Даволі мяккім было стаўленне беларуса да сваіх дзяцей. Бацька і маці любяць дзяцей, іх праца, па магчымасці, палягчаецца. Формула сямейнага выхавання заключалася ў тым, што дзеці абавязваюцца падпарадкоўвацца бацькам, іх нельга "распускаць", але гэтыя правілы не маюць суровых праяў. Калі дзеці непадкантрольныя, то бацькі самі ў тым вінаватыя. Прыкладам, на скаргу маці на непаслухмянства і сваркі сыноў суд пастанавіў: старэйшаму – 15 бізуноў, малодшаму – 10, старэйшы абавязваўся падпарадкоўвацца маці, малодшы – і маці, і брату, а маці суд загадаў адправіцца на багамолле ў царкву і прасіць пакаяння за няўменне мірыць дзяцей [3, с. 21]. З іншага боку, несправядлівасць бацькоў сустракала асуджэнне грамадскасці: суд мог прымусіць бацьку аддзяліць сына, якога ён крыўдзіць.

Наогул, грамадская думка і валасныя суды строга каралі сямейныя спрэчкі, непаладкі, усё, што разбурала сям'ю.

З навуковага пункту гледжання прадстаўлены М. Доўнар-Запольскім матэрыял дае падставы для разумення сямейна-дэмаграфічных працэсаў на Беларусі ў II палове XIX ст. Аўтар пераканаўча паказаў, што беларуская традыцыйная мадэль сям'і адпавядала аграрнаму тыпу грамадства. Гэтым былі вызначаны яе галоўныя функцыі як працоўнага калектыву, колькасны стан, шматдзетнасць, унутраная іерархія, сямейныя каштоўнасці і традыцыі выхавання.

Літаратура

1. М.В. Довнар-Запольский. Белорусская свадьба в культурно-религиозных переживаниях // Исследования и статьи. – Т. 1. – Киев, 1909. – С. 61-146.
2. М.В. Довнар-Запольский. Белорусская свадьба и свадебные песни (Этнографический этюд) – Киев, 1888. – 38 с.
3. М.В. Довнар-Запольский. Очерки семейственного обычного права крестьян Минской губернии // Исследования и статьи. – Т. 1. – К., 1909. – С. 1-60.
4. М.В. Довнар-Запольский. Ритуальное значение каравайного обряда у белорусов // – С. 147-159.
5. М.В. Довнар-Запольский. Свадебные песни пинчуков // –. С. 353–383.
6. М.В. Довнар-Запольский. Первобытные формы брака // – С. 384–404.
7. М.В. Довнар-Запольский. Женская доля в песнях пинчуков // – С. 159-173

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 17.12.09

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 94(476.2):00:168.522

Культурная спадчына Гомельшчыны як суб'ект культуралогіі

Д. Д. Паўлавец

У артыкуле разглядаюцца помнікі мастацкай і духоўнай культуры Гомельшчыны, якія могуць быць уключаны ў турыстычныя маршруты, знаёмства з якімі будзе дапамагаць прывіваць любоў да радзімы, садзейнічаць захаванню апісаных аб'ектаў.
Ключавыя словы: культура, суб'ект культуры, лакальнае, рэгіянальнае, матэрыяльная і духоўная спадчына, культавае дойлідства, сядзібна-паркавага ансамбль, дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва.

The article deals with the monuments of artistic and spiritual culture of the Gomel region which may be included into tourist itineraries, acquaintance with them will help foster the love for a country, contribute to the conservation of objects described.
Keywords: culture, subject of culture, local, regional, material and spiritual heritage, religious architecture, a manor-park complex, arts and crafts.

Адным з складнікаў і элементаў прадмета культуралогіі з'яўляецца разгляд спецыфікі лакальных, рэгіянальных культур, іхняй гістарычнай тыпалогіі, узаемасувязі і ўзаемазалежнасці ў разнастайныя перыяды. Такім чынам, суб'ектам культуры становіцца рэгіён, які разглядаецца як сукупнасць пэўных сацыяльна-культурных сіл, этнічных груп, як носьбіт культурнага патэнцыялу, у які ўключаюцца гісторыка-культурныя і этнакультурныя адметнасці, паданні, помнікі гісторыі і культуры, звычаі і абрады, вырабы народных промыслаў і г.д. Усё гэта аб'ядноўваецца пад паняццем матэрыяльная і духоўная спадчына.

У сучаснай культуралогіі тэрмін культура полісемантычны, што абумоўлена разнастайнымі і падчас узаемавыключальнымі падыходамі і метадамі аналізу культуры. Як падаецца, культура – гэта гістарычны сацыяльны досвед, назбіраны за стагоддзі, гэта спадчына, што засталася "ад прадзедаў спакон вякоў". Культура – гэта жывое дрэва, тысячагадовай гісторыі народа, якое глыбока ўкаранілася ў родную глебу, волат – дуб, які акумулюе, генерыруе і транслюе праграмы дзейнасці, паводзін і зносін паміж людзьмі. Культура – гэта велізарная мазаічная карціна, на якой адлюстраваны калектыўны вопыт памяці чалавечага роду ў выглядзе адбіткаў – архетыпаў. Гэта сума грамадскіх дасягненняў, адмысловая форма дзейнасці, знітаваная з мысленнем, мастацтвам, узроўнем развіцця грамадства, яго адукаванасцю, з духоўным вымярэннем чалавечай дзейнасці, сістэмай нормаў і каштоўнасцяў. Апошнія разам з нормамі і ідэаламі з'яўляюцца найгалоўнейшым кампанентам усялякай культуры. Звычайна да каштоўнасцяў адносяцца агульнапрынятыя і раздзяляльныя той або іншай супольнасцю, групай святыні, духоўныя абсалюты, звычаі і традыцыі, міфалогія. Таму вельмі важна выкарыстоўваць іх пры выхаванні сучаснага чалавека не толькі для прышчэплівання прыгожага, але і пачуцця патрыятызму. Такую працу неабходна, як падаецца, пачынаць з асэнсавання спадчыны малой Радзімы, гісторыі яе культуры, а ўжо пасля пераходзіць да вывучэння агульнанацыянальнай і сусветнай, бо, як вельмі тонка заўважыў В. Ластоўскі "гісторыя – гэта фундамент, на каторым будуецца жыццё народа, і нам, каб адбудаваць сваё жыццё, трэба пачаць з фундаменту, каб будынак быў моцны" [1, с. 247]. Гэта актуальна яшчэ і таму, бо і сёння, як і сто гадоў таму, "амаль кожны дзень знікаюць старыя сялібы нашых продкаў. Адны з іх знішчыў агонь або вайна, другія – бязлітасны час, трэція – заўчасна разбурыла абыякавая рука, нават не пакінуўшы ні малюнкаў, ні апісанняў. Дзіўныя і сумныя бываюць праявы лёсу. Пасля парцэляцыі многія старыя і шмат у чым цікавыя маёнткі – гнёзды высока маральных сямейных і грамадзянскіх традыцый, калыскі знакамітых людзей, асяродкі асветы ў краіне – заняпалі, новыя, дробнамаянтковыя гаспадары пачалі прыстасоўваць іх пад корчмы ці разбіраць на іншыя, драбнейшыя будынкі. Пра кожную старую сядзібу можна было б напісаць цэлую кнігу ці нават раман. Але паказаць праўдзівую гісторыю шмат якіх з гэтых шляхецкіх гнёздаў ужо немагчыма, бо загінулі датычныя іх паперы, зніклі з паверхні зямлі пабудовы, павыміралі людзі, забыліся нават традыцыі" [2, с. 450]. Гэтыя словы, сказаныя ў канцы XIX стагоддзя, актуальны сёння як ніколі. Бо няўмольны час, людская абыякавасць, брак дзяр-

жаўных сродкаў, садзейнічаюць канчатковаму знішчэнню таго, што яшчэ захавалася ад мінуўшчыны, што лучыць сучаснае з прошлым і вызначае накірункі культурна-грамадскай дзейнасці цяпер і ў будучыні.

Каб упэўніцца ў тым, што нашы продкі не зніклі бясследна, жылі нездарма, варта пазнаёміцца з тымі помнікамі дойлідства, народных промыслаў і мастацтва, казкамі і песнямі, паданнямі і звычаямі, якія нам засталіся ў спадчыну. А тое, што Гомельшчына як складовая частка Беларусі мае багатую шматвяковую культурную гісторыю – агульна вядомы факт. Гэта зямля, на якой сышліся плямёны радзімачаў, дрыгавічоў і драўлян. Тут захоўваецца комплекс археалагічных помнікаў мілаградскай культуры, які датуецца 4 ст. да н.э. – 2 ст. н.э. Археолагі даказалі, што ўжо ў тыя далёкія часы нашы продкі выраблялі ўпрыгожанні, паляўнічыя прылады і аздаблялі іх адмысловымі малюнкамі. Гомельшчына – чароўны край, на тэрыторыі якога сустракаюцца Прыпяць, Беразіна і Сож з Дняпром, каб несці свае хвалі ў Чорнае мора. Тут пралягаў шлях з варагаў у грэкі, праплывалі дзіўныя для гэтых мясцінаў ладдзі заморскіх гасцей-купцоў. Людзі, якія спакон веку жылі ля вады, лічылі, што яна валодае цудадзейнай сілай. Сюды прыходзілі шукаць дапамогі падчас войнаў, пераследаў (напрыклад, стараверы). Адсюль родам многія таленавітыя паэты, пісьменнікі, мастакі, музыканты, навукоўцы, якія праславілі не толькі Гомельшчыну.

Падарожжа на Гомельшчыне можна пачаць з старажытнага Турава – сталіцы раннефеадальнай дзяржавы, утворанай на землях дрыгавічоў у канцы X стагоддзя, які ўпершыню згадваецца ў 980 годзе. Тураў – гэта, на нашу думку, брама ў больш, чым 1000-гадовую гісторыю Палесся і Беларусі. Гэта сэрца палескай душы. “Размешчаны на вялізнай і цяжкадаступнай тэрыторыі, гэты надзвычай урадлівы, месцамі гарысты край, захаваў, збярог усе багацці шматвяковай культуры – сялянскай і гарадской” [3, с. 8]. Тут было створана Тураўскае Евангелле – самы старажытны (з захаваных) рукапісны помнік кніжнай культуры на беларускіх землях. Тураўскае Евангелле сведчыць, што пісьменнасць і культура ў гэтай частцы Гомельшчыны былі даволі высокія. Тураўская зямля, Тураў на той час былі месцам прыцягнення і мелі вызначальны ўплыў на прылеглых тэрыторыях. У Тураве XII стагоддзя, як і ў Полацку, сфармаваўся культурна-асветніцкі цэнтр, які складаў аснову і вызначальныя накірункі развіцця старажытнай беларускай культуры. У XIII стагоддзі ўзведзена тураўская вежа – помнік абарончага дойлідства, дамінанта тураўскага замка, на жаль, разбуранага ў 1830-я гады. Сёння можна пазнаёміцца толькі з рэшткамі замчышча старажытнага горада. Тут жыў і працаваў адзін з самых вядомых рэлігійных дзеячаў, пісьменнікаў і красамоўцаў Кірыла Тураўскі. На жаль, лёс горада склаўся не вельмі ўдала. Пасля заняпаду Тураўскага княства і ўваходжання яго земляў у склад ВКЛ жыццё ў Тураве паступова занепадае. Аднак у пачатку XVI стагоддзя з’явілася надзея на адраджэнне былой магутнасці горада пасля таго, як ён стаў уласнасцю князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага. Дарэчы тут, у Тураве, нарадзіўся ягоны сын Канстанцін (Васіль), вядомы культурны і грамадскі дзеяч ВКЛ, які пазней заснаваў першую школу вышэйшага ўзроўню на Украіне ў горадзе Астрогу, а таксама школу ў Тураве. Добра захаваная і царква Усіх Святых – помнік палескай драўлянай архітэктуры пачатку XIX стагоддзя, у якім спалучаюцца традыцыі народнага стылю з элементамі праваслаўнага культавага дойлідства.

Ужо больш за 1000 гадоў існуе паданне пра тураўскія крыжы, якія нібыты прыплылі ўверх па цячэнні Дняпра і Прыпяці за часамі прыняцця хрысціянства з Кіева. Налічвалася больш за дзесяць каменных крыжоў, якія знаходзіліся ў Тураве і навакольных вёсках. Найбольш вядомы з іх гэтак званы Тураўскі, або Святы, які цяпер захоўваецца ў Гомельскім абласным музеі, сюды перавезены і два крыжы з Барысаглебскіх могілак (бадай, самых старажытных і дзейных у нашай краіне). Аднак найбольш уражваюць два крыжы з Тураўскай Усясвяцкай царквы, якіх у народзе называюць Бацька і Маці, і крыж, які расце з зямлі на Барысаглебскіх могілках і які называюць Сынам. Крыж сапраўды робіць уражанне, паступова “вырастаючы” з зямлі і вылучаючы цяпло. Не выпадкова, што ён стаў аб’ектам паломніцтва – людзі вераць у яго цудадзейную сілу і дапамогу ад хвароб і едуць, ідуць, каб дакрануцца да яго.

Якраз тут, на старажытнай Тураўшчыне, адчуваеш повязь пакаленняў і разумееш, наколькі дакладна ахарактарызаваў гэтае пачуццё О. Шпенглер, калі гаварыў, што “кроў продкаў працякае праз шэраг пакаленняў і аб’ядноўвае іх у ланцуг лёсу, рытму і часу” [4, с. 9].

Узыдзеш на Замкавую гару да помніка Кірылу Тураўскаму, паглядзіш на Прыпяць і падасца, што да прыстані падплываюць чаўны, лодкі-чайкі, шугалеі з дарамі Палесся і распачынаецца шумны гандаль, льецца меладычная паляшуцкая гаворка.

З Турава ўніз па Прыпяці мы патрапім ў в. Юравічы Калінкавіцкага раёна, дзе знаходзіцца адно з самых старажытных паселішчаў першабытнага чалавека на Беларусі і курганны могільнік дрыгавічоў. Тут, у палескай глыбінцы, у 2-й палове XVII стагоддзя быў пабудаваны выдатны помнік позняга беларускага барока комплекс – касцёл Раства Багародзіцы, у якім захоўваўся цудадзейны абраз Юравіцкай Маці Божай, і рэзідэнцыя езуітаў, які нават цяпер пасля доўгіх гадоў занядбання і запусцення ўражвае сваёй велічнасцю, быццам казачны велікан, аглядаючы наваколле з высокага берага Прыпяці. Як паведамляе "Люстрацыйны інвентар Юравіцкай калегіі езуітаў", складзены пры касацыі ордэна, "касцёл вялікі, мураваны, пышны, дахоўкамі крыты, з дзвюма вежачкамі на перадзе". У адной з вежаў быў вялікі гадзіннік, які біў кожную чвэрць гадзіны, у другой – "звонаў дужых тры" [5]. (Зараз у комплексе дзейнічае жаночы праваслаўны манастыр Раства Багародзіцы, што дае надзею на яго аднаўленне). Юравічы былі вядомым у ВКЛ мястэчкам, якое мела каралеўскі прывілей на вольны гандаль і правядзенне кірмашоў. Яны не раз згадваюцца ў "Палескай хроніцы" І. Мележа, таму было б мэтазгодна арганізаваць літаратурную экскурсію па старонках гэтага твора, наведаць месцы, дзе жылі героі твора, прайсціся па сцежках-дарожках Васіля Дзятліка і Ганны Чарнушкі, Міканора Дамеціка і Апейкі, Карчоў і інш.

Адсюль зусім недалёка да Беларускай Швейцарыі, як вобразна нярэдка называюць Мазырскае Палессе і яго "сталіцу" Мазыр. Тут знаходзіцца адзін з цэнтраў айчыннай нафтаперапрацоўчай прамысловасці і першы на Беларусі солевыварны камбінат, які вырабляе кухонную соль "Палессе". Аматараў экатурызму не пакінуць абыякавымі пешаходныя экскурсіі па тэрыторыі ландшафтнага заказніка Мазырскія Яры, у якіх можна пабачыць рэдкія для нашай краіны кляновыя і букавыя гаі, піхту, калі пашанцуе, – занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі венерын чаравічак, лілею кучаравую, званочак сібірскі і іншыя. Стары Мазыр прываблівае аматараў даўніны няблага захаванымі помнікамі беларускага барока такімі, як касцёл і кляштар кармелітаў і Кімбараўскія цыстэрыянскія кляштары і касцёл (дасюль захаваўся будынак касцёла і частка жылога комплекса), а таксама помнікам архітэктуры савецкага канструктывізму – будынкам клуба-тэатра, які ўражвае сваім аб'ёмным паўкруглым фасадам з калонамі. Да 850-годдзя горада адрэстаўраваны замак, які існаваў на працягу 16-18 стагоддзяў. Для аматараў экстрыму ўзведзены гарналыжны комплекс.

Далёка вядомыя за межамі нашай краіны выдатныя вырабы ўжытковага мастацтва Неглюбскія ручнікі на Веткаўшчыне. У старажытным арнаменце гэтых ручнікоў захоўваецца інфармацыя пра светаразуменне нашых продкаў, іх узаемаадносіны з навакольным асяроддзем, адлюстраваны рытм жыцця, погляд на будову сусвету. Ветка прываблівае турыстаў і шыкоўным музеем народнай творчасці, у якім прадстаўлены цудоўныя ўзоры веткаўскай разьбы, якія ўвасабляюць традыцыі народнага архітэктурнага дэкору па аздабленні ліштвы, ганкаў, варот, карнізаў і г. д. Аматары даўніны з цікавасцю азнаёмяцца з калекцыяй рэдкіх беларускіх старадрукаў 16-18 стст., творамі мясцовай школы іканапісу і шыцця жэмчугам, золатам і бісерам. Ветку вобразна называюць Іерусалімам стараверaў. Знаёмства з узорамі ручнікоў дазваляе пранікнуць у мікракосмас мясцовай культуры, якая непарыўна лучыцца з культурай агульнанацыянальнай. Не даязджаючы да Веткі, можна завітаць у вёску Хальч, дзе захаваўся палац Халецкіх – помнік архітэктуры класіцызму пачатку XIX стагоддзя, пабудаваны на стромым высокім беразе Сажа, цяпер тут размешчана філія абласнога краязнаўчага музея.

Далей наш шлях праляжа ў Чырвонабярэжскую сядзібу Жлобінскага раёна – помнік сядзібна-паркавага дойлідства канца 19 стагоддзя. Двухпавярховы сядзібны дом у стылі мадэрн і ўязная брама ў неагатычным афармленні і яркай афарбоўцы не пакінуць незадаволенымі вытанчаных эстэтаў. Тут жа, у Чырвоным Беразе, неабходна наведаць мемарыяльны комплекс "Дзецям – ахвярам вайны". Выдатным узорам расійскага класіцызму на Жлобіншчыне з'яўляецца мураваная стрэшынская Пакроўская царква пачатку 19 стагоддзя – помнік рэспубліканскага значэння. Жлобін вядомы за межамі нашай краіны не толькі Беларускім металургічным заводам. З сярэдзіны 50-х гадоў мінулага стагоддзя горад становіцца своеасаблі-

вым цэнтрам дэкаратыўна-ўжытковага мастацкага промыслу інкрустацыі саломкай. Сваім нараджэннем ён абавязаны таленавітым майстрам – мужу і жонцы Міхаілу Васільевічу і Веры Нікадзімаўне Дзехцярэнкам, якія ў 1955 годзе арганізавалі цэх інкрустацыі. Невялікі калектыў з васьмі чалавек вырабляў інкруставаныя куфэркі, папяросніцы, пудраніцы, іголь-ніцы і іншыя рэчы, якія карысталіся вялікім попытам, былі ўпрыгожаны дзівосным, мудрагелістым і дарагім арнаментам, што ззяў, пераліваўся залацістымі адценнямі ў яркім бляску сонечных промняў. І ўсё гэта выраблялася са звычайнай жытняй саломкі. У 1961 годзе маленькая саматужная арцель стала фабрыкай мастацкай інкрустацыі, душой якога доўгія гады былі муж і жонка Дзехцярэнкі, якія ў сваёй творчасці абапіраліся на традыцыі народнага мастацтва. На аснове багатай спадчыны і традыцый беларускага народнага мастацтва сфармаваўся своеасаблівы мастацкі стыль жлобінскай інкрустацыі, які заваяваў папулярнасць не толькі ў СССР, але і ў Канадзе, Італіі, Бельгіі, Польшчы і іншых краінах свету. Вырабы жлобінскіх майстроў годна рэпрэзентавалі дасягненні нацыянальнага мастацтва нашай краіны на разнастайных Усесаюзных і замежных выставах. Выробленыя рукамі жлобінскіх майстроў падарункі, можна сказаць без перабольшвання, разыходзіліся ва ўсе канцы свету, бо адным з галоўных заказчыкаў было Таварыства культурных сувязяў з замежнымі краінамі. З прадпрыемствам актыўна супрацоўнічаў вядомы беларускі мастак Уладзімір Басалыга. Справу Дзехцярэнак прадоўжылі іх вучні В. Котаў, З. Пашкоўская, Т. Аляксеева, якія, абапіраючыся на традыцыі папярэднікаў, шукаюць новыя вобразныя і арнаментальныя вырашэнні ў інкрустацыі, робяць іх паліхромнымі. Промыслы працягваюць развівацца, сёння гэта сучаснае прадпрыемства, дзе побач з ручной працай выкарыстоўваецца і механізаваная. Зараз у горад прыязджаюць і аматары водных відаў спорту. Тут узведзены сучасны аквапарк і басейн.

Знаёмства з гісторыяй Гомельшчыны і яе культурнай спадчынай дэманструе, што яна мела асаблівасці і развівалася як па адпаведных унутраных законах, так і пад знешнім уплывам, што выразна праявілася ў разнастайнай мастацкай стылістыцы (барока, класіцызм, неаготыка, народнае дойлідства і промыслы) і своеасаблівай народна-паэтычнай творчасці (паданнях, звычаях, побыце).

Папулярызацыя культурнай і духоўнай спадчыны, абуджэнне інтарэсаў да яе, будзе садзейнічаць захаванню помнікаў, іх належнай ахове. Бо не сакрэт, што многія з іх прыйшлі ў заняпад, занядбаныя, знаходзяцца ў запусценні. У гэтым артыкуле мы не звярталіся да апісання помнікаў горада Гомеля: яны дастаткова разгледжаны ў разнастайнай навуковай і навукова-папулярнай літаратуры, добра захаваныя і з'яўляюцца аб'ектамі для наведвання шматлікімі гасцямі горада як беларускімі, так і замежнымі.

Літаратура

1. Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. Уклад., прадм. і кам. Я. Янушкевіча / Мн.: "Беларускі кнігазбор", 1997. – 512 с. [4] л. іл.

2. Глогер, А. Дудзічы. Старонкі з гісторыі старой сядзібы / А. Глогер // Ельскі А. Выбранае / Уклад. Н. Мазоўка, У. Казберука. Прадм. У. Казберука, К. Цвіркі. Пер. з пол. Н. Мазоўка, У. Казберука, Г. Кісялёва. Мн.: "Беларускі кнігазбор", 2004. – 496 с. [4] с. іл

3. Лабынцаў, Ю. А. Старая казка Палесся: Турава-Пінская зямля / Ю. А. Лабынцаў. Пер. з рус. м. М.І. Шорнікавай. Прадм. Г. Каханоўскага. – Мн. Полымя. 1993. – 144 с.: іл.

4. Шпенглер О. Закат Европы. Очерки морфологии мировой истории. Т. 2. Всемирно-исторические перспективы. Мн.: ООО «Попурри», 1999. – 720 с.

5. ЦГАДА (Москва). Ф. 2188. Оп. 8 Д 94.

6. Кісялёў, Г. Радаводнае дрэва: Каліноўскі – эпоха-наступнікі. – Мн.: Маст. літ., 1994. – 303 с. [12] л. іл.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 11.12.09

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 398 (=161.3)

Гендэрныя даследаванні ў філалагічных навуках канца XX – пачатку XXI стагоддзяў

Ю. Ю. Атрошчанка

Цэнтральнае месца ў гендэрных даследаваннях займае праблема сацыяльнай няроўнасці мужчын і жанчын з пункту погляду розных дысцыплін: філасофіі, эканомікі, этналогіі, паліталогіі і інш. У дадзеным артыкуле робіцца агляд гендэрных даследаванняў у філалогіі канца XX – пачатку XXI стагоддзяў, праводіцца спроба аналізу розных падыходаў да вырашэння гендэрных праблем у кантэксце навуковых дысцыплін.
Ключавыя словы: гендэр, праблема полу, ролевая сацыялізацыя, узор паводзін, мужчынскае, жаночае, сацыяльнае ўзаемадзеянне, фемінісцкая лінгвістыка, маўленчыя стылі, камунікацыя

The central place in gender studies is taken by the problem of social inequality between men and women from the perspective of different disciplines: philosophy, economics, ethnology, political science and others. This article provides an overview of gender studies in philology of the late 20th and the beginning of the 21st century. There has been made an attempt to analyze different approaches to solving gender problems in the context of scientific disciplines.
Keywords: gender, problem of sex, role socialization, role models, male, female, social interaction, feminist linguistics, conversational styles, communication.

Эвалюцыя гендэрных даследаванняў ішла ад жаночых даследаванняў да ўласна гендэрных. Яшчэ ў 60-х гадах XX ст. паняцце “гендэр” у значэнні “суадноснасць полаў” было амаль невядомым. На Захадзе гендэрныя даследаванні толькі ў 80-ыя гады выдзеліліся з так званых жаночых даследаванняў, якія мелі больш доўгую і больш палітызаваную гісторыю існавання. Тэрмін «гендэр» упершыню выкарыстала ў 1975 годзе амерыканскі антраполаг Гейл Рубін для абазначэння полу як прадмета грамадскай дзейнасці. У 80-ыя гады гэта паняцце становіцца асновай для шматлікіх канцэпцый.

Фемінісцкая лінгвістыка альбо фемінісцкая крытыка мовы ўзнікла ў заходнім мовазнаўстве ў 70-ыя гады XX стагоддзя, што было абумоўлена развіццём новых навуковых накірункаў у самой лінгвістыцы – псіхалінгвістыкі, квантытатыўнай сацыялінгвістыкі, прагматыкі, тэорыі камунікацыі, а таксама з’яўленнем уласна метадалагічнай і навуковай базы для развіцця гендэрных даследаванняў у сацыяльных навуках. У працах лінгвістаў панавалі гіпотэзы “дэфіцытнасці” жаночай мовы і “дыферэнцыяцыі” мовы на жаночую тактыку “камунікатыўнага супрацоўніцтва” і мужчынскую тактыку “камунікатыўнага суперніцтва”. Абедзве гэтыя тэорыі былі мадэрнізаваны ў “тэорыю дзвюх культур” амерыканскай сацыялінгвісткай Д. Танен. Даследчыца ў сваёй манаграфіі “Ты мяне не разумееш”, аналізуючы мужчынскія і жаночыя маўленчыя стылі, прыходзіць да высновы, што размова паміж мужчынамі і жанчынамі ўяўляе сабой камунікацыю супрацьлеглых культур. Д. Танен лічыць, што адрозненні камунікатыўных стратэгій полаў маюць карані ў глыбокім дзяцінстве: “Пачынаючы з ранняга ўзросту ствараюцца розныя светы, у якіх потым жывуць дарослыя мужчыны і жанчыны. Таму не дзіўна, што жанчыны і мужчыны, якія імкнуцца да гармоніі ў іх адносінах, часта знаходзяць, што іх партнёры не разумеюць іх і нават крытыкуюць” [15, с. 352-353].

Калі на Захадзе да праблемы мовы і полу звярнуліся яшчэ ў 70-ыя гады, то для айчыннага мовазнаўства – гэта даволі малады напрамак даследавання, так як інтарэс да яго ўзмацніўся толькі ў 90-ыя гады ў сувязі са знікненнем забарон і ідэалагічных догмаў. Адной з першых грунтоўных прац у дадзеным ракурсе на постсавецкай прасторы была манаграфія А. В. Кірылінай “Гендэр: лінгвістычныя аспекты” (1999), дзе робіцца спроба сістэмнага асэнсавання і апісання мовы ў сувязі з феноменам полу, ствараецца тэарэтычная мадэль гендэра і сістэматызуюцца метадалагічныя падыходы да даследавання праблемы гендэра ў мовазнаўстве [6].

Пытанні, звязаныя з распрацоўкай методыкі лінгвістычнага даследавання гендэра, стварэннем інструментарыя гендэрных даследаванняў, у апошні час становяцца актуальнымі ў айчыннай лінгвістыцы. Значнае месца сярод літаратуры, прысвечанай дадзеным праблемам, займаюць працы Ул. Коваля "Мова і тэкст у аспекце гендэрнай лінгвістыкі" [7], А. С. Грыцэнка "Мова як сродак канструявання гендэра" [3], В. Х. Антынескул "Гендэр як параметр тэкстаўтварэння" [1] і г. д., дзе аўтары спрабуюць сфармуляваць законы выяўлення гендэрнай асновы функцыянавання маўлення, выпрацаваць метадалагічны апарат даследаванняў гендэрнай праблематыкі ў мовазнаўстве.

У сваёй працы «Гендэрныя асаблівасці інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту ў параўнальна-супастаўляльным аспекце (На матэрыяле перакладаў рамана Р. Баха "Чайка Джанатан Лівінгстон» на рускую і нямецкую мовы)" В. Б. Мойсава адзначае, што "як прадукт сацыяльных адносін і культурнай традыцыі гендэр не з'яўляецца асабіста лінгвістычнай катэгорыяй, аднак шляхам аналізу моўных структур можна раскрыць яго змест, выявіць гендэрныя стэрэатыпы, зафіксаваныя ў свядомасці носьбітаў мовы" [11, с. 8]. Згодна з гэтым ў сучасным мовазнаўстве магчыма вылучыць накірунак псіхалінгвістычнага аналізу гендэрных стэрэатыпаў пэўнага этнасу, а таксама розных нацый. Прыкладам могуць з'яўляцца працы А. М. Калугіна "Канцэпты "мужчына" і "жанчына" ў субстандарце рускай і ангельскай моў" [5], С. У. Грыбач "Вобраз сям'і ў моўнай свядомасці рускіх: гендэрны аспект" [2] і інш.

Разам з мовазнаўцамі ў 90-ыя гады XX стагоддзя да гендэрных даследаванняў звярнулася і літаратуразнаўцы. Нягледзячы на тое, што ў 60-70-ыя гады ў заходнім літаратуразнаўстве склаўся напрамак фемінісцкай крытыкі, пра станаўленне метадалогіі гендэрных даследаванняў у літаратуры можна казаць, як пра факт нядаўняга фарміравання, над якім ідзе праца і на сённяшні дзень. На думку С. В. Ахотнікавай, гэта звязана з маскуліннасцю класічнага літаратуразнаўства [12]. Даследчыца адзначае: «Хоць многія навукоўцы прыйшлі да высновы, што асэнсаванне літаратуры і культуры праз прызму гендэра дае каштоўны матэрыял як для філалогіі, культуралогіі, так і для гуманітарных навук увогуле, аднак толькі ў 80-ыя гады падобнага роду даследаванні пачалі ўспрымацца як адзіны комплекс, найбольш прымальны для аналізу "іншасці жаночай свядомасці» і тых сродкаў, пры дапамозе якіх гэта "іншасць" знаходзіць сваё выражэнне ў літаратуры" [12, с. 530].

За апошні час у межах гендэралогіі сфарміравалася асобная вобласць літаратуразнаўства, якую ўмоўна называюць "гендэрнай паэтыкай". Прадметам дадзенага віду паэтыкі з'яўляецца гендэр, які выступав не ў якасці біялагічнага полу, а як сукупнасць сацыяльных рэпрэзентацый у межах тых або іншых сацыякультурных ўяўленняў, што замацаваліся ў дадзеным грамадстве. У адпаведнасці з такім падыходам гендэр разглядаецца як важны канцэпт літаратуры і ўяўляецца як вымярэнне сацыяльных мадэлей паводзін, характэрных для дадзенага тыпу культуры. Гендэрная паэтыка ўлічвае таксама аспекты стварэння, успрыняцця і інтэрпрэтацыі тэксту, таму яна аперыруе шматузроўневым падыходам да літаратурнага твора. Так, навуковец Ю. А. Крысцева дапушчае выдзяленне ў складзе мастацкага тэксту трох узроўняў: суб'екта пісьма, атрымальніка і размешчаных па-за імі тэкстаў, тры інстанцыі, якія знаходзяцца ў стане дыялогу [8]. У сваім артыкуле "Бахцін, слова, дыялог і раман" даследчыца адзначае: "У дадзеным выпадку статус слова вызначаецца гарызантальна (слова ў тэксце адначасова належыць і суб'екту пісьма, і яго атрымальніку) і вертыкальна (слова ў тэксце арыентавана ў адносінах да сукупнасцей іншых літаратурных тэкстаў – больш ранніх або сучасных)" [8, с. 97]. Такім чынам, на думку аўтара, гендэр рэалізуецца на ўсіх трох узроўнях.

У той час як лінгвістычныя і літаратуразнаўчыя гендэрныя даследаванні прэтэндуюць на аўтаномнае існаванне ў выглядзе гендэралагічнага накірунку філалагічнай навукі, фалькларыстычныя працы ў дадзеным рэчышчы на сённяшні дзень яшчэ з'яўляюцца адзінкавымі фактамі ў гісторыі развіцця фалькларыстыкі.

Да таго патрэбна адрозніваць гендэрныя даследаванні ў фалькларыстыцы ад проста фалькларыстычнай працы: пры разглядзе народнай творчасці ў гендэрным аспекце ставіцца праблема феміннасці або маскуліннасці аб'екта аналізу, у той час як у спецыялізаваных працах можа разглядацца толькі пэўны вобраз. Так, праца Д. В. Сакаевай "Вобраз жанчыны-ваўчыхі ў асецінскай няказкавай прозе ў кантэксце фальклору індаеўрапейскіх народаў" уяўляе

сабою цікавае і арыгінальнае даследаванне ў рэчышчы класічнай фалькларыстыкі, аднак не з'яўляецца гендэрным, так як не мае на мэце пастаноўкі праблемы ўзаемаадносін полаў, суадносін жаноцкага і мужчынскага ўяўленняў, зафіксаваных у тэксце, мастацкага вырашэння жаночага пытання [14]. Артыкул К. І. Мадлеўскай "Гераіня-ваяўніца ў рускіх былінах" з'яўляецца гендэрным даследаваннем, таму што аўтар разглядае вобраз былінай ваяўніцы Настассі ў апазіцыі з вобразам мужчыны-волата. Даследчыца закранае пытанне разгляду жаночых персанажаў у кантэксце лёсу мужчынскіх і прыходзіць да высновы: "У быліне пра Настассю і Дунай прадстаўлена супярэчнасць, прычынай якой выступіла спалучэнне "няправільных" шлюбных партнёраў. Акрамя таго, у перспектыве лёсу гераіні матыў супрацьстаяння суадносіцца з пэўным этапам яе жыцця – гэтая барацьба ўяўляе сабой пошукі шлюбнага партнёра" [10, с. 58].

Распрацоўкай гендэрнага пытання беларускага фальклору займаліся прадстаўнікі ўніверсітэцкай школы фалькларыстыкі: Р. М. Кавалёва, Т. В. Лук'янава, С. В. Шамякіна, Н. П Карыцкая, В. І. Палукошка. Даследчыкі разглядалі розныя жанры народнай творчасці: сямейна-бытавыя песні, песні пра каханне, легенды і казкі. Асноўныя праблемы, якія закраналі аўтары, заключаліся ў інтэрпрэтацыі гендэрных стэрэатыпаў, выражаных у фальклорных тэкстах. Гендэрны падыход да аналізу фальклорных твораў дазваляе ўсвядоміць сюжэтныя сітуацыі і вобразы ў катэгорыях стабільнасці ці нестабільнасці "мужчынскіх" і "жаночых" стэрэатыпаў.

Так, Р. М. Кавалёва разглядала тры псіхатыпы залётніка ў беларускіх песнях пра каханне. Даследчыца адзначыла, што беларускі народ пры дапамозе псіхалагічных дэталей праз сімвалічныя характарыстыкі персанажаў тонка адрознівае тыпы залётнікаў: "У аднолькавых сітуацыях залётнікі паводзяць сябе адпаведна сваёй псіхалагічнай прыродзе, прычым амаль усім ім уласціва залежнасць ад гендэрных стэрэатыпаў" [4, с. 207]. Т. В. Лук'янава даследавала гендэрную вызначанасць фальклорнага аўтара ў беларускіх легендах і прыйшла да высновы, што "спецыфіка фальклорнага аўтара заключаецца ў тым, што яго палавая прыналежнасць вар'іруецца ў залежнасці ад кожнага канкрэтнага твора і выяўляецца шляхам комплекснага аналізу" [9, с. 213].

Асноўныя гендэрныя пытанні вырашаюцца на розных узроўнях: палітычным, эканамічным, бытавым і інш. У рэчышчы філалогіі таксама разглядаюцца важныя праблемы, звязаныя з даследаваннем адрозненняў вынікаў сацыяльных трансфармацый (статусу, ролі, функцый) для мужчын і жанчын і прагназаваннем наступстваў змен для сям'і і гендэрных адносін у грамадстве. Калі гендэрная праблематыка для лінгвістычных і літаратуразнаўчых навук з'яўлецца адной з фундаментальных тэм (таму і шырока прадстаўленай у навукова-даследчай прасторы), то для фалькларыстыкі гэта новы і мала вывучаны, таму і перспектыўны аспект даследавання фальклорных тэкстаў.

Літаратура

1. Антинескул, О. Л. Тендер как параметр текстообразования: автореферат дне. ... канндидата филологических наук: 10.02.19. / О. Л. Антинескул; Перм. гос. ун-т. – Пермь, 2000. – 19 с.
2. Грибач, С. В. Образ семьи в языковом сознании русских: тендерный аспект: автореферат дис. на соискание ученой степени кандидата филологических наук: 10.02.19 / Грибач С. В.; [Московский государственный лингвистический университет]. – Москва, 2005. – 21 с.
3. Гриценко, Е. С. Язык как средство конструирования тендера: автореферат дис. доктора филологических наук: 10.02.19 / Е. С. Гриценко; Тамб. гос. ун-т им. Г. Р. Державина. – Тамбов, 2005.
4. Кавалёва, Р. М. Тры псіхатыпы залётніка ў беларускіх песнях пра каханне і гендэр / Р. М. Кавалёва // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія Сувязі / пад нав. рэд. Р. М. Кавалёвай, В.В. Прыемка. Мн., 2004. С. 193-207.
5. Калугина, Е. Н. Концепты "мужчина" и "женщина" в субстандарте русского и английского языков: автореферат дис. кандидата филологических наук: 10.02.19 / Е.Н. Калугина; Место защиты: Ставроп. гос. ун-т. – Ставрополь, 2008.
6. Кирилина, А. В. Тендер: лингвистические аспекты / А. В. Кирилина. – М.: Институт социологии РАН, 1999. – 256 с.

7. Коваль, В. И. Язык и текст в аспекте тендерной лингвистики / В. И. Коваль; Министерство образования Республики Беларусь, Учреждение образования "Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины". – Гомель: ГТУ, 2007. – 217 с.

8. Кристева, Ю. А. Бахтин, слово, диалог, роман / Ю. А. Кристева // Вестник МГУ. Сер. 9, Филология. – М.: МГУ, 2000. - С. 95-103.

9. Лук'янава, Т. В. Гендэрная вызначанасць фальклорнага аўтара ў беларускіх легендах / Т. В. Лукъянава // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія Сувязі / пад нав. рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. Мн., 2004. С. 208-214.

10. Мадлевская, Е. И. Героиня-воительница в русских былинах / Е. И. Мадлевская // Язык – тендер – традиция: Материалы международной научной конференции 25-27 апреля 2002 года / под общ.ред. С. Б. Адоньевой. – СПб., 2002. - С. 53-59.

11. Мойсова, О. Б. Тендерные особенности интерпретации художественного текста в сравнительно-сопоставительном аспекте (На материале переводов романа Р. Баха «Чайка Джонатан Ливингстон» на русский и немецкий языки): автореферат дис. ... кандидата филологических наук: 10.02.19 / О. Б. Мойсова; Южный федеральный ун-т. – Ростов-на-Дону, 2009.

12. Охотнйкова, С. В. Тендерные исследования в литературоведении: проблемы тендерной поэтики / С. В. Охотникова // Введение в тендерные исследования. Часть 1. Учебное пособие. / под ред. И. Р. Жеребкиной. – Харьков, Спб., 2001. – С. 529-543.

13. Пушкарева, Н. Л. Женщина в русской семье: традиции и современность / Н. Л. Пушкарева // Семья, тендер, культура: Материалы международных конференций 1994 и 1995 гг. / отв. ред. В. А. Тишков. – Москва, 1997. – С. 187-195.

14. Сокаева, Д. В. Образ женщины-волчицы (ус-бирзегъ) осетинской несказочной прозы в контексте фольклора индоевропейских народов / Д. В. Сокаева // Известия СОИГСИ / под ред. Ф. Х. Гутнов. – Владикавказ, 2007. – Вып. 1 (40). – С. 78-92. 20.Стрельцова, Н. В. Межличностные отношения в языковом сознании русских: тендерный аспект: автореферат дис. кандидата филологических наук: 10.02.19 / Н. В. Стрельцова; Моск. гос. лингвист, ун-т. – Москва, 2005.

15. Таннен, Д. Ты меня не понимаешь. (Почему мужчины и женщины не понимают друг друга) / Д. Таннен. – М.: Вече Персей АСТ», 1996. -398 с.

Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі
і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі

Поступило 18.12.09

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 821.161.3 (091).09:621.039 (476):1:7.01

Чернобыль – Terra incognita литературы

И. Н. Афанасьев

В статье рассматриваются мировоззренческие установки литературы после Чернобыля. Сделан вывод о взаимосвязи художественного опыта с важнейшими тенденциями в развитии гуманитарного знания эпохи катастроф. Моральный и эстетический поиск литературы проанализирован как факт исторической альтернативы.
Ключевые слова: «длинные линии» преемственности, историческая и эстетическая альтернативы в литературе, человек и «надчеловеческое» в литературе катастроф, Чернобыльская катастрофа, метафизика неизвестности.

The article considers the world outlook attitudes of literature after Chernobyl catastrophe. There is made the conclusion of the interrelation of artistic experience with major tendencies in the development of humanitarian knowledge during the catastrophe epoch. The moral and aesthetic development of literature is analyzed as a fact of historical alternative.
Keywords: succession long lines, historical and aesthetic alternatives in literature, human and overhuman in literature of disasters, Chernobyl catastrophe, metaphysics of uncertainty.

Если романная форма в XXI веке может исчерпать себя одной-единственной фразой сноровистого умельца – «Не надо! Я сама», которому почти всерьез зачтется за эпические его труды, снискавшие автору литературную премию [см.: 1, с. 10], то заглавие этой статьи на полном основании следует рассматривать в качестве завершенного и притом фундаментального литературоведческого исследования, двусмысленности в котором куда меньше, чем в эпохальном вскрике безымянной героини из романа-строчки. Terra incognita и есть Terra incognita: неизвестность, непостижимость, тайна. Над чем здесь размышлять? О чем судачить? И преувеличения в этом категоричном утверждении нет. Разве Чернобыль не исполнен мистической тайны, пределы которой объемлют и наши технократические притязания, и наши мировоззренческие потуги?.. Филологические приличия для иного въедливого интерпретатора тоже соблюдены. Литературный первоисточник буквально взывает к исследовательскому благоразумию, как знаменитое эссе В. Козько «Terra incognita. Зона»: склонить голову, преклонить колени перед тайной. И тем не менее…

«Судьба искусства, судьба современного мира – одно», – утверждал В. Вейдле [2, с. 120]. Упокоиться в точке, низвести всю протяженность земного бытия к словесному плевку – удел незавидный и вряд ли кем-то взлелеянный всерьез. Однако парадоксальным образом именно он может стать точкой отправной, заявив в мире-перевертыше ту меру вещей, в которой человек перестает быть ее законодателем и абсолютом, возвращая нас к другому мудрому предостережению В. Вейдле: «Искусство, которым вполне владеет человек, которое не имеет от него тайн и не отражает ничего, кроме его вкуса и рассудка, такое искусство как раз и есть искусство без человека, искусство, не умеющее ни выразить его, ни даже изобразить» [2, с. 117]. Чернобыль, посрамив человеческую цивилизацию, жестоко доказал чудовищную возможность мира **без** человека – причем именно мира, человеком замысленного, сотворенного. Надчеловеческая реальность катастрофы вполне смогла обходиться без него. Неравенство человека Событию, его интеллектуальное, технологическое и моральное бессилие устраняли то основание меры в искусстве, которое искушало творца со времен классического целеполагания античности, где человек «был “мерой всех вещей”» [2, с. 117]. Для В. Вейдле этот соблазн неотделим от голой целесообразности искусства, которое низводится до средства удовлетворения эстетических, религиозных, моральных и прочих потребностей человека, установленных рассудком и презревших, говоря словами В. Вейдле, «соборность художественного служения» [2, с. 116]: «Все только человеческое – ниже человека. В том искусстве нет и человека, где хочет быть только человек» [2, с. 118].

Превратив мир в чернобыльскую зону и оказавшись за ее пределами, засвидетельствовав неразгаданную тайну происшествия-бытия, человек трагически приблизился к тому «надчеловеческому», «сверхприродному» и «сверхличному», в котором и должно быть укоренено его существо, чтобы гарантировать цельность художественного опыта и познания, способных обратить человека к высшему и в том устремлении выразить его больше, нежели в обращении к самому себе. Сознание собственной неполноты может быть спасительным, целебным, может стать предпосылкой той общей, всеобъемлющей цельности, что казалась навсегда утраченной в меркантильных предпочтениях «железного» ли, «силиконового» века. В эссеистике и прозе В. Козько – одного из самых чутких и глубоких толкователей чернобыльского откровения – бегство от целесообразности ищет этой неполноты, а писательские память и фантазия придают метафизике отсутствия приземленную форму, понятную утилитарному миру, принимающую его язык, чтобы преодолеть гнетущую целесообразность на новом уровне обретаемой цельности: «Я застаюся там, у дваццатым стагоддзі. І гэта не прыхамасць і не гульня, ці брахня словам. Я ёсць і крыху яшчэ застаюся, таму што ў мяне было гэтае дваццатае стагоддзе. А ў ім маё дзяцінства. І я цалкам там, дзе быў яшчэ не падменены і не надкусаны. І гэта не бяды, што там не было цукру. Няхай лепш яго і не будзе, але буду я.

І ніхто не забароніць піць пустую гарбату. Ніхто мяне не будзе вучыць, як трэба правільна сыпаць цукар, не будзе павучаць, чаго нельга рабіць супраць ветру. Буду рабіць тое, чаго просіць, чаго прагне душа.

Яе ўжо ніхто не выправіць. Ніхто нічога не здолее забараніць.

Я ўжо не тут і не з вамі» [3, с. 198].

В. Козько – с Беларусью, для которой XX век стал главным историческим перепутьем, где друг против друга восставали разные следствия общих причин. Об этом уже доводилось говорить и писать: в веке XX-м именно Чернобыль явил миру Беларусь. О белорусах узнали, о них заговорили, их открыли для себя. Однако в нацию с исторической судьбой белорусов «рукоположило» событие, которое причиной их исторического бытия никак быть не могло. Сейчас миру предложены иные слагаемые знания о нас. Момент национально-исторической идентичности по преимуществу совпадает с политической злобой дня и, к сожалению, в сознании европейских соседей уже не связан с перспективами белорусской экзистенции как таковой. Однако она до сей поры проблематична, не поддается соображениям целесообразности и, скорее, ищет оправдания в тех, кто готов себя пожертвовать универсуму зоны, умиряющему крайности и в лоне целого допускающему противоположность смыслов. «Зона сёння – гэта пратэст і выклік тэхнагенным цывілізацыям. Гэта даведзеная да абсурду бессэнсоўнасць рэальнасці нашага спажывецкага быцця, пазбаўленага духоўнасці, культуры і, падобна, інтэлекту, – читаем в эссе В. Козько «Terra incognita. Зона». – Выкрышталізаваная ў гэтай рэальнасці абсурду фантасмагорыя ў д'ябальскім спалучэнні сэнсу і поўнай бессэнсоўнасці, бесталачы нашай зямной жыткі, непасцігальная і не заўсёды відавочная, нібыта загадкавая ўсмешка, што блукае на вуснах той жа Моны Лізы, немаўляці, а мо яшчэ і нават эмбрыёна, зародка жыцця, якое знаходзіцца ні то ў далёкім мінулым, ні то ў бязмежным будучым» [3, с. 237].

Формы этого жертвоприношения могут быть разными. Весь вопрос в том, каким видится условие задачи. Для С. Залыгина (не только замечательного русского писателя, главного редактора журнала «Новый мир», но и ученого-эколога) и А. Адамовича решающей на исходе XX века представлялась перемена, что произошла с главным уравнением человеческого бытия: на смену двум извечным и, казалось бы, исчерпывающим вопросам («Что такое хорошо?» и «Что такое плохо?») пришел третий: «Что такое НИЧЕГО?». Мир, обнесенный колючей проволокой тридцатикилометровой зоны, вместил и его. И возвращение В. Козько в XX век, размежевавший нашу судьбу чернобыльскими пределами, – тоже из разряда такого жертвоприношения, попытка уберечь других от предназначенного жертвенника. В. Козько угадывает зримые, воплощенные черты третьего уравнения в самой реальности, самодовлеющей настолько, что ее неподвластность первым двум почти не удивляет: «…там, за калючым дротам, сёння нараджаецца і штосьці невядомае нам, новае. Добрае, злое? Каб гэта

ведаць наперад» [3, с. 237]. Рыбак на Припяти, под самым корпусом четвертого энергоблока забрасывающий сеть в атомные воды, – не апостол ли Петр? Или это всего-навсего предприимчивые «мужички-полешучки», нашедшие в чернобыльском пекле убежище от бдительного рыбнадзора? На эти вопросы у писателя нет ответов. Оба допущения – фантастическое и житейское – одинаково верны и не потерпят подробностей в мотивировках. Всей своей невидалью на человека надвигается то, что для В. Вейдле когда-то и определяло «соборность служения», истолкованного в его разнообразных проявлениях, которые неизменны именно в том, что сохраняет человека в «нерасщепленном единстве его личности» [2, с. 142], понуждая литературу, искусство бежать в провинцию, к земле, к «первобытным заботам и страстям» [2, с. 143], возвращающим «утраченную плоть … искусства». «Возвращение к земле, как и возвращение к детству, есть искание чудесного, – утверждал В. Вейдле, – жажда мифического мира, познаваемого, как реальность, а не выдумываемого, как произвольная и пустая функция» [2, с. 143]. В прозе В. Козько этот путь проложил зубр Сноудала из романа «Хроника детдомовского сада», в котором, пожалуй, впервые в творчестве писателя рай детства соединился с тем, что В. Вейдле назвал «потерянным раем первобытности» и противопоставил ему умирание искусства, которое сам же и возвестил. «Потерянный рай первобытности – как и детства – вовсе не розов, не идилличен, – предостерегал от поспешного умиления В. Вейдле, – в нем есть и зло, и страх, и боль; он рай лишь в сравнении с адом практической и разумной бездуховности. Если все неудержимей к нему тянется, его взыскует современный человек, то не потому, что ждет от него забав и перемен, а потому, что видит просвечивающую в нем, в мире современном сокрытую, правду и свободу» [2, с. 144 – 145].

Мировоззренческая, интеллектуальная, технологическая неприступность Чернобыля давно уже притча во языцех. Увы, духовная почва, вспаханная и засеянная им, – факт не столь очевидный. Однако именно здесь пресловутая «точка невозврата» в истории парадоксально совпадает с «точкой возврата» искусства, литературы, духа.

Говоря о перестройке литературного процесса в переходную эпоху, теоретики литературы всё настойчивее заявляют о неполноте всех традиционных подходов, которые структурировали ее прежде (литературный процесс как сумма идейных течений и методов, как судьба жанра, как творчество отдельных писателей), если исключена «невидимая часть айсберга, которая держит на поверхности видимую и определяет движение целого»: духовное состояние общества [4, с. 53]. «Зона» в творчестве В. Козько в обнаженно-рельефном виде предъявляет эту скрытую, но определяющую сторону бытия, которая по определению оказывается теневой. Она и пробуждается ночью: «партизанами»-самоселами, бомжами и мародерами, любителями экстремального туризма и секса, лесными Божьими тварями, которые, как лось и лосиха в эссе писателя, разделены колючей проволокой человеческого безрассудства и в неутоленной страсти продолжения рода бросаются на нее, чтобы погибнуть и в этом чудовищном, самоубийственном исходе предвосхитить все беды, что еще обрушатся на человека, кому суждено пережить трагедию распавшегося Отечества.

Создав свою версию печально знаменитой истории о пагубных последствиях договора с дьяволом, автор романа-фантасмагории «Искушение» раскрыл глубинную сущность зла, его особенности и основные проявления в современном обществе. Главный персонаж, художник и писатель Антон Климович, поддался искушению темной потусторонней силы и едва не погубил себя. Различные этапы внутренних блужданий героя, его движения в сторону прозрения и обретения мудрости отражены в заголовках каждой из частей произведения. Антон Климович заключает деловой договор с дьяволом («Заказ»), подвергается соблазну стать одним из первых подданных в его инфернальном мире («Искушение») и, наконец, осознав иллюзорность благ, предлагаемых властителем этого мира, находит в себе силы вырваться из дьявольских сетей.

В рассказе-притче А. Козлова «Верасава вечнасць» в сопротивлении героя искушающей силе проступают черты отраженных в мифах и связанных с древними мистериальными практиками архаических верований. Эти же черты характеризуют художественные миры романа-мистерии Т. Бондарь и повести А. Боровского «Пякельны Рай», в которых состояние «посвящения» и сокровенное знание герои обретают в немалой мере и посредством «борьбы духа».

Зло в мистической прозе А. Боровского, Т. Бондарь и А. Козлова многолико. Изменчивость – одна из особенностей Искусительницы (Спакусніцы). В ее образе автором рассказа-притчи «Верасава вечнасць» выражены архетипические черты древней ведьмы и женщины-воительницы. Персонаж произведения, юный Верас, типологически близкок героям солярных мифов и предстает как воплощение силы и мужества. Сверхъестественная витальность проходящего через испытания героя утверждается в его сопротивлении разноликой Искусительнице, в образе которой персонифицируется древнее мистическое зло. Мотив искушения образует смысловое ядро идейного мира рассказа-притчи, включающего наиболее устойчивые компоненты представлений, связанных с архаическим ритуальным таинством инициации, с идеей духовно-нравственного испытания человека в экстремальной ситуации с его последующим внутренним «перерождением». Черты солярно-мифологической героики просматриваются также в образе главного персонажа мистической повести «Дети ночи» Вилена, который, преодолевая «черного монстра» своей души в ситуации испытания, одерживает победу над служителями культа дьявола, «детьми Властелина ночи» [4]. Способность принимать необходимый для достижения своих целей облик – специфическая черта демонов в романе-мистерии Т. Бондарь «Павуцінне». Служитель инфернального воинства предстает в нем как двойник одного из персонажей, властелин темной, животной части его натуры. В отношении потерявшего нравственную опору в жизни кинооператора Дана и одного из посланцев ада «эксплицируется внутренний раскол и надлом человека», связанный с «фаустовской тематикой в мировой культуре» [3]. В романе-фантасмагории «Искушение» в образе Анатаса (Сатаны) акцентированы такие черты, как способность к бесконечным перевоплощениям и сокрытие своей подлинной сущности. Основной метод воздействия дьявола на человека – ложь, обольщение. Выступая под именем, образованным по принципу обратного чтения, Анатас (Сатана) скрывает свою подлинную природу. «Искуситель – тот, который испытывает кого-либо, прельщает, обманывает. В Евангелии под этим именем разумеется дьявол» [5, с. 83].

Одна из основных нравственных идей произведения А. Боровского заключается в том, что без веры в Бога, нарушая Его заветы и заповеди, человек в своей самонадеянности оказывается совершенно беззащитным перед демонической прелестью, перед ее искушающим воздействием. Эта идея выражена и во внесюжетных фрагментах текста романа-фантасмагории, представляющих собой вставные новеллы-притчи на библейские темы. Заключающийся в них глубокий нравственно-религиозный смысл проецируется на все, что происходит с Антоном Климовичем.

Мотив искушения является сюжетообразующим в эпизоде на тему грехопадения первых людей. Автор вставной новеллы-притчи стремится проникнуть в потаенные глубины зла, показав ложь как его главное проявление. В художественном сознании Змей-искуситель олицетворяет злую волю и «Мудрость». Он характеризуется как «самый хитрый и коварный» из всех зверей, созданных по замыслу Божьему, который «злое замыслил», а когда совершил грех, то лишь возрадовался, ощутив себя победителем: «И у Змея не было страха – он был готов ко всему, даже к худшему. Его не волновала смерть, радовало, что он оказался хитрее человека, созданного Творцом…» [6, с. 252]. Автор показывает расхождение между словом Змея, обращенным к Еве, и его намерениями по отношению к ней. Склоняя женщину нарушить запрет Творца, искуситель сулит ей невиданные блага: «Понравилась ты мне – вот и захотелось помочь тебе стать богиней. И все. Ты должна быть усовершенствованной и мудрой, чтобы у тебя всего было в достатке. И ты будешь сильной и ни в чем не будешь иметь нужды и недостатка, ты станешь сверхчеловеком…» [6, с. 245]. Мотив искушения присутствует во вставной новелле-притче о Марии Магдалине. Выраженное в ней видение

истории преображения грешницы, ставшей последовательницей Христа, – это одно из проявлений стремления Антона Климовича понять сокровенный смысл происходящего с ним самим после того, когда он оказался в плену у Сатаны.

С мотивом искушения связан и образ Марии Магдалины в романе-мистерии Т. Бондарь «Павуцінне», созданном в соответствии с композиционным принципом текста в тексте. В художественном мире произведения этот образ, занимающий одно из центральных мест, предстает как воплощение авторского идеала самоотверженной женщины, которая преодолела природную слабость и ради утверждения евангельской истины поднялась на высшую ступень духовного подвижничества. В авторской концепции Мария Магдалина – «посвященная» в мистерию невидимого противоборства сил добра и зла. События времен Христа осмысляются под мистическим углом зрения. В структуре произведения Мария Магдалина – это психологический двойник героини из мира современного Ангелины, пишущей о принявшей Господа блуднице роман «Страсти по Марии». Ангелина неоднократно представляет себя одной из тех многочисленных жертв, которые попали в паутинный плен. Вырваться из него нелегко, поскольку каждой своей нитью паутина коренится в животной природе человека, в его страстях и плотских желаниях. Выход из состояния несвободы – в «борьбе духа», в постоянном сопротивлении искушениям, в изживании в себе всего низменного и греховного. Для Ангелины, проходящей мученическим путем своей героини, переживающей ее боль и внутреннее перерождение, Мария – образец сильной духом женщины, которая в борьбе с «демонами блуда», со страхом и сомнениями, смогла обрести состояние внутренней свободы.

Мотив искушения является одной из главных сюжетных частей в романе-мистерии Т. Бондарь «Павуцінне». Он имеет сюжетообразующее значение в романе-фантасмагории А. Боровского и в рассказе-притче А. Козлова «Верасава вечнасць». Этот мотив концентрирует основные нравственные и психологически значимые смыслы, составляющие принадлежность таких сторон содержания произведений, как тема зла, идея внутреннего усилия человека в борьбе с влияниями, препятствующими его совершенствованию и служению добру. Антидуховные силы в художественном мире романа-фантасмагории А. Боровского «Искушение», романа-мистерии Т. Бондарь «Павуцінне» и рассказа-притчи А. Козлова «Верасава вечнасць» предстают как различные персонифицированные проявления мистического зла.

Литература

1. Бондар, Т. Павуцінне: Раман-містэрыя / Т. Бондар. – Мінск: Маст. літ., 2004. – 223 с.

2. Андреев, Д. Роза мира / Д. Андреев. – М.: Эксмо, 2006. – 800 с.

3. Сандулов, Ю. Дьявол. Исторический и культурный феномен / Ю. Сандулов. – СПб.:: Лань, 1997. – 192 с.

4. Казлоў, А.С. Горад у нябёсах: аповесці, апавяданні / А. Казлоў. – Мінск: Литература и Искусство, 2009. – 224 с.

5. Протоиерей Свирелин, А. Церковно-славянский словарь для толкового чтения св. Евангелия, Часослова, Псалтири, Октоиха (учебных) и других богослужебных книг / протоиерей А. Свирелин. – Нижний Новгород: Издательство «Христианская библиотека», 2008. – 272 с.

6. Боровский, А. Искушение: роман-фантасмагория / А. Боровский. – Минск: Асобны, 2007. – 304 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 09.12.09

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 821.161.3.09:1 “19”

Мудрая самаахвярнасць зерня

В. К. Шынкарэнка

У дадзеным артыкуле зроблены акцэнт на матывах памяці, вернасці родным вытокам у творчасці Б. Сачанкі. Акрамя таго, разглядаюцца асаблівасці іх вобразнага ўвасаблення, стылёвай рэалізацыі ў мастацкай прозе і публіцыстыцы аўтара.
Ключавыя словы: паэтызацыя, самабытнасць аўтарскага “я”, адметнасць зместу, вобразная сістэма, мастацкі ўзор, матыў памяці, ідэя першапачатковага разумнага светаўпарадкавання, абагулены вобраз, культурна-гістарычны локус, анталагічныя і аксіялагічныя арыенціры.

This article emphasizes the memory motifs, dedication to the native roots in B. Sachenko’s creative work. Besides, it discusses the features of their figurative embodiment, the style implementation in prose and journalism of the author.
Keywords: poetization, identity of author’s “I”, content features, image system, artistic example, memory motif, idea of initial reasonable world order, generalized image, cultural and historical locus, ontological and axiological guidelines.

Штодзённа быццё ўсяго чалавецтва нястомна папаўняецца тым значным і драбніцамі, што перажываюцца кожным з людзей. Найбольш жа істотна яго ўзбагачаюць і тым самым шмат у чым абумоўліваюць далейшы кірунак развіцця лёсы выключна яркіх асоб, іх мастацкія наробкі, у якіх арганічна пераўвасабляецца біяграфічнае, звязанае з уражаннямі маленства і юнацтва, рэгіянальным каларытам найдаражэйшых за іншыя і самыя прыгожыя куткі зямлі родных мясцін, а таксама ўласцівае ўсёй нацыі і наогул чалавецтву. Зразумела, гэта адбываецца толькі ў тым выпадку, “калі ён, – кажучы словамі Дзм. Бугаёва, – творца, адкрывальнік новых шляхоў” [1, с. 3]. І пазней адданасць жыццёвым вытокам, родным мясцінам, незабыўныя ўспаміны пра іх і багатых душой насельнікаў, бездакорнае веданне і ўвага да даўніны, абрадаў і рэалій побыту народа, арганічная повязь са сваімі каранямі працягваюць забяспечваць самабытнасць аўтарскага “Я”, адметнасць зместу, вобразнай сістэмы і стылю напісанага ім, выступаюць тым вечным агнём, “з якога нараджаецца творчасць” [2, с. 504].

Як глыбока адчутае і вынашанае праз наканаванае лёсам успрымаецца наступнае перакананне палешука Івана Паўлавіча Мележа (1921 – 1976): “Зямля гэтая дарагая майму сэрцу, як ніякая іншая. …Я хачу, каб чытачы маіх кніг таксама палюбілі гэтую зямлю і яе людзей або па крайняй меры – хаця б ведалі пра іх” [3, с. 309]. Пісьменнік – увесь ад гэтай зямлі, ад свайго народа. Нават назвы паселішчаў у родных мясцінах для яго нібы “жывыя істоты, таварышы маладосці…” [4, с. 177]. Якраз па гэтай прычыне лепш за І. Мележа пра Палессе і палешукоў ніхто не здолеў сказаць. “Ёсць у кожнага свой мілы сэрцу куток, які з бегам гадоў не толькі не цьмее ў памяці, а становіцца як бы яснейшы, даражэйшы. Багата можа быць у чалавека за жыццё іншых куткоў, і больш слаўных, і больш выдатных. Але гэты куток, і не слаўны, і не выдатны, можа, нічым, не забываецца, не адступае ўдалеч; сярод іншых дарагіх, хвалюючых успамінаў – ён самы дарагі, самы шчымлівы! Куток гэты – тая хата, дзе мы вучыліся хадзіць, дзе чулі цеплыню матчыных рук і матчынага сэрца, куток нашага маленства” [4, с. 177].

Вядомаму эпіку ўдалося скласці непаўторную сагу пра Палессе, апаэтызаваць раней вялікі балотны край з непраходнымі зараснікамі, векавымі лясамі, апець хараство прыроднага свету, дзе пануе “радасць вясновай травы і дрэў” [2, с. 504 – 505], незвычайная музыка жаўранкаў: “быццам неба спявае…” [2, с. 505], напісаць найлепшыя творы пра родную зямлю і землякоў, увесь беларускі народ. Праўдзівасць прамоўленага І. Мележам, які ніколькі не сумняваўся ў тым, што “…ў літаратуры ўсё робіцца любоўю” [5, с. 228], узмацняюць выключнасць таленту, захапленне і боль-клопат за чалавека, Айчыну. А пачыналася ўсё з невялі-

кай палескай вёскі Глінішчы, што, – як пісаў Іван Паўлавіч у аўтабіяграфічным артыкуле “Калі гартаеш старонкі…”, – “прыляпілася двума радамі хат на самым беразе нешырокай, але доўгай паласы трывалай зямлі, што цягнецца між бяскрайніх балот ад Хойнік да Юравіч, вялікага сяла каля Прыпяці. Глінішчы — цераз кіламетр ад шляху. Я помню за вёскай цудоўныя гаі і дубровы, бор удалечыні” [6, с. 157].

Барыс Іванавіч Сачанка (1936 – 1996), яшчэ адзін ураджэнец Хойніцкага раёна, вуснамі свайго героя Івана Гарапашкі пра асабліва дарагія сэрцу мясціны гаворыць з не меншай любоўю і захапленнем. “На Палессі, на самым поўдні Беларусі, ёсць куточак зямлі, асабліва мілы, дарагі майму сэрцу. Дзе б ні быў я, куды б ні закінула мяне доля, не-не дый згадаю яго. У радасці і ў журбе, з блізкіх і далёкіх дарог я вяртаюся зноў і зноў туды, дзе сярод старых, пракаветных лясоў і вялізных, неабсяжных балот на пясчанай выспе раскінулася вёска, у якой я нарадзіўся…” [7, с. 5]. Шмат давялося пабачыць за свой век вёсцы пісьменніка, неаднаразова яе знішчалі пажары, але дзякуючы клопатам і намаганням адданых жыхароў яна заўжды вярталася да жыцця. Здольнасць вёскі да аднаўлення падкрэсліваецца Б. Сачанкам: “У вёскі добрая, жывая памяць! Вёска заўсёды ўсё ведае, усё помніць. Ад яе нічога нідзе не схаваеш, бо яна мае ўсюды свае вочы, вушы. Вёска помніць, хто калі нарадзіўся, хто калі хрысціўся, хто куды ездзіў, хто з чым і адкуль вярнуўся” [7, с. 9]. Празаік згадвае звесткі, звязаныя з заснаваннем вёскі беглымі запарожцамі на неабжытым тады Палессі, дзе раскінуліся на сотні кіламетраў “няходжаны лес, непралазныя балоты” [7, с. 12], з якімі ў месцічаў было звязана шмат страхаў і прымхаў. Творца не абмінае ўвагай канкрэтныя гістарычныя падзеі, перажытыя вёскай у мінулым, часы паншчыны, апошнюю вайну, калі няскораны Вялікі Бор (у рамане “Чужое неба” – Бароўка) быў спалены да апошняй хаты, а сям’я Сачанкаў разам з іншымі аднавяскоўцамі напоўніцу зведала нягоды вайны, горкі палон Нямеччыны. Такія экскурсы ў мінулае істотна паглыбляюць вызначальны для ўсёй творчасці пісьменніка матыў памяці. Б. Сачанка ніколі не сумняваўся: “У кожнага пакалення сваё жыццё, свая памяць. І менш за ўсё трэба каго б там ні было папракаць, наракаць то на тое, то на гэтае, трэба кожнаму помніць сваё. Калі кожны будзе помніць сваё, усе разам будуць помніць усё…” [7, с. 21].

Яшчэ ў напісаных на пачатку творчай дарогі “Барвах ранняй восені” малады Б. Сачанка з упэўненасцю заяўляў, “што чалавек – не той грыб узбоч дарогі: яго не так лёгка выбіць з роднага гнязда і растаптаць…” [8, с. 22]. Калі мець на ўвазе самога пісьменніка, то ён ніколі не забываўся пра сваё – вёску, землякоў, балоты, лес з яго соснамі і хвойнікам, грыбнымі мясцінамі і ягаднікам, неба. У адным з “Вершаў з самаробнага сшытачка”, што разам з іншымі рэтраспекцыямі, шматлікімі адступленнямі ўзбагачае структуру рамана ў навелах “Чужое неба”, асаблівую ўвагу выклікаюць наступныя радкі: “*Ні аб чым не прашу. Мне/ Нічога,/ нічога не трэба./ Борам палескім толькі б прайсці,/ Толькі б пабачыць роднае неба*” [7, с. 169]. Відавочна, што гэтыя радкі не толькі перадаюць непазбыўную тугу, вострую настальгічную гаму перажыванняў вязня Адася, але і арганічна тоесныя адчуванням самога пісьменніка, гатовага аднолькава бясконца любавацца бязмежным нябесным блакітам, асобнай расінкай, “што звісае з лістка і ў якой / пераліваецца сонца” [7, с. 166]. Як і яго славуты зямляк, што здолеў у “Палескай хроніцы” звязаць у адно “фарбы, гукі, лёс людзей” і па чыім перакананні “чалавек, вакол якога не жыве прырода, … бачыцца нейкім жабраком, непрыкаяным” [9, с. 330], Б. Сачанка надзвычай уважліва ставіцца да ўсіх без выключэння праяў і насельнікаў расліннага, птушынага і жывёльнага царстваў. Алегарычныя творы з цыкла “Апавяданні жывое прыроды”, псіхалагічныя “Сад”, “Дзік-бадзяга”, “Ваўчыца з Чортавай Ямы” – адны з самых лепшых твораў празаіка на гэтую тэму.

Сярод таго бясконцага мноства з’яў свету, што нязменна цікавілі пісьменніка з часоў дзяцінства, сам ён асабліва вылучаў зерне і вочы (апавяданні “Вочы”, “Зерне і млын”, навелістычны “Вечны кругазварот”). Першае здзіўляла далучэннем да вечнасці, здольнасцю гінуць і праз смерць нараджаць новыя зярняты, а таксама відавочнай аналогіяй з чалавечым лёсам і часам цяжка вытлумачальнай прысутнасцю ў ім заканамернага і выпадковага. “А мы, людзі, хіба ж не тыя самыя зярняты, хіба мы вольныя, выбіраем, куды каму ўпасці – у цёплую пульхную раллю, каб набрацца сіл, прарасці, узгадаваць жменю, прыгаршчы новых зярнят, ці ўпасці на цвёрдыя, бязлітасныя камяні млына і быць расцёртымі, змолатымі на му-

ку?..” [10, с. 470]. Вочы ж прыцягвалі асобу творцы здольнасцю гаварыць без слоў, выразна перадаваць як шквал нястрымных пачуццяў, так і таемныя сховы, імгненныя і часам няўлоўныя зрухі душ родных людзей і незнаёмцаў, усіх жывых істот.

Увогуле, у кожным з атрыбутаў акаляючага свету Б. Сачанка бачыць вышэйшую мэтазгоднасць, нябесны промысел. Яго гераіня Адарка з апавядання “Навальніца” не без асуджэння ў бок асабліва “гаспадарлівых” кідае: “Бог падумаў, добранька падумаў пра ўсё. І каб рэчачка была, і каб поле было, і каб лясок быў… І пра балота таксама падумаў… Трэба яно – няхай будзе… Дык бачыш – поля захацелася, усю б зямлю жытам засеяць, бульбаю засадзіць. А жабе той, буслу, кнігаўцы дзе падзецца?” [11, с. 15].

Па сутнасці, прама ці ўскосна да ідэі першапачатковага разумнага светаўпарадкавання пісьменнік звяртаецца амаль ва ўсіх сваіх творах, хоць яны і адрозныя па жанравай спецыфіцы, часта маюць выразна аўтарскае вызначэнне іх зместава-фармальных асаблівасцей. Варта ўзгадаць празаічны рэквіем “Апошнія і першыя”, раманныя навелістычныя вузлы памяці “Чужое неба”, эпічна разгорнуты “Вялікі лес”, лірычную “Мальвіну”, аповесць-быль “Загадка аднаго падполля”, быль з часоў апошняй вайны “Ехала – упала”, палескую быль “Ваўчыца з Чортавай Ямы”, драматычную “Ноч няволі”, гістарычную “Англіцкую сталь”, “Дыярыуш Мацея Беланавіча”, творы вострай экалагічнай скіраванасці “Родны кут” і “Еўка”, фантастычныя “Тыя”, сціслыя “Мурашкі”, зварот да элементаў апавядальных споведзі, эпізодаў, аўтабіяграфіі, запісаў, сноў, нарысаў і іншых сінтэтычных формаў.

У празаічнай спадчыне Б. Сачанкі адметнае месца займае “Твор, які не магу скончыць”. Вобраз шляхетнага каліноўца і фалькларыста Гаўрылы Несмяловіча павінен быў стаць своеасаблівым увасабленнем павагі палешукоў да такіх даследчыкаў краю і збіральнікаў вуснай народнай творчасці, як Пяткевіч, Сербаў, Сержпутоўскі, Раманаў, Федароўскі, Шэйн і іншыя. Апавядальніку здаецца, што той духоўны агонь, які вылучае яго героя, “тое святло, што струменіць з яго”, падае і на яго, “асвятляе, сагравае, цешыць” [12, с. 232]. І забіць, ніколі больш не размаўляць, назаўжды развітацца з такім чалавекам уяўляецца пісьменніку сапраўдным рабаўніцтвам. Менавіта па гэтай прычыне застаўся незавершаным яго твор.

Даўняя мара пісьменніка –“паглядзець на ўсё Палессе адразу”, “з самай сярэдзіны” [13, с. 142] – увасобілася ў старонках з яго дарожнага дзённіка “Зямля маіх продкаў”, што распачалі з’яўленне такіх наступных вядомых кніг-візітовак пра Беларусь, як “Зямля пад белымі крыламі” У. Караткевіча, “Зялёны лісток на планеце Зямля” Я. Сіпакова і іншых аналагічных выданняў публіцыстычнага характару. Зразумела, што ажыўлены ў тэксце культурна-гістарычны локус утрымлівае адпаведныя савецкай рэчаіснасці характарыстыкі. Але адзначаныя моманты істотна не псуюць прыемнае ўражанне ад твора і ўспрымаюцца толькі ўстойлівымі атрыбутамі той эпохі і літаратуры. Тым больш, што мэта, якую ставіў перад сабой Б. Сачанка перад пачаткам рачнога падарожжа па Палессі, не абмяжоўвалася механічнай фіксацыяй убачанага і пачутага: “Было і яшчэ адно жаданне, таемнае, вельмі асабістае: мне чамусьці здавалася, што ўсё тое, што я ўбачу, пачую, паможа мне глыбей зразумець самога сябе, зразумець тыя змены, што за апошнія гады адбыліся ў жыцці маёй роднай вёскі Вялікі Бор, у жыцці кожнага калгаса, горада, чалавека і ўсёй краіны наогул” [13, с. 143]. Часта інфармацыйная насычанасць матэрыялу суседнічае з адкрытым і публіцыстычна пададзеным выяўленнем пазіцыі грунтоўна абазнанага ў пытаннях экалогіі аўтара. У гэтым пераконвае яго горкае прадчуванне той непапраўнай бяды, да якой прывядзе бяздумнае асушэнне балот і такое ж бесклапотнае знішчэнне векавых дуброў, гаёў, пушчаў. У асобных месцах апавядальная плынь твора годна аздабляецца ўсхваляванымі лірычнымі інтанацыямі. Асабліва пры ўслаўленні падарожжаў, ваенных і працоўных подзвігаў землякоў, дасканаласці ліній помнікаў архітэктуры, перадачы хараства пейзажных малюнкаў, многія з якіх для сучаснікаў ужо недасяжныя, незваротна страчаныя, ці асобных з’яў не заўжды ласкавай для тутэйшых людзей прыроды: “Ці не таму так часта і звяртаўся паляшук у сваіх песнях-жальбах да прыроды, прасіў быць літасцівым да яго, прасіў “не замачыць, не высушыць” поля, не спаліць хаты… Ці не таму ў казках яго, у загадках, у прымаўках – усё жывое, усё думае, гаворыць, спрыяе чалавеку ці замінае яму – луг, поле, дрэвы, кусты, кожная былінка, кожная травінка” [13, с. 221].

У адметным па будове апавядальным цыкле “Вечны кругазварот” Б. Сачанка зноў уздымае пытанні сэнсу жыцця, прызначэння зярняці, важнасці каранёў як для дрэва, так і чалавека, чалавецтва наогул. Філасофія быцця беларуса, упэўнены пісьменнік, нічым асабліва не адрозні-

ваецца ад анталагічных і аксіялагічных арыенціраў прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. Мудрасць у тым, каб быць, дбаць пра надзённае і памятаць пра вечнае, нараджаць і паміраць. Слушнасць такога сцверджання Б. Сачанка даводзіць, напрыклад, праз зварот да радзіннахрэсьбіннай паэзіі і абраднасці. Пісьменнік дакладна перадае адметнасці працоўнага календара, будні і святы, асаблівасці матэрыяльнай культуры беларусаў. Ён нікольки не сумняваецца ў наступным: "Фантазія і душа народа – у песнях, казках, іншых відах творчасці, у рамёствах, ядзе, выхаванні дзяцей, святах… Яна і ў адзенні" [14, с. 324]. І, зразумела ж, у святах, сродках і спосабах лекавання, чарах, народных песнях і творах, народжаных фантазіяй продкаў.

Усё пералічанае ўлюбёным у сваю зямлю аўтарам – крупінкі вечнага кругазвароту, зярняты, што рыхтуюць сабой новыя ўсходы і тым самым сцвярджаюць, што "жыццё не спыняецца, прадаўжаецца" [14, с. 351]. Несумненна, што ўсё лепшае з напісанага Б. Сачанкам праз загадкавую магію слова шмат у чым дадало моцы, істотна ўзбагаціла і яшчэ будзе ўзбагачаць, усяляк спрыяць бясконцаму, нястомна стваральнаму руху колу быцця.

Літаратура

1. Бугаёў, Дз. Вернасць прызванню [Тэкст] / Дз. Бугаёў. – Мн.: Маст. літ., 1977. – 240 с.

2. Мележ, Іван. Жыццё, якое я зведаў [Тэкст] / Іван Мележ / Збор твораў: У 10-ці т. / Т. 8. Жыццёвыя клопаты: Артыкулы, эсэ, інтэрв'ю. – Мн.: Маст. літ., 1983. – 686 с. – С. 503 – 506.

3. Мележ, Іван. Да чытачоў рамана [Тэкст] / Іван Мележ / Збор твораў: У 10-ці т. / Т. 8. Жыццёвыя клопаты: Артыкулы, эсэ, інтэрв'ю. – С. 308 – 310.

4. Мележ, Іван. Трохі згадак і думак [Тэкст] / Іван Мележ / Збор твораў: У 10-ці т. / Т. 8. Жыццёвыя клопаты: Артыкулы, эсэ, інтэрв'ю. – С. 177 – 188.

5. Мележ, Іван. В. Жыдліцкаму [Тэкст] / Іван Мележ / Збор твораў у 10-ці т. / Т. 10. Эпісталярная спадчына (1945 – 1976); Летапіс жыцця і творчасці. – Мн.: Маст. літ., 1985. – 496 с. – С. 227 – 228.

6. Мележ, Іван. Калі гартаеш старонкі… [Тэкст] / Іван Мележ / Збор твораў: У 10-ці т. / Т. 8. Жыццёвыя клопаты: Артыкулы, эсэ, інтэрв'ю. – С. 155 – 158.

7. Сачанка, Б. Чужое неба [Тэкст] / Б. Сачанка / Памяць: Аповесці, апавяданні. – Мн.: Маст. літ., 1973. – 304 с. – С. 5 – 194.

8. Сачанка, Б. Барвы ранняй восені [Тэкст] / Б. Сачанка / Барвы ранняй восені: Апавяданні, аповесці. – Мн.: Дзярж. выд-ва БССР; Рэдакцыя маст. літ., 1962. – 326 с. – С. 18 – 22.

9. Мележ, Іван. Майстэрства – гэта імкненне. *Некалькі заўваг аб простых ісцінах* [Тэкст] / Іван Мележ / Збор твораў: У 10-ці т. / Т. 8. Жыццёвыя клопаты: Артыкулы, эсэ, інтэрв'ю. – С. 324 – 333.

10. Сачанка, Б. Зерне і млын [Тэкст] / Б. Сачанка / Выбраныя творы: У 3 т. Т. 2. Вялікі лес: Раман у 3 кн. Кн. 3. Апавяданні. – Мн.: Маст. літ., 1994. – 542 с. – С. 451 – 470.

11. Сачанка, Б. Навальніца [Тэкст] / Б. Сачанка / Ваўчыца з Чортавай Ямы: Аповесці, апавяданні. – Мн.: Маст. літ., 1978. – 240 с.

12. Сачанка, Б. Твор, які не магу скончыць [Тэкст] / Б. Сачанка / Горкая радасць вяртання: Аповесці, апавяданні. – Мн.: Маст. літ., 1987. – 352 с. – С. 221 – 232.

13. Сачанка, Б. Зямля маіх продкаў (Старонкі з дарожнага дзённіка) [Тэкст] / Б. Сачанка / Зямля маіх продкаў: Апавяданні, нарыс. – Мн.: Выд-ва "Беларусь", 1964. – 255 с. – С. 142 – 255.

14. Сачанка, Б. Вечны кругазварот [Тэкст] / Б. Сачанка / Горкая радасць вяртання: Аповесці, апавяданні. – С. 273 – 351.

Гомельский государственный
университет им.Ф. Скорины

Поступило 12.01.10

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 821.161.3 – 1.09:94 (470)

Святло і колеры Айчыны

В. У. Ярац

У артыкуле “Святло і колер Айчыны” даследуецца творчасць выпускніка нашага ўніверсітэта паэта Аляксандра Дамброўскага. Разглядаюцца кнігі паэзіі аўтара, якія выйшлі ў выдавецтвах Мінска на працягу апошніх трох гадоў.
Ключавыя словы: паэзія, вершаванае слова, тэматыка, вобраз, лірычны герой, мастацкі прыём.

The article “Fatherland light and colour” studies the creative work of Gomel State University graduating student, poet Alexander Dombrovskii. It considers the author’s books of poetry published in Minsk for the past three years.
Keywords: poetry, poetic word, topic, image, lyrical character, artistic technique.

У 60-я гады мінулага стагоддзя, калі паэзія была на самым высокім піку папулярнасці, калі ў многіх гарадах Савецкага Саюза творцы вершаванага радка збіралі вялізныя залы і шматтысячныя стадыёны слухачоў-аматараў, што будуць рабіць пазней эстрадныя зоркі, нарадзіўся і стаў крылатым выраз: “Что-то физики в почете. Что-то лирики в загоне”. Парадокс (ці прадбачанне?) выказвання Барыса Слуцкага? Адчуванне перспектывы?

Многія аўтары-сучаснікі напаўняюцца радасцю з водсмакам ніякаватасці, калі за ўласныя грошы альбо сродкі спонсараў (што здараецца надта рэдка) трымаюць у руках кніжачку сваіх вершаў, выдадзеную тыражом 50-100 экземпляраў. Сярод такіх шчасліўцаў – і Аляксандр Дамброўскі, які нарадзіўся ў вёсцы Хімы Рагачоўскага раёна ў сям’і настаўнікаў у самой сярэдзіне XX веку. Асноўныя вехі ягонай біяграфіі: закончыў фізічны факультэт Гомельскага ўніверсітэта, працаваў інжынерам і выкладчыкам, быў вайскоўцам. Пісаць вершы пачаў яшчэ школьнікам. Актыўна друкаваўся ў студэнцкай шматтыражцы, у газетах “Камунар”, “Сельмашевец”, “Гомельская праўда” і іншых выданнях. Ён – адзін з аўтараў калектыўных зборнікаў “Дзень паэзіі”, “Універсітэт літаратурны”, “Западная Двина”, літаратурна-мастацкага альманаха “Гоман”. Па выніках усебеларускага літаратурнага конкурсу 2006 года заняў другое месца ў жанры “паэзія” (прыз “Сярэбранае пяро”).

Усе асабістыя зборнікі аўтара (а іх на сённяшні дзень чатыры) убачылі свет у розных выдавецтвах у Мінску: “Полесские мотивы” (2007), “Поэзия любви” і “Пуля” (2008), “Задумчивый вечер” (2009). Сур’ёзна ставячыся да такой падзеі, як з’яўленне першай кніжкі, вершатворца не вельмі спяшаўся імчацца стрымгалоў з рукапісам да выдаўцоў. Адсюль – і дэбют у такім сталым узросце, калі словы нетаропка ўзважаны душой, грунтоўна праверaны на вока і слых. І таму яны (не ўсе, канешне) не пакідаюць абыякавым чытача. Вось верш “След” – своеасаблівы акорд, запеўка да той размовы, якую аўтар вядзе з людзьмі і часам:

Не человек
проходит по двору
С корзинкою –
в ней хлеб, кусочек сыра –
Судьба подходит
к моему перу,
С тем, что в судьбе
осталось в этом мире…
Стучит костыль.
Он оставляет след
На мокром тротуаре.
Исчезающий…

Ушёл за поворот
и скрылся. Нет! –
Остался след в душе моей.
Пылающий…

Для мастакоўскай пазіцыі Дамброўскага ўласціва скіраванасць на пазітыў: светлыню і дабро, чуласць і спагадлівасць, узаемападтрымку і самаахвярнасць. Ён прынцыпова не жадае корпацца ў брудным і нізкім, малаістотным, не хаваючыся ад злога, нахабнага, жорсткага, але не даючы яму разгарнуцца і гаспадарыць у сваёй тэматычнай галерэі. Шмат перажыўшы і спазнаўшы, ён часта адштурхоўваецца ад глыбокіх, па-філасофску ёмістых выказванняў выдатных майстроў слова – Ж. Санд, М. Прышвіна, А. Ахматавай, М. Цвятаевай, Д. Мадзіні, Р. Эмерсона, трымаючыся свайго правіла: “Отбросить всё, что мелкое в судьбе”.

Невыпадкова радкі пра любоў – вызначальная дамінанта зборнікаў, адзін з якіх і мае назву “Поэзия любви”. Падзяляючы прызнанне К. Цілье “Быць любімым – гэта болей, чым быць багатым, таму што быць любімым – значыць быць шчаслівым”, аўтар імкнецца адметна асэнсаваць стан закаханасці ў вершах “Свеча”, “Звенит вино”, “Последний роман”, “У моря”, “Ночь любви”. Лірычны герой прымае любоў, як найвышэйшы дарунак лёсу, як самае найгалоўнае, беручы ў саюзнікі і Поля Верлена з ягоным крэда: “Любоў – гэта адзіны сэнс жыцця, і сэнс сэнсаў, сэнс шчасця”. Для яго каханая – песня, пяшчота, сонца. Разважаючы пра ўласнае жыццё, паэт імператыўна заяўляе: “Где Любовь – там и центр Земли!”

Славячы імгненні і дні, асвечаныя каханнем, для лірычнага героя і ростань – не безвыходнасць і нудзьга, а толькі яшчэ адна прыступка на “лесвіцы ў неба” (М. Слуцкіс):

Расстаёмся.
Улетаем.
Но друг друга
Обретаем…

Не ўсе, аднак, вершы гэтай спавядальнай тэмы выглядаюць пераканаўчымі ў мастацкіх адносінах. Асобныя з іх трапілі ў палон расцягнутасці, неабавязковага шматслоўя, дыдактычнасці (“Что говорить!”, “В минуты высшего блаженства”, “Не ревнуй к прошлому”, “Вам я сердце свое отдаю”, “Как жаль!”). Узорам альбомнай “красивости”, банальнага апісальніцтва выглядаюць падобныя сентэнцыі:

Что говорить,
я в глаза голубые смотрел!
Шел разговор,
любовался с волненьем.
Свет красоты оживил мое сердце,
согрел.
Стал для меня
вдохновения чудным явленьем.

Імкненне да ўзвышанага ладу пачуццяў часам абарочваецца трывіяльным наборам штампаў: “О, Прекрасная Женщина”, “Чувством прекрасного жизнь осветив, Счастьем любви опустилась на плечи….”, “В минуты высшего блаженства Моя душа тобой полна…”.

Асобная балючая тэма ў творчасці аўтара – памяць пра родных яму людзей, якія так дачасна пайшлі з жыцця. Бацьку скасіла франтавая куля не на вайне, а ўжо ў мірным, пасляваенным свеце:

Лишь потом, когда понял причину
(Он ведь пулю у сердца носил!),

Видел я, как большого мужчину
Тот металл все косил и косил…

Згадваецца бураўкінскае: “Тыя кулі, што калісь заселі ў целе, даляцелі ўсё ж да сэрца, даляцелі…”. Поруч з вершам “Пуля” з аднайменнага зборніка стаіць невыпадкова верш “А у убийцы нет лица” – у ім той жа роздум пра жыццё і смерць, а яшчэ – пра забойцу, воблік якога ў рэчаіснасці нярэдка размыты, пазбаўлены канкрэтных рыс, індывідуальных адметнасцей:

Грамм девять – пуля из свинца.
И нет отца!
А пуля все летит-летит через поля,
через луга –
Все ищет нового врага…
И нет ее пути конца!
Грамм девять – пуля из свинца.
В какой войне,
В тебе ль, во мне
Замедлится полет свинца?
…А у убийцы нет лица…

Кранаюць шчодрасцю сардэчнай самааддачы і вершы пра маці. Іх у аўтара не вельмі многа, але ўсе яны запамінаюцца, выклікаюць суперажыванне. У ліку такіх – “А?!”, “Увидел женщину…”, якія можна занесці ў аўтарскі набытак:

Сегодня мама мне приснилась.
Она спала.
Невероятно утомилась.
И не ждала.
Шептал я тихо: «Мама! Мама...
Мам… Ты жива?»
Та, что была родною самой,
Сказала: «А?!»
И я проснулся вдруг, мгновенно.
Хожу, хожу…
То радуюсь – попеременно –
То вдаль гляжу…
А это «А?!» звучит над миром…
Звучит уже
В моей строке, моей квартире,
В моей душе.

Сустракаючы на вуліцы пасівелую жанчыну, паэта нібы працінае ток “Мама жива!”, жадаючы ўбачыць у рэчаіснасці той цуд, які, на вялікі жаль, немагчымы, бо маці ўжо ніколі не вернеш адтуль, адкуль яшчэ ніхто не вяртаўся. І горача, і разам з тым па-мужчынску стрымана гучаць фінальныя радкі лірычных асацыяцый:

Но горечь – рекою!
Из сердца выйдет ли?!
Слезы
уже потекли из глаз…
Хорошо – один.

Хорошо – не видели.
Закурю –
и выдержу на этот раз.

У адной са сваіх апошніх кніг “Сума немагчымасцяў” (2009) Алесь Разанаў разважае: “Мастацтва не мае свайго абсягу, ён рассяроджаны ва ўсёй рэчаіснасці. Вобразы і тэмы аточваюць мастака, як вірусы”. Сапраўды, нават у такой традыцыйнай сферы навукі аб літаратуры, як падзел на тыя ці іншыя тэмы, існуюць розныя падыходы і погляды, хоць у большасці сваёй апаненты сыходзяцца на тым, што пры ўсёй умоўнасці вызначэння ёсць тая дамінанта, той выразны стрыжань, тое ядро, вакол якога збіраюцца творы пэўнага накірунку.

Менавіта адной з вядучых тэм у зборніках А. Дамброўскага выступае наша беларуская прырода – сціплая, своеасаблівая, неаднойчы зраненая агрэсіўна-татальным прагрэсам. І таму і сёння актуальна гучыць сцвярджэнне аўтарытэтнага рускага вучонага-біёлага Зялінскага: “Паводзіны чалавека ў прыродзе – люстэрка ягонай душы”. Як тут не звярнуць увагу на грымасы часу? Учора быў лозунг “Асушым балоты!” Сёння гучыць: “Адродзім балоты!”

Пішучы на рускай мове, адчуваецца крэўная сувязь аўтара перш за ўсё з Беларуссю, з яе гісторыяй, з яе абсягамі, краявідамі. Шчырасць і адкрытая прамата паэта вызначаюць ягонае вершаванае слова – зразумелае, даходлівае, немудрагелістае. Сказанае датычыць такіх вершаў, як “Родным”, “Истоки”, “Полесские мотивы”, “Слово”. Не ўсе вершы гэтай лірычнай епархіі сталі фактам мастацкім. Асобныя з іх перанасычаны прамалінейным пералікам дэталяў без вобразна-выяўленчай палітры (“Лучик”, “Окна”), перагружаны звычайнай расцягнутасцю апісання (“Моё время”), іншым, болей лаканічным, не стае паэтычнай энергіі – рытмічнага дынамізму і метафарычнасці (“Воздух Родины”, “Мудрая щедрость”).

Іншым разам аўтару не ўдаецца пераадолець магнітнае прыцягненне класікі – і ўзнікаюць запазычванні накшталт: “Готов я небо над деревнею, Березкам ноги целовать!” Тут Сяргей Ясенін – навідавоку, у поўны рост.

У лірычных радках рускамоўнага вершатворцы нярэдка сустракаюцца не толькі тапанімічныя адзнакі палескага рэгіёна, але і лексічныя адзінкі, уласцівыя шырока беларускай мове – і “жывой”, размоўна-бытавой, і літаратурнай. Вершы А. Дамброўскага прасякнуты любоўю да роднай зямлі, насычаны галасамі і колерамі дарагога з маленства краю – непаўторнага ў сваёй адметнай, някідкай маляўнічасці Палесся. Для лепшых строф і радкоў аўтара ўласціва сцішаная, некрыклівая споведзь перад людзьмі і часам, перад мінулым і сучасным, дзе адказнасць за будучыню ўскладзена на кожнага, хто рупіцца пра лёс сваёй Айчыны, дбае пра яе росквіт, дзе заўжды будзе гучаць неўміручая мова Купалы і Коласа, Караткевіча і Мележа, Быкава і Брыля, Пташнікава і Казько…

Менавіта такія прызнанні, у якіх гарманічна яднаюцца шчырасць, паўната пачуццяў і паўната мастацкая, дадаюць свету свае колеры і адценні, свае асабістыя мелодыі, якія цікавыя для ўсіх, хто імкнецца зразумець глыбіню, непаўторнасць кожнай людской душы і глыбіню,таямніцу Паэзіі.

Гэта не так ужо і мала, калі часта за радкамі строф рэльефна бачыцца асоба, чалавек з выразна выяўленымі адносінамі да зямнога быцця, да ўсяго, што “дзеецца на свеце” (Ф. Багушэвіч). А пралікі і хібы, як і іншыя агрэхі і цяжкасці на творчым шляху кожнага – засцерагальныя знакі-сігналы, што не даюць права на заспакоенасць і млявае сузіральніцтва. Вучыцца заўсёды ёсць чаму і ў каго: і ў папярэднікаў, і ў сучаснікаў.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 15.02.10

Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

УДК 398.3(476)

Інтэрпрэтацыя каляндарных стыляў у беларускім фальклоры: вераснёўскі стыль

А. Ю. Лозка

Разглядаецца гісторыя вераснёўскага каляндар нага стылю і абгрунтоўваецца гіпотэза пра першаснасць друкавання Ф.Скарынай “Кнігі святога Іава”, а не “Псалтыра”. Абвяргаецца думка пра беднасць і адсутнасць у фальклоры беларусаў восеньскага навагоддзя і выкарыстання вераснёскага стылю ў гісторыі нашага краю. Разглядаюцца абрады і звычаі “жаніцьбы пасьвета” (1/14 верасня), свята Багача (8/21 верасня) і інш., якія найбольш ім адпавядаюць і выяўляюць адметнасць і багацце беларускага фальклору. Прыводзяцца некаторыя падобныя звычаі народаў Еўропы.
Ключавыя словы: беларускі народны каляндар, каляндарна-абрадавая паэзія, культ продкаў, сімволіка, абрад "Жаніцьба коміна", свята "Багач", навагодні комплекс, традыцыя.

On the background of the european traditional culture the hypotheses of the reprethetation in Belarusian folklore of the september calendar style and autumnal equinox is being substantiated.
Keywords: Belorussian folk calendar, calendar and ceremonial poetry, the cult of the ancestors, the symbolism of the rite "Marriage Comyn”, holiday "Richer ", New Complex, a tradition.

Беларускі фальклорна-этнаграфічны матэрыял утрымлівае розныя рэлікты язычніцтва і наступнай гісторыі фарміравання календара. Паэтычны каляндар беларусаў – фенаменальная з’ява ў свеце, у якой адлюстраваны перыяд замены/сінтэзу язычніцкай і хрысціянскай культур, афіцыйныя (пасхальны, сакавіцкі, благавешчанскі, раждзественскі)[1] і неафіцыйныя каляндарныя стылі, што сведчыць пра актыўны ўдзел нашых продкаў у пошуку і фарміраванні аптымальных сродкаў летазлічэння на зямлі.

Пад стылем летазлічэння разумеецца не толькі вядомае ўсім паняцце новага і старога, якое звязана з грыгарыянскай і юліянскай рэформамі, а і менш вядомае – вызначэнне пачатку года. Так, у спецыяльнай літаратуры згадваецца пра шэсць каляндарных стыляў, якія існавалі ў Еўропе ў розныя перыяды. Такім чынам, лік дзён у годзе пачыналі з 25 снежня, 1 студзеня, 1 сакавіка, 25 сакавіка, Пасхі і 1 верасня [1, с. 395].

У шэрагу прац [2] мы абгрунтоўвалі многія фактары феномена беларускага народнага календара (БНК), яго багацце, кансерватыўнасць, шматграннасць, глыбіню памяці і тое, што не толькі вылучае, але і збліжае яго з досведам гістарычнага фарміравання аптымальных храналагічных і астранамічных ведаў народаў Еўропы і свету. Адразу зазначым факт фенаменальнасці народнага календара беларусаў як з’явы: усе названыя стылі зафіксаваны нашым фальклорам, што не наглядаецца ў іншых народаў. Тут жа мы спынімся толькі на адным феномене БНК, звязанага з восеньскім Навалеццем.

У фалькларыстыцы тэма вераснёўскага стылю і восеньскага раўнадзенства дастаткова не вывучана. Такая няўвага да “залатой” пары хутчэй за ўсё тлумачыцца тым, што даследчыкі не знаходзілі яркіх звычаяў, абраднасці, тым больш паэзіі, прысвечанай гэтаму важнаму моманту ў земляробчым коле ў параўнальна бедным каляндарна-абрадавым восеньскім перыядзе.

Як вядома, вераснёўскі стыль выкарыстоўваўся некаторымі краінамі яшчэ з візантыйскага перыяду, напрыклад, у паўднёвай частцы Італіі. Старажытныя рымляне “септэмбер” прысвячалі Вулкану, богу агню, і святкавалі Вулканаліі, забіваючы ў ахвяру парася і цяля. Афіцыйна вераснёўскі стыль быў уведзены ў 321 г. імператарам Канстанцінам і лік пачынаўся з 23 верасня, дня нараджэння першага рымскага імператара Актавіяна Аўгуста. У 462 г. пачатак Новага году быў перанесены на 1 верасня. Александрыйскі каляндар (26 г. да н. э.) пачынаў год 1 Тота – 30 жніўня (12 верасня н. ст.). Гэтае стабільнае егіпецкае летазлічэнне ў

[1] Мы адрозніваем Пасху (хрысціянскае свята) ад язычніцкага Вялікадня (нерухомыя дзень ці дні ў годзе, звязаныя з раўнадзенствам), хрысціянскае Раство (25 снежня) ад традыцыйнай каляднай пары.

першых стагоддзях н. э. было ўведзена ў старажытнай Грузіі, дзе першапачаткова Новы год адзначалі 6 жніўня па юліянскім календары. На медалі, які быў заснаваны ў гонар увядзення рэспубліканскага календара Французскай рэвалюцыі, быў зроблены надпіс "Пачатак французскай эры з восеньскага раўнадзенства 22 верасня 1792 г…". Гэтае цікавае летазлічэнне праіснавала да падзення камуны – 28 мая 1871 г. [3, с. 78]. Яўрэі і цяпер адзначаюць Новы год па сонечна-месяцавым календары ад першага дня месяца Тышры, які пачынаецца ў маладзік перад восеньскім раўнадзенствам, таму асноўнае свята можа адбывацца у межах ад 6 верасня да 6 кастрычніка. Згодна з вучэннем рабінаў, у першы дзень Бог стварыў першага чалавека Адама, які судзіць у гэты дзень людзей за іх грахі ў мінулым годзе. Старажытныя тыбетцы адзначалі Новы год у час жніва ячменя і называлі яго Ласар (Новы ўраджай).

З 1493 па 1770 г. вераснёўскі стыль быў афіцыйным ў Расіі, і Руская праваслаўная царква дагэтуль лічыць яго пачаткам індыкта. Усходнеславянская пісьменнасць карыстаецца візантыйскім стылем з канца XV ст., побач з рымскім (студзеньскім) ён таксама ўжываўся ў справаводстве Вялікага княства Літоўскага. Згодна з аўтарытэтным сведчаннем В. Тумаша, "ад XII стагодзьдзя побач з'яўляецца аднак, а каля палавіны XV стагодзьдзя й канчаткова замацоўваецца ў Беларусі візантыйскае восеньскае навагодзьдзе ад 1 верасня. У часе Скарыны ў Вялікім Княстве Літоўскім у дзяржаўна-адміністрацыйным і царкоўным ужытку тарнаваўся скрозь ужо вераснёвы пачатак каляндарнага году" [4, с. 100]. Першы друкаваны скарынаўскі каляндар "Малая падарожная кніжка" (1522 г.) год пачынае з 1 верасня і заканчвае 31 жніўнем.

У сучаснай Беларусі ўсюды пануе думка, асабліва ў школьных падручніках і студэнцкіх дапаможніках, што першай друкаванай кнігай Францыска Скарыны з'яўляецца "Псалтыр", які выйшаў 6 жніўня 1517 года. Украінскі ж даследчык П. Папоў яшчэ ў 1924 годзе заўважыў, што беларускі першадрукар пачаў сваю дзейнасць з выданняў філасофскага зместу, з кнігі святога Іава (10 верасня 1517 года) [5, с. 13, 22]. Тое ж самае знаходзім і ў іншай замежнай літаратуры. Напрыклад, англійская энцыклапедыя Брытаніка сцвярджае, што "яшчэ раней некаторыя кнігі Бібліі ўжо былі надрукаваны па-беларуску, пачынаючы з кнігі Іава" [6, с. 586].

Пісьменнік і гісторык Уладзімір Караткевіч, выпускнік Кіеўскага універсітэта, які ў 1973 годзе, будучы ў Празе, напісаў эсэ пра пражскі перыяд у жыцці слыннага палачаніна, дзе зазначыў: "Нейкая горкая іронія ёсць у тым, што ён пачаў выдаваць Біблію з "Кнігі Іава". Нібы прадбачыў свой нялёгкі шлях…" [7, с. 298]. Найбольш грунтоўны погляд на гэту праблему ў філосафа Уладзіміра Агіевіча, які ў сваёй манаграфіі сцвярджае: "У Празе Чэшскай у 1517 – 1519 гг. першадрукар выдаў, пачынаючы з кнігі Святога Іава (10 верасня 1517 г.), а не з "Псалтыра" (6 жніўня 1517 г.), бо год тады пачынаўся з 1 верасня…" [8, с. 56]. Некалькі публікацый па ўзнятай праблеме былі і ў аўтара названага артыкула.

Пры вызначэнні сутнасці "вераснёўскага году" ў адносінах да студзеньскага неабходна карыстацца высновай І. Клімішына: «Калі падзея прыходзіцца на перыяд часу з верасня па снежань (абдва гэтыя месяцы таксама ўваходзяць у перыяд), то з ліку года візантыйскай эры N адымаем 5509 гадоў (R= N – 5509), калі ж падзея прыходзіцца на студзень – жнівень, то адымаем 5508 гадоў (R = N – 5508)» [1, с. 880]. Няцяжка зразумець, што астраномы перыяд з верасня па снежань адносяць на год раней у пераліку на сённяшняе летазлічэнне. Такім чынам, з усяго сказанага вынікае, што **першай друкаванай кнігай беларусаў і ўсходніх славян з'яўляецца не «Псалтыр», а «Книга светого Иова», якая была здзейснена 10 верасня 1517 года па тагачаснаму вераснёўскаму стылю, што адпавядае 10 верасню 1516 года сучаснага студзеньскага летазлічэння.**

Не маюць рацыі і тыя даследчыкі ў сваіх сцверджннях, што першавераснёўскае Навалецце "не мае гістарычных пасведчанняў аб адпаведнасці яе выкарыстання на тэрыторыі Беларусі", што восеньскае раўнадзенства "ніяк не зафіксавана ў фальклоры беларусаў" [9, с. 87]. Засяродзім увагу на дадзеным аспекце.

У царкоўным календары 1/14 верасня адзначацца памяць прападобнага Сямёна Столпніка (459 г.), які праславіўся строгім аскетычным ладам жыцця дзеля служэння Богу. Акрамя таго, 1 верасня (пачатак індыкта) быў прыняты замест 1 сакавіка Маскоўскім Саборам у 1492 годзе, хаця раней быў уведзены імператарам Канстанцінам Вялікім у гонар перамогі 1 верасня 312 года над Максентыем, калі была падаравана хрысціянам поўная воля выяўляць сваю веру.

У беларускім народным календары вядомы дзень Сымона (Сямён, Стоўб), які няблага прадстаўлены фальклорам. Пра яго гавораць: «У Сямёнаў дзень да абеду ары, а пасля абеду аратага з поля гані» (прыказка; тут і далей фальклорныя прыклады ўзяты з нашай кнігі "Беларускі народны каляндар" [10]), «Святы Сымон – а й сявец дамоў» (з валачобнай песні). На Віцебшчыне запісаны розныя павер'і, звязаныя з ураджайнасцю і прымеркаваныя да гэтага дня. Напрыклад: «Калі першы засевак жыта рабіць напярэдадні Івана (28 жніўня), то жыта ўродзіцца з буйным коласам, калі ж напярэдадні Сямёна Стаўба, то яно дасць добрую салому, але не будзе каласістым». Пра зменлівы характар надвор'я ў прысвятак добра сведчыць прыказка: «Сымон да варот, на дварэ сем пагод: сее, вее, круціць, муціць, зверху лье, знізу мяце». Гэты дзень лічыўся днём адлёту птушак: «На Сымона ластаўкі хаваюцца ў ваду», «На Сымона птушкі лятуць у вырай». На Падзвінні да Сямёна імкнуліся падстрыгчы авечак, каб ён не ўкраў сабе на рукавіцы. А яшчэ казалі: «На Сямёнаў дзень вужы на землю выходзяць».

На Смаленшчыне праводзілі «жніво» – абрад выгнання мух у час дажынак. Падобны звычай выгнання насякомых пры дапамозе такой прадметнай атрыбутыкі, як штаны, быў вядомы на Віцебшчыне .

Раней на Сямёна праводзілі абрад «Жаніцьба коміна» (пасвета[2], лучніка). У ім адлюстраваны культ агню-багача, хатняга духу-продка, хатніка. І невыпадкова, бо дзень скарачаўся, пачынала цямнець і трэба было выконваць некаторую працу пры лучыне. Комін упрыгожвалі ручнікамі, кветкамі, стужкамі. «Частавалі» агонь на пасвеце гарэлкаю, кідалі кавалак сала, зерне, арэхі. Выказваліся пажаданні аб сямейным дабрабыце, каб спорна ішла работа. Жанчыны спявалі вясельную песню «жаніху»:

Ой, прыйшлі ж ночанькі доўгенькі,
Пасвяці ж нам, коміну беленькі.
Мы ж цябе кветкамі ўбіралі,
Барвяночкам, рутай аперазалі...

У якасці "маладых" тут выступалі Комін і Праца. «Праца наша – дзеўка гарненька, палюбіці Коміна радзенька» (Піншчына, 1883 г.; [11]).

Існуе толькі з дзесятак запісаў ці невялікіх паведамленняў пра "жаніцьбу коміна" і пераважная большасць з іх запісана на тэрыторыі Палесся. У 1988 годзе звесткі пра гэты абрад зафіксаваны в. Дзяржынск Лельчыцкага раёна.

